Ка́жуць: што кра́й, та абыча́й, што село́, та но́раў, а што ґалава́, та ро́зум. У вадно́м ме́йсцы быў абыча́й—дабива́ць стары́х людзе́й, каб ены́ дарэ́мно не е́ли хле́ба, кали́ не маґу́ць рабі́ць. Ча́сам и са́ми стары́е лю́дзи прасі́лиса, каб их дабі́ли, бо, ве́дамо, им ця́жко было́ лу́паць ачы́ма, чака́ць, паку́ль им даду́ць е́сци, або́ пі́ць. От жыў адзи́н чалаве́к; у его́ было́ мно́ґо дзецей да ўсе́ ўда́лые, до́брые. Саўси́м састаре́ўса ба́цько, а ены́ его́ слу́хаюць, шану́юць. Але́ от дава́й суседзи прыстава́ць, каб ены́ дабі́ли свайґо́ ба́цька-дарма́еда, бо е́н ужэ́ ве́льми стары́ й никто́му не ґо́ж. Шко́да дзе́цям старэ́нькаґо ба́цька. И схава́ли ены́ его́ ў по́ґраб да й но́сяць ему́ туды́ цишко́м е́сци й пиць. До́ўґо жыў старэ́ньки ў по́ґрабе. Лежы́ць сабе́ на сало́мцэ да Бо́ґу мо́литца, а як суседзи разы́дутца на рабо́ту, от е́н вы́сунетца з по́ґраба, паґляди́ць на я́снае со́нейко, паґре́етца й зноў захава́етца ў по́ґраб. Малы́е ўну́ки й пра́ўнуки прынесу́ць ему́ туды́ суни́ц, або́ другі́х я́ґад, а е́н е́сь и ка́жэ

им ка́ски. А то забеґу́ць к ему́ маладзи́цы, або́ дзеўча́та, паю́ць ему́ ў по́ґрабе пе́сни, ча́шуць ґо́лаў. А сыны́, ўжэ́ барада́тые, ча́сто прыхо́дзяць к старэ́нькаму ба́цьку пажу́піць пра хаджа́йство да папытаць старо́ґо: кали́ й ґдзе́ што се́яць, як лепш абрабля́ць по́ле, як даґлядаць ґаўя́дко. Старэ́ньки ўсе́ им ска́жэ, ўсему́ на́ўчыць. Жыве́ сабе́ стары́ ба́цько, а дзе́ци да й уну́ки ра́ды. Але́ ось наста́ў там вели́ки ґо́лад. Прапа́ў не́маль уве́сь ста́так. Пу́хнуць лю́дзи ат ґо́ладу, жыватами кача́ютца, — нема́ за што рук залажы́ць. Панесли́ дзе́ци старэ́нькаму бацьку апо́шни хлеб, а е́н да й ка́жэ им, каб ены́ садра́ли з харо́м стре́хи да й вымалацили ту́ю сало́му. Паслу́хали дзе́ци старэ́нькаґо ба́цька, садра́ли стре́хи да й дава́й малаци́ць стару́ю сало́му. Глядзя́ць, аж на таку́ так мно́ґо зернят, што хва́ціць хле́ба да но́ваґо ураджа́ю Пыта́юць усе́дзи, аткуль у их хлеб, а ты́е й разказа́ли им, што ґэ́то их нау́чыў стары́ ба́цько, като́раґо ены́ хава́юць у по́ґрабе. Пашли́ ґэ́то ўсе́ усе́дзи, старые́ й малые́ ў по́ґраб к старэ́нькаму да й вынесли еґо́ аттуль на рука́х. До́ўґо ещэ́ по́сле таґо́ жыў старэ́ньки ба́цько. От з тае́ пары́ ґо́дзи дабива́ць стары́х людзе́й, а пачали́ им служы́ць, даґлядаць их да шанава́ць.

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б. Рожинъ.

---

9. Кузьма.

На свѣце усего́ нажыве́ш и
Кузьму ба́цькам назаве́ш.
Прыказка.

Ещэ́ саўси́м дзецюко́м жани́ўса Кузьма́, а жо́нку ўзя́ў маладу́ю, здарово́ую да ве́льми ўпра́ўную. Про́сто жы́дки нема́ Кузьме́: жо́нка сло́ва не дась кы́ґаварыць. Штоб е́н ни зрабіў—усе́ не так. З ким-бы е́н ни заґаварыу—жо́нка ўсю́ды сво́й язы́к ваткне́, насыпле, як бо́бу. Урадзи́ўса хлапчу́к. Не мо́жна й сказаць, чаґо́ не нацерпе́ўса Кузьма́ ат жо́нки! Падро́бс тро́хи хло́пец, а жо́нка й не падпуска́е к ему́

бли́зко ба́цька. Расце́ хло́пец и нико́ґо не слу́хае. Наўчы́ла еґо́ ма́ци, каб ён не зва́ў Кузьму́ ба́цькам.—Кузьма́, идзи́ ара́ць; Кузьма́, свине́й заґани́,—ка́жэ сын, а ба́цькам нико́ли не назаве́. Го́рно Кузьмѣ́, але́ ничо́ґо не зро́биць. Смею́тца лю́дзи,—ду́рэнь,—кажуць—Кузьма́. Перш жо́нка е́здзила на ка́рку, а цепе́р подґадава́ў сы́на, дак то́й сѣ́ў на ка́рак.—От адзи́н раз паѣ́хаў Кузьма́ з сы́нам па сѣ́но. Накла́ли ены́ вели́кие вазы́ да й е́дуць да ґаспо́ды. Маро́з быў не вели́ки, даро́ґа харо́шая, ле́ґкая. Паўзла́зили ены́ на вазы́ да й е́дуць сабе́ памале́ньку. Пере́хали ґла́дкае бало́то, падъѣзжджа́ючь к ле́су. Пашли́ ўха́бы. Злѣ́з Кузьма́ з во́за й на выбо́инах падтрымо́ўвае сво́й во́з, а сын лежы́ць на во́зе да то́лько каме́ндуе: „Кузьма́, онь уха́ба; падтрыма́й мо́й во́з; праведзи́ жараби́цу тро́хи на цалину́, а то во́з абе́рнетца“. Падтрыма́ў Кузьма́ сво́й во́з на ўха́бе, а во́з сы́на нахили́ўся й ле́ґ на бо́к. Палецѣ́ў Кузьмы́ сын з во́за й упаў у сне́ґ. Абла́яў сын Кузьму́; падняли́ ены́ во́з и паѣ́хали да́лей. Але́ ось на растанцо́х зно́ў пахили́ўся во́з дзецюка́. Падо́ѣґ ён збо́ку й упе́рса плечо́м, але́ незмо́ґ и ўпа́ў у сне́ґ, а во́з на еґо́.—Кузьма́!—крычы́ць з пад во́за,—падыми́ во́з, а то жыў не бу́ду.—Маўчы́ць Кузьма́; доста́ў сабе́ люльку, вы́няў з кише́ни капшу́к з цюцюно́м и дава́й заку́рваць.—Лежы́—ду́мае сабѣ́,—кали́ не хо́чеш назва́ць мене́ ба́цькам.—Зваў, зваў дзецю́к Кузьму́, але́ ба́чыць, што той не слу́хае, а сам з пад во́за не мо́жэ вы́лезци, от ён и ка́жэ: „бацько́, падыми́ во́з“. Рад Кузьма́, што сын назва́ў ба́цькам, падня́ў во́з и аслабани́ў сы́на. Падня́ўся дзецю́к, абтрапа́ў сне́ґ, да й ка́жэ: „На све́це ўсе́ нажыве́ш и Кузьму́ ба́цькам назаве́ш“.—От з таѣ́ пары́ й пашла́ пры́казка, што на све́це ўсеґо́ нажыве́ш и Кузьму́ ба́цькам назаве́ш.

Пересказалъ И Аземша.

С. Лучицы.

10. Бэч рыж.

Жыў сабе́ адзи́н баґа́ты чалаве́к. Не то ўжэ́, каб ён быў ве́льми старэ́нны, або́ працави́ты, але́ ему́ ва ўсём шанцава́ло. Ча́сто суседзи каза́ли, што ма́быць ему́ не́чысць памаґа́е; да пе́ўне, што ён з нечы́стым зна́ўса. Быў у то́м селе́ старэ́нны й ку сему́ зда́тны чалаве́к, але́ таки́ бе́дны, што ча́сам и хле́ба не ма́ў. Не быў ён ни ґульта́й, ни пья́ница, але́ штось ему́ не шанцава́ло, а мо́жэ ґэ́то ён ужэ́ таки́ нещча́сны ўрадзи́ўса. От пашо́ў раз, бе́дны на заґуме́чэ; тра́пиласо ему́ иди́ кале́ ґумна́ баґа́таґо. То́лько ён параўня́ўса з ґумно́м, ба́чыць, аж баґа́ты абсма́львае ў сваём ґумне́ паўце́не: падпа́лиць зу́бленкаю пад са́мым стро́пам, а як аґо́нь разґары́тца, та баґа́ч то́лько ка́жэ: „бэч рыж!“ Гары́ць сабе́ ци́хенько паўце́не, а сало́ма хаць-бы што—от як у вадзе́. Абсмали́ў баґа́ч у ґумне́ ўсе́ паўце́не, заткну́ў зу́бленку ў сто́ўп, да й пашо́ў сабе́ ў ха́ту. Даґарэ́ла зу́бленка да са́маё сало́мы да й пату́хла. Ба́чыць бе́дны, што баґа́таґо аґо́нь слу́хае, пашо́ў и ён у сваё ґумно́ й дава́й апа́льваць павуце́не. То́лькы ён падаткну́ў зу́бленку, як заґары́тца страха́; крыча́ў ён, крыча́ў „бэч рыж!“—ничо́ґо не зро́биц,—аґо́нь не слу́хае. Нарабы́ў ён кры́ку, збе́ґласо ўсе́ село́, але́ што ни рабы́ли,—зґаре́ло ґумно́ бе́днаґо, ўсе́ ро́ўно, як еґо́ языко́м слиза́ло. Беду́е бе́дны чалаве́к, нема́ за што́ рук заця́ць. Прышо́ў ён к баґа́таму да й пыта́е: „скажы́ ты, братко́, чаму́ цебе́ аґо́нь слу́хае?“—Ґэ́то мне́,—ка́жэ,—так шанцу́е, а ве́дамо, кали́ шанцу́е, та й у ла́пцях танцу́е. Ма́быць мая́ така́я до́ля, што, штоб я ни зраби́ў, та ўсе́ бу́дзе до́брэ. От раз быў баґа́ты ў по́ли, ба́чыць, аж ґары́ць их село́. Усе́ ки́нулиса тушы́ць по́жар, альбо́ ратава́ць сваё баґа́тство. Пабе́ґ и бе́дны чалаве́к, а баґа́ты аста́ўса.—Чаґо́ я,—ка́жэ,—пайду́ ратава́ць, мо́о ў ґэ́тум маё ща́сце.—Зґаре́ло село́. Пачали́ лю́дзи пераґре́баць по́пел. Гледзи́ць баґа́ты, аж там, ґдзе́ была́ еґо́ ха́та, зо́лато слило́со: кусо́к, мо́о ху́нтаў дзе́сяць.—От,—ка́жэ,—мне́

й по́жар шанцу́е, ґэ́то така́я мая́ до́ля.—И зажы́ў баґа́ты з таѣ́ пары́ ащэ́ лѣ́пш, як уперо̆д, а бѣ́дны бѣ́дным так и аста́ўса

Пересказалъ Данило Кулешъ.

Дер. Чудинъ.

11. Бусел *).

Уперо̆д не было́ ни гадзю́к, ни жаб, ния́каґо ґэ́таґо плюґа́ўства От раз Бо̆ґ падазва́ў к сабѣ́ чалавѣ́ка й да́ў ему́ завя́заны ґарщо́чак.—На—ка́жэ,—занеси́ ґэ́ты ґарщо́чак и ўки́нь у мо́рэ; то̆льки, ґлядзи́, неразвя́звай.—Прышо́ў чалавѣ́к да ґаспо́ды й пача́ў збиратца ў даро́ґу: узлажы́ў чы́стую, бѣ́лую саро́чку, абу́ў но́вые ла́пци й прану́ў чо́рную сви́ту.—Куды́ ты збира́ешса?—Пыта́е жо̆нка.—А ось,—ка́жэ,—пасыла́е Бо̆ґ занесци́ ґэ́ты ґарщо́чак и ўки́нуць у мо́рэ—А што ў е́м тако́е?—Не вѣ́даю.—Дава́й паґля́дзим.—Бо̆ґ велѣ́ў не развя́зваць,—ка́жэ чалавѣ́к. Хо́четца ба́бе паґлядзѣ́ць, што там тако́е ў ґаршку́. Вѣ́дамо, ба́ба ве́льми цика́ва. Аж з шку́ры пражэ́тца ба́ба, хо́чэ паґлядзѣ́ць у ґарщо́чак, але́ чалавѣ́к упе́рса й непазваля́е. Ужэ́ суси́м сабра́ўса е́н у даро́ґу. Ба́чыць ба́ба, што ничо́ґо не зро́биць. Ужэ́ не так е́й хо́четца вѣ́даць, што ў ґарщэ́чку, як паста́виць на свае́м на перако̆р ґаспадару́.—Ну й куды́ ты по̆йдзеш пе́рад ве́чарам? Лѣ́пш пераначу́й до́ма,—ка́жэ ена́ ґаспадару́.—Што там но̆ч, я не баю́са,—ка́жэ чалавѣ́к.—У но̆чы ещэ́ лѣ́пш ици́: не так ґо́рачо.—Ба́ба ў сле́зы, дава́й ґаласи́ць да ўпика́ць ґаспадара́, што е́н еѣ́ не лю́биць, кали́ нехо́чэ пераначава́ць з е́ю апо̆шнюю но̆чку.—Кали́-ж нибу́ць да ўсе́-ж бу́дзе апо̆шняя но̆ч—ка́жэ чалавѣ́к.—Куды́ тут! И слу́хаць не хо́чэ ўпа́ртка ба́ба: ґало́сиць, аж разлива́етца. Паду́маў сабѣ́ чалавѣ́к, што ўсе́ ро̆ўно, кали́ ни занесци́ ў

*) Варіантъ этой сказки записанъ мною въ д. Чудинѣ, Слуцкаго уѣзда и переданъ для напечатанія въ «Извѣстіяхъ» И. А. Н. въ ст. «Грамматическій очеркъ живого бѣлорусскаго нарѣчія».

мо́рэ ґарщо́чак, и аста́ўса до́ма. Ра́да жо̆нка; напраґла́ ена́ яе́чни, даста́ла ґаре́лки,—часту́е ґаспадара́, як ґо́сця. Наѣ́ўса, напи́ўса чалавѣ́к и ле́ґ з жо̆нкаю спаць.—Не́маль усю́ но̆ч недала́ ба́ба засну́ць,—вѣ́дамо, маладая́ да здаро́вая маладзи́ца. То̆льки ўжэ́ пѣ́ўни заспева́ли, як е́н звеў во́чы, але́-ж за то́е, як засну́ў, дак як уби́ты. Спиць сабъ, храпе́ чалавѣ́к на ўсѣ́ аста́ўки, а жо̆нка тым ча́сам ци́хенько ўста́ла да й развеза́ла ґарщо́чак. То̆льки ена́ еґо́ откры́ла, а атту́ль и вы́скачыли ўселя́кие ґадзю́ки, я̆щарки й жа́бы. Спало́халаса ба́ба, нараби́ла кры́ку. Прахапи́ўса чалавѣ́к да так бо́сы, ў бѣ́ло̆й саро́чцэ, то̆льки наки́нуўшы на пле́чы чо́рную сви́ту, дава́й збира́ць ту́ю не́чысь. Збира́ў, збира́ў,—ничо́ґо не зро́биць. Але́ ось прыхо́дзиць Бо̆ґ и ка́жэ тым лю́дзям: „вы выпусцили ґа́даў, вы́ й збира́йце их“. И аберну́ў Бо̆ґ тых людзе́й у буську́ў. Хо́дзяць з таѣ́ пары́ па бало́це бо́сые, з чырво́ными наґа́ми, у бѣ́лых саро́чках и чо́рных сви́тах буськи́ да й збира́юць уся́кую не́чысь. Ены́ й стара́ютца жы́ць бли́жэ к сваи́м брато̆м—лю́дзям,—зна́юць, што их, як брато̆ў, лю́дзи не бу́дуць биць. От аткуль узели́са буслы́.

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы

12. Стралцы.

Пасбира́лися раз стралцы́ да й выхваля́ютца, чыя́ стрэ́лба лѣ́пш бъе. Вѣ́дамо, ко̆жын стралец сваю́ стрэ́лбу хва́лиць.— Мая́ стрэ́лба,—адзи́н ка́жэ,—хаць и разсыпа́е, але́ не жы́виць: пападзе́ адна́ шыраци́на, и пту́шка па́дае без ду́ху.—А мая́ хаць и не на́дто до́брэ бъе,—ка́жэ друґи́,—дак ве́льми шанцу́е: абы́ вы́шаў у лѣ́с, дак от на цебе́ ўсе бежы́ць и лецю́ць.—И пачали́ ены́ хвали́тца, што тако́е зрабили, каб стрэ́лба до́брэ би́ла й шанцава́ла. Быў тут адзи́н стралец да таки́ здатны, што нихто́ так до́брэ не ўмѣ́ў страля́ць як е́н. Усѣ́ вѣ́дали, што е́н чарадзѣ́йник, што е́н замо́виў сваю́ стрэ́лбу. Ен

слу́хае, як другі́е выхваля́ютца, маўчы́ць да то́льки смеѣтца сабе́ ў бо́раду. От и дава́й его́ праси́ць адзи́н малады́ страле́ц, каб е́н наўчы́ў, што зраби́ць, каб и его́ стрэ́лба шанцава́ла.—До́брэ—маўля́ў чарадзе́йник,—хадзе́м за́ўтрэ ў ле́с, та я цебе́ наўчу́. Це́лую но́ч не спа́ў малады́ страле́ц, так ему хаце́ласо скаре́й наўчы́тца замаўля́ць стре́лбу. Усхапи́ўса е́н чуць све́т, узя́ў сваю́ стрэ́лбу й пабе́ґ к старо́му стралцу́. Той мо́ўчки адзе́ўса й пацеґну́лиса ены́ ў ле́с. То́льки схава́лиса ў су́вараты, аж и бежы́ць за́яц. Злажы́ўса малады́ страле́п, вы́стралиў, а за́яц хаць-бы што: се́ў сабе́ пе́рад стралца́ми да то́лько ву́шы ўхмыли́ў.—Страля́й, дзя́цько́,—ка́жэ малады́ страле́ц,—ма́быць я даў пу́дла.—А той то́лько смеѣтца сабе́ ў бо́раду. Ось малады́ страле́ц стаў набива́ць стрэ́лбу, ба́чыць аткуль ни вазми́са бежы́ць ло́сь и екура́т кале́ за́йца. Злажы́ўса стары́ страле́ц да як стрэльну́ў, дак ло́сь на ме́сце й капыты́ задра́ў, а ґлушэ́ц про́сто з хво́и пакаци́ўса стралцо́м пад но́ґи. Глядзя́ць ены́, ажно́ за́йца ло́сь прыби́ў роґа́м, як па́даў дало́ў.—От як трэ́э страля́ць,—ка́жэ стары́ страле́ц. Дзи́витца малады́ страле́ц, аж на его́ страх напа́ў. Вы́пусцили, ґэ́то ены́ ло́сю ки́шки, забра́ли ґлусца́ й за́йца да й пашли́ да ґаспо́ды. Иду́ць да йду́ць, а стары́ страле́ц и ка́жэ: „от кали́ хо́чэш, каб и табе́ так шанцава́ла стрэ́лба, дак зраби́, што я табе́ скажу́“. Клине́тца малады́ страле́ц, што ўсе́ зро́биць.—Ну дак слу́хай,—ка́жэ стары́ страле́ц —И пача́ў ему штось шапта́ць на́ўхо. Спужа́ўса малады́ страле́ц, пабелѣ́ў як палатно́ й дрыжы́ць, бы аси́на, але́ слу́хае, бо ве́льми хо́четца, каб стрэ́лба шанцава́ла. Не пье́, не е́сь малады́ страле́ц, вы́сах, то́льки его́ цѣнь аста́ўса. Было́ ґэ́то пе́рад Благавѣ́щанем.—Схадзи́ ты, Се́мко, да спо́ведзи,—ка́жэ жо́нка. Пашо́ў малады́ стра́лец у спо́ведзь, а на за́ўтрэ збира́етца к прыча́сцю. Гледзи́ць жо́нка и дзи́витца, чаґо́ ґэ́то е́н хо́дзиць, як непрыто́мны. Пашо́ў Се́мко ў це́ркаў, узя́ў прыча́сця, але́ не пракаўтну́ў его́, да затрыма́ў за ґубо́ю. Вы́шаў ґэ́то е́н хуче́й з це́ркви, забе́ґ да ґаспо́ды, ўхваци́ў сваю́ стрэ́лбу да й сунў́ў у ле́с. Гудзе́, сто́ґне ле́с И здае́тца Се́мку, што ўве́сь све́т пла́чэ. Мо-

ташно Се́мку на се́рцу, мо́ташно й стра́шно. Вы́браў е́н скаре́й, як учы́ў стары́ страле́ц, крывую аси́ну, ўщами́ў у сук прыча́сце, атышо́ўса, злажыўса да й дава́й це́литца. Злажы́ўса, хацьў вы́стралиць у прыча́сце, але́ ба́чыць, што там хре́ст, а на е́м Хрысто́с, да так жа́ласливо ґледзи́ць на еґо́, жто ў Се́мки й ру́ки апусці́лиса. Не мажэ́ страля́ць у Хрыста́. Ки́нуў е́н стре́лбу, перахрысці́ўса да дава́й Бо́ґ но́ґи. Ве́село шуми́ць ле́с, от як пе́сни спева́е. Зака́яўса з таѣ́ пары́ Се́мко й у ру́ки браць стре́лбу.

Дак от як стралцы́ замаўля́юць сваѣ́ стре́лбы, каб ены́ шанцава́ли.

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы.

---

13. Маскаль и смерць.

Бы́ў вели́ки памо́рак на людзе́й и на ґаўя́до. Лю́дзи ме́рли, як му́хи. Прапа́ў уве́сь ста́так. Прышли́ на пасто́й маскали́—нема́ каму́ даць им е́сци. Сланя́ютца маскали́, як тру́тни, е́сци хо́чэтца, а нема́ чаґо́. Зневажа́юць людзе́й, а лю́дзи, хто аста́ўса жыў, нарака́юць на Бо́ґа да праклина́юць смерць. А ена́ сабѣ́ хо́дзиць ат села́ да села́ да ко́сиць людзе́й. От пашо́ў адзи́н маска́ль у ле́с па ґрыбы́ й сустрака́е смерць. Спужа́ўса маска́ль и ў вачу́ пацемне́ло. Доста́ў е́н з кишэ́ни ражо́к з таба́каю, хацѣ́ў панюхаць таба́ки, каб тро́хи ў вачу́ пасветле́ло, а смерць про́сиць у еґо́ таба́ки.—Нюхай—ка́жэ маска́ль,—и су́нуў е́й ражо́к пад са́мы но́с. Панюхала смерць—ничо́ґо ў но́с не папа́ло.—Ничо́ґо—ка́жэ—мне́ ў но́с не папа́ло, дай мне́ до́брэ зажы́ць таба́ки.—Ле́зь—ка́жэ маска́ль—у ражо́к, там до́брэ нанюхаешса.—Уле́зла смерць у ражо́к, а маска́ль мо́цно-мо́цно зачыни́ў ражо́к и схава́ў еґо́ ў кишэ́ню. Назбира́ў маска́ль ґрыбо́ў да й пашо́ў у село́. Седзи́ць смерць у ражку́, не мажэ́ аттуль вылезци. Дзиву́ютца лю́дзи, што ни́хто не у́мира́е. Уперо́д ду́мали, што ґэто смерць здаво́лиласа, атдыха́е, але́ по́тым ба́чаць, што прайшо́ў ґо́д и нихто́ не памёр. Нараджа́ласо дзеце́й и у́сѣ

ґадýютца Зноў развелóсо ґаўя́до. Пашлí ўраджа́йные ґады́. Жывýць лю́дзи да Бóґа хва́ляць. Так мóо прайшлó ґадóў з петдзеся́т. Тóлько пачалí лю́дзи старе́ць, да ўсé жывýць, а малады́х тóлько напладзи́ласо, што як земля́ их паднима́е. Састаре́ўса той маска́ль. Ужэ́ й у Петрóўку апране́тца ў кажýшак, седзи́ць на прызбе ца на со́нейку ґре́етца. Даўно́ пара́-б памира́ць, да байтца смерць з ражка́ вы́пусциць, каб ена́ на ґало́дные зýбы не наки́нуласа на стары́х и малы́х. Пражылí лю́дзи без сме́рци мóо ґадóў сто. Ця́жко ста́ло на све́це жыць, бо ве́льмо наро́ду размнóжыласо, так размнóжыласо, што й земля́ не паднима́е. И пачалí лю́дзи на Бóґа нарака́ць, што не даé сме́рци —От калí-б вайна́, памóрак, альбó яка́я по́шасць,— ка́жуць лю́дзи, — хаця́-б прастарнéй было́-б на све́це жыць.—И дава́й лю́дзи наседа́ць на старóґо маскаля́. — Гэ́то е́н—ка́жуць— смерць у ражкý трыма́е,— сам не ўмира́е и другі́м не даé.—Гóрко зраби́ласо маскалю́, што так лю́дзи кажуць за еґó добро́, не́ма чаґо рабиць, вы́пусциў смерць. И пашла́-ж ена́ з таé пары́ на ґало́дные зýбы касиць и стары́х и малы́х.

Пересказалъ И. Аземша.

С Лучицы.

14. Круци не круци, а трээ умерци.

Ка́жуць—даўнéй быў ве́льми вели́ки памóрак на людзéй. Такóґо памóрку нихто́ й не памета́е. Не было́ такóе ха́ты, каб дво́е-тро́е не памéрло, а ў нéкатарых усé паўмира́ли, так што й ґаспада́рки запуставáли. Быў адзи́н чалавéк; у еґó было́ дванáнцацеро дзецéй: сéм сынóў и пяць дачóк. Усé ены́ былí ґóжые да ўда́лые. Працава́ў ён сам, працава́ли й дзéци, й да́ў Бóґ им баґа́тство й ваўсем даста́так. А вéдамо, калí дасць Бóґ здарóве, ў семéйцэ лад да худóбку, та не трэ́э бóльшаґо ща́сця. И ґэ́то была́ щасли́вая ха́та. Але́-ж ка́жуць, што ща́сце не вéчнае. Так и на ґэ́тую ха́ту пасы́паласо нещáсце адно́ па другóм: по́шасць за вéсну скаси́ла ўси́х

дзецéй. Астáўса той чалавéк адзúн з бáбаю: да й бáбу саґнýло ў сук. У лéтку змóкло ўсé село, и ў таґó чалавéка зґарéла ўся седзúба. Град збúў збóжэ, а пакóсы паплылú. Прышлá óсень, и ат памóрку прапáло ўсé ґаўядо. Астáўса той чалавéк адзúн, як кóл и ґóл, як мáци радзúла. Цáжко йцú жабравáць. И пашóў éн к рацé тапúтца. Стáў на бéразе й давáй нараκáць на Бóґа й звáць к сабé смéрць. Усхадзúласа бýра; заґýў лéс; затращáли вéтки. Ось и выхóдзиць смерць да такáя страшная, што не мóжна й сказáць.—Ты звáў менé?—Пытáе смерць.—От я прышлá, алé ты не памрэш.—Чаґó-ж ты хóчэш? Наштó ты менé мýчыш?—кáжэ чалавéк; и давáй еé зневажáць. Слýхае смéрць да тóльки смеётца так, што аж рэбра ляскаюць.—Ты, —кáа смерць,—не тóлько скóро сам не памрэш, алé й друґúх вылечыш; тóльки не лечы тых, у каґó менé ўбáчыш у ґалавáх.—И зникла. Пастаяў чалавéк, падýмаў и ещэ ґарéй егó апанавáў жаль. Узышóў ґэто éн па высóки бéраґ и кúнуўса аттýль у рэку. Упáў у вóду, бáчыць, ажнó смерць стайць у наґáх да пад азáдак падтрымóўвае. Як éн ни круцúўса, немажэ патанýць. Плюнуў ґэто ен смéрци ў зýбы й пашóў у свéт. Хвóрых людзéй усюды мнóґо: куды ни прыдзе, е каґó лечыць. От хóдзиць той чалавéк па свéту й лéчыць уселяких хвóрых Паглядзúць, ґдзé ў хвóраґо стайць смерць, калú ў наґáх, дасць ему вышиць вады, той и выздаравее, а калú ў ґалавáх, та скáжэ, што ґэтаґо хвóраґо берэ к сабé Бóґ. Пашлá слáва аб тóм чалавéку па ўсём свéце. От захварэў адзúн цар. Не хóчетца ему памираць. Прызвáў éн дахтарóў су сеґó цáрства: алé чаґó еныы ни рабúли, ничóґоо не зробяць. И абецáў цар даць таму паўцáрства, хто еґó вылечыць. Алé не нашлóсо такóґо дóхтура, каб вылечыў царá. Прачýў цар, што е такú чалавéк, што ўсúх, вылéчвае й паслáў еґó шукáць. Ци дóўґо шукáли, ци скóро, тóлько знайшлú таґó чалавéка й прывезлú к царý. А тут цар ужэ чуць дышэ. Паглядзéў той, чалавéк, ажнó смерць стайць у наґáх, и велéў éн дастáць вады з дванáнцаци крыніць. Дастáли вады. Узяў éн карэц таé вады, насыпаў туды трóшки ґлúны й даў царý

вы́пиць. Наси́лу цар палыкну́ў ка́плю вады́, як ему́ леґчэ́й зраби́ласо, а це́раз тры дни саўси́м папра́виўса. Вы́здаравёў цар и обдарыў таґо́ чалавёка, чым ён захацёў. Зажы́ў з тых ча́саў той чалавёк, як у Бо́ґа за па́зухаю: усеґо́ ему́ дава́ли, ўсё еґо́ шану́юць. Жывё саб'ё ў пала́цах и ничо́ґо не дба́е. Але́ то́лько адно́ еґо́ ґрызе́—ґэ́то, што прыдзе́тца кали́ нибу́ць памира́ць. А ему́ цепе́рь ой як не хо́чэтца памира́ць. Вёдамо, чалавёк здаро́вы, баґа́ты. От и прыду́маў ён, як абшука́ць смерць и велёў зраби́ць саб'ё таку́ю карава́ць, каб ена́ круци́ласа. Ось па нема́лым ча́се й захварэ́ў той чалавёк. Ба́чыць, аж смерць стаи́ць у ґалава́х, от ён и пакруци́ў карава́ць так, каб смерць была́ ў наґа́х. Паґлядзёла смерць, што ена́ стаи́ць у наґах и пашла́ да́лей.

Пажы́ў тро́хи чалаке́к, але́ зно́ў прышла к ему смерць и ста́ла ў ґалава́х. Пакруци́ў челавёк карава́ць, и зно́ў пашла́ смерць шука́ць друґо́ґо чалавёка. Пажы́ў так то́й чалавёк ещэ́ ґадо́ў з два; але зно́ў захвары́ў, и захвары́ў ве́льми мо́цно. От ле́ґ ён на карава́ць и чака́е, паку́ль пры́дзе, смерць. То́льки зирне́, аш ена́ стаи́ць у ґалава́х да смеётца. Пакруци́ў ґэ́то чалавёк карава́ць, а смерць зноў ста́ла ў ґалава́х. Чалавёк зноў пакруци́ў карава́ць, а смерць зно́ў перебёґла на друґи́ бо́к. Доўґо ён так круци́ў карава́ць, а смерць усе́ бёґала, як не прыто́мная, але́ по́тым и ка́жэ: „круци́, не круци́, а трэ́э умерци́“, и ўзсёла ему на ґо́лаў. Як ён ни круци́ў карава́ць, дак пазира́е, а смерць усе́ ў ґалава́х. Нё — ду́мае,—пра́ўду кажэ смерць: круци́, не круци́, а прыдзе́тца ўмерци́. Ма́быць смерци не абмануць. И памёр той чалавёк таґды, як не хацёў, бо ўся́ки чалавёк таґды не ўмрэ, як хочэ, а таґды, як Боґ дасць.

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б. Рожинъ.

15. Неха́й.

Але́кса быў вельми́ недба́лы, ґультаева́ты мужы́к. Сусѣ́дзи ка́жуць ему́: „Але́кса, што ты не залапи́ш дзи́рки ў страсѣ́? Ба́чыш—ха́та цечэ́!“ А Але́кса смокчэ сабѣ́ лю́льку да й ка́жэ: „неха́й цечэ́“. Ци ка́жуць: „Але́кса, ба́чыш,—сви́не ла́зяць у ваґарŏд.—Неха́й ла́зяць,—ка́жэ Але́кса. Пашо́ў раз Але́кса ў лѣс драць лу́цье. забра́ўса ў ґущэ́чу, дзерэ́ й не ба́чыць, што стра́жник кра́дзетца. А стра́жник ци́хенько подкра́ўса зза́ду да й хап Алексу за ру́ки. Круци́ўса, круци́ўса Але́кса—ничо́ґо нейме́: трыма́е стра́жник, як кле́щами. Дава́й Але́кса зневажа́ць стра́жника на чŏм свѣт стаи́ць Слу́хаў, слу́хаў стра́жник, перш маўча́ў, але́ як ста́ў Але́кса праклина́ць еґо ма́тку, невы́трымаў, прывеза́ў ґа́да к дзе́раву й ну еґо дуба́сиць лу́цьями. Пало́саваў, пало́саваў да й ка́жэ: „ну, ґад, сдыха́й тут у лѣ́се, а кали́ хто тра́пиць, дак скажы́, што цебе́ прывеза́ў Нехай“. Пашо́ў стра́жник, а Але́кса папро́буваў атвеза́тца, але́ ничо́ґо не зро́биць: ве́льми мŏцно еґо ўкрампава́ў стра́жник. Пача́ў ґэ́то Але́кса крыча́ць на прами́лы Бŏґ. Ишли́ тут дзецюки́, пачу́ли, што хтось крычы́ць и пашли́ па ґо́ласу це́раз ґущэ́чу. Падхо́дзяць к Але́ксе, пыта́юць, хто еґо́ прывеза́ў, а е́н ка́а: „Неха́й прывезаў“. Плю́нули дзецюки́ й пашли́ да́лей. Стаи́ць Але́кса, пла́чэ. а тут камарэ́ча апанава́ла—о́чы выеда́е. Дава́й Але́кса зно́ў крыча́ць, зва́ць людзе́й на по́мач. Учу́ли пастухи́, ду́маюць, што мо́о каґо́ медзьвѣ́дзь дзерэ́: беґу́ць туды́; ба́чаць—стаи́ць Але́кса пад дзе́равам да тŏльки галаво́ю мата́е. Зирну́ли ены́ ближе́й, ажно́ Але́кса прывя́заны к дзе́раву.—Хто цебе́, дзяцько́, привеза́ў? — пыта́юць пастухи́. — Неха́й привеза́ў,—ка́жэ Але́кса.—Хацѣ́ли ўжэ́ й пастухи́ паки́нуць Але́ксу, але́ е́н зно́ў пача́ў крыча́ць: „Ратўи́це, хто ў Бо́ґа вѣ́рыць, атвеже́це ру́ки!“—Хваре́ць-жэ тваеи́ ма́церы,—ка́жуць пастухи́—чаму́ж ты не хо́чэш, каб цебе́ развеза́ли, да ўсе́ ка́жэш, што нехай прывеза́ў.—Азвеза́ли ґэ́то пастухи́ Але́ксу: ухваци́ў е́н сваю́ сакѣ́рку да й

сунўў да ґаспо́ды, як воўк. С таѣ пары ґо́дзи Але́кса каза́ць за́ ка́ждым сло́вам „неха́й“.

Пересказалъ Грышко Бохматъ.

Дер. Чудинъ.

---

16. Зави́сны багаты́р.

Было́ два браты́: адзи́н баґа́ты, а друґи́ бѣ́дны. Абу́два ены́ ґаспадарава́ли. Што ни зро́биць баґа́ты—ўсе́ до́брэ, ўсе́ ў ру́ку, бо ему́ шанцава́ло. А бѣ́дны бо́льш ево́ ґарава́ў, але́ штоб ни зраби́ў—усе́ з рук плыве; так ему́ не шанцава́ло. Ма́быць ужэ́ ево́ была́ така́я до́ля. Вѣ́дамо, даўнѣ́й, ещэ́ светы́е хадзи́ли па земи́. От раз зсыпа́е бѣ́дны ў каду́шку жы́то, яко́е слемаза́рнае Бо́ґ даў. То́льки ось падхо́дзиць к ему́ яки́сь дзедо́к.—Памаґа́й Бо́ґ!—ка́жэ дзедо́к.—Дзя́куй, стара́ньки,—ка́жэ бѣ́дны. От як уба́чыў бѣ́дны стара́нькаґо дзедка́, шко́да ему́ ста́ло старо́ґо й пасыла́е ён ево́ ў ха́ту к ба́бе, каб тро́хи пасилкава́ўса да отды́хаў. Падзя́куваў стары́ да й пашо́ў у хату. Пашо́ў дзедо́к, а бѣ́дны ўсе зсыпа́е жы́то ў каду́шки; насы́паў ён ужэ́ ўсѣ́ каду́шки, а ку́ча ўсе як была́, не ме́ньшытца. Насы́паў ен усѣ́ засѣ́ки—ку́ча на таку́ як и была́ ўпе́рад. Кли́кнуў бѣ́дны бра́та, папраси́ў у ево́ каду́шак, але́ й ты́е ўсѣ́ насы́паў жы́там. Даґада́ўса таґды́ бѣ́дны, што ґэ́то быў не про́сты дзедо́к, а яки́сь светы́. Здаво́лиўса бѣ́дны зсыпа́ць жы́то, бо ўжэ́-ж то́лько назсыпа́ў, што бу́дзе хаць на дзе́сець ґадо́ў, и пабѣ́ґ у ха́ту, каб падзя́куваць свето́му. Прыхо́дзиць ён у ха́ту, ба́чыць, аж жо́нка́ заки́дала палатно́м усю́ ха́ту.—Што ты ро́биш—пыта́е; а ба́ба й ка́жэ, што прышо́ў яки́сь дзедо́к, назва́ўса Петро́м. Паґлядзѣ́ла я, што ў ево́ нема́ саро́чки, от я ўзела́ сво́й палатна́, каб атре́заць дзедку́ на саро́чку, а ен и зни́к; я-ж з таѣ пары́ ўсе́ раскру́чваю сво́й,—от ба́чыш,—ка́жэ,—ко́лько ўжэ́ палатна́ наки́дала; на два́дцаць ґадо́ў ста́не, бу́дзе на́шым дзѣ́цям и ўну́кам, а сво́й усе́ таки́, як быў.—Давѣ́даўса баґа́ты брат, яки цуд зраби́ў светы́ Петро́, й ста́ло баґа́таму зави́сно. Рас-

пыта́ўса е́н, як было́ й чака́е, ци не пры́дзе светы́ Петро́. На друґі́ дзень ба́чыць баґа́ты, што бежы́ць чужы́ саба́ка; ухапі́ў е́н ка́мень и папусці́ў у саба́ку. Тым ча́сам идзе́ светы́ Петро́. Про́сиць еґо́ баґа́ты, каб зайшо́ў у ха́ту. Петро́ зайшо́ў. От жо́нка баґа́таґо па-бе́ґла скарэ́й па во́ду, а Петро́ й зник. Гледзя́ць лю́дзи да й дзи́вятца, што баґа́ты ўсе́ збира́е каме́не да но́сиць на сво́й дво́р, а еґо́ жо́нка ўсе́ но́сиць у ха́ту во́ду. От ена́ нанаси́ла вады́ ўжэ́ по́ўную ха́ту да й ещэ́ прэ. Уба́чыў то́е бе́дны брат и даґада́ўса, што ґэ́то так зраби́ў светы́ Петро́, каб не быў таки́ зави́сны баґа́ты брат.

Пересказалъ И. Аземша.

С Лучицы.

---

17. По́шасць и памо́рак.

Даўне́й быў ве́льми до́бры адзи́н ґод: харо́шая о́сень, ро́ўная зима́, а весна́ це́плая, паґо́дная. Ў но́чы йдзе ци́хеньки, це́плы до́жджык, а ў дзень я́сно све́ціць со́нейко да так ґре́е, што, здае́тца, пасадзи́ на по́ли дзиця́, та й то́е вы́расце. Усе́ расце́ на по́ли, бы на дро́жджах. Ра́ды лю́дзи, што даў Бо́ґ ураджа́й. Прышло́ ле́то. Нихто́ й не памета́е тако́ґо до́браґо, паґо́днаґо ле́та! Усе́ зрадзи́ло. Яґады хаць шуплю́й, а ґрыбо́ў у ле́се да ўселя́каѣ ґу́бы — хаць каси́. От идзе́ адзи́н чалаве́к па ле́се, ба́чыць, аж седзи́ц на пни яка́ясь ве́льми го́жая маладзица й трыма́е ў прыпо́ле сно́п жыта да тако́ґо бу́йнаґо, яко́ґо той чалаве́к ещэ́ нико́ли не ба́чыў. Падышо́ў е́н бли́жэ й ба́чыць, аж маладзи́ца пла́чэ да сваи́ми до́ўґими валаса́ми я́сные во́чки ўцира́е. Адґарну́ла маладзи́ца валасы́ й аткры́ла ґру́дзи. Ба́чыць чалаве́к, аж ву́ж упи́ўса ў са́мую цы́цку й ссе маладзи́цу. Хаце́ў ґэ́то чалаве́к заби́ць таґо́ ву́жа, але́ маладзи́ца то́лько прамо́вила: „велики ураджа́й, да не бу́дзе каму́ спажыва́ць“ И зни́кла. Пришо́ў чалаве́к у село́ й раска́звае, яки́ ба́чыў цуд. Спужа́лиса лю́дзи. Чака́юць велика́ѣ по́шасци, ци памо́рку. То́лько

ось по́зно лави́ли дзецюки́ ры́бу да й заначава́ли каля́ раки́ на ґрудку́. От седзя́ць ены́ каля́ аґно́ да апе́кающь ры́бу. Но́ч ци́хая, як у ву́се. то́лько ры́ба пля́скае ў раце́. Але́ ось узыша́ў ме́сяц. Ста́ло видно́, хаць иґо́лки збира́й. Ба́чаць ены́, аж за рако́ю падышли к бе́раґу яки́ясь дзве́ ве́льми стра́шные ба́бы. Ко́сы ў их распле́цены, твар це́мны, бы земля́, то́лько во́чы блища́ць. Падышли́ ены́ к раце́ й про́сяць дзецюко́ў каб перавезли́ их на други́ бе́раґ. Даґада́лиса дзецюки́, што ґэ́то не ба́бы, а по́шасць на людзе́й и памо́рак на ґаўя́до. Спало́халиса дзецюки́ й дава́й у их ки́даць ґалаве́шками да маха́ць зу́бленками. Хаце́ли ты́е ба́бы перш па клатцэ́ перайці́ це́раз ре́ку, але́ як уба́чыли аґо́нь, спало́халиса й пашли́ наза́д. Ось и чу́юць лю́дзи, што за рако́ю пашла́ по́шасць лама́ць людзе́й, а памо́рак каси́ць ґаўя́до, й дава́й ены дзень и но́ч кла́сци су сих канцо́ў села́ аґо́нь, каб не-падпусци́ць по́ґани бли́зко. От то́лько так ураґава́ли сваё село́. Мно́ґо памёрло людзе́й, мно́ґо прапа́ло ґаўя́дка. То́лько к зиме́ тро́хи хваро́бы атаймава́лиса. От з таё пары́ и дава́й лю́дзи кла́сци аґо́нь да рабі́ць куро́дым, як пачу́юць, што хваро́ба ци яка́я по́шасць падхо́дзиць.

Пересказалъ И. Аземша.

С Лучицы

18. Завидны по́п.

У аднаґо́ ве́льми бе́днаґо чалаве́ка памёрло дзиця́. Про́сиць бе́дны чалаве́к сусе́дзей зраби́ць дамави́ну й вы́капаць маґи́лу для дзиця́ци. Але́, ве́дамо, кали́ чалаве́к баґа́ты, та ўсе́ ему́ памаґа́юць, а бе́днаму—нихто́. Прасі́ў, прасі́ў бе́дны чалаве́к, але нихто́ не пашо́ў капа́ць яму. Го́рно ему́, сле́зы так и цеку́ць, бы з бере́зины со́к. Нема́ чаґо́ рабі́ць, тре́э йци само́му капа́ць яму для сваґо́ дзиця́ци. Ка́жуць ґэ́то ве́льми вели́ки ґре́х, але́ што зро́биш, кали́ ат бе́днаґо й лю́дзи атступи́лиса. Узяў бе́дны чалаве́к за́ступ и пашо́ў, але́ перш зайшо́ў къ папу́ й про́сиць, каб пахава́ў дзиця́.—

Дóбрэ,—кáжэ пŏп,—тŏльки ты мнѣ перш прынесí дзéсяць злóтых и павасьмíнку аўсá.—Немá,—кáа,—бáцюшко, ў менé ни аўсá, ни ґрóшэй.—И давáй прасíць, каб пŏп пахавáў дзиця́ так, а што ен ужэ́ пóтым атрóбиць. Куды́ там! Пŏп нехóчэ й слýхаць. Як ни прасíў бѣдны, пŏп стаíць на сваем да й тŏлько. Заплáкаў бѣдны з жáлю й пашóў капáць маґíлу. Ось капáе ен да капáе й вы́капаў ґарщóк з ґрашы́ма: чырвŏнцы аж зъя́юць.. Панéс ґэ́то бѣдны чалавѣ́к ґарщóк з ґрашы́ма да ґаспóды й схавáў еґó пад пѣч, а адзíн чырвŏнец прынóсиць папу́. Здзивíўся пŏп, аткýль ґэ́то ў бѣднаґо зóлато й давáй вышы́таць. Бѣдны ўсе й расказáў, як было́. От пахавáли ў бѣднаґо чалавѣ́ка дзиця́. Самá пападзя́ з папóм пóтым зайшлí ў хáту к бѣднаму на памíнки. Тŏлько пŏзно разышлíся ўсѣ. Астáўся бѣдны чалавѣ́к адзíн з жŏнкаю. Прышóў ґэ́то пŏп дамŏў и хóчэтца ему́ атабráць ат бѣднаґо ґрóшы. Зарѣзаў ґэ́то ен казлá, абвернýўся ў казлíную шкýру, прылáдзиў и рóґи да й пашóў у сáмую ґлýпась к бѣднаму пад вакнó. Прышóў, высунýў у вакнó ґалавíщу з раґáми й кáжэ нѣмым ґóласам: „атдáй маѣ́ грóшы“. Спалóхаўся бѣдны чалавѣ́к и атдáў ґарщóк з ґрашы́ма. Ухапíў пŏп абѣ́ручки ґарщóк и пабѣ́ґ дамŏў. Прыбѣ́ґ, хóчэ пастáвиць ґарщóк на стŏл, да нѣ́льґа,—рýки прырослí. Папрóбувала пападзя́ садráць з папá казлíную шкýру. Куды́ там! И шкýра, й рóґи прырослí. Што ни рабíў завíдны пŏп, ничóґо не ўрáдзиць. Прышлóсо прасíць бѣднаґо чалавѣ́ка, каб ен забráў сваѣ́ грóши. Сабрáлиса лю́дзи, дзívятца на папá, а ен тŏлько казлíнаю барадóю трасé. Ось прышóў бѣдны чалавѣ́к и як узя́ў сваѣ́ грóшы, дак и шкýра з папá звалíласа, да не тŏлько казлíная, алé й свая́. От якí быў завíдны пŏп.

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы.

19. За добрае злым заплата.

Ішо́ў мужы́к у во́сень пе́рад све́там з ґумна́ ў ха́ту. Гумно́ было́ дале́ко ат села́, но́ч це́мная, хаць во́ка вы́калі. Уски́нуў мужы́к на пле́чы пусты́ мешо́к и це́п, закуры́ў лю́льку да й памале́ньку су́нетца, каб у пацемку на што не наткну́тца. Заблудзи́ў мужы́к и пашо́ў у друґі́ бо́к. Насу́нуўса мужы́к на во́ўка й хаце́ў его́ мала́ці́ць це́пам. А во́ўк ка́жэ. „лежа́чаґо не бъю́ць Ба́чыш, мене́ ўха́пи́ла па́стка. Аслабани́ мене́, мужычо́к“. Мужы́к аслабани́ў во́ўка, бо й во́раґа ў бедзе́ шко́да. А во́ўк и ка́жэ· „цепе́р я цебе́ зае́м“.— За што́-ж ты мене́ зъеси́?—пыта́е мужы́к,—я-ж цебе́ з беды́ вы́звалиў?!—За до́брае злым запла́та,—ка́жэ во́ўк —Ну, кали́ так,— ка́жэ мужы́к,—хадзе́м и каґо́ суустре́нем, папыта́емса й кали́ ен ска́жэ, што за до́брае злым запла́та, та таґды́ ты мене́ зъеси́.— До́брэ,—ка́жэ во́ўк И пашли́ ены́ да́лей. Иду́ць ены́ да йду́ць. От пачало́ свита́ць. Ба́чаць, аж сланя́етца ў хмы́знику ґало́дная, слепа́я кабы́ла. От мужы́к и пыта́е е́ё, ци пра́ўда, што за до́брае злым запла́та.—Пра́ўда,—ка́жэ стара́я кабы́ла —От, як я была́ мала́да́я, здоро́вая да до́брэ служы́ла свайму́ хаджа́іну, та таґды́ ен мене́ карми́ў, даґляда́ў, а як саста́раласа, упа́ла на но́ґи, дак от як е́н мене́ даґляда́е, што я падыха́ю з ґо́ладу. Заўсю́ды за до́брае злым запла́та — Хаце́ў во́ўк зъе́сци, чалаве́ка, але́ той атпраси́ўса ещэ́ пачака́ць да другі́ґо ра́зу. Иду́ць ены́ да́лей: ось валача́тца стары́ саба́ка. Зноў пыта́е мужы́к и саба́ку, ци пра́ўда, што за до́брае злым запла́та.—Пра́ўда,—ка́жэ саба́ка.- бо паку́ль я бы́ў малады́ й до́брэ служы́ў сваму́ хаджа́іну, дату́ль е́н сяк-так ещэ́ мене́ карми́ў и трыма́ў у дамо́ўцэ, а от, як я сапсе́ў да занеґо́ж, дак е́н и праґна́ў мене́ з ачо́ў, и я здыха́ю з ґо́ладу. Эгэ-ж, за до́брае злым запла́та.—Атпраси́ўса мужы́к у во́ўка ещэ́ трэ́йци раз папыта́ць, каґо́ суустре́нуць. Иду́ць ены́. аж и бежы́ць лис. Мужы́к и пыта́е его́, ци пра́ўда, што за до́брае злым запла́та.—А на што

табѣ́ ґэ́то знаць?—пыта́е лис. И расказа́ў мужы́к ли́су, як е́н во́ўка з беды́ вы́бавиў и што е́н за то́е хо́чэ еґо́ зъѣ́сци.—Брэ́шэш,—ка́жэ лис,—як ты, таки́ недо̆шлы мужы́к, да мо̆ґ во́ўка вы́бавиць, хадзѣ́м, цакажы́.—Пашли́ ены́ на то́е мѣ́йсцэ, залѣ́з во́ўк у па́стку, а лис и ка́жэ: „а ну, мужы́к, пакажы́, як ты мало́циш“. Даґада́ўса мужы́к, замахну́ў цє́пам да па во́ўку, да па во́ўку. Заби́ў мужы́к во́ўка да й захацѣ́ласо ему прынесци́ ба́бе ли́саву шку́ру, от е́н як махне́ цє́пам да ли́су па ґалавѣ́. Лис и зви́ўса, то̆льки ўспѣ́ў прашапта́ць: „за до́брае злым запла́та“, а мужы́к палажы́ў ли́са ў мѣх и папе́р да ґаспо́ды.

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б Рожинъ.

---

20. Брахня.

Быў адзи́н таки́ пан, што штоб ему́ хто ни сказа́ў, та е́н усе́ ка́жэ, што пра́ўда, так. Хто ему́ ни хлуси́ў, нихто́ не мо́жэ так схлуси́ць, каб е́н сказа́ў, што ґэ́то непра́ўда. Ве́льми люби́ў той пан слу́хаць ка́ски. Хлу́сиць ему́ хто яку́ю ба́йку, а ен усе́ за ка́ждым сло́вам ка́жэ: „пра́ўда, так“. От захацѣ́ласо таму́ па́ну пачу́ць таку́ю ка́ску, каб сказа́ць, што ґэ́то непра́ўда; але́ нихто́ не мо́жэ прыду́маць тако́е ка́ски. Абеца́ў той пан даць жме́ню зо́лата таму́, хто ска́жэ таку́ю ка́ску, каб пан не павѣ́рыў. Нашо́ўса адзи́н пъянчу́жка. Зва́ли еґо Ахре́мам. Ен свайґо́ хаджа́йства не маў, бо быў ве́льми вели́ки ґульта́й и пъя́ница. Пашо́ў Ахре́м к па́ну каза́ць ка́ски. До́ўґо каза́ў Ахре́м па́ну ўселя́кие ба́йки, а пан усе ка́жэ: „пра́ўда, так“. Кажэ Ахре́м,—от иду́ я да йду́ па вадзѣ́, а рака́ шыро́кая, што й бераґо̆ў не бачно́, але́ ось вы́скачыў з вады́ медзьвѣ́дзь, задра́ў к ве́рху хво̆ст да ка мнѣ. Што тут раби́ць! Перш я схава́ўса ў бабрави́ну, але́ не мо̆ґ там уседзѣ́ць, бо хто́сь накла́ў на днѣ раки́ аґню́ й нараби́ў токо́ґо куро́дыму, што дым во́чы выеда́е, на́вед ры́ба пачала́ пы́рхаць да чмы́хаць но́сам. Вы́лез ґэ́то

я з бабравíны, а медзьвéдзь ка мнѣ... От я сýнуў емý рýку ў гóрло. Ен туды́-сюды́—тóлько хвастóм крýціць. Засýнуў ґэ́то я рýку дáлей и ўхапíўся за хвóст. От як убráў я за хвóст, закруцíў егó на рýку да як упéрса, дак и вы́вернуў медзьвéдзя трыбухáми навéрх. Тóлькі равé медзьвéдзь. а кусáтца не мóжэ, бо зýбы тырчáць ва ўсѣ́ стóраны. — Прáўда, так, — кáжэ пан. — Пашóў я дáлей, аж бáчу узсѣ́ло на пчалý дванáнцать медзьвéдзей. Я бѣґци да бѣґци, ратавáць пчалý. Бѣґ ад рáнку да сáмаґо змрóку. Тым чáсам медзьвéдзи зъѣ́ли пчалý, тóльки кóстачки асталíса. Прыстáвіў ґэ́то я пчалíные кóсци к хмáрцэ да й палѣ́з на нéбо. Узлѣ́з на нéбо, пабáчыўся з бáцькам сваíм да з дзéдам. Падпайли ены́ мене́ трóхи, й немагý я найщí астрóґи, каб злѣ́зци з нéба. От убáчыў я кýчу мекíны Давáй ґэ́то я з мекíны вищь вербýку. Звиў вербýку, прывезáў еѣ́ за нéбо й спускáюся ўниз. Ось лецíць маты́ль. Як махнé éн крылóм, вербýка й парвáласа, а я палецéў у низ да й упаў у пéкло.— Прáўда, так,—кáжэ пан. Зирнýў я ў пéкле, аж чэ́рци на пáнськом бáцьку смалý вóзяць, да ґáдами падґаняюць — Хлýсиш, ґáлган!— крыкнуў пан —Не мóжэ таґó быць!—А калí пан не вéрыш, та паґлядзí сам,— кáжэ Ахрéм. Заплацíў ґэ́то пан Ахрéму жменю зóлата да й ґóдзи кáзки слýхаць.

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б. Рожинъ

21. Вада памагла.

Жáлитца адна́ маладзúца, што ёй ат ґаспадара́ жы́тки нема́: як тóлько сы́дýтца, та перш сва́ратца, клинýтца, зневажа́юць адно́ друґóґо, а пóтым ґаспадáр давáй еѣ́ биць. И так нéмаль кóжын дзень. Церпѣ́ла, церпѣ́ла маладзúца й давáй шука́ць людзéй, каб памаґлú. Яки́х тóлько забабóнаў и пры́мхаў ена не рабúла,—ничóґо не памаґáе, ещэ́ ґарéй бъе ґаспадáр; бо éн перш не пúў, а як пачáў з жóнкаю калацúтца, дак стáў пиць. Хадзúла маладзúца й

унро́щу, пасци́ла й се́м пя́шниц, дава́ла ґаспадару́ зельёў пиць— ещэ́ ґаре́й идзе́ ў их калатня́. От пара́дзили лю́дзи схадзи́ць ещэ́ к старэ́нькаму дзедку́, мо́о е́н што пара́дзиць. Недале́ко ат села́, кале́ перавоза жыў сабе́ той старэ́ньки дзедо́к. У ле́тку ен лави́ў ры́бу й перавозиў у чо́ўне, каму́ трэ́, це́раз ре́ку. За то́е ему́ дава́ли хлеб и стра́ву. Так и жыви́уса сабе́ дзедо́к. От прыхо́дзиць к ему́ маладзи́ца й жа́литца на сваю́ беду́. Паслу́хаў дзедо́к и да́е е́й пляшку вады́.—На,—кажэ,—ґэтае зе́лье. Як пры́дзе ґаспада́р у ха́ту, ты наберы́ еґо́ ў рот, не каўта́й (ґлыта́й), а так и дзержы́ ў ро́це, та ґаспада́р и не бу́дзе не то́лько биць, але́ й зневажа́ць.—Падзя́кувала маладзи́ца й пашла́ да ґаспо́ды. От як прышо́ў ґаспада́р у ха́ту, ена й набра́ла ў рот вады́, трыма́е й маўчы́ць. Так прайшо́ў адзи́н дзень, другі́, це́лая недзе́лька, а ґаспада́р и па́лцам не зачапи́ў е́е. Ра́да маладзи́ца. Хва́лиць зе́лье, што даў дзедо́к. То́льки ось вы́шла ўся вада́ з пляшки. Зноў дава́й ены́ сварытца да калаци́тца. Удру́ґае пашла́ маладзи́ца к старэ́нькаму дзедку́. про́сиць, каб даў ещэ́ зе́лья. Даў дзедо́к пляшку вады́. От и ўтре́йки прыхо́дзиць маладзи́ца к дзедку́ па во́ду. — Эй,— ка́жэ дзедок,— маладзи́ца, маладзи́ца, ци ты неба́чыш, што ґэ́то про́стая вада́! Вада́, ба́ч, табе́ памаґла́, бо як ты наберэ́ш у рот вады́, та й немажэ́ш аскирза́тца, а маўчы́ш, як-жэ кажуць, бы вады́ ў рот набра́ўшы. От ґаспада́р хаць абла́е цебе́, кали́ е за што, ты маўчы́ш и е́н замаучы́ць. Ве́даеш, што ба́бу бъю́ць за язы́к. Ка́жуць: за ґубу́ да ў ґубу́. От идзи́ш,—ка́жэ,—дзе́тки, з Бо́ґам да не напрыкра́йса сваму́ ґаспадару́, а ле́пш прамаўчы́, та ўсе́ бу́дзе до́брэ.—З тае́ пары жыву́ць маладзи́ца з ґасцадаро́м ладко́м и нико́ли не сва́ратца.

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы.

22. Нашоў грошы.

Кали Бог дась, та и в акно́ пада́сь.

Усе́ лю́дзи ка́жуць, што на Купа́ло ў но́чы цвице́ па́параць, и хто на́йдзе той цвет, той мо́жэ з им найци́ й узяць заклятые гро́шы. От на Купа́ло зґавары́лиса дзецюки йци ў ле́с, шука́ць цве́ту па́параци. А ў то́м селе́ жыў адзи́п чалаве́к ещэ́ малады́, але́ разу́мны. Ен и не баґа́ты быў, але́ не нарака́ў на Боґа: ґарава́ў, маў кусо́к хле́ба, нико́ґо не кры́ўдзиў, ниякаґо ли́ха ў еґо́ не было́ на се́рцы, от е́н и щасли́во жыў. Прихо́дзяць к ему́ дзецюки́ й кли́чуць ици́ шука́ць ґро́шэй. А е́н ка́а: „чаґо́ я пайду́ шука́ць ґро́шэй? Кали́ Бо́ґ дась, та й вакно́ пада́сь“.—Ну, чака́й, —ка́жуць дзецюки́,— пакуль Бо́ґ у вакно́ пада́сь!—А са́ми й пашли́ ў ле́с. Прахадзи́ли ены́ ўсю́ но́ч—ничо́ґо не нашли́, то́льки стра́ху нацерпе́лиса. Ве́дамо, но́чу на Купа́ло по́вен ле́с уселя́кае́ не́чысци. Перш их чорт вадзи́ў па ле́се, й ены́ не маґли тра́пиць наза́д к селу́: тре́йко падхо́дзили к сваи́м ґу́мнам, але́ не пазнава́ли свае́ будо́ўли и зно́ў варо́чалиса ў ле́с По́тым ста́ла падма́ньваць их яка́ясь не́чысь и чуць не завела́ ў бало́то й таку́ю не́тру, што наси́лу ены́ вы́бралиса. От чу́юць ены́, што за ку́стам пла́чэ дзиця́. Ены́ туды́, а ено́ ўжэ́ пла́чэ да́лей. Ены́ йду́ць да́лей, а ено́ зноў абзыва́етца да́лей, мо́о за кро́каў два́дцаць: ведзе́ их у ґущэ́чу да ў тхлань. Зале́зуць ены́ ў вы́жар па са́мае ґо́рло,—таґды́ ено́ засме́етца, зараґо́чэ, бы жарабе́ц и зни́кне. Му́чылиса ены́ ўсю́сеньку но́чку, то́лько ось ста́ло свита́ць. Ба́чаць ены́, што заби́лиса ў са́мую не́тру. Вы́бралиса ґэ́то ены́ аттуль, выхо́дзяць на шлях и ба́чаць, аж на даро́зе лежы́ць до́хлы саба́ка.—А што,—ка́жуць,— Паўлю́к каза́ў, што кали́ Бо́ґ дась, та й вакно́ пада́сь; занесе́м ткале́ ему́ ґэтаґо до́хлаґо саба́ку.—Узели́ ґэ́то ены́ таґо́ саба́ку й папе́рли ў село́. Паўлю́к жый у само́м канцы́ села́. Но́чка це́плая, аж па́рыць. Ба́чаць ены́, што

ў Паўлюка́ акно́ атчы́нено: от ены́ й упе́рли праз его́ до́хлаго сабаку Паўлюку́ ў ха́ту. Ки́нули ены́, але́ чу́юць, штось забраща́ло, бы гро́шы разсы́палиса. На за́ўтрэ пыта́юць ены́ Паўлюка́, што ему́ Бо́г пада́ў в акно.—Эге́-ж, дзя́куваць Бо́гу,—ка́жэ Паўлю́к.—пада́ў Бо́г це́лую то́рбу гро́шэй. — Даґада́лиса таґды́ дзецюки́, што ены́ ўки́нули Паўлюку́ ў ха́ту не саба́ку, а то́рбу, зро́бленую з саба́чэ шку́ры, по́ўную гро́шэй. Пабо́жкали ены́, да нема́ чаго́ рабі́ць. А Паўлю́к дава́й спажыва́ць гро́шы.

Пересказалъ И. Аземша.

С Лучицы.

---

23. Грошы цвитуць.

Пашла́ ґавбрка па селу́, што на бе́разе, кале́ раки́, ґдзе́ зда́ўна мно́го капцо́ў, гро́шы цвиту́ць. Ка́жуць—ужэ́ ко́лько раз ба́чыли здалёка, што на яко́мсь капцы́ ў но́чы ґары́ць аґо́нь: але́ то́лько хто зхо́чэ падыци́ ближе́й, як той аґо́нь и пату́хне. И пашла́ ґавбрка, што ў капцо́х зако́паны заклятые гро́шы; ены́ й цвиту́ць, хо́чуць, каб их хто вы́бавиў з земли́, бо мо́о й им ця́жко лежа́ць без дзе́ла. Дак от ґаво́раць, што той и той ба́чыў, як цвиту́ць гро́шы, але́ нихто́ не ве́дае, як их узя́ць. Ве́дамо, к заклятым ґрашо́м не́льґа падступи́тца. Ка́жуць, адзи́н чалаве́к ужэ́ про́буваў, але́ тако́го набра́ўса страху́, што чуць жыў прыбе́ґ да ґаспо́ды, да й пракача́ўса ў хо́ндзи недзе́ль з ше́сць. Але́ ось быў у нас лехча́й, зва́ли его́ Ничы́парам. Ма́быць ён тро́хи зна́ўса з уселя́каю пе́чысью, бо быва́ло падыдзе к жарабцу́, паґла́дзиць его́ па аза́дку,—той и стайць, як уко́паны. Вылехчае ґэто Ничы́пар жарабца́, а той и не чу́е, ба́тцэ ґэто му́ха ўкуси́ла. То́льки адзи́н раз ка́жуць Ничы́пар таки́ наско́чыў на тако́го жарабца́, што як трапну́ў, дак у Ничы́пара зу́бы й вы́сыпалиса. Дак от Ничы́пар и надумаўса узя́ць ты́е гро́шы, што цвиту́ць кале́ раки́. Узя́ў ґэто ён залезня́к и пашоў шука́ць гро́шэй. Ле́то. Но́чка хаць и це́мная, але́ це́плая, ци́хая. То́лько

Ничы́пар вы́шаў за село́, ба́чыць, аж кале́ раки́ штось свѣцитца от бы ґары́ць аґе́ньчык, то́льки си́ним по́ламьем. Су́нуўса Ничы́пар туды́, а тут пе́рад им што́сь коцитца чо́рнае, бы капа́; прыкаци́ласо пад са́мые, но́ґи да як разсы́плетца, дак то́лько и́скры ґара́ць на траве́. Пашо́ў Ничы́пар да́лей. Аткуль не возми́са це́лая чарада́ ваўко́ў, от так и са́дзяць на его́. Дава́й ґэ́то Ничы́пар маха́ць залязняко́м, наси́лу атби́ўса. От падхо́дзиць ен к капцу́ й то́лько чапну́ў залязняко́м земли́, аж як заґрымаци́ць штось, як разсту́питца земля́ да вы́скачыць аттуль яко́есь страшы́лищэ: ў Ничы́пара й дух заняло́. Ки́нуў ен залязня́к да як сунуў да ґасно́ды, дак и саба́кам не даґо́ниш. Прыбе́ґ, дрыжы́ць, бы аси́на. Таки́ хо́ндзю схапи́ў, а як вы́чухаўса, дак дзися́таму заказа́ў, як хадзи́ць шука́ць закля́тых ґро́шэй. Дак от и да ґэ́тае пары́ нихто́ не ве́дае, як падступи́тца к тым ґрашо́м.

Пересказалъ Рѣдкій.

С Б. Рожинъ.

24. Заламка.

У ко́ждум селе́ е сво́й ведзьма́р, але́ ў вадно́м до́брэ зна́етца, а ў другом—бо́льш чму́ціць. Ве́дамо, кали́ ба́цько быў ведзьма́р, та пе́рад сме́рцю ён и сы́на на́ўчыць таму́, што сам уме́ў. Пры жы́цю немо́жна друґо́ґо наўчы́ць, бо сам не бу́дзе маць мо́цы. Эґэ́ж. Дак я ку, што ведзьмары́ е ў ко́ждум селе́. Ены́ шэ́пчуць, ле́чаць, атрабля́юць уселя́кую хваро́бу, або́ нещасце. Лю́дзи бая́тца их, го́дзяць им. От быў таки́ ведзьма́р. Его́ зна́ли не то́лько ў суседних се́лах, але́ мо́о ў це́луй акру́зе. Гэ́то быў таки́ вели́ки ведзьма́р, што ён усе́ знаў. Нихто́ не сме́ў ему́ сказа́ць наперако́р, так его́ баялиса. То́лько быў там адзи́н чалаве́к; ен мно́ґо на све́ту хадзи́ў: ка́жуць—быў аж у кралеўцу. От ґэ́ты чалаве́к не баяўса ведзьмара́ й усе́ каза́ў, што ён то́лько чму́ціць. Але́ ему́ не ве́рыли. От той чалаве́к пашо́ў у свае́ жы́то й зраби́ў там за́ламку.

Цéраз недзéлю, а мóо й дзвé прыхóдзиць к тамý ведзьмарý й прóсиць, каб éн вы́рваў тую зáламку. Пашлú ены́ на пóле. Падышóў ведзьмáр к зáламцэ на шаґóў двáдцаць да й кáжэ, што не мóжэ йци дáлей, такáя мóцная зáламка Скúнуў ґэ́то éн наґавúцы й сарóчку да так, як мáци радзúла й папóўз к зáламцэ рáкам. Паўзé й усé стóґне, што вéльми мóцно ўдзéяно. Маўчáў ґэ́то, маўчáў той чалавéк, а як падышлú другúе лю́дзи, ўзсéў на ведзьмарá вéрхам, дастáў з пад палы́ ґарáпник да давáй палóсуваць ведзьмарá.—От-жэ я табé, хварéць,—кáа,—тваей мáтары, пáкажу́, як мóцно ўдзéяно, бо ґэ́стую зáламку я зрабúў сам.—Равé нéмым ґóласам вéдзьмáр, а той егó лу́пиць. Биў-биў, пóкуль здавóлиўса да й пытáе:—а што,—кáа,—не бу́дзеш бóльш дóбрых лю́дзей чму́ціць?—Не бу́ду,—прóситца ведзьмáр,—тóлько пусцú жывóґо.—Пусцúў той чалавéк ведзьмарá. Усхапúўса ґад, забы́ў и сарóчку й наґавúцы апрануўць да так и сунýў наўцекачá. Падзивúлиса лю́дзи, дýмали перш, што ведзьмáр таґó чалавéка з свéту зжывé, алé бáчаць, што той чалавéк жывé сабé й не лыс, пачалú ґаварыць, што мáбыць той чалавéк мацнéйшы áт ведзьмарá, калú так з егó накпúў. Гóдзи ведзьмáр з таé пары́ чму́ціць. Алé не дóўґо жыў, бо вéльми егó збиў той чалавéк. Дак от якúе е ведзьмары́.

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б. Рожинъ

---

25. Што майстар, та злодзей.

Жыў сабé адзúн пан. У егó было́ мнóґо маéнткаў, мнóґо падда́ных Баґáты быў пан. Мало éн жыў у маéнтках, а ўсé éздзиў за ґранúцу. Маéнткамі рóндзили камысáры да акамóны. Набráў пан з села́ хлопцаў и отдáў их у Аршáву, а мóо й за ґранúцу вучы́ць каґó на шаўцá, каґó на краўцá, альбó рымара, каґó на стальмахá, каґó на каваля́. Вернýлиса тые хлóпцы па наýцэ й рóбяць усé на пáна. От вернýўса раз пан, прызвáў тых майсцерóў и пы-

та́е, што ены́ наўчы́лиса й што маґу́ць рабі́ць. А ены́ ка́жуць, што ўсе́ маґу́ць. Рад пан, што ў еґо́ е сваѣ́ майстры́. Ён, ба́чыце, ду́маў, што его́ падда́ные ничо́го неўмѣ́юць рабі́ць. Сам ён, вѣ́дамо як пан, ничо́го неўмѣ́ў. От уздумаў той пан жани́тца. Знайшо́ў сабѣ́ харо́шую, маладу́ю панёнку, а сам ужэ́ си́вы, стары́. Не спадаба́ўса ей стары́ пан, але́ ба́чыць, што ў еґо́ мпо́ґо маёнткаў — пашла́. От жани́ўса пан и паѣ́хаў з жо́нкаю за ґрани́цу. Ци до́ўґо, ци ко́ратко ены́ ѣ́здзили, то́льки па́ни не даё па́ну, да й усе́.— Нема́,—ка́а,—ў мене́ таґо́, чаґо ты хо́чэш —Ну, до́брэ,—ка́жэ пан, — у маи́х маентках е таки́е майстры́, што ены́ ўсе ўмѣ́юць рабі́ць.— Прыѣ́хали ґэ́то ены́ ў маёнтак, от пан пазва́ў майстро́ў и пыта́ес, ци зро́бяць ены́ па́ни то́е, што трэ́э. Адзи́н ґо́жы, малады́ ма́йстар и вызваўса зрабі́ць усе́, што трэ́э, то́лько просиць у па́на матаря́лу. Даё ему́ пан уселя́каґо матаря́лу, атво́дзиць ему́ у пако́ях мѣ́йсцо кале́ па́ни, каб то́лько ён скаре́й рабі́ў. Пашо́ў той ма́йстар к па́ни. Паґлядзѣ́ла па́ни на ґо́жаґо ма́йстра. Спадаба́ўса ей ма́йстар и дава́й ены́ рабі́ць ра́зам. Прахо́дзиць недзѣ́ля, а мо́о дзвѣ́. Ро́биць ма́йстар, што хо́чэ. От здаво́лилиса ены́, таґды́ ма́йстар и ка́жэ па́ну, што зрабі́ў. Даў пан ма́йстру ґасци́нца и велѣ́ў ему́ жыць у пако́ях и рапарава́ць па́ню, кали́ трэ́э бу́дзе. Ось на друґі́ дзень прызва́ў пан майстра да й ка́жэ: „але́ што ма́йстар, та зло́дзей; я табѣ́ даў це́лую бабро́вую шку́ру, а ты уста́виў па́ни то́лько кусо́чак“.

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б Рожинъ

---

26. Скорам.

Атслужы́ў маска́ль мо́о ґадо́ў два́дцаць и варо́чаўса ў сваё село́. Вѣ́дамо, даўнѣ́й чаґу́нки ещэ́ не было́, й маска́ль ишо́ў пѣ́шки. До́ўґо ён ишо́ў, мо́о недзѣ́ль ше́сць, але́ от ужэ́ падышо́ў бли́зко к ро́днаму селу́ Прыту́паўса маска́ль, не мо́жэ йці́ да́лей и заначава́ў ён у адно́м селѣ́. От пасадзи́ли маскаля́ вечэ́раць, паста́вили ква́рту гарэ́лки. Вы́пиў маска́ль, пасилкава́ўса тро́хи й пача́ў рас-

ка́зваць, як служы́ў, ґдзѣ што ба́чыў. Вѣ́дамо, маска́ль, хлуси́ць до́брэ ўмѣ́е. Стаў е́н выхваля́тца, як ему́ до́брэ было́ пад кане́ц, як е́н быў у аднаґо́ ахвице́ра, як ему́ ахвице́ры падвы́пиўшы жме́няю дава́ли ґро́шы. Часту́е хаджа́ин маскаля́, а той ужэ́ й так асала-вѣ́ў. Вѣ́дамо, што ў цверо́заґо на мы́слях, то ў пъя́наґо на языцѣ́. Выхваля́етца маска́ль, што мно́ґо нажы́ў ґро́шей и паказа́ў маґа-лѣ́йку з чырво́нцами. По́зно ены́ каля́кали, аб усе́м ґамани́ли, па-ку́ль маска́ль зсу́нуўса з ла́вы й захро́п. Паза́рыўса хаджа́ин на маскале́вы ґро́шы й, як усѣ́ леґли́ спаць, падкра́ўса да й зарѣ́заў маскаля́. Но́ч—ма́ци. Нихто́ не чуў и не ба́чыў, як хаджа́ин вы́цяў маскаля́ ў канец села́ да й запе́р еґо пад мо́ст. Ста́ў е́н разбира́ць маскале́у клу́нак, ба́чыць, аж там мно́ґо пиражко́ў з мя́сам. От е́н вы́нес ґэ́тые пиражки́ да й пихну́ў на ву́лицы пад мо́сцык, от яку-ра́т пе́рад сваею седзи́баю, бо ўжэ́ нѣ́льґа было́ несци́ да́лей—ужэ́ свита́ло. Заґи́б маска́ль, як ка́жуць, прапа́ў и щу́рачки не пашли́. Прайшло́ дзе́н пяць и заґаманили́ лю́дзи, што ба́чыли як ишо́ў маска́ль да ґаспо́ды й ґдзѣ́сь заґи́б. Дачу́ласо нача́лство, и пачали́ таґо́ маскаля́ шука́ць. Саґна́ли людзе́й, абшука́ли лѣ́с, бало́то. Пра-па́ў маска́ль, як ка́мень у во́ду. То́льки ось ґуля́ли на ву́лицы дзѣ́ци, перасыпа́ли песо́чак; ба́чаць ены́, што сви́не штось вы́рыли з пад масткá. Сышлиса лю́дзи, зирну́ць, аж там маскале́вы пиражки́ з мя́сам. Пачали́ дапы́тватца да дашу́кватца й дайшли́, хто забию́ маскаля́. Ператрасли́ таґо́ хаджа́ина, ґдзѣ́ маска́ль начава́ў, и нашли маскале́во добро́. Нема́ чаґо́ запира́тца, прызна́ўса той хаджа́ин и паказа́ў, куды́ маскаля́ схава́ў. Закава́ли ґэ́то таґо́ хаджа́ина ў ка-ло́дки да й павели́ ў вастро́ґ. Там и пыта́юць, нашто е́н схава́ў пиражки́ пад мо́ст, а е́н и ка́жэ: „Ба́чыце, пиражки́ з мя́сам, а была́ серада́, ско́рам е́сци мя́со, от я й запе́р скаро́мные пиражки́ пад масто́к“.—Дак ты бая́ўса ґраху́ е́сци ў се́раду скаро́мнае, а не бая́ўса ґраху́ забиць чалаве́ка,—ка́жуць ему́. Не вѣ́даю, так ка́жуць, мо́о была́ й пра́ўда.

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы.

27. Мужык, пан и ксёндз.

За штóсь пан вéльми абазлúўса на ксендзá От и захацѣласо емý накпúць над ксендзóм, алé так накпúць, каб ксéндз не даґадáўса, хто ґэ́то так зрабúў. Дýмаў, дýмаў пан, ничóґо не прыдýмае. Седзúць пан сердзúты да тóльки вýсы кусáе. Тым чáсам прыхóдзиць к емý мужы́к. Бáчыць мужы́к, што пан вéльмо мóцно штось дýмае, да не мóжэ аґарнýць сваéю пáньскаю ґалавóю й захацѣласо емý памаґцú пáну сваúм дурны́м мужы́цким рóзумам. — Памаґáй Бóґ, панóчку!—Кáжэ мужы́к, и целю́х пáну ў нóґи.—Табѣ́ што?—Пытáе пан.—Панóчку дараґéньки!—кáжэ мужы́к,— пан штóсь дýмаешь вéльми мóцно; скажы́ мнѣ́, мóо я памаґý сваúм дурны́м мужы́цким рóзумам,—и плюсь пáна ў рýку.—Што ты—кáа—памóжэшь! мнѣ́ трэ́э накпúць над тым галганам ксендзóм. — Дóбрэ, панóчку. Зáўтрэ пан пабáчыць, як я накплю́ над ксендзóм. — Ну ґлядзú, калú дóбрэ зрóбиш, та заплачý, а калú нѣ́, та зъеси́ бизунóў.—Слýхаю—кáжэ мужы́к, и пашóў на рéку. Налавúў ґэ́то мужы́к рáкаў, папрыклéйваў им свѣ́чачки, папускáў рáкаў у садý пéрад ксендзóўськими вóкнами да й пазапáльваў свѣ́чачки. Пóўзаюць рáки. Вéчар цúхи, як у вýсе. Гарáць свѣ́чачки ў травѣ́, бы зóрки. Падышóў мужы́к пад вакнó и клúчэ ксендза. — Хто там? — пытáе ксéндз. — Анял з нéба. — А чаґó éн прышóў? — Па ксендзóўськую дýшу. Вéлено еѣ́ атнéсци ў нéбо.—Рад ксéндз. Атчынúў éн акнó, зирнýў, аж у травѣ́ ґараць свѣ́чачки, бы зóрки. Павѣ́рыў ксéндз да й вы́сунуўса ў вакно. Мужы́к падстáвиў мѣх, а ксéндз шусь у мѣх. Ускúнуў мужы́к мѣх на плéчы и папéр у свинýшник, кúнуў там мѣх з ксендзóм и запéр дзвéры. На зáўтрэ, ўжэ́ сóнейко высóко, мужы́к пашóў к пáну й прóсиць, каб пан прадáў ему парсюкá. От пан и пашóў з мужыкóм к свинюшнику, паґлядзѣ́ць парсюкá. Падхóдзяць ены́ туды́. Скрыґúчуць свúне ў свинюшнику, аж дзвéры ґрызýць. От атчынúли дзвéры; вы́беґли свúне; зирнýць ены́

ў свинюшник, аж там седзи́ць у вуґлѣ́ ксе́ндз у адно́й саро́чцэ, чуць жыў ат стра́ху.—Чаґо́ ґэто,—пыта́етца пан,—сюды́ забра́ўса ксе́ндз дабро́дзей?—Маўчы́ць ксе́ндз зу́бы сця́ўшы, так ему́ со́рам. Пасмея́ўса пан и даў мужы́ку мно́ґо ґро́шэй.

Пересказалъ И. Аземша

С. Лучицы

---

28. Радзинки й паминки.

Пашо́ў адзи́н чалавѣ́к у свѣт. До́ўґо е́н ходзи́ў, мно́ґо ба́чыў уселя́каґо дзи́ва на бѣло́м свѣ́це. Мно́ґо е́н обышо́ў краёў, мно́ґо ба́чыў уселя́ких людзёй. Усю́ды лю́дзи ро́дзятца, жыву́ць и памира́юць; усю́ды ча́сам пла́чуць, а ча́сам ска́чуць: усю́ды е лю́дзи до́брые й лихи́е. То́лько ўсю́ды лю́дзи трыма́ютца свайго́ абыча́я. Прышо́ў е́н у вадну́ вёску да й заначава́ў. То́лько ось даў Бо́ґ дзень, усхапи́ўса е́н, з праcóня да й не разшало́пае, чаґо́ ґэто ўсѣ́ ў ха́це пла́чуць. Перш е́н ду́маў, што мо́о хто памёр, або́ друґо́е яко́е нещасце, да й пыта́етца, чаґо́ ґэто ены́ так ґало́сяць. А ему́ й ка́жуць, што заты́м пла́чуць, што радзи́ласо дзиця́, от ены́ апла́кваюць еґо́ до́лю, бо невѣ́даюць, што еґо́ ў жы́тцы стре́не. — У нас,—ка́жуць,— таки́ звы́чай, што заўсю́ды пла́чуць, як хто ро́дзитца. Падзива́ваўса той чалавѣ́к да й паду́маў, што мо́о ґэто й пра́ўда, бо невѣ́дамо, яка́я бу́дзе, жы́дка ґэтаґо дзицяці. Але́ ось на друґи́ дзень прахапи́ўса той чалавѣ́к да й чуе, што ўсѣ́ спева́юць, ска́чуць да ґасцю́юць, як на весѣ́ли. Ен и зно́ў пыта́е, чаґо́ ены́ так весе́лятца. А ему́ ка́жуць, што памёрла маладзи́ца, от ены́ й ра́ды, паю́ць, ска́чуць, весе́лятца, што ена́ пераже́ла ґэтую цяжкую жы́тку.—Як тут не весели́тца,—ка́жуць ему́,—кали́ ґэтая маладзи́ца ещэ́ ма́ло ба́чыла беды́ на сваём веку́; а цепе́р, як памёрла, та й неўба́чыць. У нас усѣ́ весе́лятца, ска́чуць, пѣ́сни паю́ць, як хто ўмро́.—Ду́маў, ду́маў той чалавѣ́к, а по́тым и даґада́ўса, што ґэто пра́ўда Вѣ́дамо, яка́я на́ша слимаза́рная жы́тка: ча́сам лѣпш памёрци, як ґэ жыць.

Пересказалъ Грышко Бондаръ.

Дер. Чудинъ

---

29. Ведзьмак.

Мо́о зна́еце, от там кале́ ста́ва ещэ́ й цепе́р тырча́ць з вады́ па́ли. Ко́лись ґэ́то бы́ў млын. Харо́шы бы́ў млын, мало́ў чуць не кру́ґлы ґо́д. У млынѣ́, вѣ́дамо, заўсю́ды чэ́рци жыву́ць, а ў ґэ́тум их так мно́ґо ўплю́нуласо, што быва́ло ў ґлу́пась нихто́ не смѣ́ў и бли́зко падыщи́ к млы́ну. То́лько адзи́н ме́льник ничо́ґо не бая́ўса й цо́нгле жыў у млынѣ́. Да чаґо́ ему́ баятца, кали́ ён даўно́ з чарця́мы зна́ўса да су селя́каю ґэ́таю не́чысцью. Еґо́ й ба́цько бы́ў до́бры ведзьма́к, наўчы́ў сы́на з мале́нства. Але́ куды́ ба́цьку да сы́на! Як падро́с Ничы́пар, дак ско́ро бацька зґурава́ў. Раз ены́ чуць зуба́ми не ґры́зліса, ўсе спо́рыли, хто з их мацнѣ́йшы, але́ наре́шце ба́цько зда́ўса, уба́чыў, што сын бо́льшы ведзьма́р. И баялиса-ж Ничы́пара не то каб то́лько ў сваём селѣ́, але́ й на дзе́сяць миль круґо́м. И чаґо́ то́лько ен не рабиў! Насыла́ў и хваро́бу, и по́жар, и ґо́лад, и памо́рак на людзе́й и на ґаўя́до. Дашо́ў да таґо́, што пача́ў каме́ндаваць и вѣ́трам, и со́нейкам, и дажджо́м, и паґо́даю, и цепло́м, и маро́зам. Церпѣ́ли лю́дзи, маўча́ли,— баялиса. На́вет и бо́язно мали́лиса Бо́ґу, каб пасла́ў на еґо́ яки́ не́будзь кане́ц. Але́ ось раз усхадзи́ласа ве́льми вели́кая хви́ля. Мно́ґо ена дзеро́ў з каре́нем павыдзира́ла, палама́ла таки́е дубы́, што мо́о ены́ ўжэ́ прастаяли ко́пу векоў. Спужа́лиса лю́дзи, думали, што прышо́ў кане́ц сѣ́ту. Але́ ось памале́ньку не́бо прачы́сциласо и тро́хи супако́иласа хви́ля. Вы́сунулиса лю́дзи з паґрабо́ў, зирну́ли, аж млын хви́ля перавернў́ла. Спало́халиса, што цепер Ничы́пар са зло́сци ещэ́ ґаре́йшае ли́хо пашле́, але́ ба́чаць, аж з Ничы́пара й дух вы́перло. Ра́ды ты́е лю́дзи. Скаре́й пахава́ли Ничы́пара й ду́мали, што тут ему́ капцы́. Але́ то́лько ось пришла́ но́ч, ґлядзя́ць, аж ён уста́ў з дамави́ны да и хо́дзиць па падо́канью. Спало́халиса лю́дзи ещэ́ ґаре́й, баятца й з ха́ты вы́сунутца. Недзѣ́ль дзвѣ́ хадзи́ў Ничы́пар и мо́о хадзи́ў-бы й бо́льш, каб лю́дзи не даґада́лиса прыби́ць еґо́ аси́навым кало́м. Раскапа́ли ены́ маґи́лу, аткрыва́юць

дамави́ну, ба́чаць, аж Ничы́пар лежы́ць мо́рдаю ўткну́ўшыса ў зе́млю. От ены́ й прыґваздава́ли еґо́ аси́навым кало́м, а во́чы засы́пали прыскам, каб ничо́ґо не ба́чыў. От то́лько з таѣ пары́ ўжэ́ бо́льш не пашо́ў Ничы́пар пало́хаць до́брых людзе́й.

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы.

---

30. Мужык и жыд.

У баґа́таґо жы́да-ландара́ служы́ў сабѣ́ адзи́н мужы́к-пьянчу́жка па́рабкам. Мо́о зато́м е́н и пиў, што нѣ́льґа было́ ўзби́тца на сваѐ хаджа́йство. Што ни рабіу Янко, ничо́ґо не зро́биць, ґро́шэй не нажыве́, бо ландар то ли́шнюю кватэ́рку зали́чыць, та за но́вые, але́ ґнилы́е або́ры здзерэ́ два зло́тых, та за ла́плены кажу́шак зали́чыць тры рубли́. От так усѐ наро́виць, каб заўсю́ды Янко ўперо́д забра́ў пла́ту за слу́жбу. Ду́маў, ду́маў Янко, як ему́ вы́братца з лап паґа́наґо жы́да, перш пиў, а по́тым штось наду́маўса. Было́ ґэ́то ў лѣ́тку. Пасыла́е ланда́р Янка ў сусѣ́днее село́ к ландару́-ж з ка́ртаю. Трэ́э было́ Янку перайци́ ре́ку бро́цьки. Узя́ў ґэ́то е́н узапа́с адзе́жку, ки́нуў на бе́разе сваю́ старэ́нькую серми́ґу й дзира́вую ша́пку, а сам апрану́ўса ў но́вую сви́ту, надзѣ́ў брыль и пашо́ў у сусѣ́днее село́ к свами́ сва́ту. Праґасци́ў там Янко тры дни й прыхо́дзиць к свайму́ ландару́. А той ду́маў, што Янко утапи́ўса. От вечарко́м, як нико́ґо не было́ ў ка́рчме, Янко прачыни́ў дзве́ры й су́нетца про́сто к сталу́. Ланда́р стая́ў пры сценѣ́ й мали́ўса Бо́ґу, да як уба́чыў Янка, дак так спужа́ўса, што не мо́жэ вы́мавиць и сло́ва. Ачу́хаўса тро́хи Ле́йзар и пыта́е Янка, аткуль е́н прышо́ў.—Аткуль! Вѣ́дамо аткуль. З таґо́ свѣ́ту,—ка́жэ Янко. Ланда́р, ба́чыце, ду́маў, што Янко утапи́ўса ў раце́, як перахо́дзиў еѣ́ бро́цьки. Дава́й Ле́йзар пыта́ць Янка, ци не ба́чыў е́н на то́м свѣ́це еґо́ ба́цька й ма́тки.—Чаму́ не ба́чыў? Ба́чыў. На тваем ба́цьку ча́рци смалу́ во́зяць. Ен

праси́ў, каб ты прысла́ў ему́ ко́ней. Ма́тка-ж праси́ла, каб прысла́ли ей перы́ну, бо ена́ спиць на цвико́х, наби́тых у до́шку, й хо́дзиць суздро́м ґо́лая.—Даў ґэ́то Ле́йзар Янку па́ру са́мых ле́пших ко́ней, а жыдо́ўка но́вую перы́ну да ўселя́каґо адзе́ня. Пае́хаў сабе́ Янко ў местэ́чко, прада́ў усе́, а на ты́е ґро́шы дава́й сабе́ спраўля́ць ха-джа́йство. Заве́ў ґаспада́рку, але́ ось сустрака́е еґо́ Ле́йзар.—А што,—пыта́е,—ци атда́ў ко́ней?—А як-же? Атда́ў.—А не хлу́сиш?—От ещэ́ што! Але́ ты́е ко́ни падо́хли. Ба́цько твой праси́ў ещэ́.—Даў ещэ́ Ле́йзар па́ру ко́ней и дава́й цикава́ць, куды́ их Янко паведзе́. А Янко адре́заў у ко́ней хвасты́ й заткну́ў их у зе́млю кале́ са́маґ карчмы́, а ко́ней пове́ў на кирмаш прадава́ць. Вы́шаў Ле́йзар за ка́рчму, ба́чыць, аж пра́ўда: Янко пае́хаў на той свет, то́лько ко́нские хвасты́ тырча́ць. Шко́да ста́ло Ле́йзару ка́ней. Паце́ґ ён за хвасты́ й вы́рваў их з земли́.—Ой гиву́лт! хвасты́ атарва́лиса,—ка́жэ Ле́йзар.—А Янко спажы́ў ко́ней, зраби́ўса ґаспадаро́м

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы.

---

31. Як жиды школу будавали.

Даўно, ве́льми даўно́ ґэ́то было́. Ма́быць таґо́ не памета́юць на́шы ни дзеды́, ни пра́дзеды. Мнѣ ко́лесь разка́зваў старэ́ньки дзе́д, а ён ка́жэ ащэ́ бла́знам чуў ат свайґо́ пра́дзеда. Ащэ́ ў на́шо́м краю́ не было́ ґэ́таѣ по́ґани—жыдо́ў. Дак ось чорт нахапа́ў ґдзе́сь цэ́лыхъ двана́нцаць жыдо́ў и прывало́к их у наш кра́й на прыпло́дак.

Вала́ндаютца пархатые, бы тру́тни; рабиць ничо́ґо не у́мѣюць. Сабра́лиса у́сѣ каґа́лам и дава́й гергета́ць, як збудава́ць шко́лу. Гергета́ли ены́, гергета́ли—нѣ, без це́сли ничо́ґо не зро́бяць. Дава́й ены́ шука́ць це́сли.

Быў там пьянчу́жка Ива́нчык; ён да ў сяго́ здо́лны: што ни

вóзьме, ўсé зрóбиць да ўсé смеéтца да кéпики стрóиць. А калú ўжэ́ запьé бывáло Ивáнчык, дак не прасыпáетца недзé́ль дзвé́.

От жыды́ падпайли Ивáнчыка, éн и ўзя́ўса будавáць шкóлу. Цéлую недзé́лю пиў Ивáнчык, а як трóхи праспáўса, павéў жыдо́ў у лéс выбирáць дзéраво. Идýць жыды́ праз лéс, ажнó пéрад úми паля́нка, а на éй цвицé ґрэ́чка.—Ивáнчык, дóбры чалавé́чак—крычáць жыды́,—мóрэ, як ми папливо́м?—Э, хварéць вáшуй мáцеры!—кáжэ Ивáнчык,—ґэ́тож ґрэ́чка, алáдки бýдуць.—Идýць ены́ далéй и падхóдзяць к рацé.—Ивáнцик, ракá,—як нам перапльць?—Онь каладзьé плывáе,—кáжэ Ивáнчык,—садзе́цеса да й плывé́це —От сáмы разýмны жыд—éн усé над бýбляю седзе́ў—аседлáў калóду да й ноґи прывезáў к éй, каб не свалúтца. Тóльки атапхнýли жыды́ калóду ат бéраґа, як ена́ перакруцúласа рáзам з жы́дам, тóльки ноґи тырчáць з вады́. — Глядзú,—кáжуць парха́тые, — якú Ицко разýмны: ещэ́ рéку не перапльўў, а ўжэ́ панчóхи сýшыць.— А Ицко тóлько наґáми дрыгае, чуць не захлебнýўса, каб еґó Ивáнчык не вы́цяґ. Сняўў Ивáнчык наґавúцы, ўскúнуў их на плéчы й павéў жыдо́ў убро́д. Сам éн дóбрэ знáе, як прайцú, а жыды́ папáли ў сáмы вир и такú напилúса вады́. Тóльки ены́ вы́лезли на бéраґ, ось два жыды́ як шабулды́хнутца ў бабравúну, насúлу их Ивáнчык вы́цяґнуў. Пашлú ены́ далéй, а тýт нахапúласа нóч. Зрабúласо ў лéсе цéмно, хоць вóко вы́каль. Баятца жыды́, каб каґó чорт не ўхапúў, а тут ещэ́ их пужáюць сóвы да елякú.—Ивáнцик, дóбры чалавé́чак,—прóсятца жыды́,—палажы́ ты нас нáнач, каб нам мя́ґко булó, як на перы́не. Насцеґáў Ивáнчык сухóґо елóваґо вершáльнику, пакры́ў еґó вéтками и кажэ: „ну, лажéцеса“, а сам атышóўса, наклáў аґню́, паґравáетца сабé́ да на ражэ́ньчыку сáло печэ́. Разлеґлúса жыды́ на ламý, а пастырчáки як закóлюць им у бóки; жыды́ як падним́уць крык да зрабúли такú ґармúдар, што Ивáнчык падышóў к им з пáплискаю й кáжэ: „чаґо вы раскрычáлиса, хúбо каґó чорт ухапúў“? и давáй личы́ць их пáплискаю. — Раз жыд, два жид,—да заўсяким рáзам як перацяґне жы́да пáплискаю. Крý-

цятца жыды́, бы вьюны́ ў ґаршку́. Личы́ў, личы́ў Ива́нчык да й ка́жэ. „не круцѐцеса, бо нѐльґа личы́ць“, и зноў пачына́е з пача́тку. Здаво́лиўса Ива́нчык, —усѐ—ка́а: стаў и дава́й заку́рваць лю́льку.

— Ива́нчык, до́бры чалавѐчак — про́сяць жыды́, — палажы́ нас так, каб мы ўсѐ ў серэ́дзину были́.—До́брэ—ка́жэ Ива́нчык и паве́ў жыдо́ў к вели́зазнаму муравѐйнику, разґро́б его́ й палажы́ў жыдо́ў уси́х ра́зам ґалава́ми, а сам пашо́ў к аґню́. То́льки ён атышо́ў, як закрыча́ць жыды́, што ве́льми бло́хи куса́юць. А ґэ́то им так задали́ ды́хту мура́шки. Пашо́ў Иванчык у дру́ґае личы́ць жыдо́ў па́плискаю, каб вѐдаць, ци не ухапи́ў каґо́ чорт Паличы́ў — усѐ жиды́. Чэ́шутца жыды́, як у каро́сце, и про́сяць Ива́нчыка, каб ён палажы́ў их на пала́тки, ґдзѐ нема́ бло́х. Паве́ў Ива́нчык жыдо́ў к адру́, прыста́виў астро́ґу й сказа́ў, каб ены́ лѐзли наве́рх. Паўзла́зили жыды́ на адзе́р и леґли́ спаць, а Ива́нчык аткі́нуў астро́ґу да й пашо́ў к аґню́.

Спяць жыды́ на адры́, ра́ды, што бло́хи не куса́юць От ужэ́ й даў Боґ дзень; со́нейко падняло́со з-за лѐсу, начына́е прыпѐкаць. Ужэ́ пара́-б жыдо́м и снѐдаць, а тут з адра́ нѐльґа злѐзци.—Ива́нчык, до́бры чалавѐчак—крыча́ць ены́—пада́й астро́ґа.—А Ива́нчык пражэ́ сабѐ са́ло на ражэ́ньчыку да маўчы́ць, як вады́ ў рот набра́ўшы Крыча́ли, крыча́ли жыды́—нихто́ не обзыва́етца. Ѣсци хо́чэтца, а нема́ чаґо́. Ба́чаць ены́—на адры́ ульи́; от и захацѐласо им ме́ду. Вы́няли ены́ з у́лья снѐд и до́ўжэнь,—аж шаршни́ як вы́сыплюць з ву́лья да пачну́ць ихъ куса́ць. Пу́каютца жыды́ ат бо́ли, кача́ютца на адры́, а ўцека́ць не мо́ґуць — нема́ астро́ґи От, як тро́хи шаршни́ ўтаймава́лиса, са́мы разу́мны жыд-Бо́рух и ка́жэ: „я вазьму́са за адзе́р, а ты, Шле́ма, бери́са за мене́, Ицко дзержы́са за Шле́му, а Сро́ль за Ицка, таґды́ Ха́им да земли́ доста́не“ Пабра́лиса жыды́ адзи́н за друґо́ґо, але́ Бо́рух як атарве́тца — от усѐ й палецѐли на зе́млю. Нараби́ли жыды́ тако́ґо кры́ку, што ўжэ́ Ива́нчык не вы́щерпѐў, шко́да ста́ло, и прышо́ў туды́.

Папра́вилиса тро́хи жыды́, и павьѐў их Ива́нчык рабі́ць клины́

Нараби́ли ены́ клинŏў мо́о з вŏз. Таґды́ Ива́нчык велѣ́ў им до́шки биць. Узберу́тца жыды́ на дзе́раво, зсеку́ць верх и дава́й биць ґэ́тае дзе́раво на до́шки: забива́юць све́рху клины́, а друґи́е жыды́ стаяць пад дзе́равам да памаґа́юць—за ўся́ким ра́зам ка́жуць „ґак“! От як забью́ць све́рху клины́ ў сук, та ены́ й леця́ць у ни́з да жыдŏм па ґалава́х.—Ой, гива́лт!—крыча́ць жыды́,—Ива́нчык, до́бры чалавѣ́чак, клины́ узґуля́лиса. — Паразбива́ли жыды́ сабѣ́ ґо́лавы. не вы́били ни ґо́днаѣ до́шки и пашли́ да́лей. Иду́ць ены́ да йду́ць и ўби́лиса ў таку́ю не́тру, што й свѣ́ту Божаґо небачно́. Про́сятца жыды́, каб Ива́нчык вы́веў ихъ з ґэ́стаґо пе́кла. Павье́ў их Ива́нчык у бало́то. Сам ска́чэ з ку́пины на ку́пину й не лыс, а жыды́ непападу́ць на ку́пину, да ўсе шабо́ўсь у ґразь: вы́мазалиса, як чэ́рци. Друґи́ чуць не захлебну́ўса ў ба́ґне. Падво́дзиць Ива́нчык жыдŏў к лазѣ́. Вѣ́дамо, лаза́ паґну́ўшыса расце́. Што сту́пиць жыд на лази́ну, щакаўзне́тца наґа́, а жыд плясь у гразь Наси́лу парха́тые вы́бралиса з лазы́. До́ўґо валачы́лиса жыды́ па лѣ́се, яко́е беды́ ены́ не ба́чыли, яки́х стра́хаў не надрыжа́лиса! Камарэ́ча, авады́ й уселя́ки ґнюс во́чы им павыеда́ли. Зжа́лиўса Ива́нчык и збудава́ў жыдŏм халу́пу. Абжыли́са тро́хи жыды́, акрыя́ли парха́тые й зно́ў слепи́цаю лѣ́зуць Ива́нчыку ў во́чы, каб ен будава́ў шко́лу. Не слўхае Ива́нчык, да ўсе́ кпиць з жыдŏў.—Ну, кали́ е́н так — ка́жуць жыды́ — нако́рмим еґо́ гу́гелям, та е́н не бу́дзе мужыко́м, тра́сца еґо́ ма́церы. — Накарми́ли ґэ́то жыды́ Ива́нчына гу́гелям, палажы́ли еґо́ ў сваёй халу́пцэ на перы́ны й дзве́ры падпе́рли кало́м. Лежы́ць Ива́нчык да ўсе́ о́йкае, што еґо́ абкарми́ли.—А што, ци до́брэ табѣ́ нас не слу́хаць—кажу́ць жыды́.—Ой, ой!—крычы́ць Ива́нчык,—тŏлько вы накарми́ўшы гу́гелям, не вазѣ́це мене́ на са́нях па рали́, бо таґды́ я не вы́трымаю.—О то-ж бу́дзем вази́ць—кажуць жыды́. Палажы́ли ены́ Ива́нчыка́ на перы́ны, вы́несли на рука́х на са́ни, сами ўпраґли́са й дава́й вази́ць Иванчыка па рали́. Беґу́ць, аж пе́йсы трасу́тца, а Ива́нчык тŏлько крэ́хчэ на перы́нах. Вази́ли-вази́ли, аж языки́

высалапили, а Ива́нчык уста́ў з са́няў, пасмея́ўса з дурны́х жыдо́ў да й пашо́ў да ґаспо́ды, бо ве́льмо ску́чыў без ба́бы. Так от як жыды́ шко́лу будава́ли.

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы.

32. Баязливы жыд.

Пашо́ў жыд у местэ́чко. Нахапи́ласа но́ч. Баи́тца жыд, аж дрыжы́ць, а ярмо́лка расце́, аж ша́пку падыма́е. Бежы́ць жыд кале́ ле́су. Аґлене́тца ен—хтось ґо́нитца ззаду. Пу́сцитца жыд хутче́й бе́ґци—не астае́тца той, бежы́ць сле́дам Бе́ґ, бе́ґ жыд, чуць духи́ з еґо́ не вы́перло, спатыкну́ўса да й упа́ў. Лежы́ць и не ды́шэ. Ачу́хаўса тро́хи, зирну́ў—нико́ґо нема́. Падня́ўса жыд, ба́чыць, аж ґэ́то за им бе́ґ еґо́ цѣнь. Пашо́ў жыд да́лей. Идзэ́ кале́ ле́су: ба́чыць, аж ме́сяц идзе́ по́ручки з им: жыд за дзе́раво, и ме́сяц за дзе́раво; жыд ста́не, и ме́сяц ста́не: жыд пабежы́ць, и ме́сяц бежы́ць. Зно́ў спало́хаўса жыд, не ве́дае, што рабиць. Чу́е жыд, хтось тарахци́ць. Гаре́й спало́хаўса жыд, ду́мае е́дуць разбо́йники. Зале́з жыд у кана́ву, лежы́ць, а душа ў пя́тки схава́ласа. Зирну́ў жыд, аж е́дзе мужы́к. Дава́й жыд расиць мужыка́, каб е́н схава́ў еґо́ ат разбо́йникаў. Пасадзи́ў мужы́к жы́да ў дзеру́ґу й ка́жэ: „от тут седзи́ сме́ло, разбо́йники не зна́йдуць“. Седзи́ць жыд. Е́дзе мужы́к, а на сустре́к иду́ць маскали́.—Што ты, мужы́к, везе́шь?—Пыта́юць маскали́.—Шкло,—ка́жэ мужы́к. Дава́й ґэ́то маскали́ биць па дзеру́зе, каб пазна́ць, ци пра́ўда там шкло, а жыд седзи́ць, да то́лько дзи́нькае.—Дзинь, дзинь!—крычы́ць жыд, а маскали́ пе́раць еґо́ па́плискаю. А мо́о там ни я́ких и маскале́ў не было́, а ґэ́то сам мужы́к, каб напужа́ць жы́да, пе́рыў еґо́ па́плискаю.—Ну, выла́зь,—ка́жэ мужы́к;—разбо́йники схава́лиса ў ле́с.—Вы́лез жыд чуць жы́ў и дава́й дзя́куваць мужыку́, што е́н укры́ў еґо́ ат разбо́йникаў.

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы.

33. Атрабляне.

Ся́бер раска́зваў, што жыў у адно́м селе́ калду́н-ведзьма́к. Аткуль то́лько к ему́ не хадзи́ли лю́дзи! Ен и за́витки вырыва́ў, и ат уся́ких хваро́б вылеча́ў, и атрабля́ў, як каму́ што лихо́е ўдзе́яно, и ваўко́ў насыла́ў, и малако́ ў каро́ў атбираў Усе́ его́ бая́лиса й ґадзи́ли ему́, як лихо́й скуле́. Куды́ ни пры́дзе калду́н-знахо́р, ци на весе́ле, ци на радзи́ны,—ўсю́ды его́ са́дзяць на по́куць, часту́юць, шашку́юць, як пе́рад папо́м А ён седзи́ць, насу́нуўши ша́пку, да то́лько вачы́ма бли́скае, як воўк От раз у ваднаґо́ чалаве́ка занепа́ла каро́ва. Жо́нка каза́ла папраси́ць калдуна́-зна́хара, каб пашапта́ў, а ґаспада́р не паслу́хаў жо́нки,— каро́ва на за́ўтрэ й вы́пруциласа. Беду́е мужы́к — нема дзе́цям ни ка́пли малака́, а каб купи́ць друґу́ю каро́ву,— ґро́шэй баґи́ их ме́ли. Пашо́ў той мужы́к з беды́ ў карчму́, хаце́ў вы́пиць кватэ́рку ґаре́лки. Прыхо́дзиць туды́, ажно́ там седзи́ць за сталом калду́н-знахо́р; седзи́ць, лю́льку паку́рвае, чака́е, паку́ль хто паўква́рты паста́виць. — Што — ка́а калду́н-знахо́р – неща́сце, Сцепа́не?—Эґэ́-ж, неща́сце.—Ге́то, ма́быць, удзе́яно, трэ́э на зо́ры паґлядзе́ць,—Глянь на́ Баґа, Ничы́пар, паґлядзи́ на зо́ры, хто ґэ́то мне́ удзе́яў, каб ему́ дабра́ не было́.— Ничо́ґо, не бо́йса, я атрабмю́—ка́жэ калду́н-знахо́р. Паста́виў ґэ́то ему́ Сцепа́н паўква́рты, а друґу́ю ўзя́ў у кишэ́ню й паве́ў Ничы́пара да ґаспо́ды. Спраґла́ ґэ́то жо́нка ее́чню,— часту́юць калдуна́-зна́хара. Напи́уса Ничы́пар, нае́уса й ле́ґ спаць. Але́ ось у са́мую ґлу́пась уста́ў и пыта́е Сцепа́на, ци ён спиць. Сцепа́н абазва́уса, што не спиць.—Спи—ка́а Ничы́пар—спи, ничо́ґо не бо́йса,—а сам и пашо́ў з ха́ты ґлядзе́ць на зо́ры. Так трэ́йко ён хадзи́ў ґлядзе́ць на зо́ры. Але́ ось на за́ўтрэ, ещэ́ чуць све́т, чу́юць, аж у суседзей ба́бы ґало́сяць: са́мая ле́пшая, зда́ровая каро́ва ў ве́чар нае́ласа, а к све́ту й вы́пруциласа.—А што́—ка́а калду́н-знахо́р — от и атра-

би́ў.—Дава́й ужэ́ ты́е сусѣ́дзи праси́ць Ничы́пара к сабѣ́: ґо́дзяць. часту́юць. От так, як и ў Сцепа́на, напи́ўса, наѣ́ўса ў их Ничы́пар, да й ле́ґ спаць. Нŏчу е́н уста́ў, пыта́е,—ци вы спице́?—Нѣ́,—ка́жуць—не спимо́ — Спѣ́це, спѣ́це, ничо́ґо не бŏйцеса, я тŏлько паґляджу́ на́ зо́ры. — И пасунуў з ха́ты на двŏр. А ў за́ печку лежа́ў хлапчу́к, ґэ́так ґадŏў двана́нцаци падшпа́рак, да ве́льми цика́вы. Хо́четца ему́ вѣ́даць, як ґэ́то Ничы́пар ґлядзи́ць на зо́ры. Вы́лез ґэ́то е́н з за́печка й ци́хенько вы́шаў з ха́ты да й прытаи́ўса за ўґло́мъ. Ба́чыць, што Ничы́пар пастая́ў на ву́лицы да й пашо́ў азира́ючыса къ сусѣ́ду на двŏр. До́ўґо стая́й хлапчу́к, хацѣ́ў ужэ́ йци́ ў ха́ту, але́ ось чу́е, штось у сусѣ́да ў хлевѣ́ ве́льми мŏцко сту́кае. Падбѣ́ґ ґэ́то хлапчу́к к сусѣ́ду пад акно́, пабараба́ниў у абало́нку да й ка́жэ: „Дзяцько́, Мики́та, о, дзяцько́, Мики́та, поґлядзи́ тко-бо, штось у тваéм хлевѣ́ ве́льми мŏцко сту́кае. Запали́ў Мики́та лучы́ну, ўсту́рхаў па́рабка да й пашли́ ены́ ў хлѣ́ў: ба́чаць, ажно́ Ничы́пар седзи́ць на са́мум лѣ́пшŏм валу́ да зацурко́ўвае ему́ ґо́рло, а вŏл лежы́ць да тŏльки наґа́ми дры́ґае —Што ты—ка́а,—ґад, ро́бишъ!? Дак ґэ́то ты ґэ́так атрабля́еш! — И дава́й еґо́ лупцава́ць чымъ папа́ло. Нараби́ли кры́ку Збѣ́ґласо паў села́. Наси́лу атратава́ли вала́, а Ничы́пара калдуна-зна́хара так прыби́ли, што ду́мали ен ужэ́ бŏльш неўста́не. Але́ жыву́ч ґад, як кŏт,—палежа́ў тро́хи без па́меци, а по́тым и ачу́хаўса, даста́ў з кишэ́ни бутэ́лячку ґаре́лки да як пацяґну́ў, дак и на но́ґи падня́ўса. Ба́чыць, што еґо́ вы́кинули за пло́т. як сце́рву, от е́н ци́хенько й папо́ўз у су́вараты. Тамъ ма́быць атлежа́ўса й саўсим ускара́бкаўса. Але́ ґо́дзи с таѣ́ пары́ калдава́ць да атрабля́ць. Дак от як Ничы́пар калду́н-знахŏр ґлядзѣ́ў на зо́ры да прырабля́ў и атрабля́ў. А мо́о й усѣ́ ены́ ґэ́так атрабля́юць, чарты́ их вѣ́даюць, не пе́рад начу́ ка́жучы.

Пересказалъ Г. Бохматъ.

Дер. Чудинъ.

34. Про́ща.

У ґлухо́м Палѣси, за бало́там, за тако́ю тхла́нью, што аттӳ́ль и свѣ́ту Бо́жаґо не видно́, бы́ло сельцэ́. У то́м сельцы́ была́ цэ́рква старэ́нькая, зкрывӣ́ўшаяся. Недале́ко ат цэ́ркви стая́ла карчма́ така́яж стара́я, аблу́пленая, без страхи́, с заґа́таю ӣ падпо́ркамп. Бѣ́дны бы́ў там по́п, бѣ́дны ӣ рандар: бо кали́ нема́ даго́ду папу́. та нема́ ӣ рандару́. Але́ рандар бы́ў ве́льми хы́тры жыд. Тры дни е́н седзе́ў, ни пӣ́ўшы, ни е́ўшы, ўсе ду́маў, як-бы ему́ разбаґацѣ́ць Спало́халаса жыдо́ўка, ду́мае, што мо́жэ Абру́мка памеша́ўса То́льки от на трэ́йци дзень Абра́м сказа́ў. „рэхт“ и пашо́ў к папу́. По́зно ен седзе́ў у папа́, не́маль да тре́йцих пе́ўняў, усе́ штось ґаварыў папу́. От прышле́паў Абра́м да ґаспо́ды, а на друґи́ дзень паѣхаў у местэ́чко.

От прайшла́ недзе́ля, а мо́о дзве́. Пачали́ каси́ць. Было́ паґо́днае ле́то От вечарко́м у недзе́лю седзя́ць лю́дзи та на пры́збах, та пад ли́пами кале́ цэ́ркви, седзя́ць, жу́пяць, лю́льки ку́раць. Тут жэ, кале́ са́маґо села́, пры раце́ ґуля́юць дзе́ци. Ве́чар паґо́дны. цеплы От пачало́ цемне́ць; на не́бе заґаре́лиса зо́рки Ось беґу́ць дзе́ци ӣ крыча́ць: „сюды́, сюды́, вонь на раце́ плыву́ць зо́рки!“ Падняли́са мужыки́, ба́чаць, аж пра́ўда на раце́ штось плыве́ з вадо́ю ӣ круґо́м еґо́ як-бы све́чачки ґара́ць. Пабе́ґли сказа́ць аб то́м папу́. Прышо́ў по́п, паґлядзе́ў и кажэ, што ґэ́то цуд. Палѣз ста́раста на званни́цу ӣ дава́ӣ звани́ць, як на вели́кдзень. Вы́сыпало ўсе́ село́ к раце́. Пабе́ґ по́п у цэ́ркаў, адзе́ўса ў ры́зы да ӣ пашо́ў з пратэ́самн к раце́ сустрака́ць той цуд. Падышли́ лю́дзи ближе́ӣ к раце́, ба́чаць, ажно́ плыве́ стара́я до́шка, а на е́ӣ лежы́ць абразо́к памиж све́чачак. Ци́хо, як у ву́се, све́чачки гара́ць ро́ўно, бы ў цэ́ркви. Падплыла́ до́шка к бе́раґу, заплу́таласа памиж кали́так да ӣ ста́ла. Узя́ў ґэ́то по́п абразо́к на бе́раґ, паста́виў на ка́мени ӣ дава́ӣ служы́ць мале́бен. Усю́ды заґаварылн, што ў то́м селе́ объяви́ўса цуд, и павали́ли атусю́ль лю́дзи к то́ў про́щы.

Несу́ць ахвя́ру, хто што мо́жэ. Разжы́ўса ско́ро по̆п, але́ ещэ́ бо̆льш папа́ разжы́ўса рандар, бо, ве́дамо, хто аткуль ни прыхо́дзиць, та ўсе-ж дасць рандару́ ўтарґава́ць. И сла́витца та́я про́ща, на ўвесь свет. Але́ ка́жуць, што ґэ́ты цуд зраби́ў ранда́р, намо́виўшыса з папо́м. А Бо̆ґ его́ святы́ ве́дае! Ка́жуць, што з местэ́чка крама́р пазна́ў, ба́тцэ ґэ́то той абразо́к, што ў его́ ранда́р купиў, ни́бы для папа́ Мо́о й пра́ўда!

Пересказалъ Рѣдкій.

С Б Рожинъ.

---

35. Аб то̆м, як ксендзы́ вылечылиса.

Тры ґла́дкие, аты́лые кзендзы́ сабрали́са е́хаць на во́ды лечы́тца. Ены́ растаўсцэ́ли, як аткормленые вапруки́. Чаґо́ ены́ не рабили, яки́х зелье́ў не прыма́ли—ничо́ґо не памаґа́е. Дахтуре́ ка́жуць, што им трэ́э е́хаць на во́ды, дак там ло́ю збу́дзе. Пае́хали ксендзы́ па пано̆х збира́ць ґро́шэй на дарбґу. От прыезджа́юць ены́ к аднаму па́ну й жа́лятца ему́ на сваю́ беду́. Про́сиць пан ксендзо̆ў пасилкава́тца да пераначава́ць. Заначава́ли ксендзы́. От пасадзи́ў пан их вечэ́раць да так участава́ў, што ксендзы́ й засну́ли пры стале́. Храпу́ць ксендзы́ на ўсе́ ста́ўки, спяць так мо̆цно, што хаць з ґарма́т страля́й—не пачу́юць. От пан веле́ў их раздзе́ць, перанесци́ ў бро́вар да й палажы́ць там ра́зам з браварськи́ми рабо̆тниками. Прачу́халиса на за́ўтрэ тро́хи ксендзы́, але́ не ве́даюць, ґдзе́ ены́ Але́ ось и бу́дзяць дзецюко̆ў набива́ць картапля́ник. Падняли́са ксендзы́ й нехадзе́ли йци на рабо́ту, але́ як перацёх их намесник бизуно́м, небо̆сь, пашли́. Ро́бяць ксендзы́ ра́зам з другими́ ўсе, што трэ́э ў бро́вары, ра́зам еду́ць, ра́зам спяць и ни як не мо́ґуць з бро́вара вы́рватца. От прахо́дзиць недзе́ля - друґа́я, й пачало з ксендзо̆ў спада́ць сало, а це́раз недзе́ль пяць ены́ падґи́ндзилиса як харты́. Паґлядзя́ць ены́ адзи́н на друго́ґо й пазна́ць не мо́ґуць, так вы́петрали за ґэ́тые пяць недзе́ль. Ду́мали ўжэ ксендзы́, што ґэ́то

их чэ́рци ўхапи́ли да й засадзи́ли ў бро́вар на паку́ту; ду́мали, што ўжэ́ им нико́ли аттуль не вы́бавитца. От раз велѣ́ў пан даць браварськи́м работникам ведро́ ґаре́лки, а ксендзо́м—лѣ́пшае ґаре́лки, са́маѣ мо́цнаѣ. Напили́са ены́ й без па́мяци пазсо́валиса ў бро́вары кале́ катла́. От як ксендзы́ мо́цно засну́ли, пан велѣ́ў перане́сци их у ахвицы́ну й палажы́ць там, ґдзѣ ены́ лежа́ли пе́ршую но́ч. Прахапи́лиса на за́ўтрэ ксензы́ й трасу́тца, спало́халиса, што по́зно спа́ли; бая́тца, каб намѣ́сник не лупцава́ў их бизуно́м; ста́ли скаре́й апрана́тца, але́ ба́чаць, аж кале́ их лежы́ць ксендзо́ўськая адзе́жа. Дзи́вятца ксендзы́ й ачо́м не вѣ́раць. Адзѣ́лиса ены́, але́ ось прыхо́дзиць пан, заве́ ґарба́ту пиць. Ста́ў ґэ́то пан часта́ваць ксендзо́ў да й пыта́е, куды́ ены́ ду́маюць ѣ́хаць на во́ды.—Нѣ—ка́жуць ксендзы́ ў вадзи́н го́лас — цепе́р не трэ́ба ѣ́хаць на во́ды, бо мы ўжэ́ вы́лечылиса —От як пан вы́лечыў ксендзо́ў.

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы.

---

36. Ка́таржник и страста.

Не раби лихо́го й не бойса нико́го.
Пра́уда наве́рх выдзе. (Прыказки).

Даўно́. Я ещэ́ быў падшпа́ркам.—Што ему́ до́ма рабиць,—ка́жэ ба́цько, вѣ́чны пако́й, — неха́й бѣ́ґае ў Михаля́ падпа́сычам. — И атда́ў мене́ ба́цько на ўсе лѣ́то к старо́му пастуху́. Пасту́х Миха́ль быў ужэ́ ве́льми стары́. Ен усе́ жы́це па́сьциў ґаўя́до. От так, як и мене́, его́ ко́лись ещэ́ малы́м атда́ў ба́цько падпа́сычам. Падня́ўса Миха́ль на но́ґи, але́ к то́й пары́ ба́цько памер, хаджа́йство зни́щыласо; й стаў ён сам па́сьциць ґаўя́до, перш у селѣ́, а по́тым каша́ру ў лѣ́се. Це́лае лѣ́цячко дну́е й начу́е з ґаўя́дам у лѣ́се, а ў зи́мку слу́жыць у каґо́-не́буць. Была́ адна́ маско́ўка. Мо́жэ ґадо́к не пажыла́ з ґаспадаро́м, як ены́ пабра́лиса, але́ ось и забра́ли его́ ў маскали́. Вѣ́дамо, яка́я даўнѣ́й была́ слу́жба: два́дцать пяць ґадо́ў

служы́ли. Прапа́ў ґаспада́р. Заґна́ли еґо́ ґдзе́сь на Кашка́з, ци што. Быва́ло й карту прысыла́ў у ґо́д раз, а по́тым и саўси́м не ве́дамо, што з им ста́ласо. Схла́, схла́ маладзи́ца: й за́муж не мо́жна йци, бо нихто́ не зна́е, мо́о ещэ́ й жыў ґаспада́р, и так жыць цяжко. От и ўзела́ та́я маско́ўка к саба́ Михаля́ памаґа́ць у хаджа́йстве. Быва́ло я адзи́н астаю́са ў каша́ры, а Миха́ль по́йдзе памаґа́ць маско́ўцэ се́но рабі́ць, або́ жаць, ци ара́ць. От так и прайшла́ Михаля́ ўся жы́тка. От быва́ло наха́дзимса за дзень па ўселя́куй не́тры, заґо́ним ґаўя́до ў каша́ру да й седзимо́ кале́ аґно́. Я ла́пци плету́, а Миха́ль ку́рыць лю́льку да ка́жэ ка́ски. И яки́х то́лько ка́зак е́н незнаў! Гэ́то е́н наслу́хаўса ат старо́ґо пастуха́, як быў у еґо́ падпа́сычам. Але́ не то́льки ка́ски, е́н быва́ло раска́зваў и пра́ўду. От як цепе́р паметаю, ку́рыць Миха́ль лю́льку й ка́жэ, што на еґо́ па́меци жыў у суседнюм селе́ ўжэ стары́ чалаве́к. Гэ́то быў са́мы баґа́ты мужы́к ва ўсе́й акру́зе. До́бры быў чалаве́к, ве́к ззжыў, а нико́ґо не скры́ўдзиў. Усе́ паважа́ли еґо́ й вы́брали ста́растаю. Але́ ось прые́хаў станавы́, саґна́ў людзе́й и ка́жэ, што яки́сь ка́таржник прызна́ўса пе́рад нача́лствам, што е́н ве́дае ме́йсцо, ґдзе́ схо́вано мно́ґо ґро́шей. Прывели́ й таґо́ ка́таржнаґо. Чуць на нага́х трыма́етца стары́ ка́таржник. Разґлядзе́ўса е́н у селе́ й паве́ў людзе́й у ле́с к то́ўстаму ду́бу. — От тут, — ка́жэ, — схо́ваны ґро́шы, а от кале́ тае́ хво́и зако́пан ку́пец, як еґо́ аґра́били От е́н, — и ка́таржны паказа́ў на ста́расту, — адзи́н упра́виўса з купцэ́м и хапе́ў забра́ць сабе́ усе́ ґро́шы, але́ мабыць то́лько ухваци́ў адну́ жме́ню, бо я еґо́ як пырну́ў нажэ́м у бо́к, дак е́н и пакаци́ўса, як сно́п. Пе́ўне и цепе́р ещэ́ е знак на баку́, бо я еґо́ до́брэ пачаставаў. Ки́нули мы еґо́ як саба́ку, закапа́ли купца́, а ґро́шы схава́ли пад ду́бам, да ско́ро нас злави́ли. Ма́е тава́рышы паўмира́ли ў Сибе́ры, а я адзи́н аста́ўса й захапе́ў, каб дарэ́мне ґро́шы не прападали й каб супако́иць ду́шу купца́, а то е́н усе́ мне́ сни́тца, про́сиць, каб пахава́ли на мо́ґлицах.—Пабеле́ў ста́раста, як палатно́, трасе́тца, бы аси́на. Паґлядзе́ў на еґо́ станавы́,

зирнýў и ещэ́ якúсь пан, мáбыць дóхтур Пашапта́лиса ены́ прамíж себе́ й велѣ́ли ста́расце скинуць сарóчку. Спусцíў ста́раста сарóчку, ґлянь, аж на баку́ пису́х с далóню. Дава́й ґэ́то лю́дзи капа́ць кале́ хвóи. От пракапа́ли ены́ па калѣ́но я́мку, ба́чаць, аж там пра́ўда чалавѣ́чые кóсци. Ужэ́ саўсúм паґнилú. Як уба́чыў то́е ста́раста, так чуць не абамлѣ́ў. Гóдзи таúтца: й прызна́ўса, расказа́ў усé, як было́. Ця́жко было́ ґлядзѣ́ць, як ста́раста валя́ўса к наґа́м кóжнаґо чалавѣ́ка, што там былú й ўсé праси́ў, каб дарава́ли ему́ сусѣ́дзи, што ен усю́ жы́тну бая́ўса ка́ры, не прызнава́ўса, да падма́ньваў до́брыхъ людзе́й. Пазбира́ли ґэ́то кóсци купца й отвезлú ў каплúцу, пакýль зрабúли дамавúну, каб пахава́ць на мóґлицах. А пад ду́бам кóлько ни капа́ли, ничóґо не нашлú: ма́быць хтось уперóд наткну́ўса на ґро́шы й забра́ў. От звеза́ли ста́расту й павелú судзúць, а по́тым еґó кудúсь сасла́ли, мóо ў Сибе́р. Так от як Бóґ до́ўґо церпѣ́ў, а тóлько к ста́расци пакара́ў ста́расту за ґре́х. Ка́таржны-ж ско́ро захвареўу и памéр у сваéм селѣ́. Его́ й пахава́ли на мóґлицах ра́дам з тым купцэ́м. Даўно́ ґэ́то было́, ой як даўно. Я ўжэ́ састарéўса, а мнѣ́ аб ґэ́тым раска́зваў Миха́ль таґды́, як я ещэ́ быў у еґó падпа́сычам.

Пересказалъ Микита Капачъ.

Дер. Заполье

---

37. Чорт и баба.

Жылú сабѣ́ дзѣд да ба́ба. Жылú ены́ ў зґóдзе да ў ладу́, никóли не сварылиса, не зневажа́ли адно́ другóґо. Так пражылú ены́ ўсю жы́дку й дажылú да ста́расци. Чорт хацѣ́ў спакусúць их. Дванáнцаць ґадóў седзѣ́ў ен у падпѣ́чку, але́ ничóґо не зро́биць. Выпетраў чорт, бы шкура́т. А дзѣд з ба́баю жывýць сабѣ́ ладкóм да Бóґа хва́ляць. Хацѣ́ў ужэ́ чорт кúнуць ґэ́стых людзе́й да йци спакуша́ць другúх, але́ ось раз чу́е, што лю́дзи ка́жуць: ґдзѣ́ чорт не

йме́, там ба́бу пашле́. Пачу́ў ґэ́то чорт и пашо́ў шука́ць тако́ѣ ба́бы, каб ена́ звела́ ґэ́тых праўдзи́вых людзе́й. Не до́ўґо прышло́со чо́рту шука́ць тако́ѣ ба́бы: чуць то́лько е́н вы́сунуўса на ву́лицу, як ба́чыць, ажно́ бежы́ць за мужыко́м з качарґою падты́каная ба́ба й ду́басиць еґо́ па паты́лицы й па чо́м пана́ло да крычы́ць на ўсе село́, — ось жэ табе́, хвара́ць тваёй ма́тары!.. Я табе́ пакажу́, як збо́жэ ў карчму́ цяґа́ць... Я табе́ пакажу́, валацу́ґа ты ґэ́таки. Ат мене́ не ўто́ишса. Я што захачу́, та зраблю́. Хи́бо ты забы́ўса, што ба́ба й чо́рта перахитру́е! — Лу́пиць ба́ба качарґою мужыка́, а чо́рт и рад. — От, — ду́мае, — ґэ́тая ба́ба ўсе зро́биць, што зхочэ, тра́э то́лько к ей падкаци́тца. От чорт, каб задо́брыць ба́бу, хацѣ́ў ёй прыслужы́тца да й ухапи́ў мужыка́ за каўнѣ́р, каб прытрыма́ць еґо́. — Ахъ ты сяки́-таки́! — наки́нуласа ба́ба на чо́рта. — Сво́й сечы́са, руба́йса, а чужы́ не мешайса. Што́ но́с уваткну́ў у чужу́ю за́дницу?.. И дава́й чо́рта пере́сциць качарґо́ю. Наси́лу чорт вы́рваўса да ў но́ґи. То́лько на заґуме́чи тро́хи ачу́хаўса чорт, стайць да паскре́баетца, бо ба́ба ему́ не́маль усѣ ко́сци паламала. Пастаяў чорт и вернуўса ў село́. От нашо́ў ту́ю ба́бу й дава́й еѣ праси́ць, каб памаґла́ спакуси́ць тых праўдзи́вых людзе́й. — До́брэ, — зґаджа́етца ба́ба, — то́лько за тэе дай ты мнѣ ша́пку ґро́шэй. — Чорт абеца́ў даць ба́бе по́ўную ша́пку ґро́шэй, абы́ ена́ то́лько так зраби́ла, каб дзѣд з ба́баю пасвары́лиса. — Што, каб пасварылиса! — ка́жэ ба́ба, — я так зраблю́, што за́ўтрэ дзѣд не то́лько абла́е ба́бу, але́ й павало́чыць за ко́сы.

Рад чорт. Зно́ў залѣз пад пѣч и седзи́ць, чака́е, што ґэ́то ба́ба зро́биць. От ґэ́тая сердзи́тая ба́ба, бы не знаро́к бежы́ць з ведро́м и сустрака́е жо́нку таґо́ праўдзи́ваґо чалавѣка. Ста́ли ены́ пасеро́д ву́лицы й дава́й саката́ць. Вѣдамо, ба́бы, як сы́дутца, та датуль бу́дуць лапата́ць, паку́ль аб усём не пераґавора́ць. От пыта́ютца ены́ одна́ ў друґо́ѣ, ци лю́бяць их ґаспадары́, ци до́брэ з и́ми жыву́ць. — Мо́й ґаспада́р, — ка́жэ сердзи́тая ба́ба, — хаць и пья́ница, хаць и ла́етца й зневажа́е, але́ так лю́биць, так лю́биць... — А та́я ка́жэ,

што ены́ з сваи́м ґаспадаро́м так до́брэ, так зґо́дно жыву́ць, што дай Бо́ґ так жыць уси́м до́брым лю́дзям.—Але́ тво́й ґаспада́р цебе́ ма́быць не лю́биць, кали́ нико́ли не абля́яў, або не вы́цяў, ци мо́о ен ужэ́ неўзло́лее? — Пры ґэ́тых слава́х ба́ба приґну́ласа к ву́ху й што́сь шапну́ла сусе́дцэ. — Эґэ́-ж, пра́ўду ты ка́жэш, — жа́литца жо́нка праўдзи́ваго чалаве́ка,—ґэ́то маé неща́сце.— Ий, ро́дная! кали́ зхо́чэш, я наўчу́, што зраби́ць, дак не то́лько штоб што, але́ й не ната́лиш! — Ой баюся я, ро́дная, мо́о ещэ́ зашко́дзиць. — Нé, не зашко́дзиць, ты то́лько слу́хай, зраби́, што я табе́ скажу́. Ґэ́то, ба́чыш, усе неща́сце, што ў тваґо́ ґаспадара́ над барадо́ю вы́расли сухи́е валасы́: от каб ты их вы́разала, то́лько, каб ґаспада́р аб то́м не ве́даў, таґды́-б вы были́ так щасли́вы, так щасли́вы, што-б вам усе́ лю́дзи завидували.— Як жэ ґэ́то зраби́ць, каб ґаспада́р не ве́даў?—А от як. Купи́ ґаре́лки, спечы́ яе́чню да й напо́й свайґо́ ґаспадара́, а як ен ля́жэ да засне́, вазьми́ нож, паґастры́ аб пры́пек, плюнь трэ́йко пад пе́ч да й вы́раж ты́е сухи́е валасы́. Ены́ так и стырча́ць про́циў шэ́рсцы. — Дзя́куй табе́, ро́дная! — Так ґлядзи́ж, зраби́ сеґо́днячы, та за́ўтрэ ещэ́ не так падзя́куеш: здаво́лишса, ўсю но́ч спаць не дась, як з за́маладу, хи, хи, хи!.. — И ба́ба засмея́ласа да й пашла́ да ґаспо́ды.

От то́лько со́нейко се́ло за ле́с, жо́нка праўдзи́ваго чалаве́ка зо́е́ґала ў карчму́, прынесла́ ква́рту мо́цнае ґаре́лки й дава́й праґци́ яе́чню. Тым ча́сам та́я ба́ба сустре́ла таґо́ праўдзи́ваго чалаве́ка да й ка́жэ ему́, што еґо́ сеґо́днячы хо́чэ жо́нка заре́заць. Той не ве́рыць, але́ ена́ клине́тца на чо́м свет стаи́ць, што пра́ўда. — От жэ, — ка́а— паба́чыш, ена́ цебе́ сеґо́днячы падпо́иць, а як ты ля́жэш спаць, та ена́ цебе́ заре́жэ. От паба́чым. То́лько ты сеґо́днячы ўле́зеш да ґаспо́ды, ена́ паста́виць на сто́л яе́чню й пля́жку ґаре́лки Ґэ́то, каб ты ўпи́ўса да не ске́миў, што ена́ ли́хо замышля́е. А ты то́льки прыки́нса, ба́тцэ спиш, та паба́чыш, што ена́ бу́дзе рабиць —Бре́шэш, патаску́ха! за што мене́ мая́ ба́ба бу́дзе ре́заць, кали́ мы так до́брэ жыво́м,—маўля́ў справедли́вы чалаве́к и пацёґса

да ґаспо́ды, каб скара́й аб то́м сказа́ць жо́нцэ, але́ то́лько е́н пераступи́ў паро́ґ и зирну́ў, што жо́нка у́праўду пражэ́ яе́чню, дак и прыкуси́ў язы́к.—Эґэ́,—ду́мае,—ма́быць паґа́ная ба́ба не браха́ла.— И прыки́нуўса е́н, (што) ба́тцэ ничо́ґо не ве́дае, каб паґлядзе́ць, што з ґэ́стаґо вы́дзе. Пазира́е е́н; ось жо́нка спекла́ яе́чню, паста́вила на сто́л пля́жку ґаре́лки й ка́жэ: „Пасилку́ўса“. — Што ґэто ты, ба́бо? Хи́бо сеґо́дня свя́то, ци што?—Нѣ, ґэ́то кума́ мнѣ дала́... Вы́пи, не кали́ то́е бу́дзе.— Вы́пиў е́н ча́рак зо́тры ґаре́лки, зъе́ў яе́чню да й вы́цяґса на ла́ве, нибы́то засну́ў. Храпе́, ба́тцэ спиць, а адны́м во́кам пазира́е. Ба́чыць, аж жо́нка у́зела́ вели́зазны но́ж и дава́й его́ вайстры́ць аб пры́пек. — Ну,—ду́мае,—пра́ўду каза́ла паґа́ная ба́ба. — От навайстры́ла жо́нка но́ж, плю́нула тро́йко пад пры́пек так, што аж во́чы чо́рту заплева́ла, и падхо́дзиць к ґаспадару́. То́льки ена́ у́зела́ ґаспадара́ за бо́раду, а той як усхва́цитца, хо́пиць е́ѣ за ко́сы да пачне́ пере́сциць па чо́м папа́ло. Крычы́ць ба́ба на прами́лы Бо́ґ: „лю́дзи до́брые ратуйце!“ А е́н лу́пиць, як Си́дараву казу́. — Ось я табе́, хваре́ць твайму́ ба́цьку да стаґна́ць тваёй ма́церы, ось я табе́ пакажу́, як ґаспадара́ ре́заць!—Чуць не заби́ў дзе́д ба́бу, але́ суседзи пачу́ли крык, збе́ґлиса й абратава́ли. Рад чорт, вы́лез з падпе́чка, праце́р во́чы да то́лько хвосто́м виля́е. И пане́с е́н ба́бе ґро́шы. Прыпе́р це́лы мех. А ба́ба паста́вила у́верх дном вели́зазную бо́чку, праре́зала у́ днѣ дзи́рку, а на ее́ пала-жы́ла дзира́вую ша́пку. Сы́паў, сы́паў чорт у ша́пку ґро́шы — ни я́к не напо́ўниць. Знаў е́н, ґдзе́ у́ земли́ схо́ваны ґро́шы. Палецѣ́ў, прыцѣ́ґ ещэ́ мех. Сы́паў, сы́паў, а ша́пка у́се непо́ўна. Падня́ў е́н тро́хи ша́пку, ба́чыць, аж ба́ба его́ перахитры́ла. Як закмѣ́ў тэе чо́рт, дак и ки́нуўса к ба́бе з кулака́ми. Ухапи́ла ба́ба ви́лы да й ка́жэ: „ну, падле́сь, дак я табе́ атра́зу бе́льма вы́калю“. Спужа́ўса чорт и пераско́чыў цераз пло́т. Ба́ба за им. А чорт ухапи́ў о́жах и абараня́етса.— От,—ка́жэ ба́ба,—пако́ль ты мнѣ зро́биш о́жаґам адну́ дзи́рку, та я табе́ ви́лами дзве́. — Дава́й менятца, — ка́жэ чорт.—Дава́й.—Паменя́лиса ены́ й дава́й би́тца. От ба́ба што пырне́

о́жаґам праз плоўт, та ўсе ў чо́рта пападзе́, а чорт пыра́ў, пыра́ў, да ўсе ви́лы ў пло́це застраю́ць. Ба́чыць чорт, што ничо́ґо з ба́баю не зро́биць, а ена́ еґо́ ско́ро зро́биць як рэ́шато, и дава́й праси́тца.— Го́дзи, ба́бо! Дава́й пами́рымса. Я ещэ́ дам мэ́х ґро́шэй, то́льки скажы́ ты мнэ́, ў чо́м ґэ́то ў баб седзи́ць си́ла. — До́брэ, — ка́жэ ба́ба. Палецэ́ў чорт и па нема́ло́м ча́се чуць пли́щыць мэ́х ґро́шэй. Атда́ў ба́бе ґро́шы да й пыта́е: „ну, ў чо́м ва́ша сила?“ — От у чо́м, — ка́жэ ба́ба. Тут ена́ поднела́ падо́л и паказа́ла чо́рту сваё зэ́лье. У таґо́ аж во́чы на лоп вы́перло. От чорт туды́ да й схаваўса, то́льки падо́л у ба́бы скалыхну́ўса. От з таэ́ пары́ й седзи́ць там у ба́бы чорт. Лю́дзи ўсе выґаня́юць еґо́ аттуль о́жаґам, да не мо́ґуць вы́перци.

Пересказалъ И Аземша.

С. Лучицы.

---

38. Хаўрус.

Налави́ў мужы́к ве́льмо харо́шаэ́ ры́бы и панёс у дво́р к па́ну. Чуць пли́щыць мужы́к ры́бу, а насустре́к бежы́ць жыд. — Сто ты, Янко, несёш? — Ры́бу. — Ну, каму ты её несёш? — Панесу пану ґасцинца, мо́о што дась.—Ну, цу́ес, Янко, вазьми́ мене́ ў хаўру́с.— Хадзэ́м, ка́ли хо́чэш, — ка́жэ Янко. От прыхо́дзяць ены́ ў дво́р к пану. Забэ́ґ мужы́к у пека́рню й разсказа́ў, як прычапи́ўса к ему́ жыд, каб узя́ў еґо́ ў хаўру́с. Пачуў то́е лекай и сказа́ў па́ну. От пазва́ли мужыка́ с жы́дам к пану. Мужы́к стаў упе́рад, а жыд ззаду. — Дзеньдо́бры па́ну! — А цо по́веш, Янко? — Усе, до́брае, пано́чку. — А па до́брум цо? — От прынёс па́ну ґасци́нца рыбы.— До́бжэ, кохан́ку. — А ты, Ицко, цо по́веш? — Я ра́зам, пано́цку.— Як ра́зам?—У хаўру́се, паноцку.—А, ну, то до́бжэ. Цо-ж то́бе даць за ры́ба? — пыта́е пан Янка.— А што па́ньська ля́ска.—Дам то́бе пулко́рца шпани́цы. — Э, дзя́куваць, пано́чку, але й маэ́ дзэ́ци

никóли не ѣ́ли пираґо́ў. На што мнѣ пшани́ца, — ка́жэ мужы́к. А Ицко стайць збо́ку да шту́рхае мужыка́. — Янко, ду́рень, беры́ пшани́ца. — Не́хцэш, — ка́жэ пан. — Ну, то дам то́бе ко́ня. — Э, куды́ мнѣ, пано́чку, паньськи ко́нь. Ещэ́ разтрасе́ маѣ ко́стачки — Музы́к, ду́рень, беры́ каня́, — ше́пчэ Янку Ицко. — Ну, то дам то́бе дзе́сенць ру́бли. — Э, куды́ мнѣ, пано́чку, таки́е ґро́ши. Ещэ хто забье́ Маѣ, й бацькй никóли не мѣ́ли то́лько ґро́шей. — Музы́к, ду́рень, варо́на беры́ ґро́си, — ше́пчэ жыд. — От як закрычы́ць пан, — дак цож я то́бе дам, галган? — Пшани́цы не́хцэш, ко́ня не́хцэш, пене́нзы не́хцэш, так я то́бе дам пендзе́сент бизу́нов! — Дзя́куваць, пано́чку! От ґэ́то бра́ли маѣ́ бацькй й дзѣ́ды. — От павели́ мужыка́ с жыдам на ста́йню, расцеґну́ли й дава́й лупи́ць. Палажы́ли мужыка́ ближе́й. а жы́да да́лей. От хурма́н размахне́тца, размахне́тца, да як смальне́ жы́да, дак таму аж зо́рки з ачу́ пасы́плютца, а па мужыку́ бизуно́м и нераця́ґне. Кру́цитца жыд, як на ґара́чум жалѣ́зе, ла́е да клине́ мужыка́, а Янко раве́ ваўсе ґо́рло, нибы́то ему́ ве́льмо бо́лячо. Атличы́ли жы́ду два́дцать пяць. Усхапи́ўса ен, схваци́ў сваѣ́ плю́ндры да наўцекача́, то́лькы пантопли митусятца. Заплаци́ў пан мужыку́ за ры́бу й ещэ́ даў ґасци́нца. Идзе́ сабѣ́ Янко да лю́лячку паку́рвае; ба́чыць, аж бежы́ць на сустре́к Ицко. — А сто, тра́сца тваёй ма́церы, музы́к, хам, — крычы́ць Ицко, — не хацѣ́ў пшани́ца, не хацѣ́ў конь и ґро́сики не хацѣ́ў, дак от табѣ́ ў сра́ка! — Да й табѣ́-ж ма́быць тро́хи ўсы́шали ў аза́дак. — Сто мнѣ, сто мнѣ? Мене́ то́лько концикам, а цебе́ ўси́м бузуно́м. — Гэ, кали́ хаўру́с, дак хаўру́с. Трэ́э каб было́ парбўну, — ка́жэ Янко, — хадзѣ́м хи́бо ещэ к па́ну. — Падняў ґэ́то Ицко лапсарда́к да як сунуў, дак и канем не дагóниш. Атбѣ́ґса тро́хи й крычы́ць: але́ мене́ то́лько ко́нцикам, а цебе́ ўси́м бузуно́м!..

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы

39. Медзвѣдзь.

Ци вѣдаеце, скуль узя́ўса медзвѣдзь? Медзвѣдзь перш быў таки́-ж са́мы мужы́к, як и ўсѣ мы ґарапа́шники. Даўно́ то́е было́. Людзе́й было́ ма́ло. Гэ́то цепе́р так наро́ду намно́жыласо, што чуць земля́ их паднима́е. Каб не ўмерли, таб небо падперли. А даўне́й лю́дзи жыли́ сям-там па ле́се: лави́ли зве́ра, пту́шак, а ў азе́ра да ў ре́ках — ры́бу. У ле́тку збира́ли я́ґады, ґрыбы́, або́ капа́ли каре́не й запа́сили на зи́му Бо́льш усего́ запа́сили аре́хи й мед. Пчо́л таґды́ было́ баґа́цько. Ены́ са́ми вадзи́лиса у ду́плях и ў земли́ ў но́рах. Па ле́се й цепе́р ещэ́ е пчо́лы ў ду́плях. Их называ́юць слепат. Лю́дзи шука́ли пчо́л у ду́плях, и хто пе́ршы знайшо́ў, таго́ й были́ ты́е пчолы. Ен абвя́зваў то́е дзераво, ґдзе знайшо́ў пчолы й ужэ́ нихто́ не май пра́ва их чапа́ць Але быў адзи́н ґультаева́ты мужы́к. Ему́ не хацѣ́ласо само́му шука́ць пчо́л, дак ен выдзира́ў чужы́е То́лько ця́жко было́ ему ўзла́зиць на дзе́раво. От и пача́ў ен шука́ць тако́ґо калдуна́, каб так удзѣ́яў, штоб легче́й было́ ла́зиць на дзе́раво. За семю́ лѣса́ми да за семю́ балата́ми жыў таки́ калду́н, што ўсе мо́ґ рабіць. Пашо́ў той чалавѣ́к к таму́ калдуну́. Идзе́ ен да йдзе́ лѣсам, ба́чыць—ли́па абвя́зана, ду́мае— пчо́лы Падышо́ў ближе́й, зирне́, аж дупле́ суздро́м ни́зко, а ў ем мед. Вы́драў ен ты́е пчо́лы й пашо́ў да́лей. Ба́чыць друґо́е дзе́раво абвя́зано. Вы́драў ен и ты́е пчо́лы. Падхо́дзиць ен к земля́нцэ таґо́ калдуна́. А калдуна́ нема́ до́ма. Глядзи́ць ен, аж тут-же пры са́мой земля́нцэ ў дзе́раве пчо́лы. Дава́й ґэто ен их драць. Але ось идзе́ калду́н. Зирну́ў калду́н на таґо́ чалавѣ́ка да й ка́жэ: „ну, з ґэстаѣ пары́ й ты, й тваѣ дзѣци, й усе тва́е ко́тло бу́дзеце то́льки пчо́л драць“. И абернў́ў калду́н таґо́ чалавѣ́ка ў медзвѣ́дзя Так от аткуль узя́ўса медзвѣ́дзь.

Пересказалъ Рѣдкій

С. Б Рожинъ

40. Ластаўки.

Даўнéй ещэ земля́ не была́ така́я ґре́шная, як цепе́р. Сам Бо́ґ хадзі́ў па земли́ й учы́ў людзе́й, учы́ў, што лю́дзи ўсе́ браты́ й што ены́ пави́нны й жыць у зґо́дзе, як браты́. Але́ лю́дзи чым да́лей, тым ґаре́й ґрашы́ли й не захаце́ли слу́хаць Бо́ґа. Нашли́са й таки́е лю́дзи, што гавары́ли, што саўси́м Бо́ґа нема́-ш; а як прышо́ў на зе́млю Хрысто́с, дак паґа́ные жыды́ ўзду́мали Ево раскрыжава́ць От зраби́ли ены́ крыж и дава́й кава́ць ґвазды, каб и́ми прыби́ць к кры́жу но́ги й ру́ки Хрыста́. Накава́ли ены́ ґваздо́ў и ўжэ́ хаце́ли прыби́ць Хрыста́; але́ тым ча́сам прылеце́ли ла́стаўки й расхапа́ли ўсе́ ты́е ґвазды. Жыды́ ў дру́ґае накава́ли ґваздо́ў це́лую ку́чу. Зноў налеце́ло ла́ставак, бы це́мная хма́ра, й расхапа́ли ены́ ты́е ґвазды́ У тре́йци раз накава́ли жыды́ ґваздо́ў. От падлеце́ли ла́стаўки, ка́б расхапа́ць ты́е ґвазды́, але́ им Бо́ґ веле́ў не чапа́ць. Паднели́са ла́стаўки высо́ко, высо́ко к не́бу й паднели́ таки́ плач и крык, што Бо́ґ зжа́лиўса над и́ми й сказа́ў им, што за то́е, што ены́ разбира́ли ґвазды́, нихто́ з людзе́й нико́ли не бу́дзе их чапа́ць. С тае́ пары́ ла́стаўки сме́ло жыву́ць и ро́бляць свае́ ґнезде́чка пад стре́хами, й нихто́ их не чапа́е. А ча́сам и да ґэ́тае́ пары́ узлета́юць ла́стаўки высо́ко, высо́ко к не́бу й крыча́ць, пла́чуць, сва́ратца з Бо́гам, на што Ен непазво́лиў им расхапа́ць ґвазды́, й паґа́ные жыды́ и́ми прыби́ли Хрыста́ к кры́жу. От чаму́ ґрэ́х чапа́ць ла́ставак, бо ґэ́то бо́жая пту́шка.

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б. Рожинъ.

41. Цыган.

Прычапи́ўса к мужыку́ цыга́н.—Дай мнѣ, ба́тю, са́ла; дай ме́ду; дай круп. — Берэ́ цыга́н у мужыка́ ўсе, што ни ўба́чыць. Нѣльга аткаса́тца ат цыгана́, сле́пням у во́чы лѣзе.—Нема́ ў мене́ са́ла,—ка́жэ мужы́к, — нема́ ни ме́ду, ни круп. От хиба́ кали́ ўжэ ты так пражэ́шса лизнуць ме́ду, та хадзѣм ткале́ падгля́даць пчо́лы.—Хадзѣм, хадзѣм, ба́тю! — ка́жэ цыга́н. Узя́ў мужы́к ли́паўку й зу́бленку, й пашли ены́ з цыганóм у лѣс. Со́нейко стаяло на паўдни́ Печэ́, як у пе́чы.—Ото́-ж сма́лиць,—ка́жэ мужы́к,—и дава́й падо́лам саро́чки выцира́ть лы́сину. От падышли ены́ к ду́бу. На ду́бе высо́ко ўсця́гнуты у́лей. Мужы́к прыставиў астро́гу.—Ну, лѣзь,—ка́жэ цыга́ну́, — падгля́дваць пчо́лы. — Палѣз цыга́н. Узабра́ўса к у́лью, прывеза́ў себе́ поясам к ра́лу й дава́й атчыня́ць до́ўжень. Тольки е́н прыатчыни́ў, а аттуль як вы́сыплюць шаршне́ да пачну́ць цыгана́ пекци́: кру́цитца цыга́н, бы вьюн у га́ршку́. — Ба́тю, пада́й тэе!—крычы́ць мужыку́. Мужы́к узя́ў липаўку й хо́чэ лѣзци па астро́зе.—Нѣ! пада́й тээ!—Мужы́к узя́ўса за сакѣ́ру.—Нѣ, батю, пада́й тэе!—нѣмым го́ласам крычы́ць цыга́н. А тут шаршне́ ре́жуць его́, бы нажэ́м. — Ба́тю, жыў не бу́ду, — крычыць цыга́н, — пада́й тэе!—Ен хацѣ́ў каб мужы́к скаре́й пада́ў зу́бленку, але́ забы́ўса, як ена́ называ́етса. — А чарты́ цебе́ вѣдаюць, — ка́жэ мужы́к, — што табѣ́ трээ, — й узя́ўса за зу́бленку. — Тээ, тэ... — кры́кнуў цыга́н и гры-ману́ўса далбу́, чуць печанцы́ сабѣ́ не атсадзи́ў. Наси́лу ачу́хаўса цыга́н. Але́ як мину́ласа бо́ль, та й забы́ласа, й цыга́н астаўса цыганóм: што ўба́чыць, то́е й ця́гне, а кали́ не даю́ць, та сле́пням у во́чы лѣзе.

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б. Рожинъ.

42. Пŏп.

Быў адзи́н пŏп, да таки́ паґа́ны, што як его́ й земля́ наси́ла. Про́сто драў з людзе́й шку́ру. А да баб быў таки́ па́дкі, што не́маль уси́х маладзи́ц перапро́бываў Ужэ́ збира́лиса дзецюки́ абстры́ґци ему́ ко́су, да паперабива́ць но́ґи, але́ бая́лиса ґраху́. Жыў у тŏм селе́ хло́пец, сирата́, але́ ве́льми ўда́лы, да ўсего́ зда́тны. Перш ен слу́жыў, па́рабкам, а по́тым зарабі́ў гро́шэй, пабудава́ў сабе́ ха́ту й заве́ў хаджа́йство. Але́, ве́дамо, што ґумно́ пла́чэ без ґаспадара́, а ха́та без ґаспады́ни. Так и ему́ ке́пенько без ґаспады́ни. От дава́й ен сва́таць сабе́ дзе́ўку. Вы́браў сабе́ са́мую ґо́жую дзе́ўку, а на ве́шняґо Мико́лу ены́ й пабра́лиса. Жыву́ць Се́мко з Матру́наю да Бо́ґа хва́ляць. Матру́на ещэ́ пахарашела. Уба́чыў е́ пŏп—и нижы́ў. трасе́тца, бы аси́на, але́ ничо́ґе не зро́биць, бо Матру́на вельми лю́биць свайґо́ Се́мка. Але́ ось пе́рад дзися́тухаю вы́ладзила Матру́на свайґо́ Се́мка ў бало́то рабі́ць се́но Ена́ й сама́ хаце́ла е́хаць з им, але́ ен ка́жэ, што нема́ каму́ аста́тца ў дамŏ́ўцэ. Пае́хаў Се́мко адзи́н на це́лых дзве́ недзе́ли. Аста́ла́са Матру́на адна́. Су́мно е́й аднŏ́й У дзень ещэ́ ничаґу́сьсенько, а пры́дзе нŏчка—седзи́ць Матру́на да пла́чэ От даў Бŏґ недзе́льку. Даґле́дзела Матру́на ґаспада́рку, се́ла але́ акна́, пазира́е на заґуме́чэ, як там дзе́ўки з хло́пцами жарту́юць, смею́тца, пе́сни паю́ць, а са́мŏй так але́ серца й завило́: апанава́ў таки́ жаль, што не мо́жэ вы́трымаць — седзи́ць и пла́чэ. Але́ ось идзе́ пŏп и пыта́е, чаґо́ ена́ пла́чэ. — Так, ба́цюшко, з до́браго ра́ю, — ка́жэ Матру́на. Пŏп зайшо́ў у ха́ту, разсе́ўса на ла́ве, пазира́е на Матру́ну да ўсе́ кива́е ґалаво́ю.—Што ґэ́то—ка́а—Се́мко нарабий?! Што-ж ґэто бу́дзе?! — Спужа́ласа Матру́на, а пŏп ка́жэ: „Як же ґэ́то мŏжна? Гэ́то-ж Се́мко недарабі́ў дзиця́, ґэ́то-ж ено́ бу́дзе без ґалавы́“. Што-ж тут рабі́ць, ба́цюшко? — пыта́е Матру́на. — Што рабі́ць... Хи́бо ось я памалю́са да дараблю́ табе́ дзиця́.—И пача́ў пŏп мали́тца да дзиця́ дарабляць да так захадзи́уса, што Матру́на аж пачала́ крыча́ць. Здаво́лиўса пŏп и пашо́ў да

ґаспо́ды. Тым ча́сам зыска́ўса да ґаспо́ды Се́мко, а Матру́на й навали́ласа на еґо́, што ґэто́ ён нарабі́ў. — До́брэ—ка́жэ—што по́п дарабі́ў дзиця, а то было-б без ґалавы́.—Даґада́ўса Се́мко, як по́п накпі́ў над еґо́ жо́нкаю й дава́й ён ду́маць, я́к-бы замсці́тца пацу́. Ко́нчыласо ле́то. Узяли́са лю́дзи се́яць жыто. Ба́чыць раз Семко, што по́п на аґаро́дзе бера́ кано́пли; падхо́дзиць ён ближе́й и про́сиць пажы́чыць бо́рану. —До́брэ,—ка́жэ по́п,—вазьми́ хаць абе́дзьве. Онь у паве́ци стаяць бо́раны. Там кале́ свиро́нка, мабыць, мату́ля з пане́нкаю мак бьюць. Скажы́ им, неха́й дадуць абе́дзьве бараны́. Прышо́ў Се́мко к пападзи́ да й ка́жэ: „мату́лько, веле́ў ба́цюшко, каб вы й пане́нка дали́ мне́ обе́дзьве“.—Што ты ґаво́рыш,—ка́жэ пападзя́,—не мо́жэ ґэто быць?! — Папыта́йцеса ў ба́цюшки,—ка́жэ Се́мко. Пападзя́ ки́нула пра́ник, падышла́ к пло́ту й пыта́е папа́: „а ци даць Се́мку?“—Да́йце, да́йце,—ка́жэ по́п,—да́йте обе́дзьве.— А што́? я каза́ў. — Ничо́го не зро́биш,—тре́ба ба́цюшки слу́хаць.— Павели́ ґэто ены́ Се́мка ў свиро́нак и дали́ обе́дзьве: перш пападзя́, а по́тым—пападзя́нка. Пападзя́-ж ничаґу́сьсенько, на́вет ве́льми дабо́лна, — спадабала́со, а пападзя́нка таки́ аж заплака́ла, не хаце́ла дава́ць Се́мку. Ма́быць у є́е́ бы́ў яки́сь сво́й пани́ч. Спра́виўса Се́мко да й пашо́ў да ґаспо́ды. Седзи́ць пападзя́ з дачко́ю, маўча́ць: со́рам им адна́ другі́й у во́чы зирну́ць. Ось прыхо́дзиць по́п. Не ўспе́ў ён пераступи́ць це́раз парі́ґ, як на еґо́ наки́нуласа пападзя, як жыды́ на ґа́мана, крычы́ць: сяки́, таки, ты! Неха́й то ужэ́ мене́ зневажыў, дак што́-ж ты сказа́ў, каб ещэ́ й Ма́ша дала́. Тут по́п даґада́ўса, што еґо́ Се́мко падману́ў, праси́ў баро́н, а ўзя́ў жо́нку й дачку́ й рабі́ў з и́ми, што сам хаце́ў. Злу́е по́п, як сам себе́ за сра́ку не ўку́сиць, але́ ўжэ́ ничо́го не зро́биць От на другі́ дзень, сустрака́е ён Семка, параўня́ўса й ка́жэ: „Дзеньдо́бры, Се́мко. баро́н пазыча́ўшы!“ А Се́мко: —дзеньдо́бры, ба́цюшко, дзеце́й дарабля́ўшы.—Прыкуси́ў по́п язы́к и пасу́нуў да́лей.

Пересказалъ Яковъ Керножицкій.

Сел. Бѣлое Болото.

43. Вельми навучны.

Жыў сабе́ жыд сла́ўны да гу́чны да ве́льми наву́чны Ен ничо́го не гля́дзе́ў, то́льки на би́бли седзе́ў, бо таки́ ро́зум маў, што й на све́т не пазира́ў; на земли́ й пад земле́ю ўсе ба́чыў, усе́ знаў и нико́го не пыта́ў. Раз мужы́к падня́ў драби́ны да й паста́віў их к страсе́. Ду́маў, як жыды́ наву́чнаго рабе́я там абсту́пяць, та с страхи́ йгруш е́н натрасе́. Да жыды́ ўба́чыли драби́ны, а на их дзи́ўнае дзи́во: над страхо́ю верх драби́н каро́ва абмара́ла. Жыды́ ду́мали, ду́мали, судзи́ли да к тако́му дзи́ву ро́зуму не прылажы́ли. До́ўго гергетали да й па ве́льми наву́чнаго пасла́ли. Падышо́ў е́н пад драби́ны, прыци́с к илбу́ па́лец и стайць, мыслю́е. А тым ча́сам све́рху све́жы гно́й цечэ́ з страхи́ да до́лу да й якра́з наву́чнаму на мо́рду. Тут е́н цы́цальникам уце́р тро́хи мо́рду да й прамо́виў слово, да тако́е сло́во, што аж пах пашо́ў. Жыды́ слу́хаюць уша́ми, нюхаюць наса́ми. А круго́м той за́пах хо́дзиць, бы ў хлеве́ весно́ю. От сказа́ў той жыд ве́льми наву́чны: „каро́ва стала на лоб, уперласа на ро́ги, а хвосто́м све́рху закруци́ласа да й намара́ла на драби́ны“. Жыды́ пацмо́кали, пакива́ли галава́ми да й павели́ пад ру́ки ве́льми наву́чнаго рабе́я ў ха́ту. Идзе́ рабе́й и но́г не пады-ма́е, то́льки шмы́гае панто́плями. „Ой, яки-ж е́н разу́мны, яки-ж е́н письме́нны“—ка́жуць жыды́. Тым ча́сам рабе́й залезе́ панто́плями ў са́мую ку́чу. Тут пашо́ў ещэ́ ле́пш таки́ пах, што й жыды́ насы́ пазатыка́ли.—Ой, яки е́н наву́чны, яки е́н разу́мны!.. Гэ́то е́н зраби́ў, каб паказа́ць, што мы про́циў его́—пфэ!—Тут падышо́ў мужы́к, ен паглядзе́ў, паслу́хаў да й ка́жэ: „Парху́цьки вы, парху́цьки пага́ные, ра́зам з сваим рабе́ям! Ен таки́ письме́нны таки́ наву́чны таки́ разу́мны, што за ро́зумам и све́ту не ба́чыць“.

Пересказалъ И. Аземша.

С Лучицы.

44. Мудры Салимон.

Не было́ на све́це разумне́й чалаве́ка, як Му́дры Салимо́н. Салимо́н знаў усе́, што ро́бится на не́бе и ў земли́, знаў зачы́м и дзеля чаго́ усе́ на све́це так, як е. То́лько трох ре́чэй не знаў Салимо́н, гэто—на што на све́це павў́к, гад и блаха (скочка). И ду́маў Салимо́н, што Бо́г абманў́ўса й сатвары́ў павука́, га́да й ско́чку, а што ены́ на све́це не патрэ́бны.

Але ось у ца́рстве Му́драго Салимо́на бы́ў мецне́ж. Салимо́н сабра́ў во́йсько и пашо́ў на мецне́жникаў, але́ к тым падышо́ў не́приятель. Во́йська ў его́, як це́мная хма́ра. Би́ўса, би́ўса Салимо́н,—ничо́го не зро́бить: его́ во́йсько кладзе́тца, бы трава́ пад коса́ю. Ба́чыць Салимо́н, што прышла́ беда́, ки́нуў ён во́йсько, а сам пабе́г у го́ры. Ба́чыць не́прыяцель, што Салимо́н уцёк у го́ры й паго́наўса за им. Бе́г, бе́г Салимо́н, спатыка́етца, задыха́ўса, да́лей бе́гци не мо́жэ; от и залезе́ ен у печо́ру. Седзи́ць там, дрыжы́ць,—баи́тца, каб не́прыяцель не закме́ў его́ ў печо́ры. Тым ча́сам павў́к дава́й нацяго́ваць свае́ павуце́не ў праходзе ў печо́ру. Ду́хам сплёў павў́к павуце́не да й чака́е, паку́ль прылеци́ць му́ха. Падбе́г не́прыяцель к печо́ры, ба́чыць, што там павуце́не — не́, — ду́мае.— тут нема́ нико́го даўно, бо ўжэ павў́к зацяго́ў павуце́не,— й пабе́г да́лей. Праждаў Салимо́н, паку́ль прабе́г не́прыяцель, вылез з печо́ры й пашо́ў да́лей. Идзе́ ён да йдзе, ўтами́ўса й ле́г атды́хаць. Ле́г и засну́ў. Спиць Салимо́н, не чу́е, што не́прыяцель ужэ́ саўси́м бли́зко падышо́ў. От, от уба́чыць не́прыяцель Салимо́на й забъе́ его́. То́лько ось ско́чка вельми мо́цно ўкуси́ла Салимо́на за са́мае балю́чае ме́йсцо. Салимо́н прахапи́ўса ат бо́ли. Чу́е, аж не́прыяцель бли́зко, бежы́ць, аж земля́ сто́гне. Усхапи́ўса Салимо́н да як пу́сцитца наўцекача́,—то́льки его́ й ба́чыли. Уцёк Салимо́н, а не́прыяцель усе́ таки́ бежы́ць за им. Бе́г, бе́г Салимо́н, спатыкну́ўса й пакаци́ўса з гары́ ў до́л. Усхапи́ўса Салимо́н, пабе́г да́лей. Ба́чыць

ён, аж у дали́не то́лько ґа́ду. што аж кишы́ць. Хуце́нько прабе́ґ Салимо́н, то́лько раздранжи́ў ґадзю́к, але ены́ не ўкуси́ли. Тут сле́дам за Салимо́нам бежы́ць не́прыяцель. То́лко ен су́нуўса ў дали́ну, а тут як нападу́ць на ево́ сердзи́тые ґадзю́ки, дак ён и зви́ўса ат бо́ли. Ба́чыць Салимо́н, што не́прыяцелю прышли́ капцы́, вернуўса ў сваё ца́рство й зно́ў пача́ў ца́рствуваць. С таго́ пары́ Салимо́н даґада́ўса, на што Бо́ґ сатвары́ў павука́, ґа́да й ско́чку, даґада́ўса, што ён и Му́дры Салимо́н, а бо́скаґ мо́цы не зна́е. Даґада́ўса, што ўсе на све́це патрэ́бно, бо све́т не мо́жэ стая́ць, кали-б не было́ й таґо, што нам здае́тца лихи́м. Пра́ўду ка́жуць, што бе: ли́ха нема́ й добра́.

Пересказалъ Ив. Аземша.

С Лучицы

45. Писар.

Быў адзи́н лихи́ пан Ця́жко пад им жыло́со лю́дзям: це́лы ты́дзень хадзи́ на па́ньщыну, а што зро́биш у недзе́льку, й то́е атда́й па́ну. Та ему́ дава́й су́шаных ґрыбо́ў, та назбира́й рыжко́ў, та я́ґад—усе́ ему́ тре́э. Даўне́й, як дасць Бо́ґ зи́му, це́лы або́з хурма́нак пли́щаць уселя́кае добро́ ў ме́сто, або́ ў други́ дво́р. Само́ґо па́на не́маль нико́ли не бачно́ было́, бо ён усе́ е́здзиў заґрани́цу, ци ў Арша́ву. Раз до́ўґо па́на не было́ ў дваре́, й пашла́ чу́тка, што пан суздро́м не ве́рнетца, што ён прада́ў маентак яко́мусь друґо́му па́ну. Хто их там ве́дае, мо́о й пра́ўда, — ка́жуць, ба́тцэ той пан за па́ру заґрани́чных ко́ней и пето́к яки́х-сь саба́к атда́ў увесь маентак с людзьми́. Але́ ось па немало́м ча́се прие́хаў но́вы пан. Сабрала́са ґрума́да й дава́й ра́дзиться, як тут да́лей жыць, ве́льми-ж ця́жко было́ жыць пад тым па́нам, ци не мо́жна упраси́ць но́ваґо па́на, каб ён тро́хи зба́виў па́ньщыну да пада́тки. Ра́дзиласа, ра́дзиласа ґрума́да й прыґаварыла прасиць но́ваґо па́на, а каб усе́ до́брэ сказа́ць—ве́дамо, мужы́к це́мны, не ска́жэ, як тре́э—

прыґаварыли написáць пáну ўсе на папе́ры. Але́ як жэ тут написáць, калі́ нихто́ не ўме́е. Карбавáдь еныі ещэ дóбрэ ўме́юць, але́ писáць,—ани ў зуб. Прачу́ли еныі, што ў местэ́чку е якíсь пьянчу́жка пíсар и што е́н уме́е ве́льми дóбрэ писáць. Пíшэ дрóбно, бы мáкам сы́пле, а ґдзе́ трэ—кру́ґло, бы я́йца й так накру́цыць, што тóлько ве́льми письме́нны бáчыць, што там напíсано. От прывезлí еныі таґо́ пíсара, пастáвили ему́ квáрту ґаре́лки й прóсяць, чапку́юць, каб е́н ужэ́ дóбрэ написáў пáну. Тóлько пíсар це́лы тыдзень пиў да ѣ́ў я́ечни, а писáць не брáўса.—Трэ́э ўперóд нажэ́ндзе—кáжэ пíсар. Папе́ру áркуш хлóпцы купи́ли ў местэ́чку ў крóмцэ. Тым чáсам пíсар велѣ́ў назбираць дубóвых аре́шкаў да насушы́ць их, а сам пашоў у ку́зню. набráў там с пад тачы́ла вады́, налíў е́ѣ ў ґарщóк, насы́паў туды́ дубóвых аре́шкаў и пастáвиў ґарщóк на пѣч Праз тры дни ўзяў е́н той ґарщóк, аж там атрáмант, чóрны, бы сажа. От нанеслí ґэ́то пíсару су сеґó селá ґусíнаґо пе́рья. Нарабíў е́н сабе́ це́лы пук пе́рьеў.—Ну,—кáжэ,—цепе́р давáйце ещэ́ ґаре́лки, каб леґчэ́й рукá хадзíла. Далí ему́ ґаре́лки. Пíсар вы́пиў с паўквáрты, аґурко́м закусíў и давáй писáць. Сышлáса ґрумáда людзе́й. Адзíн кáжэ: „напишы́, каб пан даў на дым па пяцí кóп жэ́рдзя на плóт“.—Пишы́, каб пан збáвиў падáтки—кáжэ друґí. Мнóґо ґаварылí мужыкí пíсару. каб е́н писáў. А е́н паця́ґне з пляжки ґаре́лки да так пíшэ, што перó скрыпíць, бы не мáзаные калéса Пíшэ пíсар, аж пóт на йлбу выступиў, бáтцэ не перóм, а сакéраю дрóва пляжыць. А лоб у еґó велíзазны, й ґалавá ґóлая, хаць бóб малацí. Написáў пíсар. Мужыкí пастáвили крыжы́ й дзя́кующь пíсару. Сабрáли ему́ су сеґó селá курэ́й, яе́ц, арéхаў, мéду, сáла,—хто што мѣ́ў. Паѣхаў сабе́ пíсар да ґаспóды, а мужыкí сабрáлиса й ґуртóм пашлí к пáну. Вы́шаў пан на ґáнак и пытáе, чаґо́ еныі прышлí. Мужыкí целю́х пáну ў ноґи й падаю́ць прашэ́не. Узя́ў пан у ру́ки папе́р, перачытáў и кáжэ: „дзя́куй ваш хлóпцы, што вы мнѣ даецé з ды́му на валу́, па капе́ яе́ц и па асьмíне аўсá“. Пераґля́дваютца **му-**

жыкі́, наси́лу разшало́пали, што ґэ́то пан ка́жэ. Доґада́лиса ены́, што пи́сар их абману́ў, але́ ничо́ґо не зро́биш,—трэ́э атда́ць па́ну, што написа́ли. Пашли́ мужыки да ґаспо́ды, аж ку́длы дзеру́ць, так им шко́да добра́. Иду́ць, а адзи́н и ка́жэ „э, хваре́ць ва́шуй ма тары, падвели́ й мене́. Я таґды́ знаў, што е́н пи́шэ. Ба́чу — пи́шэ вели́кае да й закру́уиць. Ну, ду́маю, ґэ́то валы́ крутаро́ґне. Пи́шэ кру́ґлае. От ґэто вам я́йца, а дро́бнае—от вам авес". — Чаму́ж ты таґды́ не каза́ў?—Крыча́ць мужыки́, й дава́й его́ лупцава́ць. Паби́лиса мужыки́, пабо́жкали й пашли́ збира́ць па́ну аўес и я́йца

Пересказалъ И. Аземша

С. Лучицы.

---

46. Дзеды.

Стары, як малы Усѣ людзи на старасци дзецинеюць. И сабака на старасци не брэшэ. Пастарэ́ў, та й сапсѣ̀ў.
Прыказки.

Вѣ́дамо, ў са́мае жни́во ўсѣ́ пашли́ на рабо́ту; асталиса ў селѣ́ то́лько стары́е, да малы́е. Малы́е перасыпа́юць песо́чак, або́ з его́ ала́дки пеку́ць, ци я́мачки капа́юць, а стары́е седзя́ць ў кажушко́х на пры́збах да ґре́ютца на со́нейку, бо вѣ́дамо, на ста́расци дак и ў лѣ́тку хо́ладно.

От вы́сунулиса сабѣ́ два старэ́нькие дзеды́-сусѣ́дзи, ґре́ютца на со́нейку да ґледзя́ць, як дзѣ́ци ґуля́юць. Напры́крало им седзѣ́ць без рабо́ты, от адзи́н и ка́жэ,—паведо́м ко́ней на па́шу.—До́брэ,—ка́жэ другі́,—то́лько дава́й мы бу́дзем ґавары́ць, бы дзѣ́ци, мо́во ещэ́ й памаладзѣ́ем.—До́бле—ка́жэ другі́ дзѣ́д. Узели́ ены́ ко́ней, вы́вели за село́ ў хмы́зник и пусци́ли на па́шу, а са́ми сѣ́ли й дава́й перасыпа́ць песоча́к. — Дай зло́бим жы́жу.—Зло́бим да спеко́м я́ценьку.—До́бле, спеко́м. Накла́ли ены́ аґню́ й дава́й пекци́ я́чню. Спекла́са я́чня. От адзи́н и ка́жэ: „збѣ́ґай ты, паґлядзи́, ґдзѣ́ ко́си". Пэбѣ́ґ адзи́н дзѣ́д за кусты́, ґлядзѣ́ць ко́ней, а другі́ тым ча́сам и

ззе́ў яе́чню. Прыхо́дзиць по́тым той и пыта́е: „а ґдзе́-ж яе́ценька?“— Зи́жа ззе́ла—ка́жэ друґи́ дзе́д. Прамаўча́ў той, а по́тым ка́жэ: збе́ґай, паґлядзи́, ґдзе́ ко́си.—Друґи́ дзе́д ски́нуў сво́й кажу́х и паце́ґса за кусты́ ґлядзе́ць ко́ней. Гэ́ты дзе́д тым ча́сам уски́нуў кажу́х друго́го дзе́да на аґо́нь и дро́ў падлажы́ў. Зґаре́ў кажу́х, як перо́. Прыхо́дзиць той дзе́д и пыта́е: „а ґдзе́-ж мо́й казусо́к?“— Зи́жа ззе́ла—ка́жэ дзе́д. Тут дава́й ены́ ту́затца за каўтуны́ да ла́ятца на чо́м свет стаи́ць. Забы́лиса, што й ґаварылн, бы дзе́ци. Пабили́са дзеды́ й пашли́ на суд. Су́дзьи пыта́юць, за што ены́ би́лиса Раска́зваюць дзе́ды́, як было́. Адзи́н ка́жэ, што друґи́ дзе́д спалиў его́ кажу́х.—Кали́ ж то́е было́?—Пыта́е друґи́.—Хиба́ ж ты не памета́еш? А як мы ещэ гаварыли, бы дзе́ци.—Як жэ то́е было́—пыта́юць судзьи.—От перасыпа́ли,—ка́жэ дзе́д,—мы песо́чак, а по́тым зраби́ли жы́жу й дава́й пекци́ яе́ченьку. Спекли́ яе́ченьку: я пашо́ў паґледзе́ць ко́ней, а е́н ски́нуў мо́й кажу́х на аґо́нь и ка́жэ, што его́ жы́жа ззе́ла.—Пасмея́лиса судзьи, што дзеды́ здзеци́нели й на ста́расци уздумали аб то́м судзи́тца, што ещэ таґды́ было́, як ены́ ґаварыли́, бы дзе́ци.— Идзе́це вы, старэ́нькие за пе́ч да седзе́це там ци́хенько—ка́жуць судзьи. Так ничо́ґо й не пара́дзили дзеды́. не слу́хаюць их да й то́лько.

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы.

47. Мужык и Пан.

Бы́ў сабе́ адзи́н пан да таки́ паґа́ны, зло́сны, што про́сто беда́. Нихто́ не мо́ґ ему ўґадзи́ць. Усе́ его́ бая́лиса, бы чо́рта. Быва́ло як пры́дзе к ему́ хто чаґо́ ко́львек прасиць, а е́н раптоўне й кры́кне: „што ска́жэш?“—Той ка́а: „ўсе́ до́брае, пано́чку“,—а сам дрыжы́ць, бы аси́на.—А па до́брум што? —Закрычы́ць пан.—На канюшню его́ галгана.—От так не дась и сло́ва прамо́виць. Ина́чей е́н и не

ўмѣў з людзьмі ґаварыць. И баялиса-ж людзи ґаварыць таму пану, што нибуць кепскае, не пад ґумар, — засечэ, ўсю шкуру зніме, калі хто не патрапиць сказаць ему так, як ен хочэ, а скажэ не па шэрсци. Толькі быў адзин нехлемяжы мужычок, дражнили ево Стопкам, той умѣў з тым панам ґаварыць. От раз той пан иґраў у карты да й выиґраў вельми харошы маентак. Ог ґэтак весною, калі Миколы паехаў пан аглядаць той маентак да й астаўса там на ўсе лѣто. Бачыш, ему вельми спадабаўса той маентак. Праўду-ж кажуць, што новае ситко на калочку висиць, а старое над лаваю лежыць. Бачыць акамон, што доўго немаш пана, а тут у дварі беда на бездзѣ ѣдзе да й бедою паґаняе, от ен стаў думаць, як бы завѣдамиць пана. Думаў-думаў да й надумаўса паслаць к пану пасланца. Толькі не вѣдае, каго паслаць, каб ен добрэ расказаў пану пра ўсе нещасце. Каго ен ни пашле, ўсѣ не слухаюць,—баятца пана, каб за праўду не засек. Абецаў ен велики ґасцинец таму, хто пойдзе к пану. Перабраў усе село—нема ахвотника. Не знае акамон, што рабиць,— седзиць да ломиць руки. Прачуў пра тое Стопак, пашоў к акамону й кажэ: „я пайду к пану й усе ему скажу; я умѣю, як з им ґаварыць“. Рад акамон, чуць не целуе Стопка. От акамон даў Стопку целую жменю ґрошэй, чобаты с сваих ног и пасылае ево к пану ў новы маентак. Идзе Стопак и ни аднаѣ карчмы не минае. Ци доўго ен ишоў, ци мало, толькі ось прышоў у новы двор. Падходзиць к покоям, аж там сустракае ево лекай.—Ты чаго тут шляешса, валацуга! — крыкнуў лекай на Стопка й давай ево цкаваць сабаками. Стопак дастаў з верэньки кусок сала й кинуў ево сабакам. Сабаки годзи брахаць. Тым часам Стопак узышоў на ганак.—Што табѣ трэба?—Пытае лекай у другае. — Мнѣ трээ бачытца з панам, — кажэ Стопак. — Прышоў я, паночку, з стараго паньскаго двара.—Добрэ,—кажэ лекай,—я скажу пану аб табѣ, але скажы-ж ты мнѣ, аткуль ты знаеш, што я пан?—Атуль знаю—бачу. Ты пан—не пан, а так сабѣ—палупанак, бо ў цебѣ нос низки, лоп слизки, от и бачно, што лизаў паньские

палумíски.—Хацéў тут лéкай ухваціць Стóпка за каўтуны́ да, як ка́жуць, паслáць егó з валасяно́го апраўлéня да ў зéмьськи суд, алé тут як раз лéкая пазвáў к сабé пан.—Яки там хлоп?—пытáе лéкая пан. — То послáны от пáни з пáньськаго маéнтку, — кажэ лéкай —А пóзваць éго до крадэ́нсу.—Пабéг лéкай зваць Стóпка к пану. А Стóпак тым чáсам дастáў капшýк, напхáў у лю́льку цюцюнý, вы́няў з маґалéйки ґýбку й краменéц, узя́ў цаґалó й давáй красáць аґóнь. От вы́красаў ен аґню́ й давай кýры́ць лю́лячку, кýрыць сабé да паплéўвае на чы́сты памóст — Идзи́, — небé пан завé,—ка́жэ лекай.—Не трáсца трасé. нехáй абажджэ́,—ка́жэ Стóпак и пакýрвае сабé лю́лячку — Прандзэ́й пдзи́! - · Зáраз, зáраз, тóлько лю́льку дакурý.—Ждáў, ждáў пан Стóпка -не даждáўса. Гóниць у друґае лекая па Стóпка. А Стóпак аґинáетца да шавéлитца, бы мóкрае ґары́ць. От ён дакуры́ў лю́льку, вы́биў з ея́ пóпел и схавáў за пáзуху, й тóлько таґды́ памалéньку пасýнуўса к пáну ў крэ́данс. Лéкай, бы сабáка, бежы́ць па пéрадзе да атчыня́е дзвéры. От улéз Стóпак к пáну ў крэ́данс да й закáшляўса. Рыґáе Стóпак, а пан чакáе да тóлькы вýсы крýціць.—Дзеньдóбры, панóчку!—А цо нóвеш?—пытáетца пан.--Усé дóбрае, панóчку.—А па дóбрум цо?—Да от, панóчку, менé прыслáў акамóн . Пáньськи сцизóрык зламáўса.—Яки́ сцизóрык?—Да ґэ́то-ж, мáбыць, той, што пáну пéрья рабíли.—Як жэ́ éго зламáли?—Ка́жуць жэ́, пáне, што без нажэ́ндзя й вóшы не забьéш. Алé ўселя́кае нажэ́ндзе пры рабóце псуéтца. От так и пáньськи сцизóрык. Хацéли пáну на бóты злупíць з вы́жла шкýру. узели́ сцизóрык.. Алé на пáньськум вы́жлу вéльми-ж мóцная шкýра... Сцизóрык и зламáўса.—Якéго вы́жла? Цо ты плéцеш, гáлган!—Пáньськи вы́жал; той сáмы, мóжэ пан паметáе, ён ещэ́ ўскóчыў у калóдзесь, а Микíту послáли даставáць да ён и ўтапиўса там. Эґэ́ ж, той сáмы вы́жал, што пан любиў егó браць на палеванé. Э-ж, дай Бóжэ пáмець, здаéтца мнé, што пан атдáў за таґó вы́жла сусéдняму пáну трох мужыкóў.—Цо ж, мóй вы́жэл здэх?—Здох, пáне.—З чэго-ш он здэх?—Ка́жуць, панóчку, быў здарóў,

але́ як кани́ны абъе́ўса, дак ра́зам и но́ґи вы́пруциў. — Якей кони́ны?—Да мьяса-ж жарабца́.—Яке́го жжэ́бца?—Па́ньскаґо-ж була́наґо жарабца́, з лы́синкаю. — Цо ж, и он здэх? Здох, пано́чку. А шко́да—до́бры быў жарабе́ц. — Я несченсли́вы! — Э, па́не, чаґо́ ве́льми турбава́тца? Ужэ-ш ве́дамо, кали́ жарабьятко ўро́дзитца з лы́синкаю, та ено́ ци здо́хне, ци еґо́ воўк зъе́сць.—З чэ́го-ш жжэ́бец здэх?— Падарва́ўса, ма́быць.— Цо-ж на ним роби́ли? Пра́нтко ездзи́ли, чы со?—Нѣ, па́не, на е́м не ѣздзили: за́ўжды е́н стаяў на ста́йни. — А цо-ж? — Во́ду, па́не, вази́ли. — Але-ж на́ цо бы́ла та во́да?—Лю́дзи-ж ка́жуць, пано́чку, што як то́пишса, та й за брытву хо́пишса. От як заґаре́ўса ў двары свину́х, дак акамо́н велѣў и на жарабцу́ во́ду вази́ць.—Цо-ж и свину́х спа́лилсе?—Зґаре́ў, пано́чку.—Як-жэ он запа́лилсе?—Ба́чыж, па́не, е́н быў бли́зко але́ або́ры, от ат еѣ й заґаре́ўса.—То й або́ра пали́ла сен?—Гаре́ла, пане, як свѣ́чка.—С чэ́го-ж она запали́ласен?—От ґэ́таґо, пано́чку, до́брэ не ве́даю, ци ат або́зни, ци мо́о ат пако́яў.—Езус Ма́рья! то й поко́н спали́лы сен?— Зґаре́ли, па́не, суздро́м усе змо́кло. от як-бы хто языко́м злиза́ў.—И вшы́стэк дво́р спа́лил сен?—Уве́сь, па́не: чысто, ґла́дко, хаць рѣпу сѣ́й.—Ухвациўса тут пан за го́лаў и дава́й бо́жкаць.—Але́ з чэ́го-ш запали́лы сен поко́и,—пыта́е зноў пан Сто́пка.—Ат свѣ́чак, па́не,—ка́жэ Сто́пак.—Для чэ́го-ж пали́лы свѣ́цы?—Ну, як-жэ, па́не? Ве́дамо, заўсю́ды свѣ́чки па́ляць, як хто памрэ́.—Кто́-ж там зма́рл?—Вѣ́чны пако́й, каб е́й на то́м свѣце ле́хко икну́ласо,—па́ни паме́рла.—Цо, цо? Цо ты га́даш? Па́ни зма́рла? О, я несченсли́вы!.. — Дава́й тут пан пла́каць, убива́тца. — Чаґо́-ж пан пла́чэ? Па́ну-ж Бо́г даў и прыбы́так.—Яки? Гада́й пра́ндзэй!—Пану Бо́ґ даў ону́ка. Бо́льшая па́ньская пане́нка сы́на ме́ла. Го́жы, ка́жуць, хлапчу́к, ци бо пани́ч, от рыхтык як вы́литы па́ньски ху́рман Мики́та.—Пачу́ўшы то́е пан звалиуса з кре́сла, а Сто́пак пашо́ў сабѣ ў пека́рню падвечо́ркуваць. Дак от яки́ быў Сто́пак и як ён уме́ў з пана́ми ґаварыць.

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б Рожинъ.

48. Асилак.

Жылі́ сабе́ дзе́д да ба́ба. Жылі́ ены́ ў зго́дзе: люби́лиса-каха́лиса ўсе жы́це. Ра́зам ґарава́ли, працава́ли, ра́зам атдыха́ли. И были́ щасли́вые, то́льки ў адно́м не да́ў Бо́ґ им уце́хи — пражыли́ ўвесь ве́к и не ма́ли дзецёй.—Хто нам на ста́расци вады́ пада́сь?—Часто ґаварыла ба́ба й хвартухо́м уцира́ла сле́зы.—Не плач, ба́бо—разважа́ў е́ дзе́д,—нихто́, як Бо́ґ. Ён ми́ласливы, мо ещэ́ й пара́дуе нас на ста́расци.—Ба́ба пакида́ла пла́каць и ци́хенько смея́ласа. Быва́ло е́ во́чки блища́ць ат ра́дасци, дармо́, што твар бы раля́ ўвесь змо́рщыўса. Ве́дамо, чалаве́к нико́ли не ки́дае надзе́и на ща́сце, бо без надзе́и не́льґа жыць на све́це. Ча́сто маладзи́цы прасі́ли ба́бу, каб ена́ ба́била ў их дзецёй. Але́ ба́ба ўсе атпира́ласа, бо ве́дамо, ена́ бая́ласа, што як ро́дзитца ў е́ дзиця́, та еґо́ бу́дуць зваць ба́бичам да пасмиха́тца. От раз дзе́д быў на ґумне́, а ба́ба ўхаджа́ласа але́ пе́чы, пекла́ ала́дки. То́льки ось клубо́к аґню́ ўско́чыў праз вакно́ да й кача́етца па ха́це. Спало́халаса ба́ба, не ве́дае, што рабі́ць. Кача́ўса-кача́ўса клубо́к аґню́ да й падкаци́ўса ба́бе пад но́ґи. Ба́ба ўхваци́ласа за падо́л, але́ чу́е—штось у е́ памиж но́ґ шалпо́чэ. Не паспе́ла ба́ба ачухатца, як чу́е, што ў е́ штось зале́зло да й вару́шытца у ране́. И ста́ло ба́бе так до́брэ, што ена́ аж прысе́ла. Млосць узела́ ба́бу. Дацяґла́са ена́ да по́лу да й прыле́ґла. Ци до́ўго, ци ма́ло ена́ лежа́ла, то́льки ось ачу́халаса трохи да й дзи́витца, штоб ґэ́то было́. То́льки ось зажада́ласо ба́бе, як жыво́е вады́ та аселе́нца, та тарана́, та о́цту. Заґаня́ла ена́ дзе́да, каб ён даставаў ёй усе́, чаґо́ ена́ пражэ́тца. Пачала́ ба́ба ґаварыць маладзи́цам, чаґо́ ёй жада́етца, а ты́е й ка́жуць, што ґэ́то на маладзе́. Пасми́хаютца маладзи́цы з старо́е ба́бы, а ена́ ўсе не ве́рыць. Але́ ось жывот пача́ў круґле́ць. Пав'е́рыла ба́ба, што ена́ чарава́тая й ра́да, бы на све́т нарадзи́ласа. Але́ ось и радзи́ўса ў е́ таки́ ґо́жы хлапчу́к, што ўсе́ й надзиви́тца не мо́ґуць. Узели́ еґо́ ба́биць; ба́чаць, аж у еґо́ тры чо́ртавы рабра́. От ба́тцэ абручы́

так и тырча́ць. Падзиви́лиса ба́бы да й ка́жуць, што ма́быць ґэ́то бу́дзе аси́лак. От расьце́ хлапчу́к да си́лы набира́етца. И ско́ро е́н стаў таки́ ду́жы, што еґо́ ни адзи́н са́мы здарове́нны мужчы́на не мажэ́ пабаро́ць Вы́рас аси́лак, вабра́ўса ў си́лу й дава́й е́н збира́тца ў свѣт. Як ни ўпраша́ли дзѣд з ба́баю, каб ен не пакида́ў их на ста́расци,—куды́ там.—Нема́ чаґо́ мнѣ тут з ва́ми седзе́ць да курэ́й заґаня́ць. Я пайду́ шука́ць варагу́ў и ци сам заґи́ну, ци варагу́ў заґубло́ Нема́ чаґо́ рабі́ць—прыбра́ли дзѣд з ба́баю свайґо́ сынка́ ў вели́кую дарогу́ й с пла́чам правели́ еґо́ за село́ Тут ены́ напраща́лиса й верну́лиса да ґаспо́ды, бо да́лей не маґли́ йци,—ве́льми ўжэ были́ старэ́нькие Вайшо́ў Асилак— так еґо́ ўсѣ называ́ли—у це́мны лѣс да так засвиста́ў, што аж ли́сце пасы́палась Спало́халиса пта́шки, пахава́лиса ў вѣтки, або́ ў лом. Спало́халиса дзи́кие звяры́, пахава́лиса, хто куды́ мо́ґ Жыло́ у ґэ́стом лѣсе сѣм брато́ў, сѣм разбо́йникаў. И нихто́ не смѣў прайци́, або́ праѣхаць праз той лѣс. Жыли́ ены́ там и нико́ґо не баялиса. От пачу́ли разбо́йники той свист и пашли́ про́сто на Аси́лка. Тым ча́сам Аси́лак вы́шаў на парасе́льку, накла́ў аґню, седзи́ць сабѣ да на ражэ́ньчыку печэ́ са́ло. Тут еґо́ разбо́йники й абступи́ли атусю́ль.

Якие вы лю́дзи й што вам трэ́э—пыта́е Аси́лак.—Хто ты таки́, што пасмѣ́ў прыци́ ў наш лѣс?—пытае старшы разбо́йник.—Хто я—пазна́еш, як памѣ́раешса са мно́ю си́лаю, а лѣс не твой, а божы а й. Бо́ґ даў лѣс на нагро́бу ўсим лю́дзям — Ґэ́то наш лѣс; ґэ́то на́шэ па́ньство. Мы тут ту́бальцы с да́ўных час. — Вы разбо́йники. Вы разбо́ям запанава́ли ґэ́тым лѣсам. А я прышо́ў, каб атабра́ць у вас бо́жую пу́щу й даць уси́м лю́дзям.—Гэ, яки́ ты мо́цны! Дава́й перш пабо́рэмоса, хто з нас дужэ́йшы.—Давай. Узяў старшы разбо́йник залѣзную булаву́ ў дзесяць пудо́ў и стаў пе́рад Аси́лкам. Аси́лак азирну́ўса круго́м, ба́чыць—непадале́чку стаіць вели́зазны дуб, што ў трох не абняць. Ухваці́ў ґэ́то Аси́лак таґо́ ду́ба да й ьырваў з каре́нем. Уба́чыли то́е разбо́йники, спало́халиса й давай праси́тца, каб е́н не ґубиў их.—Будзь у нас старшы́м и таґды́ мы

ўсим свѣ́там запану́ем.—Нѣ—ка́жэ Аси́лак,—не заты́м я прышо́ў, каб свѣтам панава́ць, а заты́м, каб аслабани́ць свѣт ат панŏў, бо ўселя́ки чалавѣ́к сам сабѣ́ пан. А хто хо́чэ быць па́нам над друґи́ми людзьми́, той мŏй во́раґ.—И дава́й ты́е сѣм братŏў, сѣм разбŏйникаў праси́тца, каб Аси́лак узя́ў их к сабѣ́ ў тава́рышы—До́брэ—ка́жэ Аси́лак. И пашли́ ены́ ра́зам. Иду́ць сабѣ́ ены́ да йдуць ат аднаґо́ села́ да друґо́ґо. И ўсю́ды Аси́лак усе́ адно́ ка́жэ, што ўсѣ лю́дзи са́ми сабѣ́ паны́, што ўсе Бŏґ даў на патрэ́бу ўсим лю́дзям У еґо́ адна́ прымо́ўка была́. Ен еѣ́ за́ўжды ґавары́ў—ѣ́ж хлѣб и лю́дзям дай. И—жыви́, спажыва́й, да людзе́й неўжыва́й. Вѣ́дамо, хто лю́биць куса́тца, та й таґо́ друґи́е куса́юць. И пача́ў Аси́лак навуча́ць, каб лю́дзи жыли́ ў зґо́дзе да ў ла́сцэ.—Таґды́—ка́жэ—ния́кае ли́хо з и́ми не спра́витца, бо зґо́дная ґрума́да, бы адзи́н вели́ки чалавѣ́к, вели́ки баґаты́р, дуже́йшы ўсих багатырŏў. Пашла́ та́я прачу́тка на ўсему́ свѣ́ту. Спужа́лиса паны́ й дава́й лави́ць Аси́лка. До́ўґо ены́ шукали́ еґо́ да ўсе не меґли́ знайци́. Але́ ось ты́е сѣ́м братŏў, сѣм разбŏйникаў захацѣ́ли са́ми быць пана́ми, от ены́ зґавары́лиса й вы́дали Аси́лка Паны́ ра́ды, называ́юць разбŏйникаў сваи́ми брата́ми, чапку́юць пе́рад и́ми й даю́ць им мае́нтки, мнŏґо ґро́шэй и ўселя́каґо дабра́ Дава́й ґэ́то разбŏйники падмаўля́ць людзе́й, каб ены́ вы́дали мецѣ́жника-Аси́лка. Адны́х падмо́вили, друґи́х застра́шыли, а трэ́йцих падпаи́ли. Вѣ́дамо, за́ўжды мнŏґо зна́йдзетца дурны́х людзе́й, што ены́ ґато́вы са́ми ў веро́ўку лѣ́зци. Ены́ й сказа́ли панŏм, гдзѣ жыве́ Аси́лак. Набра́ли ґэ́то паны́ маскале́ў и напа́ли на Аси́лка. А вѣдамо маска́ль. Ему як прыка́жуць, та ен и рŏднаґо ба́цька заре́жэ. Аси́лак тым ча́сам ничо́ґо не вѣ́даў и ле́ґ на супачы́нак Тут маскалѣ́ напа́ли на еґо́, скрампава́ли веро́ўками й веду́ць к панŏм. Сабрало́со мнŏґо людзей. Шко́да им Аси́лка, да нема́ чаґо́ раби́ць Не маґу́ць агабра́ць у маскале́ў до́браґо чалавѣ́ка. Веду́ць маскали́ Аси́лка ў двŏр, а лю́дзи ця́ґнутца зза́ду. Мужыки́ маўча́ць, апусциўшы ґо́лавы, а ба́бы пла́чуць да бо́жкаюць. „На каґо́-ж ты нас пакида́еш? Хто-ж нам ска́жэ до́брае

славе́чко?“ Тым ча́сам сабрало́со панў, што хаць ґаць ґаци да па ґалава́х хадзи́. Бы ваўки́ над па́длам завыли, што Аси́лка злави́ли. Смею́тца, жу́пяць, ру́ки пацира́юць да яку́ю прыду́маць ка́ру выбира́юць. Адзи́н ка́жэ—шку́ру з жыво́ґо садра́ць; друґи́ кажэ — гантале́ў у це́ло назаґаня́ць; трэ́йци ка́жэ — павѣсиць за язык, каб уве́ць свѣт знаў, што пан, та не мужы́к; чацьво́рты ка́жэ — язык атре́заць да но́ґи перабі́ць, каб не мо́ґ па свѣту хадзі́ць, не мо́ґ ґаварыць да людзе́й вучы́ць. Паку́ль ены́ крычали да ка́ру прыдумля́ли, Аси́лак страпену́ўса, веро́ўки парва́ў да й да людзей сказа́ў: „братки́, кали́-б панў чорт узя́ў, таб свѣт беды́ не маў, а без ґарапа́шникаў мужыкў не было́-б ни хлѣба, ни асьмакў. А каб ґэ́тае ли́хо злама́ць, трэ́э ўсим, як адзи́н чалаве́к стаць; не ґры́зциса прами́ж сабо́ю, да ат вараґў баранитца ґурбо́ю“. — Так сказа́ў Аси́лак и зник; то́льки клубо́к аґню з таґо́ мѣ́йсца пакаци́ўса па земли́. Спало́халиса паны́ й маскали́; стаяць да дрыжа́ць. Ачу́халиса ены́, азира́ютца, бы ваўки́ ў ваўкаўни́. А Аси́лак ка́жуць и датых час па свѣту ґуля́е да людзе́й навуча́е. Але вѣ́дамо, мужыки́ дурны́е прами́ж сабо́ю ґрызу́тца, пе́рад панами-вараґа́ми ґну́тца, са́ми себе́ за ґубы́ трыма́юць и дабра́ не ма́юць. Але́ пе́ўне ху́тко то́е бу́дзе, што ко́жын сам сабе́ па́нам бу́дзе. Усѣ лю́дзи бу́дуць ро́ўно ґарава́ць, бу́дуць ро́ўно панава́ць.

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б. Рожинъ

---

49. Висельник.

Пе́ўне зна́еце Дани́ла Канцаве́йка з Пира́чыч. Дак от з ґэ́стым са́мым Дани́лам мы набра́лиса тако́ґо страху́, што й цепе́р валасы́ паднима́ютца, як узду́маю. Гэ́то было́ па весне́, от я́кось по́сле Мико́лы. Быў я ў Лютави́чах,—пакладаў там бычко́ў да по́сле таґо́ забала́каўса з до́брыми людзьми́. Вѣ́дамо, тро́хи вы́пили. Я саўси́м

быў цьверо́зы, другі́е тро́хи падпі́ўшы—непуща́ли мене́ на́ нач ици да ґаспо́ды. Вѣ́даеце-ж бо, мнѣ трэ́ йци лѣ́тникам це́раз ґрэ́блю да кале́ мо́ґлиць на баро́к; а там ка́жуць за́ўжды пужа́е ві́сельникъ, бо екра́з за ґрэ́белькаю ко́лісь тут завѣ́сиўса адзи́н чалавѣ́к. Еґо́ там и закапа́ли не́маль пры са́мо́й даро́зе. Ещэ́ й цепе́р е капе́ц. На еґо́ наки́дали ло́му, бо хто йдзе тут, та што ко́львек ки́не на капе́ц. Ка́жуць, што таґды́ ві́сельник не бу́дзе пужа́ць. У дзе́нь мо́жна абайці́ ґэ́тае мѣ́йсцо. Там це́раз балотцо пало́жаны бе́рвы. Але́ по́ўначы на бе́рвах не мо́жна прайці́: це́мно, ничо́ґо не бачно́, от так и ўсу́нешса ў выжа́рыну па са́мые ву́шы, а то й суздром у ґрази́ заґи́неш. От со́нейко ўжэ́ захо́дзиць. Я збира́юса йци. Дзецюки́ не пуща́юць, ка́жуць: „дзѣ́ду, начу́й у нас. Хиба́ ты не баи́шса ві́сельника?“ Кажу́—не баю́са. Я то тро́хи пабайва́ўса, але́ таґды́ со́рам было́ каза́ць.—Да ґэ́то е́н хвабры́тца,—ка́жуць на мене́ дзецюки́. Ат ґэ́тых слоў мене́ зло́сць узела́.—От жэ—ду́маю,—я вам пакажу́, што пе хвабру́са, а ўпра́ўду пайду́ й не баю́са ві́сельника. От надзѣ́ў я на пле́чы то́рбу, ўзяў кий да й вы́шаў з карчо́мки, нибыто хачу́ йци, а само́ґо страх бер, да со́рам прызна́тца. Зирну́ў ґэ́то я на шляґ,—аж хтось ѣ́дзе.—Хтось ѣ́дзе—кажу́,—пачака́ю, мо́о падвезе́.—Стаю́ з дзецюка́ми да ки́ем зе́млю калупа́ю. Адно́-ж падъезджае к карчо́мцы Дани́ло Канцавейко.—Дабры́ вечар!—Дабры́ вечар, ся́брэ! –Куды́ Бо́г несе́?—А от ѣ́ду з ка́ртаю ў Гаўры́льчычы, да баю́са на́нач адзи́н ѣ́хаць,—тут ве́льми стра́шно.—Падвези́,—кажу́,—мене́. Я от збира́ўса адзи́н ици́.—До́брэ, дзѣ́ду. У дво́х смелѣ́й.—Рад я, што так тра́пиласо От паку́ль кабы́лка атды́хала, зайшли́ мы ў карчо́мку, вы́шили ещэ́ па кватэ́рцэ, або́ другі́й да й паѣхали. Тым ча́сам ужэ́ й до́брэ сцемне́ло. От ѣ́дзем мы памале́ньку, люльки́ паку́рваем да жу́пимо сабѣ́. То́льки ось кабы́ла запы́рхала й ни з мѣ́йсца. Сцебану́ў Дани́ло пу́ґаю,—куды́ там: брыка́етца, храпе́, ве́рне ў бо́к з даро́ґи. Што там за ли́хо!.. Пачали́ мы прыґля́дватца, аж спе́раду стаи́ць на даро́зѣ бѣ́лы бара́н. Ён блее́ да ґалаво́ю матае́. Злѣ́зли мы з

во́за. Тольки я чу́ю—лещо́тки ў мене́ са́ми вы́сунулиса з то́рбы да ґрук да до́лу.— Што за дзи́во — ду́маю сабе́. Падня́ў я лещо́тки палажы́ў их у то́рбу й зайшо́ў упе́рад кабы́лки. Сцебану́ў Дани́ло барана́ пу́ґаю, дак з его́ аж и́скры пасы́палиса. Спужа́ўса Дани́ло й ру́ки апусци́ў, не можэ́ ен прамо́виць и сло́ва. А ў мене́ кий асма́лены с двух канцо́ў. Тако́ґо кия уселя́кая не́чысь баи́тца Узя́ў ґэ́то я кий да як сперазаў таґо́ барана́, дак ен и разсы́паўса на дро́бные кусо́чки. Тольки на даро́зе бы жа́рам пасы́пано. Се́ли ґэ́то мы на во́з: сцебану́ў Дани́ло па кабы́лцэ, а ена як рване́тца ў́пе́рад, да суне́, дак чуць мы з во́за не паскида́лиса. От мину́ли мы мо́ґлицы, узъе́хали на ґрэ́бельку. Зирну́ я у́бок да й нижы́ў. Ба́чу, аж на бало́це, ґдзе́ й сам чорт не мажэ́ прабра́тца, йдзе вели́зазны чалавек, от бы хво́я, йдзе й да бало́та не датыка́етца. Идзе́ ен, от як-бы нас пераймае. Штурхану́ў я Дани́ла пад бок да й пыта́ю,— ци ты ничо́ґо не бачыш?— Ничо́ґо.— А што ґэ́то онь там?—паказваю ему́. Данило прылажы́ў ру́ку к ачу́ й дава́й прыґля́датца. Ба́чыш,—кажу́,—онь па бало́це йдзе яки́ вели́зазны чалавек.—Ой ба́чу, — прашапта́ў Дани́ло. — Гэ́то-ж там не бало́то, а во́зеро.— Аджэ́ш во́зеро.—Мы дава́й паґаня́ць кабы́лку да ве́дамо, на ґрэ́бли не пабежыш. Да й куды́ там абаґна́ць ви́сельника А ен хуче́й узсу́нуўса на ґрэ́блю да й пхне́тца пе́рад на́ми. От узъе́хали мы на масто́к. Ско́ро ўжэ́ й капе́ц ви́сельника. Ба́чым мы, аж вели́зазны чалавек зверну́ў з даро́ґи да й пашо́ў на капе́ц.—Ну,—ду́маем—аткасну́ўса. Дак ґдзе́ табе́! То́льки мы параўня́лиса з канцо́м, як ось аттуль вы́скачыць ви́сельник и про́сто на нас и са́дзиць. Мы па кабы́ле, а ен за на́ми сле́дам так и пре́. От ужэ́ саўси́м бли́зко. Галава́ целепа́етца, язы́к вы́сунуў, бы лапа́ту; во́чы наве́рх павыла́зили, от бы ў Бе́рка луда́таґо. Седзимо́ мы, чуць жы́вы, то́льки за аґлаби́на трыма́емса, каб з во́за не ски́нутца. А кабы́лка пре́ су́са, аж з ее́ пе́на ва́лиць. Але́ кабы́лка прабе́ґла ґано́ў дво́е па ро́ўнуй даро́зе, а там пашли́ кулдо́бины да брадки́. Падска́кваюць драби́нки ўверх, або́ па́даюць у во́ду. Азирно́мса

мы—ви́сельник прэ за на́ми суси́х нŏґ. Тым ча́сам павыска́квали за́ґваздки, кале́са й скаци́лиса пасерŏд брадка́. Кабы́лка ста́ла храпе́ да рве́тца. Зирну́ў я наза́д, аж и ви́сельник супыни́ўса: стаи́ць да сапе́, язы́к выва́лиўшы. — Ну, ду́маю, — што Бŏґ дась... дай ткале́, вы́красаю аґню. Узя́ў я цаґало́ да й пача́ў краса́ць. Искры сы́плютца, а ґу́ба не ґары́ць. Наси́лу выкрасаў и дава́й дзьму́хаць. На во́зе было́ тро́хи сало́мы. Я й запали́ў жмак. Зирну́ў наза́д, аж ви́сельник чорт вѣ́дае, ґдзѣ й дзѣ́ўса. От, бы ў зе́млю правали́ўса. Пазнахо́дзили мы калеса, спра́вили драби́нки да й пераѣ́хали брŏд. Я ўсе не зваджу́ аґо́нь. И сабѣ́, й ґаўя́ду смелѣ́й. Падъѣ́хали мы к зава́лам да к верша́льникам и накла́ли аґню́. Седзимо́; кабы́лка стаи́ць, жуе́ сѣ́но да ат камарŏў абґаня́етца. Мы ўжэ ду́мали, прайшо́ў увесь страх и хацѣ́ли ѣ́хаць да́лей. Тŏльки ось чу́ем, идзе хтось па лѣ́се, аж земля́ сто́ґне. Идзе́, сви́щэ, ло́миць маладни́к и про́сто на нас и са́дзиць. Дани́ло кру́цитца, бы вьюн· та ву́шы наста́виць у той бŏк, ґдзѣ тращы́ць не́чысь, та зирне́ та на мене́, та на кабы́лку. Бо й ена́ паки́нула хру́маць и дава́й стры́ґци вуша́ми да храпци́. Узя́ў ґэ́то я ґалаве́шку да й абчарци́ў круґо́м ŏґница.—Цепе́р—кажу́ Дани́лу—хваро́бу праберэ́тца хаць яка́я не́чысь.— А Дани́ло спало́хаўса, не мажэ́ прамовиць ни сло́ва. От падышла́ та́я не́чысь, скрыґи́чэ да ля́скае зуба́ми, аж по́щак идзе́ па лѣ́се, але́ не мажэ́ пераступи́ць на ŏґнищэ. От свиста́ла ена́, свиста́ла, раўла́-раўла́ нѣ́мымъ го́ласамъ да й пашла́ да́лей, тŏльки лѣс тращы́ць. Так и пераседзѣли мы ўсю нŏч кале́ аґню́. А як даў Бŏґ дзене́к, да ўзышло́ со́нейко, паѣ́хали да́лей. Каза́ли дзецюки́, што ў ту́ю нŏч ены́ недале́ко атту́ль на начлѣ́зе па́сцили ко́ней и перадрыжа́ли ўсю́сеньку нŏчку й ачŏў не звели́, бо ўсе пужа́ла их яка́ясь не́чысь. Дак от як мене́ пало́хаў ви́сельник.

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б. Рожинъ.

50. Страх.

Пашо́ў ґэ́так вечарко́м, ужэ́ змро́кам адзи́н чалаве́к шука́ць ко́ней. Абышо́ў е́н су́вараты, пахадзи́ў па хмы́зніку кале́ вы́ґана—нема́. Што тут рабі́ць? Пашо́ў е́н у ле́с. Идзе́, ко́ськае. По́шак так и разсыпа́етца па ле́се. Со́нейко даўно́ ўжэ́ зайшло́. Ве́чар це́плы, паґо́дны. Ґэ́то было́ ў петро́ўку. Хадзи́ў, хадзи́ў той чалаве́к, дале́ко зайшоў у ле́с, а ко́ней нема́ш.—Ко́ся, ко́ся, дам абро́ку — крычы́ць е́н; а па ле́се по́шак абзыва́етца: ся, ся, абро́ку, абро́ку. Тым ча́сам так сцемне́ло, што ў ле́се, хаць во́ко вы́каль. Су́мно ста́ло чалаве́ку ў ґэ́стуў не́тры. Хаце́ў е́н верну́тца наза́д, да не ве́дае, куды́ йци, заблудзи́ўса, блука́ючы ў ле́се. Хаце́ў паґлядзе́ць на зо́ры, да за ґальем ничо́ґо не вида́ць. Стаи́ць чалаве́к и ду́мае, як з ле́су вы́бітца. А ве́дамо, пакуль ишо́ў, та знаў, ґдзе́ ґаспо́да, а як стаў, та й зґуби́ў сле́д. Ду́маў — ничо́ґо не мажэ́ пара́дзиць. И таки́ на его́ страх напа́ў, што от валасы́ расту́ць, як та́я ша́пка не ски́нетца. Ужэ́ хаце́ў е́н ле́сци на дзе́раво, але́ нияк не мажэ́, падня́тца—лы́тки дрыжа́ць, а ў рука́х си́лы нема́. Папро́буваў ґука́ць—у ґо́рле сци́сло. Беда́. Хаць лажы́са да й памира́й. Пачака́ў е́н тро́хи, паслу́хаў. У ле́се ци́хо, як у ву́се. Гукну́ў ен так мо́цно, што мо за ми́лю чува́ць До́ўґо леската́ў по́шак па ле́се, а як заци́х, чу́е—хтось абзыва́ўса саўси́м бли́зко. Той чалаве́к дава́й зноў ґука́ць Зноў абзыва́етца. От е́н ґука́е й идзе́ па ґо́ласу на сустре́к. Идзе́, спатыка́етца на каладзье да на зава́лы. А тут ґущэ́ча во́чы выдзира́е Узби́ўса на вы́скаць, чуць ґалавы́ не скруци́ў От зале́з ен у таку́ю не́тру, што й вы́карапкатца не мажэ́. — Зґинь мара́, прападзи́. Мо—ду́мае—ґэ́то лихи́ мене́ сюды́ завье́ў. Даста́ў ґэ́то е́н з маґалье́йки краменёц да ґу́боку й хаце́ў вы́красаць аґню́. Мац за по́яс—цаґала́ нема́. По́чапка це́лая й пецёлька завя́зана, як была́, а цаґало́ чорт ухапи́ў. Давай ґэ́то е́н хрысци́тца. Чуе, аж чорт атлецёў с паўґано́ў, узби́ўса на але́шыну да так жа́ласливо пла́чэ, аж залива́етца. Узя́ў таґо́ чалаве́ка страх; не ве́дае, што рабіць.

Пастая́ў ён тро́хи, пастая́ў, ачу́хаўса, паправіў за плечы́ма то́рбу, мацну́ў, ци е за по́ясам сакёрка да памале́чачку бо́кам-бо́кам дава́й атхо́дзиць аттуль наза́д То́лько вы́браўса ён з ґущэ́чы на праґа́лину. чуе, хтось ци́хенько вы́сунуў у еґо́ с-за по́яса сакёрку да й ґоп её да до́лу. Абернуўса чалавёк, падня́ў сакёрку, чу́е, аж зза́ду чорт раґо́чэ, бы жарабе́ц.— Чаґо́ там раґата́ць — думае чалавёк.— от вели́кае дзи́во зрабі́ў, што вы́цяґ сакёрку с-за по́яса.—Тым ча́сам чорт ма́быць даґада́ўса, што так паду́маў чалавёк, забёґ упе́род да й разсы́паўса на паля́натцы, бы жар. От так и ґары́ць уся́ земля́, то́льки нема́ ни по́ламя, ни ды́му.—Дак ґэ́то ён—ду́мае чалавёк—укра́ў у мене́ цаґало́ да ещэ́ хо́чэ мене́ спали́ць. Маім са́лам да па моёй шку́ры ма́жэ.—Тут чалавёк успо́мняў, што ў еґо́ ў маґалёйцы павінно быць маленькае цаґало́. Мацну́ў ён, аж цаґало́ целепа́етца на пры́вязцэ кале́ по́яса. От ён вы́красаў аґню́, раздуў да й упьёк верша́лину. По́тым узя́ў ґалаве́шку, абчарці́ў круґо́м и ле́ґ сабё кале́ аґню́ да то́лько дро́ва падкла́двае. Ба́чыць чорт, што чалавёк не баи́тца ў кру́зе й дава́й еґо́ аттуль выма́ньваць. От лежы́ць чалавёк кале агню́ да й бачыць, што от тут жэ па земли́ разсы́пано зо́лато, блищы́ць ат аґню́, бы жар зъя́е. Паґледзёў чалавёк да й ка́жэ: „до́брэ, неха́й лежы́ць; кали́ ено́ су́джано мнё, та еґо́ нихто́ не вазьме́ — ма́е маім бу́дзе“. Лежы́ць сабё да лю́лячку паку́рвае. А чорт та зараґо́чэ, бы ко́нь, та бёґае па лёсе як апантаны да ґрукаці́ць капыта́ми аб каре́не да аб каладзье. Альбо́ залёзе ў куст, шамаці́ць, трэ еґо́, аж и́скры сы́плютца. Але́ ба́чыць, што чалавёк седзи́ць пры аґни́, а з кру́ґа не выхо́дзиць, чорт ещэ́ тро́хи пасвиста́ў, пабёґаў и аткаснуўса ат таґо́ чалавёка. Тым ча́сам даў Бо́ґ дзень. От то́льки ста́ло занима́тца на свёт, пту́шачки запёли ўселя́кими ґаласа́ми, лёс ажы́ў, заґаманію́ў. От так здае́тца, як-бы ґрума́да паднела́са й збира́етца на рабо́ту. Уста́ў той чалавёк. Ба́чыць, аґо́нь даґаре́ў.—Неўэ́ш-то я—ду́мае—задрама́ў: Ба́тцэ не спаў усю́ но́ч и яки́х то́лько стра́хаў не нацерпёўса. — Зирне́ ён, аж начава́ў от кале́ са́маё даро́ґи, ґано́ў

трóе ат селá. Плю́нуў чалавѣ́к да й пашóў да ґаспóды. Идзе́ ён паўз паля́начку; ба́чыць, аж еґó кóни пераскóчыли цéраз завáлу да й пасу́тца сабѣ́ ў ваўсѣ́.—Неўэ́ж—ду́мае—ґэ́то не чорт, а еныґ раґатáли. А баґи́ их вѣ́дающь!.. С тых чáсаў той чалавѣ́к пачáў так баятца страхаў, што як змéркне, та ни за штó адзи́н не пóйдзе ў лѣс.

Пересказалъ И Аземша.

С. Лучицы.

---

51. Смерць.

Жыли́ сабѣ́ старэ́нькие дзѣд з бáбаю. Жыли́ еныґ дóўґо, дóўґо алé им здавáласо, што еныґ пражыли́ мáло Пакýль Бóґ давáў здарóве, им так жылóсо, што еныґ й ничóґо не паметáюць с свайґо жы́ця й здаётца, што былá карóткая жы́тка. Алé пад стáрась пачалó ўсе балѣ́ць: кóсци трэ, спи́ну лóмиць, нóґи й рýки млѣ́юць, кáшэль дýшыць, вóчы не бáчаць, вýшы не чýюць, а на языкý смакý немá Ѣсци хóчэтца, а палажы́ ў рот — душá не прымáе. Ойкаюць да стóґнуць дзѣд з бáбаю; а тут ещэ́ трэ́э ґаравáць, бо не даў Бóґ им плóду. Былú ў их дзѣ́тки й унýки да ўсих набráў Бóґ к сабѣ́. Цяжко жыць на стáрасци дзѣ́ду з бáбаю без памóґи. Аднó крэ́хчэ на пéчы да жáлитца, што не даé Бóґ смéрци. Другóе сабѣ́-ж стóґне на палý да на Бóґа наракáе, што лю́дзи ўмираюць и малады́е, а еґó й на стáрасци Бóґ не хóчэ прыбráць, свѣт апрастáць. Саўси́м сдзеци́нели дзѣд з бáбаю, а ўсе жывýць да жывýць. Алé ось раз палѣ́тку, вы́сунулиса сабѣ́ дзѣд з бáбаю з хáты, седзя́ць на пры́збе да на сóнейку ґрéютца. На вýлицы ґрабýтца кýры: хóдзяць свúне да ў лýжах кéўзаютца; валáндаютца ґýси да праз плóт с аґарóдаў щыпáюць траву; дзѣци перакидáютца да перасыпáюць песóчак, абó лѣ́пяць алáдки. Сóнейко печэ́, а дзѣд з бáбаю седзя́ць у кажýшках да й то им хóладно. Падышóў къ им сусѣ́д да й пытáе пра здарóве.—Ой, якóе нáшэ здарóве!—кáжэ дзѣд,—

як так жыць, лѣпи ґниць, да от Бо̆ґ атступи́ўса й не дае́ сме́рци.— Эй, дзѣ́ду, не ґрашы́ Бо́ґу! Бо̆ґ вѣ́дае, што ро́биць. Жыць ва́жко, а памира́ць ещэ́ ґаре́й.—Тут ба́ба пачала́ жалитца, што Бо̆ґ атступи́ўса ат их и не дае́ сме́рци. не апраста́е земли́. Тым ча́сам к таму́ чалавѣ́ку падбѣ́ґ еґо́ хлапчучо́к. — Злаби́ мнѣ ха́тьку, бацько́, — прыстае́ е́н и дава́й ла́щытца да праси́ць.—До́брэ, до́брэ, зраблю́,— ка́жэ чалавѣ́к и пача́ў ґла́дзиць сынка́ па ку́дзерках. Ве́село ста́ло ба́бе; ўсмиха́етца ена́ й сама́ дава́й пѣ́сциць хлапчука́. Зирну́ў дзѣд на ба́бу й узду́маў ту́ю по́ру. ак еґо́ ба́ба пѣ́сцила сваи́х дзѣ́так; узду́маў и так ра́дасно ему́ ста́ло на се́рцу, што й сам паґла́дзиў хлапчука́ От пача́ў сусѣ́д з щє́пачак будава́ць ха́тку. а дзѣд з ба́баю седзя́ць на пры́збе, пазира́юць та на я́снае со́нейко, та на дзеце́й, слу́хаюць, як ены́ смею́тца да ве́село щабе́чуць и самы́м ра́дасно ста́ло. Тым ча́сам ґусь падышла́ к ба́бе й дава́й еѣ́ щыпа́ць за кажушо́к.—Чаґо́ ена́ прычапи́ласа,—крычы́ць ба́ба. А сусѣ́д да й ка́жэ—ґэ́то, ба́бо, смерць прышла́ па цебе́ — Спало́халаса ба́ба, не хо́чэ памира́ць, атпиха́е ат себе́ гусь и крычы́ць— аґи́ль да дзѣда. А дзѣд крычы́ць—аґи́ль да ба́бы. От так ґаня́юць ены́ ґусь адно́ к друго́му, бо нико́му не хо́чэтца памира́ць. Засмея́ўса сусѣ́д, пазва́ў ґусь да й ка́жэ — жыць ва́жко, а памира́ць ґаре́й.

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы

52. Цыганъ.

Вѣ́дамо, цыґа́н вало́чытца па свѣ́це, свайґо́ хаджа́йства не ма́е, а то́е ўжыва́е, што ґдзѣ́ запарве́ або вы́дурыць А як ничо́ґо не даста́не та й ґо́ладам падыха́е. От ду́мае цыґа́н, — каб да каня́ку ат еды́ атучы́ць, таб до́брэ было́ на свѣ́це жыць. Сам туды́-сюды́ пахиста́ўса, — ґдзѣ кусо́чак са́лца, ґдзѣ сарва́ў каўба́ску, ґдзѣ блинцэ́ або́ ала́дки — от и нализа́ўса. А каня́це́ то̆льки й дбай да што дзень сенцо́ бы ру́ту падава́й. Да й то ещэ́ раґо́чэ—аўса́ хо́чэ.

Пачака́й, я ро́зуму вазьму, каня́ку ат ко́рму атвучу́. — И дава́й цыга́н мудрава́ць, сваю́ каня́ку ат ко́рму атвуча́ць. От е́н дзень и два не даé каня́цэ ни жме́ни се́на, ни аўса. Сам цыга́н сего́-таго́ назбира́ўса, вы́пиў ква́су, аблиза́ўса да й клопату не ма́е, што каня́ка га́лада́е. А ена́ зуба́ми зво́ниць да грызе́ сало́му — Эй, цыга́н,— сме́ютца лю́дзи,—бач твая́ кабы́лка ржэ—рагочэ, мо́о ко́рму хо́чэ.—Неха́й прывыка́е, — цыга́н ба́е. От с недзе́лю каня́ка ничо́го не е́ла, а по́тым и сакале́ла.—От кали́-б ещэ́ з дзене́чак пажыла́, таб прывы́кла й за́ўжды-б без ко́рму была́, да здо́хла,—цыга́н сказа́ў и з каня́ки шку́ру садра́ў.

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы.

---

53. Не вѣр ачо́м.

Пашо́ў адзи́н чалаве́к на карма́ш. Нема́ ў его́ ничо́го на прада́не. Нема́ й гро́шэй. А тут хо́чэтца вы́пиць кватэ́рку гаре́лки. От е́н злавиў на ву́лицы певуна́, запха́ў его́ за па́зуху да й пане́с на кармаш Ещэ́ не дайшо́ў да карма́шу, як тут ужэ́ устрака́юць жыдаўки́ да жыды́; ены́ пыта́юць, ци нема́ чаго́ да спрада́ня.— Е—ка́жэ той чалаве́к,— купи́ певуна́.— Яки́ гэ́то певу́н,— ка́жуць жыдаўки́,—гэ́тож за́яц.—Смеютца, хваре́ць их ма́тары,—ду́мае мужы́к и пашо́ў да́лей. Идзе е́н да йдзе, а на устре́к усе́ пыта́юць, ци нема́ чаго́ на про́даж. И каму́ не пака́жэ певуна́, ўсе́ ка́жуць, што гэ́то за́яц.—А мо й за́яц—ду́мае мужы́к, — не вѣр ачо́м. Ма́быць пра́ўда, кали́ ўсе́ ка́жуць, бы зга́варыўшыса.—Але́ ось прыхо́дзиць е́н на кармаш. Ве́дамо як на кармашу́—людзе́й мно́го. Жыдаўки́ крыча́ць, хвата́юць за по́лы да цяга́нуць к сабе́ ў кра́мку. Лю́дзи крыча́ць на чом свет стаи́ць, бо́жатца, клину́тца, каб ашука́ць адзин друго́го Там су сее́ силы лу́пяць у ско́варады, у шта́бы, або́ ў ко́сы й тым зазыва́юць к сабе́. Други́е крыча́ць: „ша́пки, ша́пки“, крыча́ць, аж ахры́пли. Пе́ршы раз той чалаве́к бы́ў на

кармáшу; éн никóли не чуў и не бáчыў такóго ґáму. Тóльки ось éн трóхи ачýхаўса, дастáў с-за пáзухи певунá, трымáе аґó да й крычыць: „купéце зáйца, зáйца!“ Тут к ему й прычапúласа аднá жыдóвачка.— Яки́-ж ґэ́то зáяць—кáжэ енá.— От зáяц да й усé,— упéрса мужы́к. Калé их сабралáса кýчка людзéй. Смеются з жыдóвачки й кáжуць аджэ́ш зáяц. Тут ужэ́ чалавéк саусúм павéрыў, што ен прынес на кармáш зáйца, а не певунá И што еґó ни ўґаварáли—не слýхае да й тóльки. Пасмеялиса лю́дзи з шалапавáтаґо чалавéка й узялúса за сваé дзéло. А éн хадзиў, хадзиў цéлы дзень з певунóм й ўсе ему́ здавáласо, што ґэ́то зáяць. Дак от яки́ прыпáдак быў з тым чалавéкам. Бо, вéдамо кали́ свет захóчэ, та й разýмнаґо здýрыць. Не то дýрэнь, каґó завýць дýрням, а то дýрэнь хто́ чужы́м рóзумам жывé. Бо прáўду казáли старые лю́дзи: людзéй слýхай, а свóй рóзум май и ни на кóґо не ўважáй

Пересказалъ И Аземша.

С. Лучицы.

---

54. Поп и пустэльник *).

Кали́ тóе было́ — не вéдаю. Мáбыць вéльми даўнó, бо от ужэ́ мнé бóльш капы ґадóў, а я ещэ́ без партóк бéґаў, як бывáло мóй дзéд, каб ему́ лéґенько йкнýласо на тóм свéце, злéзе з печы, апранé кажýшак да вы́сунетца з хáты на прызбу, сядзе на сóнейку да й кáжэ нам кáзки. А мы падшпáрки абстýпим еґó атусю́ль и лýхаемо ты́я кáски. Старэ́ньки, вéльми старэ́ньки быў мóй дзéд. От як и запамятáю, éн ужэ́ никýды не хадзиў з ґаспóды. Тóльки ў лéтку памалéньку, з киéчкам выцяґáўса з хáты на прызбу, або́ на прыґумéчэ, гдзé ў нас были́ пчóлы. Бо éн, бáчыце, вéльми любúў пчóл. Тóльки напаслéдак éн ужэ́ нúчоґо не бáчыў: пазирáе бáло на я́снае сóнейко й не жмýрытца. Алé éн да сáмае смéрци любúў

*) Эта сказка записана мною въ 1883 году, когда похожій по содержанію разсказъ Л Толстого „Три Старика“ еще не появлялся въ печати.

каза́ць ка́зки да так ґо́жэ каза́ў, што еґо́ слу́хали стары́е й малы́е. Я мно́ґо знаў тых ка́зак, але́ шмат ужэ́ пазабыва́ласо. Ве́дамо, цепе́р не той све́т наста́ў, каб ба́йки слу́хаць. Пра́ўду ка́жуць лю́дзи, што ўсе забу́дзеш, кали́ хле́ба не дабу́дзеш

Дак паслу́хайце, от скажу́ вам ка́зку свайґо́ дзе́да. Ґэ́то не ка́зка, але́ пра́ўда. То́льки даўно́ то́е было́ Даў Бо́ґ вельми харо́шы, ураджа́йны ґо́д Тако́ґо ґо́да нихто́ й не запамята́е. Усю́ ве́сну йшоў ци́хи, це́плы дож, а з Мико́лы ста́ла така́я паґо́да, што от здае́тца, пасадзи́ на ралю дзиця́, та й ено́ вы́расце Усе́ расце́ ў по́ли, як на дро́жджах. Ка́жуць жэ бо: мо́края весна́ да це́плы май, та бу́дзе пашня́ як ґай. Ба́чаць лю́дзи, што кали́ Бо́ґ убераже́ ат ґра́ду, та бу́дзе ве́льми вели́ки ўраджа́й. Але́ ве́дамо, ту́тачки ў ґэ́стум пе́кле лю́дзи так прывы́кли ґарава́ць и за́ўжды жыць у бедзе́, што харо́шы ўраджай не ра́дуе, бо ўсе́ ду́маюць, што ґэ́то не на добро́. И пашла́ прачутка, што вели́ки ураджа́й, але́ не бу́дзе каму́ е́сци, не бу́дзе каму́ спажыва́ць И пачали́ разска́зваць, што йшоў яки́сь убо́ґи да й каза́ў, ба́тцэ ў вадно́м селе́ ба́чыли на заґуме́чы ве́льми стра́шную ба́бу с адны́м во́кам. Ка́жуць, што ґэ́то по́шасць и што ена́ ху́тко пры́дзе на людзе́й и на ґаўя́до, А тут адна́ маладзи́ца пашла́ ў ле́с па ґрыбы́, ци мо́о рваць я́ґады да й сустре́ла там тако́е дзи́во, што й не разказа́ць. Идзе́ ґэ́то ена́ й ба́чыць, аж седзи́ць на ка́мени ве́льми ґо́жая маладзи́ца. Ена́ трыма́е на лане́ сно́п бу́йнаґо жы́та да так пла́чэ, што аж залива́етца Маладзи́ца папыта́ла, чаґо́ ена́ пла́чэ, а та́я й ка́жэ — як жэ мне́ не плакаць, кали́ я ве́даю, што бу́дзе вели́ки ураджа́й, але́ не бу́дзе каму́ еґо́ спажыва́ць. — Спало́халаса та́я маладзи́ца да й пыта́е, што рабі́ць? — Малі́цеса—ка́жэ ґо́жая маладзи́ца,—малі́цеса, як умі́еце. И я бу́ду за вас мали́тца.—И зни́кла. Прышла́ та́я маладзи́ца да ґаспо́ды да й разска́звае, яко́е ена́ ба́чыла дзи́во. Даґада́лиса лю́дзи, што ґэ́то была́ Бо́жая Маци. От дава́й ены́ мали́тца, як хто ўмі́е. А, ве́дамо, це́мные лю́дзи й малитца як тре́э не маґу́ць. Прачу́ў пра то́е по́п и ка́жэ—вы не так мо́лицеса, як тре́э. От вы хадзе́це ў це́р-

каў да тут ат мене́ учє́цеса мали́тца, да дава́йце на хва́лу Бо́жую.— Вѣ́дамо, папу́ трэ́э, каб лю́дзи хадзи́ли ў цэ́ркаў да бо̆льш дава́ли папу́ дахо́ду. От и пача́ў по̆п не́маль што дзе́нь ззыва́ць людзе́й на талаку́ к сабѣ́ й там нибы́то ўчыў их мали́тца да за рабо́ту, ко̆жын дзень служы́ў мале́бен Хо́дзяць лю́дзи ў цэ́ркаў и к папу́ да й несу́ць ему́, што хто ма́е: хто во́ўну, хто лен, хто во̆ск або́ мед, хто са́ло, ма́сло, сы́ры, хто палатно́, а хто пабаґацѣ́й, той с павасьми́нку аўса́, або́ жы́та ци ячме́ню запрэ́. Рад по̆п Слу́жыць мале́бены штодзе́нь и ка́жэ—ма́быць ужэ́ кане́ц свѣ́ту наста́ў, бо пи́шуць, што объяви́ўса анты́хрыст. — Ещэ́ ґаре́й заклапаци́лиса лю́дзи, су́мно стало на сэ́рцу. Паки́нули рабо́ту, да то̆льки мо́лятца да пла́чуць. Ты́м ча́сам жыў там адзи́н чалавѣ́к. Ен не слу́хаў папа́ не хадзи́ў ни ў цэ́ркаў, ни к папу́ на то́лаку. Бало смее́тца да пѣ́сни пае́. Пѣ́ў е́н якиясь усе́ нехаро́шые пѣ́сни, та смѣ́шные — весе́лые, та пра папо̆ў, альбо́ пра пано̆ў. Неўзлюбиў по̆п таґо́ чалавѣ́ка празва́ў еґо̆ шалапава́тым. От раз идзе́ по̆п па селѣ́, а шалапава́ты сустрака́е еґо́ да й пае́: каму́ клапатно́, а папу́ палатно́. По̆п слу́жыць не дзеля́ Йсуса, а дзеля хлѣ́ба ку́са. Лю́дзи памира́юць,— семья́ пла́чэ, то̆льки по̆п да дзяк пае́ да ска́чэ. — Хацѣ́ў тут по̆п перацяґну́ць шалапава́таго киям, але́ той вы́салапиў язы́к, паказа́ў папу́ хви́ґу да й сунýў на загуме́чэ. Съ тых ча́саў зник шалапава́ты; нихто́ не вѣ́даў, куды́ е́н дзѣ́ўса. То̆льки ось па нема́лум ча́се объявиўса ў лѣ́се вели́ки пустэ́льник. И атусю́ль, пашли́ к ему́ лю́дзи на пара́ду. Пашли́ лю́дзи й з таґо́ села́, ґдзѣ́ быў перш шалапава́ты, пашли́ да й ба́чаць, што ґэ́то таму́ шалапава́таму Бо̆г даў таку́ю мо̆ц, што е́н и хво́рым памаґа́е, й у клапо́це дае́ ску́так. Адби́лиса лю́дзи ат папа́ й ат цэ́ркви — ўсе хо́дзяць к таму́ пустэ́льнику. Ба́чыць по̆п, што лю́дзи атби́лиса, дак ему́ нема́ дахо́ду, от и пашо́ў е́н паґлядзѣ́ць, яки́-таки́ там пустэ́льник; ци немо̆жна еґо́ пасадзи́ць у вастро̆ґ, каб е́н не чму́циў людзе́й и не атбива́ў ат папо̆ў. От пасыла́е по̆п пападзю́ на село́ к ба́бам развѣ́даць, гдзѣ́ жыве́ той пустэ́льник. Пашла́ пападзя́ да й дава́й

распы́тваць у баб. Вѣ́дамо ба́бы—ўсе й разсказа́ли. —Ой, мату́лько — ка́жуць ба́бы, — таки́ святы́. таки́ святы́, што аж сарамацѣ́ня не закрыва́е, так у вадно́й до́ўгуй, порванно́й саро́чцэ й хо́дзиць. Медзьве́дзи ему́ ѣ́сци но́сяць, а ён сабѣ́ ска́чэ да ска́чэ цѣ́раз кало́ду да ўсе ка́жэ: табѣ́ Бо́жэ й мнѣ́ Бо́жэ. Пачу́ў то́е по́п, сабра́ўса да й пашо́ў шука́ць таґо́ пусте́льника Идзе́ ён да йдзе цѣ́мным ле́сам и забра́ўса ў таку́ю ґущэ́чу, што не ве́дае, як атту́ль вы́лезци. Хацѣ́ў ужэ́ ён верну́тца да ґаспо́ды, але́ заблудзиўса й не разпало́пае. куды́ йци. Стаи́ць по́п пад дзе́равам да чэ́пэ паты́лицу. Тым ча́сам чу́е ён, аж равў́ць медзьве́дзи. Равў́ць и падхо́дзяць усе ближе́й. Ки́нуўса по́п на дзе́раво, падлѣ́з сажо́н два, да аблама́ласа ґо́лька, й ён скациўса дало́ў Узня́ўса по́п. чу́хае бо́ки да як зирне́ ў ґущэ́чу, аж там стаяць два вели́азные медзьве́дзи на за́дних ла́пах; стаяць. равў́пь да зуба́ми ляско́чуць. Спало́хаўса по́п. Адна́ по́ўна, а друґа́я як завеза́ць. Не ве́дае по́п, што рабі́ць. Але́ ось прыглядзѣ́ўса ён и ба́чыць, аж кале́ медзьве́дзей стаи́ць яки́сь чалаве́к у до́ўго́й бѣ́ло́й саро́тцэ. Стаи́ць по́п, прытаи́ўса кале́ дзе́рава да пазира́е, што ро́биць той чалаве́к. Ба́чыць, аж ён усе́ ска́чэ це́раз кало́ду Даґада́ўса по́п, што ґэ́то пусте́льник и дава́й памале́ньку падходзиць ближе́й. Скака́ў, скака́ў пусте́льник, закмѣ́ў папа́. ки́нуў скака́ць да й пашо́ў на сустре́к. Ба́чыць по́п, што ґэ́то той са́мы шалапава́ты чалаве́к, ште ён хацѣ́ў его́ ўды́рыць кием. Ба́чыць, што за им иду́ць два вели́азные медзьве́дзи да цяґнуць на лубку́ свѣ́жые пля́стры ме́ду — Дабры́ дзень—ка́жэ пусте́льник, а по́п маўчы́ць, зу́бы спя́ўшы Так ён спало́хаўса медзьве́дзей, што душа́ ў пя́тки залѣ́зла да там схава́ласа. — Не бо́йса, медзьве́дзи не зачэ́пяць, — ка́жэ пусте́льник и павьѣ́ў папа́ ў сво́й стано́к. Ба́чыць по́п, аж пусте́льник зрабиў сабѣ́ лаґво́ пад вы́скацью й захиста́ў тро́хи ґальем да бероста́ю. Узя́ў пусте́льник у медзьве́дзей з лубка́ пля́стар ме́ду й часту́е папа́, а таму́ ат стра́ху й перасѣ́ло ў ґо́рле Але́ ось памале́ньку ачу́хаўса по́п и дава́й пе́рци ме́д за абѣ́дзьве що́ки, то́лькн барада́ трасе́тца, бы ў каза́

Наѣ́ўса пŏп да й пыта́е пустэ́льника, што ен тут ро́биць.—Малю́са,—ка́жэ пустэ́льник —Як жэ ты мо́лишса?—Пыта́е пŏп.—А от як.—Тут пустэ́льник падня́ўса, падня́ў сваю саро́чку да й дава́й скака́ць це́раз кало́ду да прымаўля́ць: Табѣ́ Бо́жэ й мнѣ Бо́жэ!—Не до́брэ ты мо́лишса,—ка́жэ пŏп.—Лѣпш неўмѣ́ю —Мали́са́ так. Дава́й ґэ́то пŏп учы́ць пустэ́льника мали́тца. Наўчы́ўса пустэ́льник тро́хи мали́тца па письме́ннаму да й павьеў папа́ це́раз лѣс на даро́ґу. От иду́ць ены да йдуць це́мным лѣсам и падышли́ к раце́ Пустэ́льник спусцпўса з бе́раґа да й пашо́ў це́раз ре́ку па вадзѣ́, бы па су́ху А пŏп тŏльки ступиў ат бе́раґа, як шабулды́х у во́ду па са́мые ву́ши —Рату́й!—крычы́ць пустэ́льнику. Той абернýўса, ўхвациў папа́ за ку́длы да й вы́цяґ з вады́ на бе́раґ. Тут пустэ́льник ски́нуў з себе́ саро́чку. пасла́ў еѣ́ на во́ду да й перавье́з папа́ за ре́ку, бы на плы́це. Вы́шли ены́ на бе́раґ, а пустэ́льник и ка́жэ—забы́ўса я мали́тца. Павучы́ ещэ́ тро́хи.—Ба́чыць то́е пŏп да й ка́жэ — мали́са, як малиўса; ма́быць твая́ мали́тва прые́мней Бо́ґу, кали́ ты хо́дзиш па вадзѣ́.—Пакланиўса ґэ́то пŏп пустэ́льнику да земли́ да й пашо́ў да ґаспо́ды. А пустэ́льник зноў пача́ў скака́ць це́раз кало́ду.

Пересказалъ Дударъ.

Дер Чудинъ

55. Пану навука.

Слу́хайце-бо! Скажу́ вам не ка́ску, а щы́рую пра́ўду. Гдзѣ то́е было́—цепе́р я забы́ўса, бо ўжэ, ба́чыце, ста́рась. А вѣ́дамо, кали́ з чупры́ны ґи́нуць валасы́, та й па́мяць—з ґалавы́. От я забы́ўса, што сеґо́нячы абѣ́даў Не памята́ю. А мо́о й ничо́ґо. Трапля́етца й ґэ. Ка́жуць-жэ: ча́сам з ква́сам, а паро́ю з бедо́ю, ци бо з вадо́ю. Цепе́р ли́хо, жа́лятца, маладзички́, а даўнѣ́й было́ ґаре́й. Вы таґо́ не памята́еце. Не ве́льми даўно́ то́е было́, ещэ́ за па́ньцыну. За па́ньцынаю было́ до́брэ, кали́ трапля́ўса до́бры пан. Было́ так до́брэ, так до́брэ, што не трэ́ й памира́ць. До́бры пан даґляда́ў

сваи́х мужыкўў, як ро́дны ба́цько. Але́ ґдзѣ трапля́лиса таки́е до́брые паны́? Бо́льш были́ не паны́, а зверъе́ паґа́нае. От як тра́питца таки́ паґа́ны пан, та хаць лажы́са да й памира́й — ничы́м ему́ не ўґо́дзиш. Ка́жуць-жэ. зачыни́ чо́рту дзве́ры, та ен вакно́. Гэ й лихи́ пан. Ты ему́ го́дзиш, щы́ро ро́биш, а ен табѣ́ у́се крычы́ць: не так шэ́льма, не так га́лга́н, не так пся крэ́ў,—и ѣсь цебе́ по́едам, ѣсь, зневажа́е, здзѣкуетца. А чуць што — жыўцэ́м шку́ру злу́пиць. Ой, ця́жко, ве́льми ця́жко было́ за лихи́ми пана́ми. А лихи́е паны́ не́маль были́ ўсѣ Эґэ-ж. От у вадно́м двары́ бы́ў таки́ лихи́ пан. Чаґо́ то́льки е́н не вычвара́ў! Як то́льки е́н не наздзѣкуваўса над людзьми́. Сѣк е́н и мужыко́ў и баб, стары́х и малы́х. Разця́ґнуць ба́ло маладзи́цу, або́ дзѣ́ўку, камыса́р ты́чэ па́лцам да й ка́жэ: па́не, о!—Лупи́ па о,—ка́жэ пап, и ху́рман начне́ пере́сциць, што аж па́ра ва́лиць. Не аднаґо́ ен засѣ́к на смерць и нико́ґо не бая́ўса. А людзе́й е́н личы́ў ґаре́й сабак... Што е́н вычвара́ў над маладзи́цами да дзѣ́ўками, дак со́рам и каза́ць. Не мо́ґ той паґа́ны пан ужэ́ бо́льш ничо́ґо прыду́маць, каб паздзѣкуватца над людзьми, от и велѣ́ў ен, каб мужыки́ прыво́дзили на про́даж вало́ў то́лько ў дво́р; а па канцо́х села́ паста́виў раґа́тки да й не пазво́лиў праѣхаць к мужыко́м ни я́каму кущу́ От и павели́ ли́дзи ў дво́р вало́ў на про́даж Але́ прыведзе́ хто вала́, а пан и ка́жэ: што-ж ты прывьеў, асе́л? Гэ́то-ж не во́л, а казе́л.—И запла́циць, бы за казла́, а то ещэ́ пашле́ на ста́йню да ўсы́пле ў седзи́бу паўсотни ґара́чых. До́ўґо му́чылиса бѣ́дные мужыки́ з таки́м паґа́ным па́нам; до́ўґо церпѣ́ли, бо што зро́биш, каму́ пажа́лишса!? Ве́дамо, паны́ за пана́ми й ця́ґнуць. Але́ ось знайшо́ўса адзи́н чалавѣ́к, што атпла́ци́ў таму́ па́ну за ўсѣ люцки́е сле́зы да за кры́ўду. Дак от як то́е было́. Бы́ў там уда́лы, зда́тны хло́пец. Ра́но е́н асирацѣ́ў, але́ й адзи́н узби́ўса таки́ на хаджайство. Га́рды бы́ў хло́пец. Нихто́ еґо́ нико́ли й па́лцам не зачапи́ў. То́лки от е́н прыво́дзиць у дво́р на про́даж вала́. Уба́чыў пан, вы́шаў на га́нак, да й ка́жэ: што-ж ты прывьеў, асе́л! то-ж не во́л, да казе́л.—Пазирну́ў той дзецю́к, што бли́зко

никóґо немá калé пáна, паказáў емý пáплиску да й пытае: што ґэ́то, пáне, берóза ци лазá? Я-ж прывьéў к табѣ́ валá не казлá... И давáй перéсциць, давáй дубáсиць пáна тóю пáплискаю. Рéзаў рéзаў, пакýль сам здавóлиўса.—От-жэ табѣ́, чáне, за тóе, што ты людзéй мýчыш Калú вы́чухаеш ґэ́то, та чакáй менé ещэ́ трэ́йко Трэ́йко я здымý з цебé шкýру.—Сказáў ґэ́то тóе дзецю́к да й уцéк у лѣс. А вѣ́дамо, якúе даўнѣ́й былú цéмные да ґусты́е лесы́. У их жывú кŏлько хóчэш, нихтó цебé не трáпиць Нашлá двŏрня пáна без пáмяци, так еґó вы́месиў той дзецю́к. Тŏлько на трэ́йци дзень трóхи ачýхаўса пан и велѣ́ў злавúць Ры́мшу—так звáли таґó дзецюкá. Да куды́ там—еґó й слѣд вѣ́грам замелó. Нéмаль недзѣль сѣм пракачáўса пан: чуць чóрту дýшу не атдáў. Якúх тŏлько дахтурŏў не справаджáли — ничóґо не парáдзяць, бо ему мáбыць Ры́мша атсадзиў печанцы́. А што ўлŏжыць хам, та не вы́ме й пан. Алé ось па не мáлум чáсе прыѣ́хаў у двŏр якúсь венґéрац. У еґó ўселя́ких зельéў, уселя́каѣ лекóбы. Рад пан, чапкýе, прóсиць таґó венґéрца, каб еґó палечы́ў. Паґасцявáў венґéрац у двары́ да й давáй лечы́ць пáна. Велѣ́ў ґэ́то ен напалúць лáзню: павьéў пáна туды́; пасадзиў еґо на лáўцы да й велѣ́ў абѣ́ручки дзержáтца за жэ́рдачку, а сам пачáў нацирáць пáна ўселя́кими мáзями. Седзúць пан, трымáетца абѣ́ручки за жэ́рдачку да тŏльки крэ́хчэ. Але не дóўґо éн так седзѣ́ў: вы́цяґ венґéрац з кишэ́ни сурŏмец, прывязáў им к жэ́рдатцы пáньские рýки, заткнýў пáну вѣ́хцям ґóрло, ўзяў хварасцúну да й кáжэ: што ґэ́то пáне, берóза, ци лазá?—Я-ж прадáў табѣ́ валá, не казлá.—Бáчыць пан, што ґэ́то Ры́мша, а не венґерац, хóчэ крычáць, да не мажэ́, бо вѣ́хаць у роце. Крýцитца пан, бы вьюн на ґарáчŏй скаварадзѣ́, а Ры́мша дастáў з пад палы канчýк и давáй хрысцúць паґáнаґо пáна па чŏм папáло. Лупиў, лупиў, нéмаль усю́ шкýру садрáў да й давáй пасыпáць пáна сóлью. Самлѣ́ў пан ат бóлю. А Ры́мша сѣ́ў на кóней да й паѣ́хаў сабѣ́. Тŏльки еґó й бáчыли. Дóўґо хварéў пан, чуць не паўґóда пракачáўса. Усѣ́ дýмали, што ўжэ́ емý прышлú капцы́. Алé лихóґо й

смерць не берэ: к весне́ тро́хи вы́чухаўса пан и хацѣ́ў е́хаць за-ґрани́цу на во́ды, да, ба́чыце, ґро́шэй нема́. От и ўзду́маў е́н прада́ць лѣс Пашла́ по́ґаласка, й пачали́ купце́ аґля́дваць лѣс. Тарґава́лиса ены́, тарґава́лиса, дак не схо́дзятца аб цану́, бо пан ве́льми даражы́ўса То́льки ось прые́хаў яки́сь бачно́ ве́льми баґа́ты купе́ц Павъе́ў его́ пан аґля́даць лѣс. От пан хва́лиць лѣс, а купе́ц то́льки ўсе атво́дзиць па́на ў ґуцарню да ў не́тру Забра́лиса ены́ ў таку́ю ґуцэ́чу, што й све́ту Бо́жаґо не бачно́: от купе́ц дава́й абдыма́ць хво́и, са́жням ме́раць таўщыну́. Абхапи́ў и пан адну́ хвайну, а купе́ц хуце́чько вы́хапиў з кишэ́ни суро́мец да й прывеза́ў па́на к хво́и Ба́чыць пан, што ґуг не пера́лиўки й хацѣ́ў крыча́ць, зваць на ратунак, але так спало́хаўса, што нема́ ґо́ласу Але ось купе́ц паказа́ў ему́ па́плиску да й пыта́е: што ґэ́то, бера́за ци лаза́? Я-ж, ка́а, прада́ў табе́ вала́, не казла́. — Тут пан даґада́ўса, што ґэ́то Ры́мша, да аж у кало́шы напусци́ў. Тым ча́сам Ры́мша запха́ў па́ну мо́хам рот да й дава́й пере́сциць па чо́м папа́ло да прыка́зваць, каб бо́льш не здзе́куваўса над людзьми́. Биў, биў Ры́мша па́на, чуць на сме́рць не забиў да так и ки́нуў прывя́заным к хво́и, бы па́дло. Так да ве́чара й усю́сеньку но́ч правися́ў пан на хво́и, чуць его́ нудзьґа́ не зъе́ла, паку́ль дво́рня нашла́ От тут ужэ́ пан це́лы ґо́д пракача́ўса: ўсе не мажэ́ вы́здаравѣць. Нема́ ачу́нку; от и ра́дзяць па́ну е́хаць на во́ды Прада́ў ґэ́то пан лѣс, прада́ў збо́жэ да ґаўя́до Сабра́ў мно́ґо ґро́шэй да й дава́й выла́джватца на во́ды. Тым ча́сам Ры́мша ўсе цику́е за па́нам От то́льки пан вы́ехаў з двара́ да ўе́хаў у лѣс, як Ры́мша ўжэ зрабиў на его́ па́стку От е́н паста́виў на даро́зе ґано́ў на тро́е адзи́н ат друґо́ґо двух ко́нных хлапчуко́ў с до́ўґими па́плисками То́льки падъе́хаў пан, як пе́ршы хлапчу́к трасе́ па́плиску да й крычы́ць: што ґэ́то па́не, бера́за, ци лаза́? А сам па каню́ да й наўцекача́. — Лапа́йце, лапа́йце! — крычы́ць пан, — то-ж га́лган Ры́мша. Ху́рман атре́заў пастро́нки, се́ў на каня́ да й паґна́ўса за хлапчуко́м. Але́ той сунў́ў у лѣс и чо́рт ве́дае, куды́ дзе́ўса. А хурма́н

папье́р даро́ґаю ўпе́рад мо́о верстŏў дзе́сяць. Тым ча́сам заѣ́хаў уперŏд пе́рад па́нам друґи́ хлапчу́к, паказа́ў па́плиску да й пыта́е: што ґэ́то, па́не, беро́за, ци лаза́? — Лапа́й, лапа́й еґо галга́на! — крычы́ць пан на ле́кая, — то-ж Ры́мша. — Узско́чыў ле́кай на друґо́ґо каня́ да й паґна́ўса за хлапчуко́м. Аста́ўса пан адзи́н. Тут Ры́мша вы́сунуўса с-за вы́скаци да й паказа́ў па́ну па́плиску: што ґэ́то, па́не, беро́за, ци лаза́? — Я-ж, — кажэ, — прада́ў табѣ́ ва́ла, а не казла́. — И дава́й дуба́сиць да пѣ́рыць па́на то́ю па́плискаю Збиў Ры́мша па́на на ґŏркае я́блыко, забра́ў усѣ́ ґро́шы да й пашо́ў сабѣ́ у лѣс, у сваю́ земля́нку. Ка́жуць по́тым Ры́мша мнŏґо дабра́ рабиў лю́дзям. Ещэ́ да тых час у це́мнум лѣ́се серŏд бало́та стаи́ць ґара́ Еѣ́ называ́юць Ры́мшаваю Гаро́ю Гэ́то пами́ж Запŏльем и Наво́селками (Мозырскаго уѣзда) Мо́о вѣ́даеце Дак ка́жуць — там жыу́ той Ры́мша. Ен ґдзѣ́сь схава́ў мнŏґо ґро́шэй, але́ нѣ́льґа знайци́. Земля́нку та я сам ба́чыў, як хадзиў туды́ ат па́на з ка́ртаю Каб пашука́ць, мо́о и ґро́шы е.

Пересказалъ Дударъ.

Дер. Чудинъ

56. Лихая Доля.

Жыли́-были́ два браты́, два рŏдные браты́ Ены́ ра́зам радзи́лиса, ра́зам хрысци́лиса, адзи́н ба́цько з ма́ткаю их ґадава́ў, да не адна́кую им Боґ до́лю даў. За што ста́ршы ни вазьме́тца, ўсе ему́ йме́тца. А мало́дшы што ни ро́биць, як ни бъе́тца, а ему́ ничо́ґо не дае́тца. Памъе́р ба́цько, а за им и ма́тка. И пашла́ па миж брата́ми зва́дка. Мо́о ены́ еще́ й ужыли́-б у ла́ду, да прами́ж жанка́ми нема́ сла́ду. Як дзвѣ ма́тки ў у́льи, так и дзвѣ жанчы́ны ў ха́це не ўжыву́тца ци́хо да робляць ли́хо: перш пра миж сабо́ю падзеру́тца; по́тым к мужыкŏм прыста́нуць. Ты́е це́раз баб и са́ми памацу́юць лба́ми. — Ну, братко́, — сказа́ў тут брат мало́дшы, — чым праз баб нам наґдыра́тца да не ў зґо́дзе жыць, тŏльки Бо́ґу ґрашы́ць

да людзе́й смешы́ць, дава́й ле́пей не сваре́мся да па пра́ўдзе падзе́лі́мся.—До́брэ, бра́це, ка́жэш—ста́ршы брат на то́е абазва́ўся да й за падзе́л узя́ўся. От щабе́чущь ба́бы, бы саро́ки; а браты́ як тра́ба падзели́ли ўсе ат ни́тки да кусо́чка хле́ба Ци́хо разышли́ся да й жыву́ць браты́, ґару́ющь да працу́ющь, зарабля́ющь хто як мо́жэ на кусо́чак хле́ба. Бо́льшы брат што дзень, та баґаце́е, а мало́дшы, як ен ни працу́е, а што дзень, та ўсе бедне́е То каро́ва ґо́лаў падверну́ла, та ў жанчы́ны се́ла ску́ла· не́каму ни жаць ни абе́д пада́ць. Ко́жын дзень — неўзґо́да; ко́жын крок — прыґо́да.— Бо́ская воля. Така́я - - кажэ—мая до́ля.

От ґэ-ж ме́ньшы брат биўса, биўса да й саўси́м пражы́ўся. Тра то́рбу на пле́чы браць да кускі́ збира́ць. Ба́ба ла́е, зневажа́е: сваякі́ дзьму́тца, суседзи смею́тца. Кали́ до́ли нема́—пни́ся, не пни́ся, ничо́го не пара́дзиш, хаць ты засили́ся. От идзе́ раз бе́дны, ба́чыць, аж браци́ха — нема́ е́й ли́ха — на пали́нцы жы́то дажына́е, а пад хра́щыкам е́ калы́шку дзе́вачка хиста́е. — Дзе́вачка, чыя́ ты? — бе́дны тут е́ пыта́е.—Дзя́ннина я до́ля—та́я атмаўля́е·

Гаре́й ця́жко бе́днаму на се́рцу то́е слу́хаць, то́е зна́ць, што его́ до́ля ему́ не хо́чэ прыя́ць, И пацеґса е́н па по́ли шука́ць сва́ю до́ли. От идзе́ е́н да йдзе с дзеля́нки на дзеля́нку, с пали́нки на пали́нку; сустрака́е ў га́ю пад вербо́ю старо́ґо дзедо́чка з си́ваю барадо́ю. Падышо́ў, схили́ўся да дзедо́чку пакланію́ся. А дзедо́чак пазира́е да й его́ пыта́е: чалавечэ, Бо́жы, чаґо́ тут блука́еш? Чаґо́ па ґаю шука́еш?—А е́н атмаўля́е, што до́ли не ма́е, та е́ й шука́е.—Твая́ до́ля—валацу́ґа, па ґа́ю ґуля́е да пе́сни спева́е.—На кие́чак да й идзи́ па по́лю та й уба́чыш сваю́ до́лю. От падзя́куваўшы дзе́ду, кий узя́ўшы ў ру́ку, пашо́ў бе́дны па по́лю шука́ць сваю́ ґо́ркую до́лю. Ось идзе́ да йдзе е́н, круґо́м пазира́е; ба́чыць, аж пад ду́бам его́ доля ґра́е. Ба́чыць—ґо́лая дзеўчы́на лы́нды бъе на мя́ґкуў тра́ўцы да хиста́етца на ґо́льцы. От схапиў бедня́к е́ за ко́сы да дава́й пере́сциць кием да дава́й вучы́ць, як на све́це жыць. До́ля про́сиць, абеца́е, што с та́е пары́ ена́ старэ́ннаю быць ма́е. От ведзе́ е́н до́лю ґо́лую па

по́лю. Со́рам ста́ло без адзе́жы. До́ля цяґне к лѣ́су, цяґне, каб закры́тца. Увайшли́ ены́ ў ґущэ́чу да прысе́ли на кало́дзе Бе́дны ка́жэ: до́ля, до́ля, паґаво́рымо-ж мы а прыґо́дзе.—Не ўбива́йса, не лека́йса,—на то́е до́ля сказа́ла да й пацалава́ла. Бе́дны азирну́ўса да й ачо́м не ве́рыць—до́ля сы́пле ему́ ў по́лы прыґа́рщами ґро́шы.—Беры́, не лека́йса, спажыва́й як во́ля — ка́жэ до́ля, — ґэ́то на́шы ґро́шы, мо́й харо́шы.—До́ля зни́кла, бы тума́н, а зо́лато зъя́е. Зґро́б еґо́ е́н да кишэ́ни да й ка́жэ: от цепе́р я—пан. Да й пусциўса да ґаспо́ды. Ен идзе́, аж лѣс ґудзе́; пад сабо́ю но́ґ не чу́е, бо ў кишэ́ни ґро́шы чу́е. От с таѣ́ пары́ пача́ў е́н до́брэ жыць да Боґа хвали́ць. Гэ-ж, бо на све́це то́льки той ща́сце ма́е, каму́ до́ля спрыя́е, а бо́ хто сваю́ до́лю да ў рука́х трыма́е. Бо без ущу́нку й ат до́ли нема́ ратун́ку.

Пересказалъ Дударъ.

Д Чудинъ.

---

57. Кавалиха.

Жыў сабе́ адзи́н кава́ль ни ґа́дки, да на еґо́ ли́хо, была́ ў еґо́ жо́нка кавали́ха. Паґа́ная была́ ба́ба. Заѣ́ла ена́ каваля́ й немо́ґ е́н з е́ю спра́витца. А ве́дамо, кава́ль,—за́ўжды седзи́ць у карчме, або ў ку́зни. А прыдзе́ да ґаспо́ды—чо́рны як му́рын; хо́чэ жо́нку пацалава́ць, а та́я як нава́литца, бы жыды́ на Га́мана, да ўче́питца ў ґи́ру, да пачне́ вадзи́ць па ха́це, дак Кава́ль не рад, што й зачапиў лихую ба́бу. А така́я была́ ду́жая да ўпра́ўная, што ни я́ки мужчы́на не мо́ґ пабаро́ць. Наґарава́ўса Кава́ль з то́ю лихо́ю ба́баю, да ничо́ґо не пара́дзиць,—не кабы́ла, не праменя́е. Жа́литца Кава́ль мужчы́нам, а ты́е смею́тца да стро́яць ке́пики.— От дак Кава́ль,—ка́жуць,—и сарама́ ему́ нема́: жо́нка цяга́е за чупры́ну, ско́ро барадо́ю бы ве́никам бу́дзе пѣч вымѣ́таць —А Кавалю́ не да смѣ́ху, кали́ з лихо́ю сла́ду нема́. Мужчы́ны смею́тца, а Кава́ль чуць не пла́чэ. Папро́буваў е́н маўча́ць да не чапа́ць лихую ба́бу.

Дак ґдзѣ там! - ещэ ґарэ́й захадзи́ласа.—Што ты—ка́а — маўчы́ш бы пень, што цебе́ й не чува́ць —Верацы́цр ба́ба на ўсе село́ Со́рам Кавалю́, а не ве́дае, што пача́ць. Абры́дла ему́ свая́ ха́та, сво́й прыту́лак· хо́дзиць та з ку́зни ў ка́рчму, та з карчмы́ ў ку́зню Але́ ба́ба й тут еґо́ тра́пила да й дава́й зневажа́ць да пере́сциць пры лю́дзях Суздро́м ашале́ла ба́ба, не пуска́е Кава́ля й да ґаспо́ды.—Ну—ду́мае Кава́ль,—пачака́й-жэ, хвары́ць тваёй ма́тары, пайду́ да й утаплю́са Паба́чымо, як ты таґды́ бу́дзеш хвабры́тца.—Пашо́ў Кава́ль к раце́, ўзяў до́ўґи ражо́н да й ты́кае ў во́ду, выбира́е, ґдзѣ ґлыбе́й. Ты́каў ён, ты́каў, да й напа́ў на чо́ртаво ґнездо́. Спало́хаўса чорт· ба́чыць, што Кава́ль у еґо́ дзецёй павыни́звае во́чы, вы́скачыў з вады́ да й пыта́е—Кава́ль, што ты тут ро́биш?—От хачу́ тут цэ́ркаў будава́ць —Дава́й тут чорт праси́ць Кавали́, каб ён не чапа́ў ґэ́таґо ме́йсца —Дам —ка́жэ,—та́бе́, што зхо́чэш, то́лькн йдзи ты атсю́ль Дам табе́ мно́ґо зо́лата.—На ли́хо мнѣ зо́лато? Ве́даеш. што ў Кавали́ ру́ки па ло́каць у зо́лаце.—Пабуду́ю табе́ но́вую ха́ту.—На што́ мнѣ ха́та, кали́ мене́ й ў сваю́ халу́пу жо́нка не пуща́е —Дам па́ру харо́шых ко́ней.—Нѣ, нѣ!--замаха́ў Кава́ль рука́ми,—таґды́ жо́нка суздро́м супако́ю не дась: будзе ґры́зци, каб вазиў жыдо́ў, або́ пано́ў —Дак чаґо-ж ты хо́чэш?—Зраби́, каб жо́нка не ґры́зласа —Гэ, таґо́ й чорт не мажэ́ пара́дзиць!—А ґдзѣ чорт не йме, там ба́бу пашле́ —Хиба́ ґэ—кажэ чорт,—клин кли́на выґаня́е До́брэ, я пашука́ю таку́ю ба́бу, каб ена́ сунела́ тваю́ жо́нку.—На то́м ены́ й разышли́са. Чорт палецѣ́ў шука́ць тако́е ба́бы, каб ена́ спыни́ла Кавали́ху, а Кава́ль паду́маў, што ўтапи́тца ешэ́ паспе́е, да й пацеґса ў ка́рчму Тым ча́сам аглядзе́ласа Кавали́ха, што Кавали́ нема́ ни ў карме́, ни ў ку́зни. бе́ґае па селу́ з качарґо́ю, бы апанта́ная, ко́сы на сабе́ рве да крычы́ць на ўвесь свѣт. Сабрали́са лю́дзи да й ка́жуць, што ма́быць суздро́м ускруци́ласа Кавали́ха. А чорт тут аґина́етца да то́льки хвасто́м пакру́чвае, так ему́ ве́село пазира́ць на шаленую ба́бу. Стаи́ць чорг, прыслухо́ўваетца, што ґаво́раць лю́дзи. Адзи́н ка́жэ,

што лѣпш засили́тца, чым з тако́ю ба́баю ажани́тца Друґи́ кажэ, што лѣпш зґниць, чым з лихо́ю ба́баю жыць. Слу́хала, слу́хала тут адна́ маладзи́ца да й кажэ: „я-б е́ѣ атра́зу атучы́ла, каб я была́ е́ѣ ґаспадарэ́м“. Пасмея́лиса мужыки́, пастро́или ке́пики съ тако́ѣ хва́браѣ маладзи́цы да й дава́й расхо́дзитца на рабо́ту. Тым часам чорт и прычапи́ўса к то́й маладзи́цы.—Нау́чы́ да нау́чы́, штоб ты зраби́ла, каб суня́ць Кавали́ху —А што-ж ты за то́е даси?—Пыта́е маладзи́ца — Дам це́лую ша́пку ґро́шэй.— Нѣ, на што мнѣ це́лая ша́пка ґро́шей. Ты дай мнѣ хаця́ не це́лую ша́пку зо́лата.—Гэ́то ещэ́ лѣпш—ду́мае чорт да й ка́жэ,—до́брэ, дам не це́лую ша́пку зо́лата —Зґо́да—кажэ маладзи́ца,—прынеси́ зо́лато, та я нау́чу, што зраби́ць з Кавали́хаю.—Палецѣ́ў чорт збира́ць зо́лато, а ба́ба ўзела жлу́кту, паста́вила еѣ над по́ґрабам, а наверх пакла́ла дзира́вую ша́пку. От прынёс чорт зо́лато, сыпану́ў у ша́пку, а ено́ то́льки зазвинѣ́ло да чорт вѣ́дае куды́ й дзѣ́ласо Палецѣ́ў чорт удру́ґае, набра́ў то́льки зо́лата, што чуць прыци́с. Але́ сыпаў ён, сы́паў, а ў ша́пцы ничо́ґо не астае́тца — Абшука́ла ты мене́ — ка́жэ чорт.— Як абшука́ла? На то быў уґавор. Ты каза́ў, што даси́ не це́лую ша́пку ґро́шэй? Каза́ў ци нѣ?—Каза́ў.—Ша́пка не це́лая?—Не це́лая.—Дак як жэ я цебе́ абшука́ла? Гэ́то ты ма́быць хацѣ́ў мене́ абшука́ць.—И дава́й маладзи́ца пере́сциць чо́рта. Чуць той вы́рваўса Атро́кса й зо́лата да сунў́ў, падаґну́ўшы хво́ст От прыбеґае чорт к Кавалю́ да й ка́жэ, што знайшо́ў таку́ю маладзи́цу, але ена ве́льми хи́трая й так и так мене́ абшука́ла.—Малайцо́м маладзи́ца,—ду́мае Кава́ль и пыта́е чо́рта, ґдзѣ ена жыве́. Чорт каза́ў.— Пачака́й,—кажэ Кава́ль,— хибо я сам з е́ю паґаманю́.— От чорт палецѣ́ў па свайму́ дзѣлу, а Кава́ль пашо́ў к то́й маладзи́цы Вѣ́дамо, ў ле́тку, ўсѣ пашли́ на рабо́ту, а маладзи́ца сказа́ла гаспадару́, што бали́ць жыво́т и аста́ласа ў ха́це личы́ць ты́е ґро́шы, што прынёс чорт. Прышо́ў Кава́ль, пакаля́каў з маладзи́цаю да й падкациўса к е́й. Спадаба́ласа ему маладзи́ца да й ён спадаба́ўса. Вѣ́дамо, ґулящы чалавѣ́к да я́драны, бо свая́ лиха́я ба́ба. Нацѣ́шыўса Ка-

ва́ль за це́лы дзень, не́маль да са́маґо змро́ку, але́ ўзду́маў, што трэ́ й да ґаспо́ды.—Заѣ́сь мене́,—ка́жэ ён,—мая́ лиха́я ба́ба.—А маладзи́ца й наўчы́ла еґо, што зраби́ць з ба́баю Рад Кава́ль. Ещэ́ раз у падзя́ку ўґадзіў маладзи́цы да й пашо́ў смѣ́ло да гаспо́ды. Ось и ўба́чыла еґо́ жо́нка да пачне́ верашча́ць, да пачне́ зневажа́ць.—Гдзѣ́ ты вало́чышса, валацу́ґа?—Пытае ена́ да слепи́цаю ў во́чы лѣ́зе.—Пачака́й бо, бабо—ка́жэ Кава́ль,—я бы́ў у во́ласци. Мене́ хо́чуць вы́браць старшыно́ю да от не ўмѣ́ю, як но́ґи за карак залажы́ць.—Гэ́й, сяки́-таки́—кажэ Кавали́ха,—ось паґлядзи́, я цебе́ наўчу́.—Се́ла ґэ́то ба́ба на по́л, шамеля́х спадни́цу на ґо́лаў да й залажы́ла но́ґи за ка́рак. Тут Кава́ль узя́ў трапка́ч, звеза́ў е́й но́ґи да дава́й вучы́ць папру́жкаю па за́дницы. Кача́етца Кавали́ха бы клубо́к да вы́слабанитца не мажэ́. А Кава́ль памо́чвае папру́жку да лу́пиць ба́бу па ґо́луй за́дницы. Заклела́са да забажы́ласа Кавали́ха, што бо́льш не бу́дзе сварытца, што бу́дзе пакара́тца ґаспадару́. Здаво́лиўса Кава́ль и развеза́ў лиху́ю ба́бу. С таѣ́ пары стала Кавали́ха мя́ккая, хаць у ву́хо ўлажы́. А мо й за тымъ ещэ́ ена́ ста́ла до́брая, што Кава́ль ве́льми пача́ў учаща́ць к то́й маладзи́цы. А ве́дамо, люби́ жо́нку щы́ро, та ена́ й на ка́ракъ ся́дзе.

Пересказалъ И. Аземша.

С. Лучицы.

58. Бортникъ.

Было́ ве́льми лаґо́днае надво́рье: от так паведзи языко́м—бы ме́д. Гэ́то ўжэ́ я́кась па весне́ пе́рад ле́там. Ве́дамо,—паґо́да харо́шая, со́нейко зъя́е, аб но́чы пра́йшо́ў це́плы до́жджык; земля́ вы́купаласа, напила́са вады́—ўсе расце́, бы на дро́жджах. От так прылажы́ ву́хо к траве́, дак и чува́ць, як ена́ расце́. А кве́тки цвитуць, бы жар ґары́ць. Ад их так цепло́м и пы́шэ, й таки́ пах идзе́, што от усе-б нюхаў и нико́ли-б не нанюхаўса. З ра́на вы́пала ме-

до́вая раса́ да й разлила́са па кве́тках, па траве́ й па земли́, ба́тцэ ўзя́ў хто да сыто́ю й апы́рскаў усю́ зе́млю Со́нейко паднело́со ўго́ру да так прыго́ра, што з земли́ аж па́ра клу́бам пашла́, павалила бы з гаршка́. А со́нейко ўсе гре́е, ўсе печэ́. Куды́ ни гля́нь— усе блищы́ць, палыску́етца да так и трасе́тца, бы гарщо́к у пе́чы, як у е́м кипи́ць вада́. Раса́ вы́сахла, а ме́д так и аста́ўса на траве́ да на кве́тках. Чмели́, пчо́лы й матыли́ лета́юць, гуду́ць над кве́ткамі да ссуць мед. Бортник пано́хаў пове́трае, лизну́ў языко́м— чу́е, аж со́латко, й пацёгса ў лёс, гдзе́ на адро́х стаяли пчо́лы. Идзе е́н да йдзе; аж чуе — раву́ць пчо́лы не́мым го́ласам, аж лёс дрыжы́ць. Прыслухо́ўваетца Бо́ртник, аж мармы́чуць медзьве́дзи.— Ну—ду́мае.—гэ́то ены́ напа́ли на пчо́лы.—Пабе́г Бо́ртник ратава́ць. Бежы́ць е́н дзень, бежы́ць други́—чу́е: пчо́лы раву́ць, медзьве́дзи мармы́чуць, а дабе́гци не мажэ́. То́льки на тре́йци дзень дабе́г е́н да таго́ ме́йсца; ба́чыць, аж два медзьве́дзи напа́ли на пчалу́, задра́ли ее́, а са́ми лежа́ць да смо́кчуць ме́д. Вы́смактали ены́ пчалу́, то́льки дрэ́бы аста́ли́са. Падбегае тут Бо́ртник, а медзьве́дзи ста́ли на за́дние ла́пы да на его́ й ки́нулиса Падбе́г адзи́н медзьве́дзь, разя́виўса да на Бо́ртника, а той ухвациў адно́ю руко́ю за язы́к, а другу́ю засу́нуў у го́рло па са́мае плечо́, учапиўса за хво́ст да як пацёг, дак и вы́вернуў медзьведзя трыбуха́ми наве́рх. Раве́ той медзьве́дзь не сваи́м го́ласам, а други́, як уба́чыў то́е, дак пусциўса наўцекача́. Бо́ртник за им. Медзьве́дзь дабе́г да раки́, ки́нуўса ў во́ду да й пераплы́ў на други́ бо́к Падбе́г Бо́ртник к раце́ Як тут перайци́? Глыбо́ко, а плыва́ць е́н не мажэ́. Ду́маў, ду́маў Бо́ртник, ухапиў себе́ за чуб да як шыбануў, дак и пераки́нуў це́раз ре́ку. Спало́хаўса медзьве́дзь, бежы́ць да то́льки хвасто́м кру́ціць. Але́ ось даг на́ў его́ Бо́ртник, ухапиў за хво́ст да й дава́й маха́ць круго́м себе́. Маха́ў, маха́ў: тым ча́сам ось як атарве́тца хво́ст да палеци́ць медзьве́дзь, да ўре́жэтца галаво́ю аб дуб, дак и дух з его́ вы́перло. Злупиў Бо́ртник з гэ́стаго медзьве́дзя шку́ру, развёсиў ее́ на дзе́раве й па́шоў к пе́ршаму медзьве́дзю. Прыхо́дзиць е́н, аж тут назбира́-

ласо на медзьве́дзя крумкачъя́ бы хма́ра, клюю́ць ены́ ў медзьве́дзя вантро́бы. а ен кача́етца да раве́ От Бо́ртник атаґна́ў крумкачо́ў. дабіў медзьведзя, а з еґо шку́ры зрабіў сабе́ кажу́х. От разґля́дае Бо́ртник ту́ю пчалу́, што медзьве́дзи задра́ли,—ба́чыць, аж ґэ́то еґо́ пчала́. Узя́ў ґэ́то ен е́ дрэ́бы да й дава́й их паліва́ць меда́вымъ со́кам з кве́так. Абліва́е да абліва́е, а ко́сци ўсе абро́стаюць ми́сам. От пчала́ заварушы́ласа й ажыла́. Ажыла́ ена́, распра́вила кры́ла да й дзя́куе Бо́ртнику, што спас е́ ат сме́рци.— Я табе́ — ка́жэ,—прыґаджу́са ў прыґо́дзи,—а сама́, бзым! да й палеце́ла. Пашо́ў Бо́ртник да́лей и зайшо́ў у це́мны ґусты́ ле́с. Але́ ось усхадзи́ласа хви́ля Трацы́ць ле́с, ломитца, а хви́ля так и кру́уиць, так и кладзе́ дзераўля́ки к са́му́й земли́. Але́ ось заґрымаце́ло. бли́снула мала́нка, а пору́н адзи́н за адны́м так и сма́лиць, так и ґре́е. Ек тре́сне ў ду́ба, або ў хво́ю, дак и разпало́суе ат са́маґо ве́рху аж да ни́зу.— Ну,—ду́мае Бо́ртник,— сеґо́нячы Илья́ мно́ґо чарце́й напалю́е.—То́льки от лину́ў дож да таки́, што бы з ведра́ Куды́ тут схава́тца. Ба́чыць Бо́ртник, што яки́сь птах звиў сабе́ ґнездо́ на семи́ дубо́х. От и пале́з ен туды́, каб схава́тца ат дажджу́. Падла́зиць, аж там це́лые пала́цы. От куды́ там ле́пш, як у на́шаґо па́на. Уле́з Бо́ртник у ты́е пала́цы й азира́етца круґо́м, каб чаґо́ не замара́ць, так там усе́ блищы́ць и зъя́е, аж палыскуетца. От ен прасла́ў сво́й кажу́шак, ле́ґ да й паку́рвае сабе́ лю́лячку. Тым ча́сам дож лу́пиць, бы з латака́ лье. Зраби́ласо це́мно, як посеро́д ночы. То́льки як бли́зне, бли́сне мала́нка, дак аж во́чы сле́пиць. А як тре́сне перу́н да заґрымаци́ць да прыци́сне. дак аж пала́цы трасу́тца, ба́тцэ их тра́сца кало́циць. Перахрысциўса Бо́ртник, бо ста́ло ему́ ве́льми су́мно. Але́ ось так забли́скало, што ста́ло са́ўси́м видно́. Зирне́ Бо́ртник, аж пе́рад им стаи́ць така́я ґо́жая дзеўчы́на, што ни ў ка́зцы сказа́ць, ни перо́м написа́ць. Стаи́ць ґо́лая ў чо́м ма́ци радзи́ла, то́льки ко́сами закры́ла сарамаце́не. А ко́сы ў е́ до́ўґие, аж да пъят. Стаи́ць ена́ да ко́сы перабира́е.— Ма́быць ґэ́то руса́лка—ду́мае Бо́ртник. Ен чу́ў ат людзе́й, што ў

лѣсе русáлки падмáньваюць мужчы́н: абдымáютца, цалу́ютца да казлы́чуць цы́цкамі да тых час, пакýль не заказлы́чуць на смéрць. Абó падмáньваюць пѣснямі к раце́ й там тóпяць лáсых да баб дурны́х дзецюкóў. Зирнýў Бóртник, аж у таѣ дзеўчы́ны цы́цкп от так и тырчáць, бы сабáчые мóрдачки; тырчáць и падымáютца квéрху, бáтцэ што разнюхóўваюць. Спалóхаўса Бóртник, зняў з себе́ крыжык да й накúнуў на тую дзеўчы́ну. Тóльки éн гэ́то зрабиў, як ена́ й кáжэ— не бóйса мене́, дóбры чалавѣ́чe. Я табѣ́ не зраблю́ лúха. Цепéр я бýду табѣ́ служы́ць усé жы́це. Тóльки ты вы́звалъ мене́ з гэ́стаѣ невóли.— И пачала́ ена́ раскáзваць, што за сúним мóрэм, за высóкими гарáми, за балóтами да за лесáми е велúкае цáрство. Там жывýць лю́дзи ўсе гóжые: бѣ́лые да румъя́ные, бы кроў з малакóм. Там и ена́ жыла́ ў рóднаго бáцька, рýднаго бáцька—слáўнаго царá: ў рóднаѣ мáтки, рóднаѣ мáтки—слáўнаѣ цары́цы. Да налецѣ́ў на тóе цáрство за сúнее морэ, за высóкие гóры, за балóта да за лесы́ велúки змѣ́й и хватáў людзéй сáмых гóжых да ўдáлых, хватáў и ѣ́ў, абó ўнóсиў за сúнее мóрэ, за высóкие гóры, за балóта да за лесы́ й там раскидáў их на свѣ́це. Мнóго людзéй асирациў éн у тóм цáрстве, мнóго ен там пралиў люцкúх слез. Сжáлиўса над людзьмú слáўны цар— мóй рóдны бáцюшко й абъявиў усúм баґатырóм и силачóм, што хто ґаґó змѣ́я пабóрэ да злóвиць, за таґó слáўны цар —мóй рóдны бáцюшко атдáсь мене́ зáмуж. Прачýў тóе стрáшны змѣ́й, прачýў да пранюхáў, пабиў вóйсько хрáбрае, паламáў засóвы залѣ́зные, павысáджваў дзвéры дубóвые да й ухапиў мене́ ат слáўнаго царá—рóднаго бáцюшка, ат слáўнаѣ цары́цы—рóднаѣ мáтачки й панéс мене́ за сúнее мóрэ, за высóкие гóры, за велúкие балóта да за цéмные лесы́, прынéс сюды́ да й схавáў у ґэ́тумъ палáцы. Сам и да тых час улетáе да людзéй цяґáе. Былá тут адна́ бóжая пчóлка. Ена́ кóжын дзень ка мнѣ летáла да вѣ́стачки насúла ат слáўнаго царá— рóднаго бáцюшка да ат слáўнаѣ цары́цы—рóднаѣ мáтачки. Тóльки от ужэ дзéнькóй тры прайшлó, як еѣ немá. Чýла я—раўлú медзьвéдзи, раўлú стрáшно, аж земля́ дрыжáла. Чýла я -крычáла пчóлка,

нѣмым ґо́ласам крыча́ла да праси́ласа ратýнку. Крыча́ла-крыча́ла да й заци́хла Ма́быць медзьве́дзи маю́ пчо́лку задра́ли.

— Задра́ць ены́ задра́ли,—кажэ Бортник,—пчо́лку задра́ли, да за то́е сваѣ́ шкýры мнѣ атда́ли. О, ґэ́то й шкýра с аднаґо медзьве́дзя,—паказа́ў Бо́ртник на сво́й кажýшак. Царэ́ўна ўхваци́ла той кажýшак да й надзе́ла на себе́. Ба́чыць ена́, аж у медзьведжо́й шэ́рсци аста́ла́са та́я писýлька, што несла́ пчала́. Перачыта́ла ена́ тýю ка́рту да й ка́жэ: пи́шуць сла́ўны цар—мо́й ро́дны ба́цюшко да сла́ўная цары́ца—мая́ ро́дная ма́тачка, каб я ў змѣ́я вы́ведала, чаґо́ ен баи́тца й хто ево́ мажэ́ пабаро́ць. Да як мнѣ ево́ пыта́ци, кали́ ен не хо́чэ й размаўля́ци?

— Не турбýйса,—кажэ Бо́ртник—мая кра́ля, бо я хаць заґи́ну, цебе́ не паки́ну.

— Ой, сако́ле мо́й ясны, як табе́ с змѣ́ям цяґа́тца, кали́ ево́ ўсѣ людзи́ баятца?

Тым ча́сам заци́хли ґрымо́ты; паказа́ласо со́нейко с-за хма́ры. Так и зазъя́ли залаты́е пала́цы Але́ ось зно́ў усхадзи́ласа хви́ля. —Ой, хава́йса, сако́ле мо́й я́сны!—кажэ Бортнику царэ́ўна,—ґэ́тож леци́ць сюды́ знѣ́й.

Спало́халаса царэ́ўна, пачапи́ласа Бо́ртнику на шы́ю да й ви́сиць, бы непрытомная. Ухапи́ў Бо́ртник ѣ́ на бере́ме да дава́й Бо́ґ но́ґи: вы́скачыў з пала́цаў да й папе́рса ў ґущэ́чу. Ци до́ўґо, ци ма́ло ен пе́р царэ́ўну, то́льки ўтамиўса да й прысѣ́ў пад ду́бам, каб атды́хатца хаць тро́хи. Тым часам верну́ўса змѣ́й у сваѣ́ пала́цы. Чу́е—чужы́м ду́хам па́хне. Дава́й ен шука́ць царэ́ўну. Ба́чыць, аж атчы́няны дзве́ры. Даґада́ўса змѣ́й, што хто́сь укра́ў царэ́ўну, абазлиўса, ґрызену́ў себе́ за хво́ст да й палецѣ́ў даґаня́ць. Леци́ць змѣ́й, а ат таґо́ и́мпату пад им аж лѣ́с ґары́ць. Чу́е Бо́ртник, што змѣ́й ужэ́ бли́зко, ўхапиў царэ́ўну на бере́ме да й пуспиўса на бало́то. Гра́зко—вѣ́дамо бало́то, то́льки пами́ж дрыґвы́ ку́пины тырча́ць. Царэ́ўна мо́цно ўхапи́ласа за шы́ю да й трыма́етца, бы клѣщ. А Бо́ртник ска́чэ сабѣ́ да ска́чэ з ку́пины на ку́пину. Так и дабра́ўса ен да остраўка́.

Тым ча́сам далецѣ́ў змѣ́й да бало́та да й ду́мае, што ма́быць зґубиў слѣд, бо це́раз бало́то нихто́ не мажэ́ прайці́. Вернуўўса змѣ́й у пала́цы да дава́й аттуль нюхаць слѣд да йци за Бортникам. Ба́чыць Бо́ртник, што змѣ́й зґубиў слѣд, зрабиў на астраўку́ з вѣ́так кубе́льцэ да й ле́ґ з царэ́ўнаю спаць, бо ўже но́ч нахапиласа. Лежа́ць ены́ сабѣ́ да каля́кающь, а тым ча́сам и но́чка прайшла. Вѣ́дамо, ў лѣ́тку, яка́я но́ч. Заснўлн ены́, як ужэ́ ўзышло́ со́нейко. От ужэ́ пачало́ прыпека́ць, а ены́ спяць, бы зма́рлые, спяць и не чўюць, што змѣ́й прэ це́раз бало́то про́сто на астраво́к. Прыпекло́ со́нейко, загули́ чмели́ да пчо́лы над квѣ́тками — збира́юць ме́д. А Бо́ртник спиць и ничо́ґо не чўе. От ужэ́ змѣ́й на астраўку́, от-от нападзе́ на кубе́льцэ да й пажрэ́ Бо́ртника ра́зам с царэ́ўнаю адны́м хла́мам. Пе́ршы спало́хаўса змѣ́я за́йчык баязли́вы, ўсхапи́ўса с пад ку́ста, прылажы́ў ву́шы да як суне́, да ат стра́ху наско́чыў на са́мае кубе́льцэ, якра́з к Бо́ртнику на но́с. Чмы́хнуў Бо́ртник да й прахапи́ўса. Прахапиўса е́н—чу́е, аж змѣ́й бли́зко; ўштўрхаў ен царэ́ўну, хапи́ў ее́ на бере́ме да й папе́р да́лей це́раз бало́то. Бѣґбѣґ, дабѣґ да раки́. Рака́ ґлыбо́кая й шыро́кая. Як тут перабра́тца на другі́ бо́к! Стаи́ць ен на бе́разе да й ду́мае, ба́чыць, аж у раце́ ґра́е щупа́к.

— Щупа́к, о щупа́к!—про́сиць Бо́ртник,—перавези́ нас на другі́ бо́к раки́.

— Нѣ́кали мнѣ,—трэ лави́ць плотак.—Вильну́ў хвасто́мъ да й паплы́ў.

Ось леци́ць шуля́к. Бортник дава́й ео́ праси́ць,—шуляк, шуля́к, перанеси́ нас на другі́ бе́раґ.

— Нѣ́кали мнѣ,—трээ лави́ць пту́шак да карми́ць дзѣ́так.—Махну́ў шуля́к кры́лами да й палецѣ́ў. Прылецѣ́ла к раце́ пчо́лка пиць во́ду. Бо́ртникъ и про́сиць ее́;—пчо́лка, пчо́лка! перапра́ў нас на другі́ бе́раґ.—До́брэ,—ка́жэ пчо́лка,—я ўвесь вѣ́к раблю́ на людзей и на Бо́ґа Садзѣ́цеса на мене́. Се́ли Бо́ртник з царэ́ўнаю на пчо́лку, а ена́ растапы́рыла кры́лца да вум! и пералецѣ́ла це́раз ре́ку.

Дабе́ґ змѣ́й да раки́ да дава́й рабіць мо́ст. Навырыва́ў з каре́нем дубо́ў, нацяґа́ў у ре́ку да й заґаці́ў во́ду ата дна аж да ве́рху. Ецэ́ й да тых час там лежа́ць на днѣ́ раки́ це́лые дубы́. Тым ча́сам Бо́ртник дабра́ўса да ґаспо́ды. А ве́дамо, ў ґаспо́дзе ко́жын смелѣ́й. То́льки ось па нема́лум ча́се и прэ змѣ́й. Што тут рабіць' Ухапі́ў Бо́ртник зубе́ль, запали́ў его́ да й вы́скачыў з ха́ты Змѣ́й тут на его́ й напа́ў, а Бо́ртник и ўсадзі́ў зубе́ль змѣ́ю ў ґо́рло да дава́й з им бі́тца. Ци до́ўго, ци ма́ло ены́ бі́лиса, то́льки змѣ́й нача́ў над Бо́ртникам брацъ верх. Ба́чыць Бо́ртник, што ему́ прыхо́дзяць канцы́, ўзду́маў пра ту́ю пчалу́, што атрата́ў ат сме́рци, да й пазва́ў ее́ на по́мач. То́льки ен кли́кнуў,—пчала́, пчала́, памажы́ ў прыґо́дзе,—як сыпне́ сюды́ це́лы ро́й пчо́л, да як нападу́ць ены́ на змѣя, да пачну́ць его́ куса́ць, да пачну́ць ґрэ́ць. Круциў'са, круциў'са змѣ́й да й звиў'са бы вужа́ка. Усхапиў'са Бо́ртник, ухваціў' сакѣ́ру да й атсе́к змѣ́ю го́лаў. До́ўго круциў'са змѣ́й без ґалавы́, круциў'са, аж я́му вы́капаў. Падзя́кува́ў Бо́ртник пчале́, дабиў' змѣя да й садра́ў з его́ пере́стую шку́ру. Ра́да царэ́ўна, бы на свѣт нарадзи́ласа, дзя́куе Бо́ртнику й про́сиць его́, каб ен пашо́ў з ею́ ў то́е сла́ўнае ца́рство, к сла́ўнаму цару́—к ее́ ро́днаму ба́цьку, к слаўнуй цары́цы—к ее́ ро́днуй ма́тцэ, каб пашо́ў туды́. Сабра́ўса Бо́ртник у вели́кую даро́ґу, узя́ў з сабо́ю ко́пу лапце́ў, цаґало́, краменец да ґу́бку, палажы́ў у то́рбу змейную шку́ру да й пашо́ў з царэ́ўнаю ў сла́ўнае ца́рство, за си́нее мо́ре, за высо́кие ґо́ры, за вели́кие бало́та, за це́мные лесы́. Иду́ць ены́ да йду́ць; перайшли́ лесы́, перайшли бало́та, падхо́дзяць к ґара́м. А ґо́ры высо́кие аж да не́ба. Пачали́ ены́ ле́зци на ґо́ры. Ле́зли, ле́зли, дак и канца́ нема́. Ба́чаць ены́, аж на ду́бе арли́нае ґнездо́, а ў ґнездзе́ малы́е арленя́тка. Седзя́ць арленя́тки, раты́ разева́юць да е́сци про́сяць. От накарми́ли ены́ арленя́так, а са́ми се́ли атдыха́ць. Тым ча́сам на ґнездо́ напа́ла куни́ца. Ена́ хаце́ла пае́сци арленя́так. Тут Бо́ртник як перацёґ па́плискаю куни́цу, дак ена́ й вы́пруциласа На ґэ́ты час налета́е арол. Уба́чыў е́н, што Бо́ртник абрата́ў малы́х

дзе́так и ка́жэ — праси́, чаго́ хо́чэш.— Перанеси́ нас це́раз гэ́тые го́ры,—про́сиць Бо́ртник.—До́брэ, садзе́цеса на мене́. Се́ли гэ́то ены на арла́, а той и перамча́ў их це́раз высо́кие го́ры да це́раз синее мо́рэ. Падзя́кували ены́ арлу́ да й пашли́ к сла́ўнаму ца́ру да к цары́цы. Иду́ць да йдуць, распыто́ўваюць даро́гу. Нарэ́шце прышли́ ены́ к ца́рским пала́цам. Прывели́ их к цару́ й к цары́цы.

— Якие вы лю́дзи?—Пыта́е цар—атку́ль вы прышли́?

Не вазна́ў ен сваё дачки́, так ена́ пахудзе́ла ў змея да змени́ласа. Але́ як учу́ла цары́ца го́лас, дак и пазна́ла дачку́. Тут ена́ ки́нуласа к е́й на шы́ю й дава́й цалава́ць да абдыма́ць. Тым ча́сам Бо́ртник доста́ў з ка́йстры шку́ру змея да й прасла́ў ее́ на земли́. Спало́халиса ат аднаё шку́ры ўсе́ тут князи́ да баяры. От дава́й цар пыта́ць Бо́ртника, як е́н вы́звалиў царэ́ўну. Разказа́ў Бо́ртник, а цар з цары́цаю пасадзи́ли его́ з сабо́ю за сто́л и дава́й частава́ць. Па нема́лум ча́се атда́ў цар за Бо́ртника сваю дачку́— пракра́сную царэ́ўну, й ста́ли ены́ жыць да пажыва́ць да людзей не забыва́ць. А па сме́рци цара́ ста́ў ца́рствываць у то́м царстве Бо́ртник. Пры ем до́брэ было́ ўсим лю́дзям, бо е́н памета́ў, што той са́мы дужэ́йшы, хто ро́биць дзе́ля людзе́й и дзе́ля Бо́га.

Пересказалъ Болбатъ.

Д. Чудинъ.

59. Кавальчук и панич.

Жыў сабе́ адзи́н ве́льми цика́вы пан. Захаце́ласо ему́ знаць, што бу́дзе з малы́м дзи́цем, кали́-б его́ не так гадава́ць, як усе́ гаду́юць. Тым ча́сам якра́з у адну́ по́ру абрадзи́ниласа па́ни й кавали́ха. Абе́дзьве прывели́ го́жых хлапчукоў. От пан ци́хенько й паменя́ў гэ́тых дзецёй: сабе́ ўзяў кавальчука́, а кавалю́ атда́ў свайго хлапчука́. Расту́ць дзе́ци. Ве́дамо, за паничо́м хо́дзяць ма́мки, ня́ньки й уся дво́рня. Живе́ кавальчу́к у раско́шы, а па́ньськи сын

напрэ́тца бу́льбы, або́ сухо́го хлѣ́ба да й по́ўзае ў ґрази́ па ву́лицы. От прайшло ґадо́ў мо пъяць, або шѐсь, па́ньськи сын падро́с, и атпраўля́юць его́ пасци́ свине́й А кавальчука́ ў двары́ адуку́юць ґубарна́нтки да пѐсцятца з им, як з лихо́ю ску́лаю. Але́ ось паѣха́ў раз пан з па́няю на по́ле Узели́ еныі з сабо́ю й панича́. Ѣдуць еныі але́ села́ паўз вы́ґан, але́ ось и ба́чыць пан, што его́ сын пасе́ кавале́вые сви́не. От хлапчу́к ата́ґна́ў свине́й ат шко́ды, сѣ́ў але́ даро́ґи, праслаў на земли́ хусци́нку, даста́ў з ка́йстрачки кусо́к хлѣ́ба й пе́чанаѣ бу́льбы, палажы́ў на хусци́нку да й ѣсь. Падъѣха́ў туды́ пан. От хлапчу́к уста́ў и низенько пакланиўса па́ну.—Бачно́, што па́ньскае дзиця,—ду́мае пан. А па́ни й пыта́е ў ху́рмана,—чый ґэ́то та́ки пажо́ндны хло́пец?—Кавалеў, па́ни—ка́жэ ху́рман.—Брэ́шэш,—ду́мае пан, але́ маўчю́ць, зу́бы сця́ўпы Паѣхали еныі да́лей. Падъезжджа́юць к лѣ́су. Зирну́ла па́ни на лѣс да й ка́жэ,—я́ке ла́днэ джэ́во.—Штоб ты з его́ зрабіў?—пыта́е пан у панича́. Той паґлядзѣ́ў на лѣс да й ка́жэ—спалиў-бы, от до́брае-б уґо́лье было́.—Ду́рэнь е́стэсь!—ка́жэ пан, а сам ду́мае,—яки́ ба́цько, таки́ й сын. Кавальчу́к кавальчуко́м.

От паѣхали еныі наза́д; параўня́лиса з тым мѣ́йсцам, ґдзѣ́ па́ньськи сын па́сциць свиней, дак па́ни падазва́ла кавалеваго хлапчука́, зирну́ла на его́ й паказа́ласо е́й, што хлапчу́к ве́льми падо́бен да еѣ́ От и про́сиць ена́ па́на, каб е́н узя́ў кавалеваго хлапчука́ ў дво́р ґэдава́ць и адукава́ць ра́зам з панічо́м Пан з ра́дасцю ўзяў ат кавали́ свайґо́ сына ў дво́р, От пачали́ их адукава́ць Кавальчу́к до́брэ бере́тца, а пани́ч усе бѣ́ґае на пека́рню да с дваро́выми хло́пцами ґрае. Зпрактыкава́ў пан, што мужы́к мужыко́м на вѣ́ки веко́м да й прызна́ўса пани, што паменя́ў хлапчуко́ў ещэ́ мале́нькими. Праґна́ла па́ни панича́ к кавалю́ свине́й па́сциць, бо на друґо́е е́н не ґо́ж.

Пересказаль Дудка.

Д Чудинъ

60. Новы чорт.

Быў сабе́ адзи́н по́п, да ве́льми хсци́вы да маладзи́ц. Ве́дамо, з ґульни́ то́льки а ба́бах и ду́мае. Нае́сца, напъе́тца, вы́спитца ў вахво́ту, а тут ат са́ла шку́ра пу́каетца. По́йдуць лю́дзи на рабо́ту, а ён и цику́е, ци не прыдзе́ яка́я маладзи́ца зачы́м ко́львек да ґаспо́ды Як пакме́ціць, дак и прыста́не, бы шаўцо́ўская смала́ Перш маладзи́цы хава́лиса ат паґа́наґо папа́, а по́тым, як пача́ў ен навуча́ць, што по́п светы́, бо́ ён пасве́чаны, дак маладзи́цы й ду́маюць—мо й пра́ўда, што хто зна́етца з папо́м, та й ґраху́ нема, бо ён светы́. Ужэ́ хаце́ли мужчы́ны абре́заць ему́ ку́длы да паперабива́ць но́ґи, але́ по́п напужа́ў их, што не дась прыча́сця да пажа́литца станово́му, каб ены́ як недаве́рки, пагнили́ ў вастро́зе. Баятца мужыки́, маўча́ць. То́льки ось вельми ча́сто пана́дзиўса по́п к адно́й маладзи́цы. Е́ ґаспада́р маў яку́юсь до́хленькую кабы́лку й вазиў на ёй жыдо́ў. То́льки я́кась прыкме́циў ён, што як то́льки ён з двара́, дак по́п у ха́ту. От раз запро́ґ той ґаспада́р кабы́лку, накла́ў на во́з мно́ґо се́на, нибыто е́дзе ў вели́кую даро́ґу, й папха́ўса за село́. Гэто ўжэ было́ пе́рад змро́кам. От як ужэ́ до́брэ сцемне́ло, ґаспада́р верну́ўса да ґаспо́ды, да и сту́кае ў дзьве́ры, каб жо́нка атчыни́ла. Тым ча́сам у жо́нки начава́ў по́п. Схапи́ўса ен с пасце́ли да так без парто́к и бе́ґае па ха́це, не ве́дае, куды́ схава́тца. А тут у се́нячках стаяла кадушка з пе́ръем. По́п шамеля́х у ту́ю каду́шку да и прыкры́ўса пе́ръем. Атчыни́ла жо́нка дзве́ры, а ґаспада́р чуў, што по́п схава́ўса ў каду́шку, не йдзе ў ха́ту, да й ка́жэ жо́нцэ,—дай дзеру́ґу,—я пае́ду на кармаш. Дала́ жо́нка дзеру́ґу, а ґаспада́р наки́нуў ее́ на каду́шку да й абвеза́ў веро́ўкаю.— Павезу́, прада́м пе́ръе. Неха́й дармо́ не валя́етца. Ба́чыць маладзи́ца, што не́льґа ничо́ґо пара́дзиць, маўчы́ць, бы вады́ ў рот набра́ўшы. Узвалиў ґаспада́р кадушку з папо́м на во́з да й папе́р на карма́ш.

— Куды́ ты, ся́брэ?—пыта́ючь суседзи.

— Паѣ́ду на карма́ш прадава́ць но́ваґо чо́рта — ка́жэ той чалавѣ́к.

Дзи́вятца лю́дзи, яки там таки́ но́вы чорт. Про́сяць каб ен паказа́ў ту́ю пачва́ру.

— Немо́жне братки́—ўцечэ́.

Назбира́ласо мно́ґо людзе́й. Хо́чэтца им паґлядзѣ́ць таґо́ дзи́ва. Запрагли́ ены́ ко́ней и паѣ́хали ра́зам на карма́ш. Ци до́ўґо, ци ма́ло ены́ ѣ́хали, то́льки ось прыезджа́юць над цэ́ркаў на карман. Пашла́ там чу́тка, што чалавѣ́к прывъе́з но́ваго чо́рта, сабра́ло́со людзе́й, што аж кишы́ць. Вы́шли паны́ з цэ́ркви да й ты́е тыц туды́, паґлядзѣ́ць на такое дзи́во. А по́п, ве́дамо, до́ўґо седзе́ў у кадў́шцы й усе́ рабиў пад себе́, дак так абмара́ўса, так у ку́длы набила́со пѣ́ръя, што саўси́м стаў пахо́ж на чо́рта. От паны́ да паны́ абступи́ли во́з и про́сяць таґо́ чалавѣ́ка, каб ен паказа́ў чо́рта — Заплацѣ́це — ка́жэ — за маю́ турба́цаю. Я ду́маў, што хто ку́пиць.

От паны́ да жыды́ насы́пали таму́ чалавѣ́ку по́ўную ша́пку ґро́шэй. Пачали́ й мужыки́ развя́зваць сваѣ́ маґалѣ́йки да даставаць аттў́ль медзяки́. Назбира́ў той чалавѣ́к то́лько гро́шэй, ко́лько не было́ ещэ́ ни ў его́, ни ў его́ ба́цька. От стаў ен на во́зе, паставиў там кадў́шку да й развеза́ў дзеру́ґу.— Ну,—ка́жэ—выла́зь атсю́ль, но́вы чо́рце,—й дава́й его́ штў́рхаць кіям. Падня́ўса по́п з кадў́шки. Зирну́ць лю́дзи, аж ґэ́то яко́есь страшы́дло: высо́ки, худы́, с до́ўґими ку́длами да з вели́зазнаю барадо́ю, цыґла́ты, ў вадно́й саро́тцы без парто́к да так умазаўса да ўкача́ўса ў пѣ́ръе, што ры́хтык чорт. Ки́нулиса перш лю́дзи ат во́за, але́ хтось и ка́жэ,— ґэ́то-ж наш ба́цюшко. Зирну́ць усѣ́, аж пра́ўда — ґэ́то по́п. Со́рам таму́ папу́, саско́чыў ен з во́за да й сунўў, куды во́чы гледзя́ць. С таѣ́ пары́ ґо́дзи ен хадзи́ць к маладзи́цам.

Пересказаль И. Аземша.

С. Лучицы.

61. С чаго лихо на свѣце.

Цепе́р куды́ ни зірні́, ўсю́ды ли́хо на све́це. Ка́жуць—служы́ў адзи́н па́рабак и ўсе его́ застаўля́ли мало́ць у жо́рна. Ме́ле ён да ме́ле, прыслу́хаетца, дак мле́н у кло́паце ўсе ка́жэ: там лѣпш, там лѣпш! Наслу́хаўса таґо́ па́рабак, паки́нуў тут хаджа́ина да й пашо́ў туды́, ґдзѣ лѣпш. Прышо́ў ён и наня́ўса к другі́му хаджа́ину. Але́ й там заста́вили па́рабка мало́ць у жо́рна. Мало́ў ён мало́ў да й дава́й прыслухо́ўватца, што ка́жуць жо́рна. Чу́е, аж мле́н у кло́паце ўсе ка́жэ: як и там, так и тут! Як и там так и тут! Ки́нуў па́рабак и таґо ґаспадара́ да й пашо́ў шука́ць, ґдзѣ лѣпш. Але ко́лькі ен ни хадзіў, усю́ды застаўля́юць мало́ць у жо́рна й ены́ ўсе кажуць: як и там, так и тут! Як и там, так и тут!—Цепе́р усю́ды парабко́м ли́хо на све́це — ка́жэ па́рабак Пачу́ў то́е хаджа́ин, пакива́ў ґалаво́ю да й ка́жэ—нѣ, ма́быць цепе́р уси́м и ўсю́ды ли́хо на све́це. Дак от я раскажу́ вам с чаго́ ли́хо на све́це. Кали́ пра́ўду скажу́—смека́йце, а прыхлушу́—не меша́йце да прабача́йце, бо як уста́рытца, та й пра́ўда бу́дзе.

Даўны́м даўно́ спрадве́ку жыли́ саб'е́ лю́дзи, пажыва́ли, ниякаґо ли́ха не зна́ли. Свѣт вели́ки: ўсю́ды во̀лно; як патрудзіўса, так и пажывіўса. Не было́ таґды́ ни пано́ў, ни мужыко́ў, а так саб'е́ лю́дзи жыли—пажыва́ли да Бо́ґа выхваля́ли, а ни аб чо́м ены́ не клапасци́лиса. А Бо́ґ таґды́ ещэ́ жыў на земли́, прыхо́дзіў к лю́дзям, бы сво́й брат, вучы́ў их, як на све́це жыць да дзѣ́так пладзи́ць, дзѣ́так пладзи́ць да ґадава́ць да зе́млю напаўня́ць. И не было́ на земли́ ни ли́ха, ни дабра́. Лю́дзи бы квѣ́тки цвили́; жыли́ бы пту́шки ў не́бе, ци ры́ба ў вадзѣ́; жыли́, што стре́ли, та ўжыва́ли—ни ща́сця, ни беды́ не ма́ли. Але́ што тако́е жы́це? Так жыве́ й звераъе́ па лѣ́се; так жыве́ й дзераўля́ка. Бо́ґ уба́чыў то́е да й пача́ў учы́ць людзе́й, як латвѣ́й даста́ць йм жы́ўнасць, як зраби́ць

саб'е́ адзе́жу, як схава́тца ў непаго́ду, як лави́ць ры́бу да звераъе да пту́шак. И пазна́ли таґды́ лю́дзи, што каму́ ўлажы́ў Бо́ґ ро́зум, той мажэ́ рабі́ць, што хо́чэ.— Гэ, мы й са́ми з вуса́ми — ка́жуць лю́дзи,—што захо́чэм, то́е зро́бим. Мы й са́ми, бы баґи́, то́льки Бо́ґ затым не даў нам си́лы, ўла́дзы, што баи́тца, каб земле́ю заўлада́ўшы, мы не ўзду́мали й само́ґо Бо́ґа сапхну́ць з не́ба И атступи́ўса таґды́ Бо́ґ ат ґа́рдых людзе́й и пашо́ў саб'е́ на не́бо. Але́ пачали́ святы́е анелы праси́ць Бо́ґа, каб не ґуби́ў людзей. И сказа́ў им Бо́ґ, што дае ен лю́дзям ула́дзу на зе́млю: на ўсе, што расце́ на земли́ на ўселя́кае звераъе, што жыве́ па ле́се, па паля́х, бало́тах. на земли́ й пад землею: над пту́шками, што купа́ютца над не́бам; над ры́бами, што ў вадзе́ ґуля́юць во́лно. И бу́дуць маць лю́дзи ула́дзу над уси́м, што е ў земли́ й на земли́. И бу́дзе лю́дзям до́брэ жыць на све́це, кали́ ены́ не захо́чуць маць ула́дзу адзи́н над друґи́м, а кали́ ўзду́маюць над людзьми́ панава́ць, та пазна́юць и добро́ й ли́хо й дату́ль бу́дзе ли́хо, паку́ль лю́дзи бу́дуць маць ула́дзу над людзьми́. Але́ я даў лю́дзям ро́зум, каб ены́ са́ми пазна́ли, с чаґо ли́хо на све́це. И ро́зум пака́жэ лю́дзям дароґу, як ли́хо адале́ць и як так жыць и маць ула́дзу над уси́м на земли́. каб уси́м было́ до́брэ и каб не было́ ли́ха. И про́сяць Бо́ґа святы́е ане́лы, каб е́н пасла́ў их на зе́млю служы́ць лю́дзям и барани́ц их ат ли́ха. И пазво́лиў Бо́ґ ане́лам сцераґци людзей, а сам веле́ў яснаму со́нейку свеци́ць лю́дзям, каб ат таґо́ све́ту ены́ набира́лиса ро́зуму, таґо́ вели́каґо ро́зуму, што мацне́й усеґо́ на све́це. Пакланили́са ане́лы Бо́ґу да й палеце́ли на зе́млю сцераґци людзе́й. Тым часо́ве, паку́ль святы́е ане́лы блаґали Бо́ґа, шатан не спаў. Уба́чыў ен, што Бо́ґ атступиўса ат людзе́й и паки́нуў зе́млю, дава́й ґэто падбива́ць дужэ́йшых, каб ены́ бра́ли ўла́дзу над слабе́йшыми. Дава́й ґэто дуже́йшые атбира́ць ат слабе́йшых, што ты́е зро́бляць, дава́й их прымуша́ць рабі́ць на себе́, дава́й и́ми ўлада́ць, бы сваим добро́м. От ґэ шата́н дуже́йшых да хитре́йшых зрабиў пана́ми й атда́ў им у ру́ки ўсих слабе́йшых людзей. И пашло́ с тае́ пары́ ли́хо

на земли́, пашло́ тако́е ли́хо, што й сказа́ць не мо́жне. Пачали́ паны́ лави́ць людзе́й, бы зверье́, пачали́ их мэ́нчыць да здзе́куватца, ба́тцэ ґэ́то й не лю́дзи, а ґаўя́до. Прылеце́ли светы́е ане́лы, су́нулиса туды́-сюды́, пачали́ падбухтэ́рваць людзе́й, каб ены́ не слу́хали пано́ў. Дак куды́ там!—ста́ло ещэ́ ґаре́й: паны́ ўзели́ ўла́дзу на зе́млю, пачали́ мары́ць людзе́й ґо́ладам, пачали́ их биць да забива́ць, да адзи́н на друґо́ґо насыла́ць. Папро́бували светы́е анелы сказа́ць, што е Бо́ґ на не́бе, што Ен усе́ ба́чыць и чу́е, што за тако́е ли́хо Ен пакара́е пано́ў. Слу́хали-слу́хали то́е паны́ да й ка́жуць—э, што вы нам ба́еце! Вы там седзе́ли на не́бе й нічо́ґо не зна́еце, што тут ро́битца на земли́. Мужы́к без па́на абайци́са не мо́жэ: бъе́тца, дзера́тца—сцержы́, ты Бо́жэ! Над мужыко́м трээ стаяць з бизуно́м над ка́ркам да ещэ́ трыма́ць во́з лазы́ за хвальва́ркам, бо ў мужыка́ така́я натура́, што без бизуна́ сверби́ць шкура́. Ен бы свиня́ напра́тца, нажра́тца, ўле́зе ў ґразь да й ду́мае, што князь. Мужы́к без ущу́нку не зна́йдзе сабе́ ратунку, бо е́н да па́ньскаґо дабра́ хци́вы, а на работу—лени́вы; бу́дзе ат ґо́ладу падыха́ць, а на баку́ лежа́ць. Адно́ ли́хо на све́це бу́дзе, як мужы́к во́лнась дабу́дзе. Свет переведзе́тца—адна беда́ астанетца.

Учу́ўшы то́е светы́е ане́лы палеце́ли к Бо́ґу на ска́ргу. Тым часо́ве паны́ запанава́ли й ли́ха-б не зна́ли, кали́-б не пачали́ вымышля́ць да адзи́н друґо́ґо е́сци, пажыра́ць. Паны́ прами́ж сабо́ю бъю́тца--дзеру́тца, а ў мужыко́ў ґи́ры трасу́тца, да йлбы́ тращаць, аж ски́вицы вища́ць. И паслаў Бо́ґ на зе́млю светы́х ане́лаў с чарця́ми ваева́ць, а светы́х праро́каў—людзе́й навуча́ць. Але́ ни ане́лы, ни праро́ки ничо́ґо не зраби́ли, бо ены́ слаўцо́м, а ли́хо дубцо́м. Ены́ па бо́жаму пра́ўду ла́дзяць, а паны́ ў вус смею́тца да че́рава ґла́дзяць. Так да тых час мужыки́ ґару́юць, мужыки́ працу́юць, а хле́ба не ма́юць, часам ґо́ладам падыха́юць, бо што ни зро́бляць, та паны́ здзира́юць. А паны́ пану́юць, ничо́ґо ие ро́бляць да ли́хо вымышля́юць, бо за сабо́ю чо́ртаву си́лу ма́юць. И нема́ ратунку ат тако́ґо жыця, бо ено́ ўсе, бы камє́ня ку́ча, сверху цяжкае ка-

мѣне дрóбных на песóк расцéрло дóле; свéрху их ґнетýць другíе а на тых лежáць и цíснуць дóлу ещэ́ цяжéйшые; свéрху-ж лéґ адзíн велíки кáмень. От ґэ́ спрадвѣ́ку й да тых час лíхо людзéй дáвиць, лíхо цíсне людзéй свéрху к долý, бы ў кýчы тóй камѣ́не. Тращы́ць кýча, трэ́ камѣ́не, на жарствý их трэ́ на дóле: тращы́ць и хýтко асядáе, асядáе нíжэ-нíжэ да ўсе нíжытца да дóлу. Мáбыць скóро затращáць падпóрки й разсы́плетца ўся кýча. Так и ў жы́цю: ўсе ґарéй-ґарéй бѣ́дным лю́дзям, бо нарóд мнóжытца, а свѣт адзíн. И так цѣ́сно лю́дзям на землí, а тут и тóе, што е слимазáрнае, дужéйшые лю́дзи захвацíли да й трымáюць, бы воўк зубáми. Забивáюць, паедáюць лю́дзи адзíн другóґо ґарéй, як звѣр звѣ́ра. Ены не знáюць таґо, што адзíн чалавѣ́к не мáе мóцы, бы чарвя́к, бы тáя былíнка ў пóли: налецíць вѣ́цер, закрýцiць хвíля да й сатрэ́, зраўнýе з землéю. Быў чалавѣ́к—пхх! й немá, бы й на свѣт не радзíўся. Тóльки таґды́ чалавѣ́к мóцны, як ён не адзíн, а жыве з другíми людзьмí ў зґóдзе да ў ладý. И чаґó тóльки не зробляць лю́дзи, калí вóзьмутца за дзѣ́ло грамáдаю, бы адзíн чалавѣ́к. Алé от ґэ́таго й не знáли лю́дзи, не знáли як жыць на свѣ́це, каб усíм было́ дóбрэ. Кóжын цéґ да себé, кóжын кóшкаў к сабѣ́, кóжын на другíх, як на вараґóў пазирáў и кóжын другíх вараґáми маў. И затрáцили лю́дзи ўсѣ́ свáѣ сíлы тóльки на тóе, каб адалѣ́ць свайх вараґóў—такíх сáмых людзéй, як и ены́. Так спрадвѣ́ку бíлися лю́дзи, нíщыли адны́ другíх. От атчаґó лíхо на свѣ́це. Алé як сказáў Бóґ, так и стáласо: радзíўся на свѣ́це ясны рóзум и пачáў расцí; тóльки расцé ён так цíхо, так памалéчку, што чалавѣ́к вѣк пражывé, а рóзуму чуць на крыху прыбýдзе. Адны́ лю́дзи ўмираюць, другíе раджáютца. Ены пражывýць вѣк и аслабаняюць мѣ́йсцо другíм. Тые гэ-ж спло́дзяць дзецéй и памрýць. Так и жывýць лю́дзи, бы вадá цечэ́ ў рацé. А рóзум хаць цíхо, памалéчку, да ўсе расцé, расцé й паднимáетца на нóґи. От як вы́расце той, ясны бы сóнейко рóзум да пачнé свецíць лю́дзям у вочы, та таґды́ ўсѣ́ пазнáюць, с чаґó лíхо на свѣ́це, пазнáюць праўду, паднímутца ў зґóдзе,

бы адзин чалавѣк, праґоняць паґа́ную не́чысь и зажыву́ць на земли́, бы ў раю́. Мы ўжэ не даждо́мса таґо́, але́ мо́о на́шы дзѣци ци ўну́ки таки́ дачака́юць.

Пересказалъ Михаль Кравецъ.

Лер Гаврильчицы.

---

62. Калатня.

Была́ ў аднаґо́ чалавѣка жо́нка ве́льми языка́тая да така́я за-я́длая, што як пачне́ сварыцца, дак и хаджа́йство забу́дзе: ки́не рабо́ту да ўсе крычы́ць, зневажа́е, аж запѣнитца, бы кру́чаны саба́ка. Неха́й то́льки хто зачѣпиць, дак ена́ ґато́ва ни пиць, ни ѣсци, а ўсе сварыцца. Гаспада́р знаў еѣ но́раў и маўча́ў, бы сцена́ або́ йшоў сабѣ на рабо́ту. Ба́ба пакрычы́ць-пакрычы́ць у тако́м ра́зе, паку́ль е́й жыво́т не забали́ць, нарэ́шце й суни́метца. Але́ от таґды́ беда́, як щѣпитца ена́ сварыцца з сусѣдками: таґды́ хаць вадо́ю разлива́й, бы саба́к. Вѣдамо, ба́бы, адна́ другі́ў не змаўча́ць: пад ни́муць калатню́ на ўсе село́. Збеґу́тца лю́дзи, смею́тца да кпи́нки стро́яць, а ба́бы да ты́х час сва́ратца да зневажа́юць адна́ другу́ю на чо́м свѣт стаиць и выдумо́ўваюць, што было́, чаґо́ й не было́, поку́ль так уто́мятца й так ахры́пнуць, што ґо́ласу нема́. От раз щапи́ласа та́я ба́ба сварыцца з сусѣдкаю Сусѣдка така́я-ж была́ языка́тая. От як начали́ ены́ з ра́на калаци́тца, дак забы́ли, што трэ́й у пе́чах пали́ць да абѣд варыць. Учу́ў ґаспада́р, што его́ ба́ба заўзела́са сварыцца, прыбѣґ туды́ да й ка́жэ сваёй паґа́ную жо́нцэ— ґэ́й, ба́бо! Ты ўжэ ўтами́ласа й ахры́пла. Дава́й я за цебе́ бу́ду сварыцца, а ты йдзи абѣд варыць.—И пача́ў тут той чалавѣк кала-ци́тца з чужо́ю ба́баю.—Да ты така́я, як твая́ сестра́... Да й ма́ци твая́ така́я... Да й ба́цько твой таки́.. Да й цетка твая́ така́я... Да й дзя́цько твой таки́... Уве́сь ро́д твой таки́... Усѣ вы такие.. Па-слу́хала жо́нка, што еѣ ґаспада́р ґо́жэ сва́рытца, да й пашла́ мо́ўчки варыць абѣд. Наварыла ена́, выняла страву з пе́чы, паста́-

вила на стол да й выбеґла на вулицу паслухаць, як ґаспадар зневажае сусєдку. аж той стайць да курыць люльку, а сусєдка палентуе на усе село да так вычвараe, што аж сорам казаць. Тут жонка накинуласа на свайго гаспадара, чаму не лаетца. От ен скажэ слово „такая твая й матка“ да й плюне. А баба крычыць, аж пукаетца Ена ахрыпла, уся пасинела, а усе крычыць да клинетца Нарэшце павернууса ґаспадар к жонцы да й кажэ. „ну, бабо, я утамиуса. цепер пайду абєдаць да атдыхаць, а ты сабє сварыса на здоровейко! — Усє вы такие!“ — сказаў ен бабам да й пашоў да ґасподы.

Пересказалъ Крукъ.

Хут Млынокъ

63. Падарожны.

Ишоў здалека адзин падарожны, утамнуса, праґаладаўса й проситца на нач. Абышоў усе село—нихто не нрымае, такие там жылі паґаные людзи. Што тут рабиць? Хаць начуй пад плотам! Стайць ґэто падарожны серод вулицы да й думае, што тут парадзиць. Тым часам идзе старац—здравенны мужык, чырваны, бы рыжок. Падарожны зняў шапку да к ему Так и так,—кажэ,—нихто не прымае нанач. Памажы упрасиць людзей. Што хочэш дам, толъки паратуй у бедзє.—Добрэ—кажэ старац—толъки ты дай мнє за тое саракоўку. Шкода падарожнаму грошэй, але нема чаго рабиць. Даставў ен калиту, выняў саракоўку й атдаў старцу.—Ну—кажэ старац,—я буду нибыто слепы, а ты будзь маим павадырэм.—Узяўса старац за кий и пашли ены ў адну хату. Уязяць ены, аж там госци. Заспеваў старац сває жаласливыє пєсни, а падарожны нибыто памаґае. Зацихли госци—слухаюць да уздыхаюць. Паспеваў трохи старац да й проситца на нач.—Да начуйце-ж божые людзи—кажэ ґаспадар и давай ґаняць бабу, каб ена скарей падала им пачостку. Ог толъки пасадзили их за стол, а госци пачали расходзитца, ары-

ляда́етца ґаспада́р к падарŏжнаму да й ка́жэ—ґэ, чалавѣ́чэ, ты нас падма́ньваеш: ты не ўбо́ґи, а той падарŏжны, што неда́ўно прасиўса на́ нач Ба́чыць падарŏжны, што папа́ўса да й прызна́ўса ва ўсе́м.—Ну—ка́жэ ґаспада́р,—неха́й цебе́ баґи́ лю́бяць! Начава́ць—начу́й, а за то́е, што зхацѣ́ў нас абшука́ць, астава́йса без вечэ́ры Падзя́куваў падарŏжны й за то́е да й прылеґ сабѣ́ на ла́ве спачыва́ць. Тым часам ён ба́чыць, як часту́юць ста́рца, ба́чыць, куды́ ґаспады́ня хава́е тую пачо́стку, што астала́са ат ґасце́й. От напе́рса ста́рац, падзя́куваў за пачо́стку, да й леґли́ ены́ ўсѣ спачыва́ць Як леґли́, так и захрапли́—спяць, бы заби́тые Тŏлько падарŏжнаму не спи́тца. Вѣ́дамо, ґалŏдны. Варо́чаўса ен, варо́чаўса, а потымъ ци́хенько ўстаў, забра́ўса туды́, ґдзѣ ґаспады́ня пахава́ла пачо́стку да ўсе й ула́дуваў, а крŏшками сы́ра абсы́паў да яе́чняю вы́мазаў ста́рцу бо́раду. По́сле таґо́ лёґ сабѣ́ падарŏжны спачыва́ць. От даў Бŏґ дзень: узшту́рхалиса лю́дзи. Уста́ла ґаспады́ня ўзду́ла лучы́ну да як зирне́ на ста́рцаву бо́раду да паґлядзи́ць, што нема́ ни яе́чни, ни сы́ра, да пачне́ ста́рца зневажа́ць, да пачне́ хрысци́ць еґо́ кавенёю, дак той аж невѣ́дае, куды́ дзѣ́тца й дава́й праси́ць у падарŏжнаґо рату́нку. От падарŏжны й ка́жэ—а ба́чыш, як до́брэ браць ґро́шы з людзе́й, кали́ ены́ ў прыґо́дзе.—Атда́м и ґро́шы, тŏльки рату́й ат лихо́ѣ ба́бы. А та́я пере́сциць еґо́ кавене́ю. Тут падарŏжны ўхапиў за каўнѣ́р ста́рца да й вы́мчаў еґо́ з ха́ты. Атда́ў ста́рац саракŏўку да ещэ́ й падзя́нуваў падарŏжнаму, што ён укры́ў еґо́ ат лихо́ѣ ба́бы. Дак от у даро́зе ўсе трапля́етца.

Пересказалъ Крукъ.

Хут. Млынокъ.

64. Зна̀хадка.

Гэ́то было́ мо́о ўжэ за ва́шу па́мец от тут не дале́ко, кале́ Слу́цька. Мо́о вѣ́даеце, там на шляху́ стаи́ць карчо́мка. Эґэ́! Дак от у ґэ́стŏй карчо́мцы жыў Ме́ндаль—ат сабѣ́ жыдо́к. Як жэ ка́жуць—

як спиць, е́сци, пиць не про́сиць. Але́ ве́дамо жыд—за ґро́шы паве́ситца. Пра́ўду ка́жуць лю́дзи, што ко́жын жыд шы́беницы варт. Так той и Ме́ндаль. Але́ ось я раскажу́ вам усе́ папара́дку, як то́е было́. Мо́о чу́ли, быў там ве́льми ва́жны пан. Ён быў маршалкам и ча́сто е́здзиў да Аршавы. Ве́дамо, за даўне́йшые ча́сы чаґу́нки ещэ́ не было́, да й шашэ́й ещэ́ не рабили; бо там, ба́чыце, цепе́р идзе́ шашэ́й з Бабру́йська да Аршавы. Даўне́й усе́ е́здзили шляхам паўз Ме́ндаляву карчо́мку. От раз ґэ́ты пан марша́лак якось у пя́тницу е́хаў шляхам да Аршавы. Ён ве́з з сабо́ю ве́льми ва́жные папе́ры й мно́ґо ґро́шэй. От кале́ са́маё карчо́мки атвеза́ласа вализа, й пан згубиў папе́ры й ґро́шы. Праёхаў пан мо́о миль дзвё й таґды́ то́льки аґле́дзяўса, што нема́ вали́зы. Ён наза́д шука́ць ґро́шэй. Тым ча́сам Ме́ндаль вы́сунуўса на шлях, ўба́чыў вали́зу, прывало́к е́ё ў карчо́мку да як разре́заў да ўба́чыў мно́ґо ґро́шэй, дак аж затро́сса. Схава́ў ґэ́то ён ґро́шы, а папе́ры й вали́зу завало́к к са́жалцы, накла́ў туды́ каме́ня да й затапиў у во́ду.—Ну, Хайка,— ка́жэ жо́нцы,—цепе́р ми ой, ой якие вели́кие паны́. А ты маўці́, ни ко́му не казы́, каб ни хто́ не знаў, што я канцы́ ў вада́ схава́ў.—Так усю́ но́ч и на за́ўтрэ ўвесь дзень то́льки й гергета́ли прами́ж себе́ Ме́ндаль з Ха́йкаю пра па́ньські ґро́шы. Хо́дзяць, ничо́ґо не ро́бляць, бы шале́ные. Тым ча́сам усю́ды, бы ў бу́бен бъюць, усе́ ґаво́раць, што пан зґубиў ве́льми мно́ґо ґро́шэй. Верну́ўса пан, шука́ў-шука́ў—прапа́ли ґро́шы, бы ка́мень у во́ду. Але́ ось у ша́баш прыхо́дзиць у карчо́мку з села́ дзе́ўка Маръя́на даи́ць каро́вў. Ве́дамо, жыдо́м у сыбо́ту немо́жна ничо́ґо рабиць. От пашла́ Маръя́на ў хле́ў да й пачала́ даи́ць каро́ву; тым ча́сам падышла́ туды́ Ха́йка да й ка́жэ—Маръя́на, а Маръя́на! Спасли́вы, цу́ес, той цалаве́к, хто знайсо́ў ты́е ґро́сыки.—А хто-ж, апры́ч ва́шых—ка́жэ Маръя́на. Ґэ́тым ена́ хаце́ла сказа́ць, што хто-ж друґи́ знайшо́ў ґро́шы, апры́ч жыдо́ў. Ены́ вало́чатца па шляху́, та пе́ўне паднели́ й ґро́шы. Але́ Ха́йка нс зразуме́ла ре́чи Маръя́ны да й ка́жэ—Сты́ги ґэрт! Аткуль ты зна́еш? Хи́бо табе́ Ме́ндаль сказа́ў?—Аўжэ́-ж

сказа́ў—пашуткава́ла Маръя́на.—Цу́ес, Маръя́на, маўцы́,—дам табе́ сто рубли́.—Да хава́й Бо́жэ, каб я маўча́ла, а по́ґань спажыва́ла ты́е ґро́шы. Пайду́ да й скажу́ пану́.

Тут Ха́йка пабе́ґла к Ме́ндалю, каб сказа́ць, што Маръя́на ўсе зна́е. Але́ не знайшла́ Ме́ндаля у карчо́мцы, бо е́н не вы́церпеў и пашо́ў к суседу, каб наґаварытца пра ґро́шыки. Тым ча́сам Маръя́на падайла каро́ву да беґо́м у двор к па́ну. Так и так—усе́ й вы́лажыла. Пан барзджэ́й ки́нуўса ў карчо́мку и велеў звеза́ць Ме́ндаля. Звеза́ли Ме́ндаля й прывели́ к па́ну.—Ах вы галґа́ны—як закрычы́ць пан на слуґ,—за цо вы звяза́ли е́го? То-ж мо́й па́ктар, пожо́ндны жы́дэк. Развье́нзаць его!—Развяза́ли Ме́ндаля, а пан пасадзиў еґо́ ра́зам з сабо́ю за сто́л да й пыта́е, ґдзе́ е́н схава́ў ґро́шы.—У або́зни пано́цку—ка́жэ Ме́ндаль.—А папе́ры?—пыта́е пан.—Затапиў у са́жалка, пано́цку!—По́каж, гдзе! Павъе́ў Ме́ндаль, паказа́ў, ґдзе́ схо́ваны й ґро́шы, й папе́ры. Палезь сам пан у во́ду па са́мы по́яс и даста́ў папе́ры. От забра́ў пан ґро́шы й папе́ры да й сказа́ў слу́ґам, каб ены́ зноў звеза́ли Ме́ндаля да й завезли́ да Слу́цька ў вастро́ґ, а Маръя́не велеў даць па́ру вало́ў, каня́, дзве́ каро́вы й сто рубле́ў.

Пересказалъ Кравецъ.

Дер. Мазали.

---

65. Смѣлы.

Собрали́са раз мужчы́ны й пачали́ спраша́тца, хто з их смелейшы. До́ўго ены́ спраша́лиса й разска́звали, якие з и́ми были́ стра́хи й што ены́ не пало́халиса. Седзе́ў тут адзи́н чалаве́к; е́н мо́ўчки куры́ў лю́льку да слу́хаў, як выхваля́ютса смельчаки́. Чаго́ то́льки ены́ не разска́звали. Адзи́н ка́жэ, што его́ як апанава́ли ча́рци ў ле́се, дак е́н атбива́ўса ат их усю но́ч, аж да све́ту. Други́ разска́звае, што его́ раз апанава́ла ў Пили́паўку во́ўчая ґанья́ й што

ґэ́то ма́быць были́ ваўкалаки́. Та ось яки́сь смельча́к разска́звае, як за им ґаня́ўса небо́щык на мо́ґлицах. Слу́хаў, слу́хаў той чалавѣ́к, маўча́ў, маўча́ў да й ка́жэ—ґо́дзи вам хлуси́ць, ґо́дзи выхваля́тца, бо ўсѣ вы еднако́во баязли́вые й не то, каб што, але́ от нихто́ з вас не асмѣ́литца пайці́ цепе́р на мо́ґлицы й уби́ць ко́л у маґи́лу ведзьмара́. Пачали́ тут хлусы́ выхваля́тца адзи́н пе́рад другі́м и ґаварыць, што небая́тца ведзьмара́ й смѣ́ло забъю́ць у еґо́ маґи́лу ко́л, але́ як прышло́со ґэ́тае зраби́ць, та ўсѣ пачали́ ўви́льваць, то́льки адзи́н са́мы смѣ́лы вы́зваўса таґды́-ж пайці́ на мо́ґлицы по́ўначы да й заби́ць ко́л. От и пашли́ тут дзецюки́ ў закла́д на ґа́рнец ґаре́лки. Дзѣ́ло было́ аб о́сени. Но́чы це́мные, хаць во́ко вы́каль—ничо́ґо не бачно́. Узя́ў той смѣ́лы чалавѣ́к ко́л да й пашо́ў адзи́н на мо́ґлицы. Мо́ґлицы были́ не дале́ко ат села́ на ўзґо́рачку каля́ раки́. Пашо́ў ён, а мужчы́ны ўзели́ зу́бленку да ци́хенько за им слѣ́дам да назиркам. Идзе́ сабѣ́ той смельча́к, кало́м размахвае да, каб было́ смелѣ́й, бурчы́ць пад но́с пѣ́сню. Падышо́ў к мо́ґлицам, пастая́ў тро́хи, паслу́хаў, а по́тым пералѣ́з це́раз пло́т да й пашо́ў шука́ць маґи́лы ведзьмара́. Ена́ была́ каля́ са́маґо таґо́ ду́ба, што на ём завѣ́сиўса адзи́н чалавѣ́к. Падышо́ў смѣ́лы дзецю́к к са́муй маґи́ле, прысѣ́ў на ко́ртачки, абма́цаў капе́ц и дава́й уби́ваць у зе́млю ко́л От забиў ён мо́цно ко́л и хацѣ́ў уста́ць да йци к дзецюко́м, але́ не мажэ́ падня́тца. От ён ту́затца туды́-сюды́—нема́ ра́ды: ведзьмар трыма́е бы зуба́ми. Спало́хаўса наш смельча́к и дава́й крыча́ць нѣ́мым ґо́ласам, ба́тцэ еґо́ хто ре́жэ. Пачу́ли то́е дзецюки́, засвеци́ли зу́бленку да туды́. Ба́чаць ены́, аж смельча́к прыбиў кало́м к земли́ палу сваѣ́ сви́ты да й кача́етца каля́ капца́. Уба́чыў ён дзецюхо́ў да й не ве́рыць, што ґэ́то лю́дзи, так ён спало́хаўса. Наси́лу дзецюки́ ўґаварыли еґо́ да прывели́ да ґаспо́ды. Але́ ён так спало́хаўса, што чуць не памъёр. Дак от якие мы смѣ́лые. Мо́о й усѣ́ ґэ? Што вы ска́жэце?

Пересказалъ Кравецъ.

Дер. Мазали

66. Адуко́ваны бычок.

Жыли́ саб'е́ дзе́д да ба́ба й не было́ ў их дзецей. Чаго́ ни рабі́ла ба́ба, к яки́м зна́харо́м и знахо́ркам ена́ не хадзі́ла, яки́х зельеў не пила́ — ничо́го не памага́е: нема́ дзецей да й то́льки Абхадзі́ла ена́ ўсе́ про́щы. Нарэ́шце пара́ила адна́ маладзи́ца, каб ена́ пашла́ на ра́ду к папу́.—Ба́чыш, папо́дзи пло́дныя, бы свине— ка́жэ та́я маладзи́ца,—схадзі́ к на́шаму папу́, занесі́ ему́ гасци́нца да папраси́ его́ го́жэнько, мо́о й ублага́еш. Ён ужэ́ мно́гим само́г. Цепе́р дзя́куюць. — Адзе́ласа гэ́то та́я ба́ба, бы ў свя́то. набра́ла гасци́нцаў да й пашла́ к папу́. Атдала́ ена́ папу́ гасци́нцы да й прызна́ласа ва ўсе́м, бы на спо́ведзи. От по́п тро́хи наблагатаў и дава́й лечы́ць ба́бу. Лечы́ў ён, лечы́ў, аж е́е сагре́ў да й сам спаце́ў.—Ну—ка́жэ,—прыхадзі́, ба́бо, што́ дзень це́лы ты́дзень. Хо́дзиць ба́ба к папу́ ко́жын дзень. А по́п е́е ўсе ле́чыць. Быў у папа́ шалапаваты па́рабак. Бе́дамо, папы́ лю́бяць дзержа́ць шалапава́тых парабко́ў, бо ены́ не беру́ць гро́шэй, а слу́жаць дармо́. От и падгле́дзяў той шалапава́ты па́рабак, як по́п ле́чыць ба́бу да й ка́жэ—ба́цюшко, гэ й я ўме́ю лечы́ць, як ба́цюшко. От ле́тась як палечы́ў на́шу цели́цу, дак ба́чыш, яко́го ена́ прывела́ го́жаго бычка́. Паплева́ў тут по́п, пала́яў шалапава́таго па́рабка, ўзяў таго́ бычка́, завъе́з у ле́с да й ки́нуў, каб ён там заги́нуў Але́ ось па́сцили ў ле́се пастухи́ гаўя́до, спатка́ли таго́ бычка́ да й прыгна́ли ў село́. Прыбиўса ён к гаўя́ду таго́ дзе́да з ба́баю да й прыце́гса на дво́р. От седзя́ць дзе́д з ба́баю на пры́збе да сваю́ беду́ разважа́юць. Тым ча́сам падхо́дзиць к им убо́ги. Пача́ў ён мали́тца да выспе́ўваць сва́е пе́сни. От абдары́ла ба́ба таго́ ўбо́гато й дава́й заганя́ць гаўя́до. Зирне́ ена́, аж яки́сь бычо́к, як уба́чыў е́е, дак падбе́г, ла́щытца, тре́тца кале́ хвартуха́, от бы дзиця. А гэ́то той са́мы бычо́к, што по́п завъе́ў у ле́с Ба́чыце, шалапава́ты па́рабак ла́щыў таго́ бычка́ да й прывучы́ў его́ к рука́м. Хо́дзиць бычо́к за ба́баю хвасто́м, бы дзиця́. Уба́чыў то́е ўбо́ги да й ка́жэ.—От разу́мнае

целя́, бы дзиця́: з его́ бу́дуць лю́дзи. Падзя́куваў ўбо́ґи да й пашо́ў да́лей. А дзе́д з ба́баю ўсе ду́маюць, што-б ґэ́то сказаа́ў убо́ґи. Ма́быць ґэ́то Бо́ґ даў нам не целя́, а дзиця́; то́льки лихие лю́дзи абернýли его́ ў целя́. От дава́й ены́ ґадава́ць таґо́ бычка́, бы сва́е дзиця́. Расце́ бычо́к, бы на дро́жджах, а дзе́д з ба́баю са́ми не даеду́ць, а ўсе его́ ко́рмяць. Ху́тко вы́рас таки́ ґо́жы бык, што хаць у со́ху запраґа́й. Не нара́дуютца дзе́д з ба́баю; ня́ньчатца з быко́м, бы з дзи́цем. Усе ду́маюць ены́, што ґэ́то заклято́, што им даў Бо́ґ сы́на, а лихие ведзьмаки́ так прырабили, што дзиця́ ста́ло бычко́м. От и пачали́ дзе́д з ба́баю жу́пиць да ра́дзитца, ґдзе́-б им найци́ тако́ґо чалаве́ка, тако́ґо мо́цнаґо знахара́, каб е́н атрабиў и абернýў бычка́ ў чалаве́ка. Жу́пили ены́, жу́пили прами́ж сабо́ю да й нара́дзилиса атда́ць свайґо́ бычка́ ў адука́цу, каб з его́ были́ лю́дзи. От сабра́ўса дзе́д у дарóґу, залыґа́ў бычка́ да й павъе́ў у све́т, шука́ць тако́ґо мо́цнаґо везьмара́, каб е́н вы́адукаваў и перарабіў таґо́ бычка́. Иду́ць ены́ да йдуць, але́ ось сустрака́е их яки́сь чалаве́к и пыта́е, куды́ дзе́д ведзе свайґо́ бычка́.

— У адука́цу, мо́й сако́лику. Ґэ́то, ба́чыш, не бычо́к, а мо́й сын, да то́льки закляли́ его́ лихие лю́дзи, каб им хвере́ць да стаґна́ць да й на то́м све́це дабра́ не маць. Закляли́, от я й шука́ю тако́ґо чалаве́ка, каб е́н атрабиў да вы́адукаваў майґо́ сы́на.

— Ґэ, дзе́ду!—ка́жэ ˈой—я з ґэ́стаґо то́льки й жыву́. Дава́й мне́ свайґо́ бычка́,—з его́ бу́дуць лю́дзи. Я ўсе атраблю́ да так вы́адукую, што ты то́льки падзи́вишса.

— Ой, мо́й ле́бедзику, да як ещэ́ бу́ду дзя́куваць. Беры́ да й рабі́, што тре́.

От и пашли́ ены́ ра́зам. Прышли́ да ґаспо́ды таґо́ ведзьмара́. а тут и но́ч нахапи́ласа. Аста́ўса дзе́д начава́ць. Усю́ но́ч ведзьма́р пазира́ў на зо́ры—ўсе ґада́ў да разґа́дваў, як ґэ́то заклято́ бычка́. Па ра́нку павъе́ў ведзьма́р дзе́да й бычка́ ў ле́с, напаи́ць вадо́ю з свенцо́нае крыни́цы. От спуска́ютца ены́ с узґо́рачка ў дали́ну, аж пад таўщэ́разным ду́бам крыни́ца. Ена́ не вели́чкая, бы ре́шато,

але́ з е́ѣ так и бъе вада́ чы́стая бы слеза́ да хало́дная бы ле́д Перш ведзьма́р што́сь шапта́ў, заґава́рваў ту́ю во́ду, по́тым напіў́са сам и напаі́ў дзе́да. От падво́дзиць е́н к крыни́цы бычка́, а той упира́етца, не хо́чэ. Ве́дамо, ґаўя́до не лю́биць крыни́чнаѣ вады́, бо ена́ ве́льми хало́дная. Але́ як ни круциўса бычо́к, ведзьма́р таки́ таўканў́ў его́ мо́рдаю ў во́ду. Абма́чы́ў бык пы́ски да то́льки зачмы́хаў. От павели́ ены́ бычка́ наза́д да ґаспо́ды. Дзе́д ведзе́ за павадо́к, а ведзьма́р идзе́ о́бак. Иду́ць ены́ да йдуць, але́ штось бычо́к упира́етца Тузану́ў дзе́д за павадо́к, пацо́каў—бычо́к упира́етца. Азирне́тца ен, аж зза́ду на павадку́ таки́ ґо́жы, высо́ки хлапчу́к за́мест бычка́. Падзивіу́са дзе́д, а ведзьма́р и ка́жэ—ґэ́тож я атрабіў́. От зирни́, яки́ твой сын. То́льки цепе́р тре́ его́ адукава́ць. Заґаманіў было́ дзе́д к хлапчуку́, але́ той маўчы́ць, бы пень.— Нѣ, дзе́ду,— ка́жэ ведзьма́р,— пе́рш тре́ адукава́ць. От прышли́ ены́ к ведзьмару́ да гаспо́ды. Дзя́куе дзе́д, дае́ ведзьмару́ гро́шы да абецае́ бо́льш прынесци́ да й ґверта́етца да ґаспо́ды. Прышоў дзе́д да ґаспо́ды да й разска́звае сваёй ба́бе, яко́е з им было́ дзи́во. Ра́да ба́ба, аж падско́квае.—А што, ци я не каза́ла—крычы́ць ена́ на ўсе село́,—ци я не каза́ла, што ґэ́то хло́пец, а не бычо́к. Ци я не каза́ла, што ґэ́то ба́цюшко зрабіў́, ба́цюшко вы́прасиў у Бо́ґа нам пацѣ́ху на ста́расци.

Бѣ́ґае ба́ба па селу́ да крычы́ць, лямантуе, па дзе́сяць раз разска́звае лю́дзям, як по́п е́ѣ лечы́ў, як малиўса й як Бо́ґ паслаў е́й бычка́ да што то не бычо́к, а хлапчу́к. Дзи́вятца лю́дзи да й ка́жуць—на ўсе бо́ская мо́ц. Наси́лу дзе́д тро́хи ўняў ба́бу, сабра́ў гро́шэй, нала́дуваў це́лы во́з уселя́каґо дабра́ да й павъе́з таму́ ведзьмару́, каб ен до́брэ даґлядаў да щы́лно адукава́ў хлапчука́. Ба́чыць, аж хлапчу́к ужэ́ стаў дзецюко́м, да таки́м ґо́жым, разу́мным да ўда́лым, што й не ўвазна́ць. От ѣ́здзиў, ѣ́здзиў адзи́н дзе́д, але́ нарэ́шце пачала́ праґци́са ба́ба, каб е́н и е́ѣ ўзяў з сабо́ю паґлядзе́ць дзецюка́. От сабра́ўса дзе́д да й паѣхаў з ба́баю. Прыезджа́юць ены́ к та́му ведзьмару́ й пыта́юць, ґдзе́ их дзецю́к. А

ведзьмáр да й кáжэ - ґэ, маѣ сакóлики, ваш дзецюк цепéр такí велúки пан. што ў еґо й крýкам нóса не дастáць.

— Гдзѣ-ж ён?—пытáюць старыe.—А онь у дварé—камысáрам. Менé й знаць нехóчэ—кáжэ ведзьмáр.

От и паѣхали дзѣд з бáбаю ў двóр шукáць таґó камысáра. Дапытáлиса ены й лѣзуць прóсто ў станцаю Бáба, дак тáя плúщыць цэлы прыпóл кускóў хлѣба, каб пакармúць свайґó бычкá, як енá кармúла еґó колись. Камысáр седзѣў за сталóм и пераґартáў якиесь папéры: алé ўбачыў дзѣда з бáбаю да як закрычыць на их, што им трé. чаґó ены сюды лѣзуць.

— Бач, якí сердзúты—кáжэ бáба к дзѣду.—Алé рыхтых бычóк,—нáват лысинка асталáса. Тóльки той ценѣй рыкáў.

От трасé бáба прыпóлам, падхóдзиць ближéй к сталý да й завé - бучóк, бучóк, бучóк!

Пазирáе камысáр и не мажэ разшалóпаць, што ґэстые людзи ґаворáць и чаґó ены прышлí.

— Бучóк, бучóк, бучок' на-ш бо табѣ лýсту хлѣба...

— Вон!—крычыць камысáр да лýпиць кулакáми па сталý.

— Бэч, бэч!—кáжэ дзѣд. И замахнýўса цýґаю да й сперазáў камысáра па лысине.—Гэй, вóўчае мясо! Хибá-ж ты нас не пазнáў'—Да й давáй лупúць, давáй перéсциць камысара. Насúлу той уцéк. Збѣґласа тут уся двóрня. Павелí дзѣда з бáбаю к пáну Той пытáў, пытáў и ничóґо не дапытáўса, а падýмаў, што ґэто крýчаные людзи да й велѣў запéрци их у свíран. Дак от яки адукóваны бычóк.

Пересказалъ Каваль.

Дер. Чудинъ.

---

67. Петрò Велúки.

У вадно̀м цáрстве памер цар. У еґó не былó дзецéй—нѣкаму былó цáрствуваць над людзьмí. И зрабúўса там велúки мецѣж. Пашлá такáя развaрýха, што никóму жыця немá. Вѣдамо, паны

хо́чуць свайґо́ пасадзи́ць на ца́рство. Князи́ свайґо́. Нема́ зґо́ды. Набира́юць людзе́й, ваю́юць адны́ з друґи́ми. Им ни ґа́дки, а лю́дзи забива́юць адны́ друґи́х, ни́щаць край да марну́юць дабро́. А наро́д, вѣ́дамо, дурны́, бы гаўя́до: куды́ еґо́ ґо́няць. туды́ йдзе, што ка́жуць, то́е ра́біць. Наш брат це́мны, паднево́лны, ґатоўў за тых, або друґи́х пано́ў и на ро́днаґо ба́цька паднятца. От кру́цяць паны́ да ваю́юць прами́ж сабо́ю—сваи́ми людзьмі́ да на сваи́х людзе́й иду́ць, забива́юць, па́ляць ве́ски да дворы́, а ўсе не мо́ґуць вы́браць сабѣ́ цара́. По́сле цара́ аста́ла́са цары́ца. Але́, вѣ́дамо, ба́ба — нихто́ еѣ́ не слу́хае. От и ўцекла́ ена́ з ца́рских пала́цаў да й схава́ласа на селѣ́ ў аднаґо до́браго чалавѣ́ка. Шука́юць паны́ цары́цу. каб еѣ́ забі́ць. Не так еѣ́ баялиса паны́, як таґо́, каб ена́ не парадзи́ла сы́на. Ена́, ба́чыце, была́ то́ўстая й хадзи́ла на пары́. Шука́юць, кало́цяць паны́ па ўсих се́лах. Прыхо́дзяць ены́ й у то́е село́, ґдзѣ́ жыла́ цары́ца. Ба́чыць той до́бры чалавѣ́к, што паны́ ўжэ́ бли́зко. павъе́ў е́н цары́цу ў ґумно́ да й захава́ў еѣ́ у сало́му. Але́ от прышо́ў час и ў цары́цы радзиўса сын, Петро́ Вели́ки. Седзи́ць цары́ца з сы́нам у сало́ме, аж вараґи́ прыхо́дзяць и ў ґэ́стае ґумно́. Зирну́ли ены́ туды́-сюды́ да ўжэ́ хацѣ́ли й да́лей ици, але́ адзи́н узяў ви́лы да й парну́ў у сало́му. Чу́юць ены́ аж Петро́ Вели́ки крычы́ць з сало́мы таки́м ґро́мким ґо́ласам, што ены́ аж прысѣ́ли ат стра́ху.—Хто там по́рэ, што чуць ачо́ў не павыма́ў! Атсѣ́кци ему́ ґо́лаў! Спало́халиса ты́е мецѣ́жники, пабелѣ́ли бы палатно́, стаяць да кало́цятца бы аси́на. Але́ ось выла́зиць з сало́мы сам Петро́ Вели́ки —хло́пец у ко́сы са́жэнь вышыне́ю. Уба́чыли еґо́ мецѣ́жники, пакланилиса да земли́ да й дава́й прасіць, дава́й мали́ць, каб е́н не ґнѣ́ваўса й аста́виў их жывы́ми. Клину́тца, што бу́дуць служы́ць ему́ да са́маѣ сме́рци. Сжа́лиўса Петро́ Вели́ки, прасциў им, забра́ў ма́тку-цары́цу да й паѣ́хаў у стали́цу ца́рствуваць. Усю́ды сустрака́юць еґо́ лю́дзи з абраза́ми да з хлѣ́бам, а мецѣ́жники ўцека́юць, куды́ но́ґи несу́ць. И пача́ў с таѣ́ пары́ Петро́ Вели́ки ца́рствуваць да вараґо́ў пабива́ць. И пакары́лиса ему́ ўсѣ́ князи́ да карали́:

тольки с адным китаецам Петро Велики не ваевау. Ен знау, што як падниметца китаевец, та будзе канец свету.

Пересказалъ Грышко.

Дер Чудинъ

68. Дваранин.

Быу сабе адзин дваранин, на прозвиско Петрбуськи. Ен не мау ни двара, ни падданых, а так сабе вадачыуса ат аднаго пана к другому. Гдзе прыстане к паном на палеване, гдзе трохи паслужыць намесникам, або акамонам. От так и жывиуса целы век. Бо,— як жэ кажуць —ен ат хаджайства атбиуса, ат земли атарваўса, але й неба не дастау да так и пелепаетца памиж небам и землею, бы баранобы яйца. Але, ведамо, дваранин,—ен усе таки спаганяе панство. Дармо, што у его часам у гаршку трасца кипиць, за то на назе чабот рыпиць. А на нашаго брата мужыка йнак не пазираe, бы як на гаўядо. Бало на палевани ци што, крычыць—мужык, гад! У цебе у роце чорно. Дак от яки то дваранин быу, бо не мау сваe хаты, а бы сабака, на дваре жыу да на людзей брахау, батцэ-б сваe добро аберагау. Але як ен ни круциуса, да таки да лиха дажыуса, як тые паляки, што ни хлеба, ни табаки. А ведамо як трывога, та й да Бога. От пан Петрбуськи пашоу да касцела, укленчыу да й молитца: „пане Езу Хрыста, дай мне рубли трыста, але й без еднэго не вэзма". Ходзиць ен кожын дзень да касцела да усе молитца, усе просиць рубли трыста, ни на шэляг не збауляе. Падслухау тое ксендз и велеу арганистаму зрабиць пробу, што з таго будзе, даць Петрбуськаму без аднаго трыста рублеу. От як Петрбуськи укленчыушы малиуса—пане Езу Хрыста, дай мне рубли трыста. Без еднэго не вэзма,—арганисты залез на хоры да й спусциу аттуль на нитачцэ дзвеста дзевятдзисят дзевяць рублеу у Петрбусь-

каґо пе́рад са́мым но́сам Петрӧўськи пераличы́ў грошы, палажы́ў их у кишэ́ню да й ка́жэ— ке́ды пан Езус Хры́ста даў ру́бли тры́ста без едне́го, то дась и ўшы́стко. Дзенько́ваць за бӧскую ла́ску. Пры ґэ́тых слава́х Петрӧўськи падня́ўса на но́ґи й хаце́ў ищи́, але́ чу́е, хтось ка́жэ—хаць жэ пан Петрӧўськи шля́хциц, але́ кеп!— Гэто сказа́ў кс̀е́ндз, бо ему́ шко́да ста́ло ґро́шэй. А Петрӧўськи паду́маў, што ґэ́то ка́жэ Езус. Закипе́ў Петрӧўськи, аж затрӧсса ат зло́сци да й крычы́ць на ўвесь касцел—цо, цо? Я кеп. З ла́ски бӧской е́стэм пан Петрӧўськи, радави́ты шля́хциц да пато́пу да прзы́тым и двожа́нин гэро́льдэм утвердзо́ны, а ты з жы́дковъ.— И пашо́ў з касце́ла. Дак от яки́ быў ґанаро́вы дварани́н пан Петрӧўськи.

Пересказалъ Раман Стайковы.

С. Комаровичи

---

69. Паморак.

Яко́ѣ тӧльки пля́ґи нема́ на людзе́й! От так беда́ на бедзѣ́ е́дзе да ещэ́ бедо́ю паґаня́е. Пастаи́ш — беда́ наґо́ниць; пабежы́ш — на беду́ налеци́ш. И жыве́ш усе́ жы́це, бы звѣр у лихо́м о́ступе: куды́ ни су́нса,—бедзѣ́ ў зу́бы. Там зирне́ш—беда́ ат Бо́ґа: та нахапи́ўса марӧз и памаро́зиў сады́, аґаро́ды, а то й хлѣб на по́ли да траву́ на сенажа́ци; та ґрад атбиў усе́, што вы́хаваласо ат маро́зу, або си́веру; та нахо́питца скло́ка да й пакру́ціць, пало́міць усе́ збӧжэ; та пӧи́дзе аблӧжны дож и да тых час лье, паку́ль усе́ заґи́не й на по́ли й на сенажа́ци; та прыпечэ́ со́нейко, й земля́ ґара́чая бы пры́сак, хаць ты ў е́й яйца печы́. А то дась Бӧґ харо́шае лѣцечко, дак тут аткуль во́зьмутца ўселя́кие по́шасци да памӧрак на ґаўя́до, або й на людзе́й. Але́ ка́жуць, што ґэ́то не ат Бо́ґа, што ґэ́то насыла́юць лихие лю́дзи. От я вамъ разскажу́, як то́е было́ ў адно́м мѣ́йсцы. Была́ ра́нняя, але́ ве́льми ґо́жая весна́. Кӧжную нӧчку

йдзе ци́хи, цёплы до́жджык, а ў дзень свѣ́циць я́снае со́нейко да ґрє́е зе́млю, ба́тцэ ма́тка ху́кае да пѣ́стуе сваé дзиця́тко. А павѣ́трае такóе лаґо̆днае, што от здаéтца, пасадзи́ на поли дзиця́, та ено́ й вы́расце, бы ґарбу́з на аґаро́дзе. Ба́чаць лю́дзи, што ўсе расцé от бы на дро́жджах Наста́ло лѣ́то: Бо̆ґ крыў ат ґра́ду, й так зарадзи́ло, што й дзева́ць нѣ́куды. Алé не ра́ды лю́дзи зраджа́ю, бо вѣ́дамо, наш брат так прывы́к к уселя́ко̆ў бедзѣ́, што еґо́ й до́брае палохае. От и пашла́ прачу́тка, што хаць Бо̆ґ даў вели́ки зраджа́й, алé бу́дзе памо̆рак, и нѣ́каму бу́дзе спажыва́ць. Спало́халиса лю́дзи ўраджа́ю ґарє́й са́маѣ беды́. Хо́дзяць ены́ засмуцо́ные, бы ў во́ду апу́щаны. То̆льки ось па во́сени й пача́ў памо̆рак каси́ць перш ґаўя́до, а по́тым и людзе́й. Было́ там адно́ село́, куды́ ешэ́ не дабра́ўса памо̆рак. Жыву́ць там лю́дзи пад стра́хам и ко̆жную часи́ну чака́юць беды́, бы во̆л до́ўбни А каб хваро́ба не забра́ласа ў их село́, пачали́ бераґци́са. А ка́жуць жэ, што беражо́наґо й Бо̆ґ беражэ́. Так и ты́е лю́дзи. Пашли́ ены́ перш уси́м село́м у лѣ́с, звали́ли там са́мую высо́кую да вынéслую хво́ю, зраби́ли з еѣ́ крыж, мо́о сажо́н дзе́сяць, на сабѣ́ вы́несли з лѣ́су, самату́ґам прывезли́ ў село́, паста́вили на ўзґо̆рачку, каб атусю́ль вида́ць было́. Тым ча́сам дзецюки́ палажы́ли калé кры́жа брусо́к я́сеню, а друґи́м наперемѣ́нку пачали́ еґо́ цéрци; цéрли ены́, цéрли да туль, паку́ль прылажы́ли ґу́бку, дак та́я й заґарє́ласа. От узели́ лю́дзи таґо́ аґню́ ва ўсѣ́ ха́ты да й нико́чи не перавóдзили еґо́. А на то̆м мѣ́йсцы, ґдзѣ́ даста́ли аґонь и па канцо̆х у́лицы пачали́ дзень и но̆ч пали́ць кастры́, каб памо̆рак не мо̆ґ вайци́ ў село́. Гаўя́до-ж ены́ заґна́ли далéко ат села́ ў цéмные лесы́, на астраўки́ за бало́то, параби́ли там каша́ры й пасцили статак да са́маѣ зимы́. Ра́но й вéчар ко̆жнаґо дня абку́рвали ґаўя́до тхары́наю: пало́жаць на ўґо́лье куски́ су́шанаѣ тхары́ны да й падкўрваюць ґаўя́до. Круґо́м расхо́дзитца таки́ смуро̆д, што аж но́с зрыва́е Тут ни я́кая хваро́ба, ни я́кая по́шасць не вы́трымае. От ужэ́ даў Бо̆ґ и во́сень; ско́ро й за́маразки. Круґо́м памо̆рак ло́скам кладзé ґаўя́до, ко́сиць людзе́й, бы

касо́ю, а ў то́е село́ не мажэ́ ўпли́щытца. От э̀н пусциўса на хитрась: ски́нуўса старо́ю ба́баю да й ця́гнетца ґлухо́ю сце́жкаю к селу́. Ця́гнетца ена́; аж наґаня́е ту́ю хваро́бу адзи́н чалаве́к.

— Куды́, ба́бо, йдзеш?—пыта́е ен ту́ю стра́шную ба́бу.

— Иду́, ґо́лубе. ў то́е село́, ґдзе́ нема́шака памо́рку.

Даґада́ўса тут чалаве́к, што ґэ́то й е той са́мы памо́рак, спало́хаўса, чуць жыў, але́ сащапіў зу́бы, прамаўча́ў да й ка́жэ—хадзе́м ра́зам. От иду́ць ены́ да йдуць, прышли́ к ґра́зкаму бало́ту. Це́раз бало́то трэ йци па бе́рвам и кладкам.

— Идзи́ ты, ба́бо, ўпе́радзь да дзержы́са за мо́й кий—кажэ́ чалаве́к.

Су́нетца ба́ба, абира́етца па бе́рвам да мо́цно трыма́етца за кий. От то́льки ўзышли́ ены́ на кла́дки ў са́муй про́рве, а чалаве́к як хисне́ ба́бу, дак та́я й шу́снула ў ґразь. А ме́йсцо то́е было́ паґа́нае, тако́е ґра́зкае да ґлыбо́кае, што й дна не доста́ць. Утапиўса памо́рак у ґрази́, што й щу́рачки не пашли́. Ки́нуўса той чалаве́к бего́м да ґаспо́ды да й разска́звае, як было, як памо́рак хаце́ў прыйці́ ў село́ Пачу́ли то́е лю́дзи да й дава́й пилно пилнава́ць, каб непусци́ць памо́рку. Але́ от пае́хаў з таґо́ села́ адзи́н чалаве́к на ґрудок па се́но Развершы́ў э́н стажо́к и дава́й кла́сци на во́з се́но. То́лько вы́таптаў драби́нки, аж ось вы́сунуўса з хмы́зніку яки́сь стра́шны дзе́д з до́ўґаю, касма́таю барадо́ю, с адны́м во́кам да й падхо́дзиць к во́зу, апира́ючыса на кие́чак. Зирну́ў той чалаве́к да й спало́хаўса: ещэ́ нико́ли э̀н не ба́чыў тако́ґо страшнаґо дзе́да й паду́маў, што хи́бо ґэ́то памо́рак. Тым ча́сам паду́паў дзе́д адны́м во́кам да й про́сиць падвезци́ ево́ да села́. Паду́маў той чалаве́к да й ка́жэ—давезци́ та я давезу́, то́льки мо́о на́шы лю́дзи не пу́сцяць цебе́ ў село́, бо. ба́чыш, ены вартуюць, каб у село́ с ким ко́львек не праплищыўса й памо́рак.

— Э, мо́й ле́бедзину,—ка́жэ, дзе́д,—я ўбо́ґи: я несу́ лю́дзям ща́сце, яко́ґо ены́ не ма́юць, по́куль жыву́ць.

— Яко́е-ж ты несе́ш ща́сце?

— Такóе щáсце, такóе щáсце, якóе бýдуць мѣць и сáмые багáтые, й сáмые здарóвые, й самые слáўные лю́дзи, якóе ўжывýць и паны́, й каралі́, й—апо̆шни ўбóґи.

Як прамóвнў ён астатнее слово, дак чалавѣ́к и даґадáўса, што дзѣд несé смерць. Бо, вѣ́дамо,—ена́ ўсих берэ́, ена́ ўсим даé рŏўнае щáсце: й каралéм, и мужыко̆м. Даґадáўса чалавѣ́к да й кажэ: ну, дзѣ́ду, лѣзь на вŏз, а я прыкúдаю цебé сѣнам, та хибá таким спóсабам увезý ў селó.

Узабрáўса дзѣд на вŏз, а чалавѣ́к закры́ў еґо́ сѣнам, прыцúс рублéм да й павéз у сваé селó. Падвóзиць ён к вы́ґану, ґдзѣ стая́ла вáрта й ґарéў стŏс дроў, да й шапнýў дзецюко̆м, што везé памŏрак. От ты́е й пытáюць—мужы́к, што ты везéш?

— Дрóва.

— Якие дрóва. Гэ́то-ж сѣно.

— На што-ж пытáеш, калі́ знáеш.

— А ў сѣни што?

— Што? Мóо шы́шки да шыпу́льки.

— Гэ, ты ещэ ўздýмаў над нáми кпиць!.. Хлóпцы, берéцеса за вŏз,—нéхáй идзé на хвáлу бŏскую.

Тут падхапúли хлóпцы пад трайню́ да пад падґэрац, дак сѣно й шýснуло на касцéр. От як вы́бухне аґóнь, дак рŏўно з лѣсам. А тут хлóпцы ещэ́ пру́цьем пашавéльваюць сухóе сѣно да падкидваюць на аґонь дроў. Круциўса, круциўса памŏрак да чуць не задóхса. Спалúли лю́дзи той памŏрак, спалúли так, што й ко̆стачак не асталóсо. Алé, вѣ́дамо, нéчысь и ў вагни́ не ґары́ць: перш зґарéла, а пóтым ажылá. От с таѣ́ пары́ ґóдзи ат таго памŏрку лю́дзи памирáць и дóхнуць ґаўя́до. Мáбыць такúй дóбрэ спалóхаўса памŏрак, як далі́ ему́ такýю лáзню, спалóхаўса да й уцéк за сúнее мóрэ, за высóкие ґóры ў далéки край да там и астáўса. Чáсам ён навѣ́двается туды́, парéжэ трóхи ґаўя́да, пакóсиць людзéй да й уцекáе назад, каб еґó зноў не злавúли да не надсмалили.

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б. Рожинъ.

70. Жа̀ласливая па̀ни.

Гэ́то было́ ещэ́ за па́ньщыну Вы у́жэ не памята́еце, бо пе́ўне таґды́ ещэ́ не раздзи́лиса на свѣт. Да й яки́ то быу́ свѣт. Хиба́ то свѣ́т, што дзися́так або́ друґи́ панŏў да баґа́тых людзе́й панава́ло, а наш брат, ґарапа́шник так му́чыўса. што не рад быў и жы́цю. И на што тŏльки Бŏґ так даў на свѣ́це, што той, хто жыве́ пра́ўдаю да ґару́е—му́чытца, а хто ли́хам да круцѣ́льствам—пану́е. Але́ ма́быць таґды́ Бŏґ атступиу́са ат людзе́й и атда́ў их у ру́ки чартŏў да панŏў. И чаґо́ тŏлько паны́ не вычвара́ли, як ены́ не му́чыли людзе́й, як не здзѣ́кувалиса над ими. Але́ мŏо вы ду́маеце што паны́ были́ лихие, што ены́ нема́ли жа́ласци ў се́рдцу й заты́м так вычвара́ли? Нѣ, маѣ́ братки́,—паны́ были́ такие-ж лю́дзи, як и мы з ва́ми, были́ жа́ласливые мŏо бŏльш нас и такие добрые да лаґŏдные, бы ане́лы, але́ ґэ́то тŏльки к свайму́ бра́ту, к вŏлнаму, а не к мужыку́. Ба́чыце, чорт, а мŏо бацьки закры́ли им во́чы, зацемни́ли ро́зум и ены́ не вѣ́дали да й не хацѣ́ли вѣ́даць, што й мужы́к таки́-ж чалавѣ́к, як и ены́. Але што ґавары́ць—таґды́, кали́ ещэ́ й цепе́р паны́ мужыкŏў не ли́чаць за людзе́й и ро́бляць пе́рад людзьми́ тако́е, што со́рам и каза́ць, ро́бляць и не саро́меютца. Раз, ужэ́ была́ вŏлнась; ѣ́хала яка́ясь па́ни; прыѣ́хала ена́ с ху́рманам у на́шэ село́ на па́ры ко́ней да й заначава́ла ў мене́. Ба́чыце, таґды́ ва ўсе́м селѣ́ тŏльки ў мене́ была́ чи́стая ха́та з ко́минам, а друґие седзѣ́ли ещэ́ ў ку́рниках. Заначава́ла па́ни, а ра́ненько хацѣ́ла ѣ́хаць да́лей. Але́ ось чуць свѣ́т ула́зиць у ха́ту ху́рман да й ка́жэ, што ко́ни вы́пруцилиса. Што тут раби́ць! От па́ни нанела́ мене́, каб я еѣ́ звазиў у адзи́н двŏр на сваёй кабы́лцы. Запрŏґ я кабы́лку, вы́таптаў драби́нки сало́маю, пасадзиў па́няю да й павъе́з. Гэ́то я́кось было́ па лѣ́ту, ў Петрŏўку, ци што. От ѣ́дам мы да ѣ́дам, тŏльки па́ни седзи́ць на во́зе да ўсе чу́хаетца Ма́быць у сало́ме было́ мнŏґо скŏчак. Чу́халаса ена́, чу́халаса да й дава́й знима́ць з себе́ ўсе адзѣ́не. Ѣдзе па́ни ґо́лая, у чŏм ма́ци

радзи́ла, то́льки парасо́ликам закрыва́етца, а тым ча́сам насустре́к иду́ць або́ е́дуць лю́дзи. Дак ничаго́сьсенько,—па́ни не саро́меетца людзе́й, да ўсе ло́виць скочки гдзе́ папа́ло. Але́, ось захацёласо е́й да ве́тру. Ка́жэ ена́, каб я супыниў кабы́лку. Я супыниў. Злезла гэ́то ена́ го́лая з во́за да й прысе́ла на даро́зе, але́ немажэ́ ўдзе́ржатца—хиста́етца: от, от упадзе́. От и заве́ ена́ мене́. Падышо́ў я, а ена́ ўчапи́ласа за ма́е ру́ки, зрабила, што трэ да й палезла на во́з. Дак от гэ е́хала па́ни не́маль увесь дзень и не саро́меласа ни мене́, ни други́х людзе́й—мужыко́ў, бо ена́ их не ли́чыць, людзьми а гаўядам, а ве́дамо, гаўя́да нихто́ не саро́меетца. Дак от я ха́чу разказа́ць вам пра адну́ жа́ласливую па́няю, яка́я ена́ была́ литасци́вая да до́брая. Эгэ, дак, дай Божэ па́мяць, быў сабе́ адзин пан з па́няю. Еныі не ме́ли дзецей. Ве́дамо, паны́, што еныі не выраблю́ць з ве́сьскими дзеўка́ми з са́маго мале́нства, чаго еныі не спро́буюць, каб маць са́мы вели́ки сло́дыч, а як пры́дзетца жыць з па́няю, дак и по́йдзе ўселя́кае ли́хо да хваро́бы. А па́ни сабе́-ж наро́вяць, каб то́льки маць сло́дыч да каб хараства́ не згуби́ць. Дак от гэ й ты́е паны́, то́льки й зна́ли, што прыемнасци шука́ли.

Жыў кале́ таго́ села́ адзи́н шляхту́н. Ён маў малы́ кусо́к земли́ й гарава́ў на е́й, як и мужыки́. Але́, ве́дамо, як во́лнаму чалаве́ку, ему́ ат сабе́ жыло́со, ек-жэ ка́жуць, што ўбиў, та ўе́хаў То́льки даў Бо́г ему́ нещасце: памёрла жо́нка й паки́нула мало́го хлапчука́. Пахава́ли жо́нку. Убива́етца шляхту́н, з гглу́зду вы́биўса й ро́зуму не прыло́жыць, што ему́ рабиць з малы́м дзи́цем. Уба́чыла гэ́то адна́ маладзи́ца—ў е́е як раз аб то́й пары́ Бо́г узяў маленькае дзицятко—пашкадава́ла шляхтуно́ваго хлапчука́ да й узела́ его́ карми́ць цы́цкаю. Вы́кармила ена́ хлапчука́ да й пакаха́ла его́, як сваё ро́днае дзиця́. Гаду́етца шляхту́н на селе́, гра́е з дзецьми́, а тым ча́сам памёр его́ й ба́цько. Пачу́ў то́е пан да й узя́ў гэ́стаго хлапчука́ ў дво́р, каб на селе́ не прападало во́лнае дзиця́. Таго́ды ўжэ быў го́жы хлапчу́к; ему́ было́ не́маль дзе́сяць гадо́ў. Жыве́ шляхтуне́ц у двары́, адуку́етца ра́зам з па́ньскими дзецьми́, але ўсе не за-

быва́е таѣ маладзи́цы, што его́ вы́ґадавала, не забыва́е свайґо́ тавары́ства й усе бѣ́ґае на село́. От так и вы́рас ён у двары́, вы́адукаваўса лѣпш панича́. И зрабиў пан маладо́ґо шляхтуна́ камыса́рам и хацѣ́ў атда́ць за его́ сваю́ дачку́; але камыса́р не схацѣ́ў, бо ен ве́льми спадаба́ў дачку́ таѣ маладзи́цы, што его́ вы́ґадавала. Пранюхаў то́е пан да й велѣ́ў атда́ць тую дзѣ́ўку за́муж за свинапа́са. Дава́й тут камыса́р прасі́ць па́на, каб ён прада́ў ту́ю дзѣ́ўку ему́; даé мно́ґо ґро́шэй и ўсю сваю́ земе́льку, што дастала́са ат ба́цька. Але́ куды́ там—пан и слу́хаць не хо́чэ, зарубиў свае́. да хаць ты ему́ ко́л чашы́ на ґалавѣ́. А свинапа́с быў ужэ́ стары́ да са́мы леда́щы, ґульта́й, пъяньчу́жка. Ка́жуць лю́дзи, што ён ба́ло пъяны так биў, так здзѣ́куваўса над пе́ршаю жо́нкаю, што тая, як пашла́ на ре́ку палака́ць пла́цье, дак аттю́ль и не верну́ласа; нихто́ не ве́даў, куды́ й дзѣ́ласа. То́льки прас ты́дзень усплыла́ наве́рх, и рыбаки́ валачко́м вы́цяґли на бе́раґ. От як пачу́ла та́я дзѣ́ўка, што пан вели́ць атда́ць еѣ замуж за тако́ґо леда́щаґо чакавѣ́ка, дак спало́халаса й та ґало́сиць, та раґо́чэ, бы кру́чаная. Ба́чыць камыса́р, што ничо́ґо не бу́дзе, што заґу́бяць его́ дзеўчы́ну, сабра́ўса, забра́ў еѣ да й пашли ены́ ў свѣ́т невѣ́дамо куды́. Аґле́дзяўса пан, што нема́ дзѣ́ўки, нема́ й камыса́ра да так разсердзиўса, што й дух вы́перло.

Тым ча́сам ху́тко за па́нам паме́рла й па́ни. Аста́ўса то́льки адзи́н пани́ч; той са́мы, што адукава́ўса ра́зам с камыса́рам. И пача́ў пани́ч сам ро́ндзиць, пача́ў тако́е рабі́ць, што лю́дзям жы́ця нема́, ґаре́й ста́ло, як пры старо́м па́ну. Стары́ пан быў хаджа́ин. Ён клапациўса, каб зрабі́ць гаспада́рку лѣпш, як у сусѣ́дзей, шкадава́ў сваи́х людзе́й, як сваé гаўя́до, бо, ве́дамо, личы́ў людзе́й сваи́м добро́м. Малады́-ж пан не ґлядзѣ́ў на хаджа́йство, а то́льки ду́маў аб то́м, каб ужы́ць сло́дыч. И пача́ў ён зґаня́ць у дво́р ґо́жых дзево́к да маладзи́ць, велѣ́ў им скида́ць усю́ адзе́жу й ґо́лым ґуля́ць у саду́. Тым ча́сам ён зваў к сабѣ́ сусѣ́дних пано́ў да ўселя́ких палу́панкаў, бѣ́ґаў з и́ми за дзеўка́ми з бизуно́м у рука́х и,

як сам вычвараў, што хацеў, так и другие паны. Але от напрыкрыли ему веские дзеучата й маладзицы й давай ен атусюль прывозиць розных пантак. Усе пакои запагании. Ведамо, без гаспадара хаджайство хутко зницыласо. Ено й пры старом пану дзержаласо тольки камысарам. Малады-ж пан зрабиў камысарам свайго хурмана. Гэтаго хурмана пан палюбиў за тое, што ен пры гасцях раз справиўса с двананцацю дзеукамі да й казаў, што ещэ не здаволиўса. Хурман так пачаў рондзиць, што хутко ў пана ничога не асталосо. Бачыць ен, што саусим прашыкаўса, от и давай шукаць багатае жонки. Па суседству там быў вельми багаты пан. У его была тольки адна дачка. А праўду кажуць людзи, што кали едначка, та курва, ци лайдачка. Так и тая пантка. Гадаваласа ена ў раскопы, ниякае работы не знала: от як выросла, дак и пачала так вычвараць, што сорам и казаць. Але дармá,—бацько личыў, што харашей и лепш его дачки никога нема й на свеце. Пачали паничы свататца. Ведамо, к багатоў пантцэ заўжды находзитца багацько жанихоў. Але куды там! Пан думае, што ее вазьме князь. Тым часове жанихи усе ездзяць у залеты к гэстой пантцэ, але ничога не парадзяць, бо от спадабаетца ей паничь, пагаворыць ена з им—усе добрэ, але як памацае его да знайдзе ў партках, дак и прагониць. От и пашла прачутка, што тая пантка шукае такога жанихá, каб у его ничога не было ў партках. От наслухаўса той паничь, зашмаргнуў матузком яйца, залыгаў петуха, прывезаў его да й паехаў у сваты к той пантцы. Памацала ена панича — нема ў партках ничога; от и згадзиласа ена йци за его замуж. Рада пантка, кличэ к сабе панича кожын дзень. Ездзиць той к пантцы пашто дзень, а яец усе не атвязвае. От ужэ пара рабиць и лад, але бацько не хочэ за галыша атдаваць свае дачки. Тым часам пантка пражэтца замуж за таго панича, як жывое вады. Бачыць пан, што ничога не можне зрабиць з шалёнаю дачкою, справиў весельe, атдаў зяцю грошы, а сам паехаў да Аршавы да там и загинуў. Жывé малады пан з жонкаю, не чапае ее да й рад, што

й ена́ его́ не займа́е, бо ён ужэ́ не мажэ́ маць з жанчы́нами дачыне́не—еду́ць его́ пра́нцы. От пакача́ўса пан ґадо́ў са тры да й здырдзиўса. От тут и пачала́ та́я па́ни сама́ ро́ндзиць маёнткам.

Тым ча́сам у камыса́ра памёрла та́я жо́нка, што ён узя́ў у ґэ́стом селе́. Паки́нула ена́ дво́е малы́х дзе́так. Ду́маў, думаў камыса́р, што рабіць да й вернуўса ў сво́й хвальварак Пачу́ла па́ни, што вернуўса той камыса́р, што ве́льми до́брэ ро́ндзиў маёнткам пры старо́м па́ну й пачала́ его́ прасіць, каб ён и ў ей стаў камыса́рам. Паду́маў той да й зґадзиўса. Прые́хаў ён у дво́р к па́ни да й ухо́дзиць у пако́и. Зирне́ ён, аж там по́ўны пачо́и ґасцёй: усе́ па́ни да пане́нткі. Усе́ паскида́ли су́кни, расплели́ ко́сы да так го́лые й хо́дзяць па пако́ях. От пашо́ў камыса́р да́лей шука́ць па́няю, ўсу́нуўса ён у другу́ю ста́нцаю, аж там це́лая чарада́ го́лыхъ хло́пцаў, а пами́ж их тэ́тца й сама́ па́ни, вищы́ць, смеётца, бе́ґае за ты́ми мужчы́нами да наро́виць абсе́ч им крапиво́ю сарамаце́не. Уба́чыў то́е камыса́р, плю́нуў да й пашо́ў вон. Па́ни за им: про́сиць, блаґа́е, каб аста́ўса.—Ге́тож—ка́жэ ена́,—маё ймени́ны. Аста́ўса камыса́р и пача́ў хадзи́ць з па́няю па ўсих пако́ях. Тым ча́сам паничы́ сышли́са з пане́нтками да з па́нями да й пашли́ раґата́ць да бе́ґаць паўси́х пако́ях, бы ко́ни. Чаґо́ то́льки ены́ не вычвара́ли. Але́ ось павела́ па́ни камыса́ра ў сад. А там ена́ вело́ла саґна́ць з села́ малады́хъ мужчы́н и жано́к да дзе́вак, напаи́ла их ґаре́лкаю, нанела́ музы́ку й зраби́ла заба́ву. Панапива́лиса ўсе́: перш ены́ скака́ли да спева́ли пе́сни, а по́тым паскида́ли адзе́жу да бы й паны́ дава́й ґаса́ць па саду́ да валя́тца ў куста́х да на траве́. Тым ча́сам паны́ й пане́нтки вы́беґли з пако́яў у сад да й памеша́лиса з мужыка́ми й мужы́чками. Ка́жуць, што дзе́ля ґэ́таё ре́чи мужыки́ смачне́й. Но́чка была́ ле́тняя, це́плая, аж па́рыло. Ужэ́ й даў Бо́ґ дзень. Со́нейко падняло́со высо́ко, а ў саду́ ещэ́ не ўсе заци́хло. И пача́ў камыса́р с тых ча́саў аґляда́ць хаджа́йство. Але́ куды́ ни зирне́, ўсе не палю́цку: по́ле не засе́яно, сенажа́ць запу́щана, зарасла́ ни́цаю лазо́ю да хмы́зникам, будо́ўля асу́нуласа, сце́ны па-

крывíлиса, стрéхи паґнилí, абó вéцер паздзираў, тóльки дрэ́бы тырчáць, бы кóсци з дóхлаґо каня. Гаўя́до звелóсо; у кóней тóльки шкýра да кóсци. Мужыкí абеднéли, пýхнуць ат ґóладу, бо нéкали хлéба зрабúць: пáни зґаня́е па штó дзень у двóр. Тут енá велéла будавáць харóмы й даґлядáць катóў, сабáк да стары́х кóней. Енá, бáчыце, вéльми жáласливая надъ ґэ́стым жыўéлам; енá атусóль назбирáла кóп пяць уселя́ких катóў,—и самá не даéсь, а их даґлядáе. Назбирáла валачáщых сабáк, кóрмиць их, мы́е, чэ́шэ да абшывáе. Цалю́сьсенькие дни даґлядáе ґэ́стую пóґань самá й трымáе на тóм дзéле ўсих баб. А здóхлым каня́кам дак енá збудавáла стáйни прыстáвила к ґэ́стаму пáдлу людзéй и велéла служы́ць. А як здóхне кóт, сабáка, абó здыхлúна—каня́ка, та пáни плáчэ, бы па рóднум бáцьку, велúць плáкаць и друґúм, а пóтым рóбиць трунý, хавáе, бы людзей и над маґúлаю кладзé прыклад. Уся́ двóрня да й усé селó тóльки й рабúло на ґэ́стую пóшкуць А пáни былá такáя жáласливая, такáя жáласливая над катáми да сабаками, што чáсам з маладзúц да з дзéвак шкýру здзирáла, калí ены́ не дóбрэ даґлядáли таґó жыўéла. Вéльми енá карáла тых маладзúц, што шкадавáли сваúх дзецéй и укрáтки кармúли их сваúми цы́цкамі, а не катóў, ци сабáк, як велéла пáни. Дак от якáя былá то жáласливая пáни. Алé кáжуць, што забéґ у той двóр крýчаны кóт да й пакусáў друґúх катóў и сабáк Прышóў маладзúк, и пакруцúлиса каты́ й сабáки. От як напáли ены́ на тýю пáняю, дак и заґры́зли еé на смерць. Стáли лю́дзи збивáць тýю пóшкудзь, алé ўсе такí мнóґо й людзéй пашалéло.

Пересказалъ И. Аземша

С. Лучицы

71. Иванко Прастачо́к.

У яко́м тось краю́ жыли́ лю́дзи бы ў раю́: ґарава́ли, працава́ли да й беды́ не ма́ли. Свѣ́т вели́ки; земли́ мно́ґо; ўсю́ды во́лно, — працу́й на хлѣ́б, рабі́ да Бо́ґа хвали́. И жыли́ там лю́дзи ў ла́сцэ, ў зґо́дзе, весь дзене́чак ґарава́ли, працава́ли, а аб но́чы атдыха́ли. А прыдзе́ беда́,—ў зґо́дзе ратава́лиса ў прыґо́дзе: бѣ́дным, хво́рым памаґа́ли, дак и ўсѣ́ беды́ не ма́ли. То́лькі ось аткуль узя́ўса й пача́ў сюды́ лета́ць стра́шны Змѣ́й; пача́ў лета́ць, пача́ў добро́ цеґа́ць, а на рэ́шце й людзе́й хвата́ць да к сабѣ́ цеґа́ць. Нахвата́ў е́н людзе́й и дава́й будава́ць сабѣ́ харо́мы. Нахвата́е атусю́ль людзе́й, зґо́ниць их у водно́ мѣ́йсцо да й прымуша́е будава́ць харо́мы. ако́пваць их кана́вами, абсыпа́ць ва́лами да абґаро́джваць часта-ко́лам, каб нихто́ не мо́ґ туды́ ўлѣ́зци. Буду́юць людзи, капа́юць кана́вы, насыпа́юць ва́лы земли́ бы ґо́ры й пату́ль ґару́юць, паку́ль там и заґи́нуць. А Змѣ́й хвата́е да вало́чыць туды́ ўсе но́вых дэ но́вых людзе́й. От набудава́ў е́н мно́ґо таки́х аґаро́даў, пралажы́ў памиж их шляхи́, лета́е па их да цеґа́е ў ва ґаро́ды й людзе́й и люцко́е добро́. Працу́юць лю́дзи, заґару́юць што ко́львек, а тут налеци́ць Змѣ́й, аберэ́ ўсе бы по́жар да й запрэ́ к сабѣ́ ў ва ґаро́ды, а лю́дзи пу́хнуць ат ґо́ладу да мруць, бы му́хи. И чым да́лей, тым ґаре́й: нема́ спасо́бу, нема ратунку ат лихо́ґо Змѣ́я. Тым ча́сам ты́е лю́дзи, што их Змѣ́й навалачы́ў у сваѣ́ харо́мы, жару́ць сабѣ́ люцко́е добро́, ничо́ґо не ро́бляць да то́лько са́ло ґаду́юць. Дак от не то́лько Змѣ́й, але́ й ены́, забы́ўшы свайх бацько́ў да брато́ў, пачали́ па шляхо́х выла́зиць з аґаро́даў, бы мура́шки з муравѣ́йника, пачали́ хадзи́ць па свѣ́ту да атбира́ць у людзе́й их добро́. И ста́ло лю́дзям ґарэ́й ат людзе́й, як ат Змѣ́я, бо, вѣ́дамо, ґэ́стых лихи́х слуґ Змѣ́я ве́льми мно́ґо. Ены́ бы пло́йма ўсю́ды наго́дзяць людзе́й и атбира́юць у их што запарву́ць. Нема́ ў их ли́тасци—з жыво́ґо шку́ру дзеру́ць. И пачали́ ены́ личы́ць людзе́й ґаре́й ґаўя́да, пачали́ саро́мятца, што са́ми ены́ лю́дзи, пачали́ выдумо́ўваць сабѣ́

ўселя́кия назви́ска. Хто назва́ў себе́ змѣям, хто во́ўкам або́ медзьве́дзям ци друґи́м звѣрам, хто арло́м, ко́ршакам ци друго́ю пту́шкаю, хто яки́м ко́львек дзе́равам, и ґэ ены́ ўсѣ дали́ сабѣ назви́ска. То́льки людзе́й называ́юць ены́ про́сто людзьми́, ба́тцэ ґэто са́мае гаре́йшае имя́. Дак от скуль узели́са паны́ Сви́ньские, Ваўки́ й друґие. Тым ча́сам пастаре́ў Змѣй, абезси́леў и лежы́ць бы па́дло. Лежы́ць ен на адно́м баку́ ци́сячу ґадо́ў; и пача́ў ен ґни́сци, пача́ў так смердзѣць, што аж но́с ве́рне. Разыша́ўса той смуро́д па ўсих харо́мах, запаґа́ниў уве́сь аґаро́д. Свѣжаму чалаве́ку нѣльґа падыци́ бли́зко к аґароду, таки́ аттуль ве́рне смуро́д, таки́ лихи́ и́мпат идзе́ ат таґо́ Змѣя. Але́ паны́ абню́халиса да й ка́жуць, што ґэто пах, што ґэто то́льки дурны́е мужыки́ не зна́ютца, што смердзи́ць, а што па́хне. Тым ча́сам Змѣй усе́ ґние́ да ґние й так запаґа́ниў аґаро́д, што там и пано́м жыць не мо́жна. Пачали́ ены́ атсѣка́ць у Змѣя ґнилы́я но́ґи, або́ што друго́е. Атсеку́ць адно́, а на за́мест таґо́ вы́расце пъяць, а то й бо́льш. От бы адно́летки на пню. И разро́зса той Змѣй бы ґара́, разро́зса й абняў увесь аґаро́д. Заґниўса аґаро́д, пашла́ во́нь на ўвесь свѣт. Прасмердзѣлиса паны́ да й пачали́ са́ми ґни́сци бы па́дло. Ещэ́ ґаре́й ста́ло лю́дзям, бо паны́ ґниюць, едзя́ць их чэ́рви, то́чаць их жуки́; а што здаро́вые, ты́е ло́вяць людзе́й, цяґа́юць у ваґа́роджу да прыка́зваюць абмыва́ць той ґно́й да карми́ць ґэстае па́дло. От слу́жаць лю́дзи до́хламу Змѣю, слу́жаць тым ґнилы́м пано́м, атдаю́ць им апо́шняе, а са́ми хо́дзяць ґало́дные, хало́дные да то́льки за пра́цаю свѣту Бо́жаґо не ба́чаць. Гэ й жыву́ць ены́ ат вѣку да вѣку. Адны́ умира́юць, друґие раджа́ютца й нема́шака ниякаѣ палеґки. И да таґо́ дажыли́са лю́дзи, да таґо́ падуре́ли, што й не ду́маюць аб лѣпшо́м жы́цю. Им здае́тца, што ґэ й трэ, што йнак жыць, дак и свѣт зведзе́тца.—Гэ жыли́ на́шы пра́дзеды й дзеды́; тре́э й нам уступиць у их следы́—ка́жуць лю́дзи да й ничо́ґо не ро́бляць, каб зраби́ць лѣпшае жы́це. Але́ ось радзиўса ў то́м краю́ хлапчу́к. Быў ен ве́льми благе́ньки, ве́льми худы́: да от так як занепа́ў з мале́нства, дак так и аста́ўса на ўсе жы́це.

Ни паны́, нихто́ е́ґо́ нечапа́е, бо ен таки́ нехлемя́жы, што нико́му непатрэ́бен. От е́н и вы́рас ужэ́, але́ ўсе ґра́е з дзецьми́ бы мале́ньки. И празва́ли е́ґо́ лю́дзи Ива́нкам Прастачко́м. От у зи́мку седзи́ць сабе́ Ива́нко Прастачо́к на пе́чы да з лучы́начак ца́цки скла́двае, а па ле́тку песо́чак перасыпа́е з дзецьми́. Такъ пражы́ў ен ґадо́ў тры́дцаць. От раз седзи́ць Ива́нко Прастачо́к на земли́ кале́ пры́збы да перасыпа́е песо́чак, аж иду́ць тры старцы́. Прыпли́ены́ к ха́це да й се́ли на пры́збе атдыха́ць. У селе́ ни жыво́е душы́— пан уси́х вы́ґнаў на рабо́ту. Пу́сто, хаць падпали́. Седзя́ць старцы́ на пры́збе, атдыха́юць да насыпа́юць у люльки́ цюцюну́. Хапи́лиса ены́, аж нема́ аґню́ да й про́сяць Ива́нка, каб е́н даста́ў аґню́ люльки́ закуры́ць. Пабе́ґ Ива́нко ў ха́ту, набра́ў у пры́ґарцы жа́ру да й прыно́сиць старцо́м. Закуры́ли ты́е люльки́, падзя́кували Ива́нку да й пыта́юць е́ґо́, што е́н ро́биць.—Песо́чак перасыпа́ю— ка́жэ Ива́нко,—бо што ни рабы́ць, та ўсе на пано́ў тахци́ць. А на́шы лю́дзи дурны́е, ця́ґнуць жы́лы да са ўсее́ си́лы пну́тца, дзе́ло спраўля́юць, а ли́хо ма́юць, бо паны́ ўсе́ к сабе́ ґрабу́ць, з мужыко́ў шку́ры дзеру́ць, а то й саўси́м их к сабе́ беру́ць, за свет заґаня́юць, бъюць, кале́чаць, му́чаць, забива́юць и ли́тасци не ма́юць.

Паслу́хали то́е старцы́, ґалава́ми пакива́ли, ўзели́са за штруме́нты да й заґра́ли. Пе́ршы раз загра́ли — Иванку ро́зум да́ли; друґи́ раз заґра́ли—ў се́рцэ жа́ласци наґна́ли; тре́ци раз ены́ заґра́ли—язы́к Ива́нку развяза́ли. Зни́кли старцы́, а Ива́нко Прастачо́к стаў ужэ́ не дурачо́к, стаў за дзе́ло бра́тца да й у свет збира́тца. Зрабиў ду́дку-весели́ўшку да заґра́ў сабе́ так жа́ласливо да так ґо́жэ, што не то́льки лю́дзи, а зверы́ й пту́шки ста́ли е́ґо́ слу́хаць, ста́ли ўкру́ґ збира́тца. И пача́ў Ива́нко Прастачо́к па све́це хадзи́ць, у ду́дачку ґраць, людзе́й збира́ць да им пра́ўду каза́ць. Як загра́е, дак и ўба́чаць лю́дзи, што вели́кая кры́ўда на све́це, што адны́ пану́юць, друґие ґару́юць; адны баґа́тству ли́чбы не ма́юць, друґие з го́ладу падыха́юць. И разне́сса ат Ива́нкавае́ ду́дки ґолас

па ўсему́ све́ту. Пачали́ лю́дзи к таму́ го́ласу прыслуха́тца да ро́зуму набира́тца: пачали́ ду́маць да гада́ць, як за пра́ўду пастая́ць. От учу́ли па пала́цах той вели́ки го́лас да и спало́халиса слу́ги Зме́я, пачали́ ены́ во́йско збира́ць да Ива́нка Прастачка́ шука́ць. Чу́юць го́лас на ўсхо́дзе—шамеля́х ены́ туды́. Палашы́ блища́ць, пи́ки бы ле́с тырча́ць, гарма́ты грымаця́ць, а Ива́нка не вида́ць. Ста́нуць ци́хо, бы на палева́ни, слу́хаюць, стая́ць. Аж тым ча́сам чу́юць го́лас на захо́дзе—гра́е ду́дка-веселу́шка, гра́е, людзе́й навуча́е. Идзе́ по́щак ат села́ да села́, па по́лю, па ле́се ат кра́ю да кра́ю. Ки́нутца ены́ на за́хад; го́няць ко́ней, бегу́ць са́ми, ша́блями звиня́ць, на зви ве́цер з гарма́т страля́юць, дак Ива́нка не спайма́юць. Гудзе́ ду́дка, гра́е: та засви́щэ, та бы бу́сел заляско́чэ, та заця́гне то́нко, от бы павуци́на, та так дро́бненько щабе́чэ, што ў пано́ў аж лы́тки затрасу́тца, а маро́з бежы́ць па спи́не, ба́тцэ мыш туды́ зале́зла да й скрабе́тца пазура́ми. От с тых ча́сау слу́гам Зме́я ни ўдзень, ни ў но́чы ани збла спако́ю, бо беды́ ены́ сабе́ чака́юць, бы во́л до́ўбни. Ду́дка сви́щэ, ду́дка гра́е; по́щак па све́ту гуля́е, людзе́й навуча́е. Его́ ни злави́ць, ни з гарма́т не заби́ць. Ён во́лно па све́ту гуля́е, ниякиx заго́рдак не зна́е; хаць сам без це́ла, да вели́кую си́лу ма́е. Гра́е, грае, а як пры́дзе час, дак уси́х ён параўня́е. Ой ты ду́дка мая́, веселу́шка мая́!

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б. Рожинъ.

---

72. Кавàль.

У якóмъ тось ца́рстве бы́ў ко́лись вели́ки го́лад, и не было́ чым жыви́тца не то́льки гаўя́ду, але́ й людзям. Пае́ли ены́ й той корм, што жыви́ласо жыўе́ло. От памира́юць людзи з го́ладу, бы аб о́сень му́хи. Але́ адны́ памира́юць, а другие раджа́ютца. И чым гаре́йшы го́лад, тым бо́льш раджа́етца дзецёй. И вел'ў цар забива́ць малы́х дзецёй, каб не мно́жылиса людзи, бо й гэ́стым нема́ чаго́ е́сци. От

хо́дзяць ца́рские слу́ги да й забива́юць дзеце́й, або́ то́пяць их у ɗаце́, бы щаня́т. Пла́чуць, убива́ютца ма́тки, ло́мяць ру́ки да рвуць на сабѣ́ ко́сы. Вѣ́дамо, ма́ткам за́ўжды дзеце́й шко́да. Але́ ца́рские слу́ґи не ма́юць ли́тасци,—забива́юць дзеце́й, льюць ане́льскую кроў

Отъ у то̆мъ ца́рстве таґды́ жыла́ сабѣ́ адна́ жанчы́на. Ена́ ўжэ была́ то́ўста, як еѣ́ ґаспадара́ забра́ли ў маскалѣ́. Ба́чыць ена́, што ўжэ хо́дзиць на часо̆х да й баи́тца, каб ца́рские слу́ґи не заби́ли еѣ́ дзиця́ци. Што тут раби́ць. Куды́ тут схава́ць дзиця, як ено́ ро́дзитца? Ду́мала ена́, ду́мала да й наду́маласа. Надра́ла ґэ́то ена́ пеле́нак, накла́ла ў лубя́нку, заки́нула еѣ́ за пле́чы да й пашла́ ў лѣс.

Вѣ́дамо, лѣс вели́к—нема́ ему́ ни канца́, ни кра́ю. Жыви́ ў е́м хаць вѣк,—нихто́ не тра́пиць. От идзе́ тая маладзи́ца да йдзе́, назбира́е яґад, праґо́ниць сма́ґу да й да́лей. И забра́ласа ена́ ў таку́ю ґущарню, што мо́о там нихто́ й зро́ду не быў. Наґледзѣ́ла ена́ сабѣ́ дуплена́тае дзе́раво, вы́калупала ў е́м парахню да й зраби́ла там сабѣ́ ха́тку. Тут непадале́чку была́ крыни́ца, а ў е́й така́я чы́стая вада́, бы слеза́. Жыве́ сабѣ́ ў то̆м дупли́ маладзи́ца. З крыни́цы пъе во́ду, а ѣсь я́ґады да ґрыбы́. Назапа́сила ена́ тро́хи сабѣ́ ґрыбо̆ў да я́ґад, назбира́ла аре́хаў да ўселя́каґо каре́ня й чака́е, по́ки пры́дзе пара́. От седзи́ць ена́ ў дупли́ да шы́е сабѣ́ саро́чку. Тым ча́сам вы́шаў уве́сь запа́с ґрыбо̆ў да я́ґад и нема́ чым пасилкава́тца. Вы́сунуласа ена́ з дзе́рава, узела́ на пле́чы лубя́нку да й пашла́ шука́ць ґрыбо̆ў. Идзе́ ена́ да йдзе, да й узби́ласа на мдзьве́джае ло̆ґво. Медзьве́дзица пашла́ шука́ць жы́ўнасци, а тым ча́сам на медзьведзеня́т напа́ў шуля́к и дава́й ихъ дзеўба́ць. Уба́чыла то́е маладзи́ца,—шко́да е́й малы́х дзѣ́так,—ухапи́ла ена лама́чыну да як спераза́ла таго́ шуляка́, дак е́н и но́ґи вы́пруциў. Тым ча́сам падбеґа́е медзьве́дзица. Уба́чыла ена́, што жанчы́на абратава́ла медзьведзеня́т и дзя́куе е́й: прыпада́е к наґа́м да ли́жэ их, раве́, а сле́зы з ачо̆ў так и цеку́ць. Отъ пашла́ маладзи́ца ў сваю́ ха́тку, а медзьве́дзица тымъ ча́сам на́зиркам за е́ю. Уба́чыла, куды́ ўлѣ́зла

маладзи́ца, да й пашла́ к сваи́м дзе́ткам. Седзи́ць сабе́ маладзи́ца, перабира́е ґрыбы́ да пае́ пе́сни. То́льки ось зирне́ ена́, аж медзьве́дзица су́нетца з кусто́ў про́сто к дуплена́таму дзе́раву. Спужа́ласа маладзи́ца, аж у жыва́ту забурча́ло.—не ве́дае, што рабі́ць. Тым ча́сам медзьве́дзица падышла́ к са́маму дуплю́, прыцяґла́ маладзи́цы на лубку́ све́жых пля́страў ме́ду, палажы́ла тут, а сама́ паўзко́м папаўзла́ назад. Уба́чыла то́е маладзи́ца да й даґада́ласа, што ґэ́то медзьве́дзица ў падзя́ку дала́ ґасци́нца. От жыве́ сабе́ маладзи́ца ў дуплена́тум дзе́раве й не ґа́дки: медзьве́дзица ко́жын дзень прыця́ґне меду. По́тымъ ена́ пачала́ наси́ць пташэ́чые я́йца й друґу́ю жы́ўнась. Але́ ось прышла́ пара́ й парадзи́ла та́я маладзи́ца ґо́жаґо хло́пца. Зирне́ ена́, аж у ево́ спе́раду на ґалаве́ со́нейко, а з за́ду ме́сячык Зья́е со́нейко, аж во́чы слепіць, не́льґа ґлядзе́ць. От абвеза́ла маладзи́ца ґало́ўку сваймў сынку́ ху́стачкаю да так и здыма́е е́ ни ў дзень, ни ў но́чы. Расце хлапчу́к бы на дро́жджах: што дзень, та на пу́шку вы́расце; у адно́ ле́цячко зраўня́ўса з ма́ткаю. Тым ча́сам наси́ла, наси́ла медзьве́дзица им жы́ўнась, а на ро́шце й сама́ съ медзьведзеня́тами перабра́ласа к таму́ дуплена́таму дзе́раву да й зраби́ла кале́ ево́ сабе́ лаґво́. Гра́е сабе́ хлапчу́к съ медзьведзеня́тами, ся́дзе на их верхо́м да й е́здзиць, бы на каня́цэ. К во́сени медзьведзеня́та зраўнялиса з ма́ткаю й пашли́ са́ми шукаць жы́ўнасци. Таґды́ хлапчу́к дава́й е́здзиць на медзьве́дзицы. Спада-ба́ласо ему́ ґэ́то. От паса́дзиць е́н на медзьве́дзицу сваю́ ма́тку, ўско́чыць сам и дава́й ґаса́ць па ле́се Гэ пражыли́ ены́ ле́то. Падхо́дзиць во́сень. Начына́ютца халады́. От и ўзду́мала маладзи́ца йци ў сваé село́. Сабралиса ены́, злажы́ли сваé добро́ ў лубяны́е каро́бки да й пашли́ да ґаспо́ды; а тут медзьве́дзи ўвеза́лиса й не пакида́юць ни на крок. Отъ ены паве́сили сваé клу́нки на аднаґо́ маладо́ґо медзьве́дзя, маладзи́ца се́ла на медзьве́дзицу, а хло́пец на друґо́ґо медзьведзюка да й паéхали. Вы́бралиса ены́ з ле́су на по́ле да й падъезджа́юць к селу́. Уба́чыли лю́дзи медзьве́дзей, спало́халиса да на ўцекача. Побе́ґли ўсе́ з села́, куды́ во́чы ґлядзя́ць.

Падъе́хала маладзи́ца к сваёй ха́тцэ, ажно́ ена́ пуста́я. От зле́зли ены́ з медзьве́дзей, зняли́ сваѣ клунки́ да й пачали́ аґля́даць ха́ту. Тым ча́сам медзьве́дзи пану́хали се́льскае павѣ́трае да й патру́хали ў ле́с. Пачали́ збира́тца лю́дзи да й не надзи́вятца, што верну́ласа маладзи́ца й прывела́ тако́ґо ґо́жаґо хло́пца. Отъ жыве́ маладзи́ца з сы́нам у сваёй ха́тцэ да даглядае хаджа́йства. Тым ча́сам еѣ хлапчу́к пача́ў плеска́ць у ку́зни да й зрабиўса до́брым кавале́м Пашла́ аб то́м прачу́тка й дайшла́ да ца́рских слуґ. Ужэ́ даў Бо́ґ зраджа́й, перста́ли забиваць дзецёй, але́ ца́рские слу́ґи ка́жуць, што Каваля́ трэ забиць, бо ён таґды́ радзиўса, як ве́лено было́ нищыць дзецёй и што винава́та ма́тка, нашто ена́ хава́ла й ґадава́ла свайґо сы́на. От судзи́ли, судзи́ли ца́рские слу́ґи да й прысудзи́ли забиць таґо́ Каваля́. Пачу́ла то́е ма́тка,—пла́чэ, ру́ки ло́миць, рве на сабѣ́ ко́сы да ўбива́етца, да ґало́сиць на ўсе село́. А Кава́ль ани́ ґа́тки: пае́ пѣсни, смее́тца да разважа́е сваю́ ма́тку. То́льки ось чу́е ен,што ўжэ́ йдуць ца́рские слу́ґи с во́йскам, каб еґо́ зни́щыць От вы́каваў ён сабѣ́ булаву́ ў дзе́сяць пудо́ў, падки́нуў еѣ ўверх да й падста́виў кале́но. Уды́рыласа булава́ аб кале́но да й сагну́ласа ў дуґу́. Узя́ў ён бо́льш зале́за, вы́каваў булаву́ ў со́рак пудо́ў, падки́нуў еѣ ўверх, наста́виў кале́но да й чака́е, што бу́дзе. Чака́ў, чака́ў, аж нема́ булавы́,—ена́ ўсе леци́ць уве́рх. Чака́ў ён з ра́на аж да паўдня́; то́льки чу́е—ґудзѣ́ ў не́бе, бы ґро́м ґрымиць, ґудзе́, леци́ць та́я булава́ ўниз. От ужэ́ со́нейко захо́дзиць за ле́с, як та́я булава́, падлецѣ́ла да й уды́рыласа аб кале́но. Ба́чыць Кава́ль, што ў ёй то́льки ру́чка тро́хи пагну́ласа. От узя́ў ен ту́ю булаву́, заткну́ў еѣ сабѣ́ за по́яс да й пашо́ў шука́ць до́браго каня́, каб на ём ѣхаць у свѣт. Шука́ў ён, шука́ў, але яко́ґо каня́ не зна́йдзе, як пало́жыць ему на спи́ну сваю́ дало́ню, дак ко́нь и падзе на кале́ни,—немажэ́ вы́дзержаць. Што тут раби́ць? Не хо́чэ Кава́ль пѣшки йци ў свѣт, а немажэ́ падабра́ць сабѣ́ каня́ку. То́льки ось ѣдзе ану́чник; а ў его́ каро́сливая кабы́лка. Падышо́ў Кава́ль да й палажы́ў ёй на спи́ну сваю́ ру́ку.—Стайць кабы́лка й не ва-

рухнéтца. Таґды́ Кава́ль палажы́ў е́й на спи́ну сваю́ булаву́. Ста́йць каро́сливая кабы́лка, то́льки тро́хи вуша́мі пакива́ла. И прыста́ў Кава́ль к ану́чнику, каб е́н прада́ў кабы́лку. От ўзяў ану́чник за ту́ю кабы́лку сто рублёў. Ён и зро́ду не мёў то́льки ґро́шэй. Пашо́ў ану́чник падска́кваючы. Тым ча́сам Кава́ль сёў на каро́сливую кабы́лку, прывеза́ў к седлу́ сваю́ булаву́, папраща́ўса з ма́ткаю да й паёхаў сустрака́ць ца́рських слуґ и во́йсько От ёдзе ен шляхам, а на сусрэ́к уве́сь шлях заняло́ во́йсько.—На бо́к, на бо́к!—крыча́ць ему́. А е́н ка́жэ—не вели́кие паны́, й са́ми зве́рнеце.—Тут наки́нулиса на Каваля́ маскалёв, а е́н ухапиў аднаґо́ за чуб да як замахне́тца круґо́м себе́, дак во́йсько пла́стам лажы́тца. Уба́чыли, друґие што беда́ да ня ўцекача́. Тым ча́сам Кава́ль, як ёхаў памале́ньку, дак так и паёхаў да́лей. От ёдзе еп да ёдзе й падъезджа́е к высо́куй ґары́: нема́ як ёхаць да́лей. Злёз е́н з кабы́лки, пусциў её пасци́са, а самъ ле́ґ супачы́ць, падлажы́ўшы булаву́ пад ґо́лаў. Спиць сабе́ кава́ль и не чу́е, што на кабы́лку напа́ло двананцаць ваўко́ў, Апанава́ли ены́ кабы́лку атусю́ль и дава́й на её ки́датца. Заржа́ла кабы́лка, заве́ Каваля́ на по́мач Прахапиўса той, ухапиў булаву́ да як пу́сциць у ваўко́ў дак уси́х ра́зам и накла́ў, а булава́ з разґо́ну як уре́заласа аб камённую ґо́ру, дак ґара́ затрасла́са да й разсёласа на дво́е. От Кава́ль сёў на кабы́лку да й паёхэў у ту́ю шы́лину ўсерэдзину ґары́. Уёхаў е́н туды́, аж там це́мно, хаць ты во́ко вы́каль от ещэ ўзсу́нешса на яко́е па́дло. Развеза́ў тут Кава́ль спе́раду ґо́лаў, и заблисцёло со́нейко, ста́ло видно́, хаць ты ґо́лки збира́й. От ёдзе ён да ёзде; зирне́ ў пе́рад, аж ба́чыць,—там ґары́ць аґо́нь. Паёхаў ён туды́, подъезджа́е ближе́й, аж ґэто зьяе дъя́мант. Лежы́ць еґо́ куcóк, бы ґарбу́з, да так зья́е, ба́тцэ аґо́нь ґары́ць. Забраў Кава́ль той дъя́мант ,да й паёхаў да́лей. Але́ ось ско́ро падъёхаў ен к камёнnуй сценё,—нёльґа ёхаць да́лей. От узяў е́н булаву́, размахну́ўса да як удыры́ць, дак сцена́ ў дрэ́безґи й разсы́паласа Зирне́ е́н, аж там пала́цы, да такие пала́цы, што паґлядзи́, дак аж ґалава́ кружытца. Злёз Кава́ль з кабы́лки, пусциў её на па́шу, а сам

пашо́ў аґляда́ць ты́ѣ пала́цы. Идзе́ ён да йдзе́ съ аднаѣ ста́нцаи да друґо́ѣ, аж им и ли́чбы й канца́ нема́. У яки́ бо́к ни зирне́, ўсю́ды пала́цы, ўсю́ды ста́нцаи адна́ за друґо́ю ўрад, бы ключ ґусе́й. Дзьве́ри атчы́няны й адна́ про́ци друґо́ѣ; дак як зирне́ш у дзьве́ры, а там усе́ дзьве́ры, дзьве́ры, дзьве́ры; ўсе ме́ньшые, ме́ньшые, паку́ль сдаю́тца ў кула́к и драбнѣй. Але́ да́лей во́ко не схва́ціць. Тут адны́ ста́нцаи канто́выя, друґие до́ўґие да ўзкие; е кру́глые да та́кие вели́зазные, што й сцѣн не бачно́. У адны́х сцѣны ґла́дкие, крамѣнные, а ў друґи́х — ба́тцэ тума́н, ба́тцэ весно́вые хма́рки, як праз их прасвѣчвае мѣсяц. Е й такие ста́нцаи, што й саўси́м сцѣн нема́, то́льки стаяць то́ўстые стаўпы́, ба́тцэ то на парасли́ хво́и, што ґалава́ми ў са́мае не́бо упира́ютца да з Боґа́м жу́пяць. Дзи́во: во́ка нема́, со́нейка не бачно́, а видно́, хаць ты ґо́лки збира́й. От идзе Кава́ль, пасту́квае сабѣ булаво́ю да туды́-сюды́ пазира́е. Прайшо́ў ён тро́хи да й заплу́таўса,—стаіць, не ве́дае, аткуль нрышо́ў и куды́ трэ йци ўпербд. Су́мно ему́ ста́ло ў пусты́х пала́цах. От стаў Каваль кале́ слу́па да й ду́мае. Але, ве́дамо, чым бо́льш чалавѣк ду́мае, тым ґаре́й ён задўрваетца й заплу́тваетца, бы му́ха ў павуцѣне. Стаіць Кава́ль и не ве́дае, што ему́ рабіць, Аж тым ча́сам бежы́ць мы́шка. Вы́скачыла ена́ з но́рки, пано́хала павѣтрае, палу́пала го́йстрыми во́чками, бы ґо́лками, хацѣла шука́ць жы́ўнасци для дзѣтак, але́ ўба́чыла Каваля́, задзиви́ласа, прысѣла на за́дние ла́пки да й седзіць, ву́шки развѣсиўшы. Зирну́ў Кава́ль, усмихну́ўса з дурно́ѣ мы́шки да й наступиў е́й на хво́ст. Уско́чыла мы́шка рвану́ласа туды́-сюды́,—хво́ст непуска́е. Ог и дава́й ена́ прасіць Каваля́, каб ён пусціў еѣ, абеца́е памагчы́ ему́ ў прыго́цзе. Усмихну́ўса Кава́ль, што мы́шка ду́мае ему́, аси́лку памаґчы́ ў прыґо́дзе; але́ ўсе-ж падня́ў но́ґу да й пусціў мы́шку. Пабѣґла ена́ ў сваю́ но́рку, а Кава́ль пашо́ў да́лей. То́льки ён вы́сунуўса ў друґу́ю ста́нцаю, аж чу́е: йржэ́ еґо́ кабы́лка, заве́ на по́мач. Пусціўса ён бѣґци па ґо́ласу. Бѣґ, бѣґ, а з пала́цаў вы́братца не мажэ́, бо, ве́дамо, ў харо́мах не разберэ́, аткуль идзе́ ґо́лас. Ещэ́ ґаре́й

заплу́таўса да й кру́цитца на аднŏм мѣ́йсцы. А кабы́лка йржа́ла, йржа́ла да й заци́хла. Ма́быць еѣ́ ваўки́ заре́зали. Што тут раби́ць? Шко́да кабы́лки, а тут з пала́цаў нѣ́льза вы́братца. Схапиў ґэ́то Кава́ль булаву́ да дава́й малаци́ць у сцѣ́ны Як замахне́тца да ре́зне, дак камѣ́нные слупы́ да сцѣ́ны сы́плютца, бы пад це́рницаю кастры́ца. От пракладáў е́н, пракладáў сабѣ́ даро́ґу, паку́ль аж вы́биўса з пала́цаў. Дава́й тут Кава́ль шука́ць сваѣ́ кабы́лки, але́ ния́к немажэ́ знайци́. Стаи́ць да чэ́шэ чупры́ну. Але́ ось и бежы́ць мы́шка. Вильну́ла ена́ хвасто́м да й ка́жэ—хадзи́ за мно́ю; я пакажу́ тваю́ кабы́лку. Але́ еѣ́ ваўки́ заре́зали да й бе́бахи вы́пусцили.--Пашо́ў Кава́ль за мы́шкаю; прайшли́ ены́ ганŏў дво́и, аж ат кавале́ваѣ кабы́лки тŏльки дрэ́бы лежа́ць, а за́мяст трыбухŏў паву́к аснава́ў павуцѣ́не да й чака́е, по́куль прылеци́ць пчала́, або му́ха. Шко́да Кавалю́ кабы́лки, така́я шкŏда, што чуць е́н не запла́каў. От седзи́ць Кава́ль кале́ сваѣ́ кабы́лки да пазира́е, што е́й ужэ́ мура́шки во́чы вы́ели. Тым ча́сам лецѣ́ла бо́жая пчŏлка, шука́ла ў квѣ́тках медку́ да й заплуталаса ў павуцѣ́ни. Бъе́тца, ґудзе́ пчŏлка, трапе́чэ нŏжками да маха́е кры́лцами й усе бŏльш заплу́тваетца ў павуцѣ́не. А тут уба́чыў то́е паву́к, ки́нуўса на пчŏлку й дава́й еѣ́ ґры́зци. Раве́ пчŏлка, аж лѣс дрыжы́ць. Пачу́ў то́е Кава́ль, забы́ў и свае́ ли́хо да й ки́нуўса ратава́ць бо́жую пчŏлку. Ухапиў ґэ́то е́н абѣ́ручки павука́ за хвŏст да дава́й еґо́ вадзи́ць круґо́м себе́; вадзиў, вадзиў да як ре́зне ґалаво́ю аб ду́ба, дак у павука́ й маски́ вы́скачыли. Вы́пруциўса паву́к, тŏльки наґа́ми дры́ґае. Дры́ґаў е́н, дры́ґай, аж у по́яс вы́ґраб я́му да й сакалѣ́ў. А Кава́ль тым часо́ве пача́ў разрыва́ць на пчŏлцы павуцѣ́не й аслабаниў еѣ́. Дзя́куе пчала́ да й ка́жэ—за то́е, што ты мене́ вы́ратаваў з беды́, хадзѣ́м, я пакажу́ табѣ́ крыни́цу з жыво́ю вадо́ю.—Падня́ўса Кава́ль да й пашо́ў за пчŏлкаю, а ена́ леци́ць уперŏд да тŏльки ґудзе́. Тым часо́ве мы́шка залѣ́зла сабѣ к Кавалю́ ў кишэ́ню да й седзи́ць там, бы ў нŏрцы. От и прыво́дзиць пчŏлка Каваля́ пад высо́кую ґо́ру. Зирну́ў е́н на верх

ґары́, дак аж ша́пка звали́ласа, хаце́ў ле́зци на ґо́ру, дак нема́ за што ўчапи́тца. От пчо́лка пасадзи́ла его́ к сабе́ на пле́чы да й папе́рла на ґо́ру. Учапиўса Кава́ль абе́ручки за пчо́лку, седзи́ць да то́льки ўхкае ат стра́ху,—нико́ли ён ґэ высо́ко не быў. От узнесла́ пчо́лка Каваля́ на высачэ́нную ґо́ру, спусци́ласа на зе́млю да й пака́звае на крыни́цу. Зирне́ Кава́ль, аж з ґары́ знад ка́меня жыва́я вада́ от так и сви́ще ўверх, бы з ду́дки. Набра́ў Кава́ль у пля́шачку тае́ вады́, напиўса сам и мы́шку напаиў. Пасадзи́ла их пчо́лка зно́ў на пле́чы да й папе́рла назад. То́льки ены́ ўзнели́са, аж и ўсхадзи́ласа така́я бу́ра, што дубы́ вырыва́е з каре́нем, варо́чае каме́не й аж ґо́ры хиста́е. Ухваци́ла та́я бу́ра пчо́лку ра́зам з Кавале́м и з мы́шкаю, ухваци́ла, закруци́ла, заверце́ла да й памча́ла чорт ве́дае куды́. Прэ, аж табе́ ў вачу́ рабі́ць. Несе их бу́ра бы перцэ́, а Кавалю́ здае́тца, што ён на ме́йсцу, а ґэ́то друґо́е ўсе бежы́ць, леци́ць, як ґо́лаў не скру́ціць Беґу́ць ґо́ры высо́кие, беґу́ць мо́ры ґлыбо́кие, беґу́ць лесы́ це́мные, сенажа́ци вя́зкие, бало́та ґра́зкие, беґу́ць пале́тки пере́стые да хаты ку́рные. То́льки со́нейко я́снае стаі́ць, бы ўко́пано. И ста́ло ено́ сму́тнае, крыва́вае, запла́кало во́чки я́сные да й ли́нуло слезки ґара́чые. Лью́тца ены́, бы з ведра́ Све́ту Бо́жаґо пе бачно́. Дава́й дож прыбива́ць их уни́з к земли́. От леця́ць ены́ ўниз, бы камень. Падлецэ́ли ўжэ саўси́м ни́зко. Кава́ль ду́маў, што як ґры́мнутца ены́ аб зе́млю, та й з ко́стачак то́льки кле́к пацечэ́. Тым ча́сам пчо́лка растапы́рыла кры́лца да як заґудзе́, дак и супыни́ласа да й памча́ла Каваля́ з мы́шкаю праци́ ве́тру. От спусци́ласа ена́ ў чужо́м кра́и, ў дале́кум ца́рстве, ссадзи́ла Каваля́ й мы́шку з пле́ч да й ка́жэ,— як бу́дзе патрэ́ба, та пазаве́це мене́, а цепе́р палечу́ я медо́к збира́ць да ў пля́стры налива́ць.—Пры ґэ́стыхъ сло́вах ввум да й полеце́ла. Пашо́ў Кава́ль з мы́шкаю, куды́ во́чы ґледзя́ць. Идзе́ ён, разґля́дае незнае́мы край, аж и сустрака́юць его́ та́машные лю́дзи, Ве́дамо, лю́дзи—па ўсему́ све́ту еднако́вые лю́дзи: ўсю́дыхъ жыву́ць, ґару́юць, працу́юць, ма́юць сво́й кло́пат, сваю́ пля́ґу. Адны́ ро́дзятца,

друґие памира́юць. Бо кали́-б лю́дзи не ўмира́ли, таб их то́льки напладзи́ласо-б, што й земля́-б не стрыма́ла. Ко́жын хо́чэ маць дзе́так: хо́чэ каб ены́ карми́ли на ста́расци, каб пры сме́рци закры́ли во́чы да каб мали́лиса да памина́ли. Але́ от жыў у то́м краю цар. У его́ быў уда́лы да прыґо́жы адзи́н сын да ве́льми ґо́жая дачка́ Цар хаце́ў паки́нуць сы́ну сваё ца́рство, а датцы́ выбира́ў прыґо́жаґо да ўда́лаґо жаниха́. То́льки не было́ ў то́м ца́рстве тако́го малайца́, каб ён спадаба́ўса царэ́ўне. И пачали́ прыезджа́ць к ей жанихи́ з чужы́х ца́рстваў, пачали́ сва́татца; але́ царэ́ўна ўсе не зґаджа́ласа. Тым ча́сам пашла́ раз царэ́ўна ў сад ґуля́ць. От ґуля́е ена́, рве кве́тки, спева́е да плеце́ сабе́ вено́к. Сплела́ ена́ вено́к, надзе́ла на ґо́лаў да й хаце́ла йци ў пала́цы; то́льки ось аткуль ни вазьми́са Ба́ба-Яґа́, касцяна́я наґа́ на сту́пе е́дзе, таўка́ чо́м паґаня́е да памяло́м сле́д замета́е. Падъе́хала ена́ к царэ́ўне, схапи́ла ее́ ў сту́пу да й памча́ла неве́дамо куды́. Разска́зваюць ґэ́то лю́дзи Кавалю́ да й ка́жуць, што пача́ў цар сзыва́ць баґатыро́ў да аси́лкаў, абеца́ў таму́, хто ве́рне царэ́ўну, атда́ць ее́ за́муж и зраби́ць нача́льникам над уси́м ца́рствам. Разышли́са баґатыры́ да аси́лки па ўсем све́це, але́ аб их нема́ й прачу́тки. Тым ча́сам царэ́вич падабра́ў сабе́ дванаццаць дзецюко́ў, дванаццаць малайцо́ў са́мых зда́тных да й пашо́ў з и́ми ў све́т шука́ць сестры́—пракра́снае царэ́ўны. До́ўґо не было́ аб ён прачу́тки, але́ ось верну́ўса адзин дзецюк, верну́ўса з лихо́ю ве́сцью: разсказа́ў ён, што Ба́ба-Яґа́ завезла́ царэ́ўну к Кащею Безсме́ртнаму. Той запе́р и трыма́е ее́ ў каме́нных пала́цах пад дванаццацю замка́ми. Ки́нуўса туды́ царэ́вич з сваи́ми малайца́ми, а Кащей Безсме́ртны як дыхну́ў, дак ены́ усе́ дванаццаць и ста́ли каме́нем, а што то́льки ён адзи́н стаяў за вуґло́м и спа́сса. Пачу́ў то́е цар и запла́каў з жа́лю, але́ не ве́дае, што пара́дзиць. Пачу́ў то́е Кава́ль и захаце́ласо ему́ найци́ да аслабани́ць царэ́ўну. Як заду́маў то́е, дак не мажэ́ ни пиць, ни е́сци, й сон его́ не берэ́. От лежы́ць ён падлажы́ўшы над ґо́лаў булаву́, лежы́ць да ўсе ду́мае. Ду́маў ен ду́маў да й

надýмаўса йци к царý, тóльки не вéдае, што емý сказáць. Вéдамо. Кавáль: éн никóли й не бáчыў царá, а не то, каб што. От лежы́ць éн, аж падбéґла тáя мы́шка да ўсе хвóсцикам казлы́чэ еґó пад нóсам.

— Аткасни́са! Чаґó ты прычапи́ласа?—Кáжэ Кавáль, да й узя́ў еé ў жмéню. Тым чáсам мы́шка вы́сунула з жмéни мóрдачку да й пачалá ґаварыць.

— Не бóйса царá—кáжэ енá,—éн такí-ж чалавéк, бы й ты. Не бóйса, тóльки вазьмí менé з сабóю: я буду табé падкáзваць, бо я вéдаю, ґдзé царэ́ўна. Вéдамо, мнé замкóў немá-ж—я ўсю́дых пралéзу. Царэ́ўна ў тых палáцах, ґдзé ты наступіў мнé на хвóст. Кащéй Безсмéртны запъéр и трымáе еé, каб нихтó не аслабаніў.

Абрáдуваўса Кавáль, пасадзіў мы́шку за пáзуху да й пашóў к царý. Ци дóўґо, ци мáло éн ишоў, тóльки ось прывóдзяць еґо к царý ў палáцы. Спалóхаўса Кавáль, як убáчыў царá, так спалóхаўса, што не вéдае, чаґó éн и прышóў, алé тут мы́шка давáй емý шаптáць с-за пáзухи да скрабцúса, каб ён ачýхаўса. Прыслýхаўса Кавáль, што емý падскáзвае мы́шка да й давáй казáць царý смéло, бы сваймý бráту. Вы́слухаў еґó цар да й велéў даць емý навы́бар сáмаґо лéпшаґо каня́. Падзя́куваў Кавáль да й пашóў у цáрськую стáйню выбирáць сабé каня́. Тóльки не мажэ́ вы́браць, бо як палóжыць на спúну рýку, дак кóжын кóнь и падзé на калéни. Сказáли аб тóм царý. От той велéў атдáць Кавалю́ свайґó каня́, алé мы́шка шэ́пчэ, каб Кавáль прасиў таґó коня́, на катóрум éздзила царэ́ўна. От Кавáль и давáй прасúць, каб ему далú таґó каня́. Пачýў аб тóм цар, падýмаў трóхи,—бáчыце, емý вéльми шкóда царэ́ўнинаго каня́,—да й велéў атдáць Кавалю́ таґó сáмаґо каня́, на катóрум éздзила царэ́ўна. Сéў Кавáль на каня́, прывезáў к седлý булавý, пасадзіў за пáзуху мы́шку да й паéхаў у свéт. От éдуць ены́ да éдуць. Нахапúласа нóч, а тут цéмны лéс круґóм и канцá емý немáш. Сцемнéло, хаць ты вóко вы́каль. Нéльґа éхаць дáлей. От Кавáль слéз з каня́, прывезáў еґó к дýбу, а сам вы́красаў

аґню́, упъе́к лама́чъе да й ле́ґ спачыва́ць. Ле́ґ да й засну́ў, бы ка́мень. Спиць Кава́ль и не чу́е, што мы́шка з кане́м жу́пяць. Тым ча́сам разсказа́ла мы́шка каню́, ґдзе́ цара́ўна да й пасыла́е еґо́, каб ен збе́ґаў за но́ч туды́ да прыне́с ве́стачку. Рад ко́нь, хо́чэтца ему́ уба́чыць цара́ўну, але́ не мажэ́ атарва́тца, бо Кава́ль ве́льми мо́цно прывеза́ў. Тым ча́сам мы́шка ўзле́зла на дуб да й перагры́зла по́вад. Пусциўса ко́нь бе́ґци да так сунў, што й пту́шка не даго́ниць. Прыбе́ґ ен к то́й ґары́, ґдзе́ были́ пала́цы Кащея́ Безсме́ртнаґо, да й дава́й биць капыта́ми. Мало́ціць ен аб каме́нную ґо́ру, аж ена́ трасе́тца, бы ее́ тра́сца кало́ціць, але́ ста́іць мо́цно. Ба́чыць ко́нь, што ничо́ґо не зро́біць, не разабъе́ ґары́, от и пабе́ґ ен шука́ць, ци нема́ щы́лины. Ве́дамо, ва ўсе́м зна́йдзетца щы́лина, або́ яка́я ска́за, то́льки трэ до́брэ пашука́ць. Забе́ґ ен з друґо́ґо бо́ку да й напатка́ў ту́ю щы́лину, што Кава́ль зрабиў як уды́рыў булаво́ю аб ґо́ру. Пусциўса бе́ґци ко́нь у ту́ю щы́лину, ўмча́ўса ў са́мые пала́цы, ґрымаці́ць там, бы ґро́м. Пачў ґэ́то Кащее́й Безсме́ртны, се́ў з Ба́баю Яґо́ю на сту́пу да й пае́хаў насустре́к. Тым ча́сам ось ко́нь и наско́чыў на их и дава́й капыта́ми малаці́ць па чо́м папа́ло. Ба́чыць Кащее́й Безсме́ртны, што тут не перэлиўки, схапиў таўка́ч да як уцы́рыць каня́ па маскаўни́, дак з таґо́ й дух вы́перло Павалиўса ко́нь, задры́ґаў наґа́ми да й вы́пруциўса. Вы́щарыў зу́бы Кащее́й Безсме́ртны, зараґата́ў бы жарабе́ц да й пае́хаў з Ба́баю Яґо́ю аґлядаць свае́ пала́цы. От е́дуць ены́ да е́дуць и ба́чаць, што пала́цы хто́сь развернў и ў са́мо́й ґары́ зрабиў щы́лину. Дава́й тут Кащее́й Безсме́ртны зарабля́ць ту́ю дзи́рку. От пача́ў ен пе́рш лама́ць да цяґа́ць туды́ каме́не. Ци до́ўґо ци ко́ратко ен то́е рабиў, тым часо́ве даў Бо́ґ дзень. Прахапиўса Кава́ль да зирнў, аж нема́ каня́. А мы́шка маўчы́ць, зу́бы сця́ўшы, ничо́ґо не ка́жэ,—баи́тца, каб Кава́ль ат зло́сци не забиў ее́. Патужы́ў, патужы́ў Кава́ль, пасадзиў мы́шку за па́зуху да й пашо́ў пе́шки. Але́, ве́дамо, ў це́мнум ле́се, ў не́тры,—йдзе, йдзе и ўсе на адно́м ме́йсцу кру́цитца. Заблудзиўса Кава́ль, се́ў на кало́дзе да

й ду́мае а прыго́дзе. Уздума́ў ён пра пчо́лку да й дава́й е́ зваць на памо́гу. Пачу́ла пчо́лка, прылеце́ла да й панесла́ Кавала́ з мы́шкаю на то́е ме́йсцо, гдзе́ лажа́ли дро́бы кавале́ваѣ кабы́лки От падняла́са пчо́лка паверх ле́су, перанесла́ це́раз вели́кие бало́та, це́раз высо́кие го́ры за си́нее мо́ре да й апусци́ласа ў ле́се кале́ гары́. Уба́чыў Кава́ль дро́бы сваѣ кабы́лки да аж запла́каў ат жа́лю. Доста́ў ён з кишэ́ни пля́шачку з жыво́ю вадо́ю да й дава́й паliва́ць ты́е ко́сци. То́льки пакрапи́ў, аж ось так и расце́ мя́со, расце́ шку́ра, вы́расла це́лая кабы́лка, як была́. Палиў ён ещэ́ раздруго́й,—дак от кабы́лка пы́рхнула да й паднела́са на но́гп. Падзя́куваў тут Кава́ль пчо́лцы, се́ў на кабы́лку да й паѣха́ў, куды́ пака́звала мы́шка. От зно́ў падъе́хаў ён к гары́, найшо́ў ту́ю щы́лину да й пача́ў абпратца па каме́ню. Спатыка́етца кабы́лка, бо Кащо́й Безсме́ртны наки́даў тут каме́ня да й заго́радзиў даро́гу. Схапиў го́ето Кава́ль булаву́ да й пача́ў прокла́дваць даро́гу. Як ре́зне ён булаво́ю, дак аж го́ры трасу́тца. Пачу́ў то́е Кащо́й Безсме́ртны, пачу́ў, што й на его́ прышло́ ли́хо да й паѣхаў насустре́к. От зъе́халиса ены́ да й дава́й би́тца. Би́лиса, би́лиса, аж го́ры растрыбуш ы́ли, развернў́ли пала́цы, але́ нихто́ адзи́н друго́го не мажэ́ аси́лиць. Ба́чыць Кащо́й Безсме́ртны, што Кава́ль разбиў сту́пу, паламаў таўка́ч и чуць ужэ́ не ре́знуў булаво́ю Ба́бу Яго́, ба́чыць, што не мажэ́ адалѣ́ць, пусциўса наўцекача́, схапиўшы Ба́бу Яго́ на бера́ме. Зирну́ў Кава́ль, што Кащо́й Безсме́ртны пусциўса ўцека́ць, не ки́нуўса его́ даганя́ць, а паѣхаў у пала́цы, шука́ць царэ́ўны. От е́дзе ён да е́дзе, а мы́шка пака́звае даро́гу, аж ба́чыць, лежы́ць вы́пруциўшыса его́ ко́нь. Злѣз тут Кава́ль з кабы́лки, доста́ў з кишэ́ни пля́шачку з жыво́ю вадо́ю да дава́й паliва́ць е́ю каня́ Ажы́ў ко́нь, падня́ўса на но́ги да й заржа́ў ат радасци. Пачу́ў то́е Кащо́й Безсме́ртны и ба́чыць, што Кава́ль е́дзе про́сто туды́, гдзе́ на семи́ замко́х седзе́ла царэ́ўна, зрабиў у пала́цах таку́ю цемна́ту, хаць ты во́ко вы́каль, ничо́го не бачно́. От Кава́ль развеза́ў на галаве́ хустачку, дак со́нейко й засвеци́ло, стало видно́, хаць ты

ґо́лки збирай, да й паѣхаў да́лей. Але́ ось падъезджа́е ён к тым пала́цам, ґдзѣ царэ́ўна, аж усѣ дзве́ры зачы́нены да й зава́лены камѣ́нем. Злѣз тут Кава́ль з кабы́лки й пача́ў аткида́ць то́е камѣ́не Аткі́даў тро́хи да й ба́чыць, што дзве́ры залѣ́зныя, таўшэ́разные, а на их па семи́ замко́ў. Што тут рабі́ць. Ду́маў ён, ду́маў да й паслаў мы́шку правѣ́даць, ґдзѣ царэ́ўна. Пабѣґла мы́шка; вѣ́дамо, ена́ ўсю́дых зна́йдзе щы́лину да й праплі́щытца Панема́лум ча́се верну́ласа мы́шка ве́льми сму́тная да й ка́жэ, што Ба́ба Яґа замаро́зила царэ́ўну. Пачу́ў то́е Кава́ль, абазлиўса, схапіў булаву да й дава́й пѣ́рыць у сцѣ́ну. Як ре́знуў раз-другі́, дак сцена́ й разсы́паласа, бы по́рхаўка. Ки́нуўса Кава́ль туды́, аж ба́чыць—лежы́ць тут царэ́вич, бы пласт. Ба́ба Яґа́ аберну́ла еґо́ ў ка́мень. Лежы́ць царэ́вич, бы жывы́, а кале́ еґо́ по́руч у рад лежа́ць адзина́нцаць еґо́ дзецюко́ў, уда́лых баґатырбў. Усѣ́ ены́, бы зро́блены з ка́меня. Аґле́дзяў Кава́ль, пама́цаў ґэ́тых камѣ́нных людзе́й да й пашо́ў к царэ́ўне. От ухо́дзиць ён у ты́е ледзяны́е пала́цы, аж там усе́ з ле́ду, а мо́о ґэ́то то́льки ўсе перавернў́ласо ў ле́д. От стаи́ць ледзяны́е дзераўля́ки; ены́ аби́невели, ба́тцэ ў вели́ки марбз. Пад ґэ́стыми дзераўля́ками стаи́ць ледзяна́я карава́ць, на ёй по́лаґ, ба́тцэ з и́нею сплѐцены. На карава́ци лежы́ць царэ́уна, ена́ ўся й прасвѣ́чвае, вѣ́дамо ледзя́ная, то́льки све́рху паў и́ней. Падыша́ў Кава́ль да як ґля́нуў на царэ́ўну, дак не мажэ́ й ачо́ў атвесци́ ат ея́, така́я ена́ ґо́жая й так ему́ спадаба́ласа. От стаи́ць Кава́ль на адно́м мѣ́йсцы, бы ўко́паны, а со́нейко з ею́ лба так и свѣ́цицъ, так и ґре́е царэ́ўну. И пачала́ ена́ памале́ньку та́яць да та́яць, пача́ў ле́д перш белѣ́ць, а по́тым чырванѣ́ць. Па нема́лум ча́се лежы́ць царэўна, бы жыва́я, то́льки не ды́шэ. Даста́ў тут Кава́ль з кишэни пля́шачку з живо́ю вадо́ю да й пакрапиў царэ́ўну. Страпену́ласа ена́, откры́ла во́чы да й падняла́са. Тым ча́сам раста́ў ле́д ва ўсих пала́цах. От адзѣ́ласа царэ́ўна, сѣ́ла на свайґо́ каня́, да й паѣхали ены́ туды́, ґдзѣ лежа́ў царэвич. Уба́чыла царэ́ўна бра́та да дава́й над им пла́каць да ўбива́тца. Ду́маў, ду́маў Кава́ль,

што тут пара́дзиць, да ничо́ґо не прыду́мае. От стаи́ць ён да ґля-дзи́ць, як царэ́ўна ўбива́етца. Тым часо́ве со́нейко ґре́е да ґре́е. От и пача́ў ка́мень мякча́ць, пача́ў царэвич и ўсѣ ево́ тава́рышы зноў рабі́тца людзьмі́. Уба́чыў ґэ́то Кава́ль, даста́ў з кишэни пля́-шачку з жыво́ю вадо́ю да як пакрапіў их, дак ены́ й ачу́халиса да й ажыли́ Мно́ґо тут было́ ра́дасци, мно́ґо сле́з. От и сабра́лиса ўсѣ ены́ ў даро́ґу. А мы́шка зноў залѣ́зла к Кавалю́ за па́зуху да й седзи́ць. Вы́бралиса ены́ з пала́цаў да й паѣ́хали лѣ́сам. От ѣ́дуць ены́ да ѣ́дуць. А лѣс вели́ки, што й канца́ ему́ нема́. То́лькі чу́юць ены́, аж Кащёй Безсме́ртны за и́ми ґо́нитца. Ат таґо́ и́мпату ўсхадзи́ласа бу́ра; лѣс тращы́ць, ло́митца, от так и кладзе́тца ло́скам. Вы́ступиў тут на сустре́к Кава́ль, аж Кащёй Безсме́ртны так и ки́-нуўса на ево́ да не ўспе́ў насѣ́сци, як Кава́ль сперазаў ево́ була́во́ю. Ат пе́ршаґо ра́зу ў Кащёя Безсме́ртнаґо трэснула ґалава́, да й раскало́ласа на дзвѣ ча́сци. От и пачали́ Кава́ль с Кащёям ту́затца. До́ўґо ены́ вадзи́лиса. Гдзѣ сту́пяць, дак там зро́битца така́я вы́скаць, або во́зеро, што й да тых час ещэ мо́жна ба́чыць их у лѣ́се. Але́ ось Кава́ль папну́ўса да й падґиба́ў Кащёя пад себе́, наступиў ему́ на ґо́рло да й падня́ў булаву́, каб расква́сиць ему́ маскаўню́. Ба́чыць Кащёй, што прышли́ ему́ капцы́, дава́й ён праси́тца; абеца́е, што бо́льш нико́ли не бу́дзе чапа́тца. а пачне́ жыць то́лькі ў бало́це. Пусциў ево́ Кава́ль да й паѣ́хаў скаре́й к цару́, каб абра́даваць ево́, што нашли́са дачка́ й сын. От прыѣ́хали ены́. Цар велѣ́ў зраби́ць свя́то ва ўсём ца́рстве, атда́ў за Кавали́ за́муж дачку́ царэ́ўну да й зрабиў ево́ нача́льникам над уси́ми нача́льниками. Пача́ў Кава́ль жыць да пажыва́ць да добра́ нажы-ва́ць. То́лькі мы́шка так и аста́ла́са у ево́ за па́зухаю. Кали́ Ка-ва́ль ро́бить добро́, та ена́ ци́хенько седзи́ць, а як пачне́ рабі́ць ли́хо, та мы́шка скрабе́тца за па́зухаю, аж се́рдце дра́пае во́стрыми кипдзюра́ми. До́ўґо жыў Кава́ль, мно́ґо добра́ зрабиў ён у то́м ца́рстве. Ещэ й цепе́р ево́ лю́дзи памина́юць. Лю́дзи ка́жуць, што Кава́ль да са́маѣ сме́рци сам кава́ў и друґи́х вучы́ў кава́ць залѣ́зо.

Ен казáў, што ў кавалí па лóкаць рýки ў зóлаце. От с таѣ пары́ й пачалí лю́дзи кава́ць залѣзо да рабúць сабѣ ўсе, што трэ. Алé як ни дóбрэ было́ Кавалю́ з маладóю жо̀нкаю ў то̀м ца́рстве, як ни паважа́ли его́, ен усé такí не забыва́ў сваю́ радзúну. От раз зрабúласо ему́ так мóташно, што й жыць не мажэ: хóдзиць засмуцóны, бы пад землéю. Пыта́е его́ жо̀нка, чаго́ ен такí смýтны. Маўча́ў ен, маўча́ў да й ка́жэ, што ему́ хóчэтца правѣ́даць сваю́ ро̀дную ма́тку, хóчэтца хаць разóк зирну́ць, што ро́битца ў ро̀днум селѣ. Дава́й тут жо̀нка прасúць Кавалí, каб ен паўéз еѣ к сваéй ма́тцы. Сабра́ўса Кава́ль у велúкую дарóгу, забра́ў з сабóю жо̀нку да й паѣхаў. Дóўго еныы ѣхали, дóўго блука́ли па свѣце, нарэшце прыбúлиса ў то́е село́, гдзѣ жыла́ ма́тка. Састарéласа ена́, згóрбиласа да й вы́сахла ў щéпку, а ўсе пла́кала па сы́ну, ўсе хацѣ́ла ўба́чыць его́ пе́рад сме́рцю От прыѣхаў Кава́ль, нашóў ма́тку ў старо̀й ха́тцы да й ки́нуўса на шы́ю, дава́й еѣ абдыма́ць да цалава́ць. Узра́дуваласа ма́тка, пачала́ пла́кать,—не мажэ́ й сло́ва вы́гаварыць ат ра́дасци. От пагасцява́ў там Кава́ль до̀ўги час, наўчы́ў сусѣ́дзей, як кава́ць залѣзо да рабúць уселя́кае нажэндзе, а по́тым забра́ў ма́тку да й паѣхаў у чужы́ край, у то́е ца́рство, гдзѣ ўсѣ лю́дзи ро̀ўно працу́юць, с пра́цы жыву́ць, адзин другóму памага́юць, а затым и лúха не ма́юць.—Мóо й пра́ўда, што е такí край и такие разу́мные да дóбрые лю́дзи, а мóо еныы гдзѣ ко́львек то̀льки ещэ бу́дуць. Паба́чымо ци бо пачу́емо, калí бу́дзем жы́вы.

Пересказалъ Рѣдкій.

С. Б. Рожинъ.

---

73. Ганья.

Ба́чыце, цепéр у нас така́я павадэ́нца, што пакýль дя́гнетца весѣ́лье, малады́ й маладáя трэ́йко кла́няютца ко̀жнаму, каго́ сустрéнуць. Малады́ѣ паклóнятца, а стрéчны паблагаславúць их ща́сцем да дóляю, трэ́йко пацалу́етца з и́ми да тагды́ то̀льки йдзе

да́лей. Дак от слу́хайце, раскажу́ вам, аткуль пашла́ та́я павадзе́нца

Ко́лись от тут недале́чко жыў адзи́н ве́льми баґа́ты чалаве́к. Быў ен таки́ баґа́ты, што й не знаў, ко́лько ў его́ дабра́. Але-ж пра́ўду ка́жуць, што нема́ тако́ґо чалаве́ка, каб е́н спрэс быў щасли́вы. Бо кали баґа́т, та хво́ры сам або́ жо́нка; а як баґа́т и здаро́ў, та дзецёй нема́, або́ е, да неўда́лые ци лихи́ѣ. От ґэ ўсѣ лю́дзи ма́юць яко́е ко́львек нещасце. На то́м и свѣт стаи́ць, бо чаґо́-ж бы й жыць, кали́-б не было́ чаґо́ хацѣць? Але́ Бо́ґ так даў, што чалаве́к за́ўжды ма́е нещасце й хо́чэ, каб его́ не было́. От затым и жыве́ ў бедзѣ да ўсе чака́е лѣпшаѣ жы́дки. Гэ й той баґа́ты чалаве́к мно́ґо маў уселя́каґо дабра́, але ў его́ штось дзѣци не ґадава́лиса. Нарэ́шце аста́ла́са адны́м-адна́ дачка́ да и та́я яка́ясь неўда́лая. Ена ўжэ была́ ў лѣцях, а за́муж нихто́ не бере́, бо ба́цько ўсе выбира́ў сабѣ баґа́таґо да ўда́лаґо зя́ця. Але́ ґдзѣ знайци́ тако́ґо малайца́, каб е́н быў и баґа́ты, й ґо́жы. Як баґа́ты, та ры́ла́ты, а як уда́лы да го́жы на вид, та ґо́л, як бич.

Паспе́ла дзѣ́ўка, бы по́рхаўка, от здае́тца чапни́, дак и разсы́плетца. Вѣдамо, пры баґа́цю да ў раско́шы дзѣ́ўка аж пу́каетца— хо́чэ за́муж, а малайца́ нема́ Бо не о́чы-ж драць, кали́ не хо́чуць браць. Мо́о й затым абеґа́юць еѣ, што ена́ адна́ ў ба́цька. Бо лю́дзи ка́жуць, што едына́чка, та ку́рва ци лайда́чка. Дзе́ля таґо́ дзѣ́ла мо́о хто й пасва́таў-бы, але́ ко́жын ду́мае, што баґа́ч зрэкузу́е й не отда́сь дачки́ за бѣ́днаґо. От ґэ й аставáласа дзѣ́ўка без спо́сабу. Мо́о-б ена́ ґэ ў дзѣ́ўках аста́ла́са й на ўсе жы́це, але́ ось там недале́чко жыў ме́льник. Не то, што-б ве́льми, але ат сабѣ тро́хи быў баґа́т е́н. Вѣдамо, ме́льник; е́н за́ўжды не бѣ́дны, бо не ма́е лихо́ґо ґо́ду: ци зраджа́й, ци не зраджа́й, а ме́льнику бу́дзе. От у таґо́ ме́льника быў дзецю́к. Ужэ-б даўно́ ему́ пара́ было́ жани́тца, але́ е́н быў яки́сь неўда́лы й до́ўґо личы́ўса ўсе ещэ́ падшпа́ркам. Але́ ось нарэ́шце ўзду́маў ме́льник жани́ць и сваґо́ сы́на. Засла́ў е́н сватбу́ к дзѣ́ўцы таґо́ баґача́ нибы́то знарбк, адно́ж той и зґадзи́ўса атда́ць сваю́ дачку́ за ме́льникавaго сы́на.

От дава́й ме́льник ла́дзиць весе́лье, дава́й збира́ць дружы́ну да жани́ць свайґо́ дзецюка́. Назбира́ласо на то́е весе́лье людзе́й мо́о з паўсве́ту: бо́ ка́жуць жэ,—ґдзе́ чу́юць, там и начу́юць; ґдзе́ е пачо́стка, там пе́ўне ат ґасце́й нема́ атбо́ю. Але́ не спадаба́ласо ни баґачу́, ни ме́льнику, што ў их так баґа́цько ґаспе́й, што ве́льми мно́ґо йдзе ўселя́каѣ пачо́стки, й пачали́ ены́ ґа́рдзиць до́брыми людзьми́. От у баґача́ да ў ме́льника та нема́ ме́ду саладзе́нькаґо, та нема́ пи́ва хмельне́нькаґо, та нема́ ту́ку, нема́ са́ла, та ґаре́лки не ста́ло. И пачали́ ґо́сци ґаманиць да скупы́х баґатырбу́ ґудзи́ць. Пачу́ли то́е баґачы́ да й пачали́ ґасцей зневажа́ць да з ґаспо́ды выґаня́ць. А ту́т на весе́льи бы́ў яки́сь падарбжны. Нихто́ не ве́даў, аткуль е́н и яки́ е́н чалаве́к. Тым ча́сам то бы́ў вели́ки ведзьма́р. Заѣ́ўса е́н на баґачбў да й аберну́ў усе́ весе́лье ў ваўкалакбў. От и ста́ла с таѣ́ дружы́ны во́ўчая ґанья́; пале́рласа ена́ з ве́ски перш на асе́лицу, а по́тым у хмы́зник да ў лѣс. С таѣ́ пары́ аж да тых час бѣґае ґанья́ ваўкалакбў—ґэ́то то́е весе́лье. Уба́чыли то́е лю́дзи да й пачали́ з таґо́ ча́су ўсих шанава́ць на весе́льи да частава́ць та ме́дам саладзе́ньким, та пи́вам хмельне́ньким. Пачали́ з таѣ́ пары́ малады́е ўсим кла́нятца тра́йко да земли́, каб ты́е паблаґаслави́ли ща́сцем да до́лею да ве́кам до́ўґим.

Дак от аткуль у нас пашла́ ґэ́стая павадэ́нца.

Пересказалъ П. Грыцкевичъ.

С. Чучевичи.

---

74. Светы чалавѣк.

Жыў сабе́ адзи́н светы́ чалаве́к. Жыў е́н як усе́ лю́дзи: гарава́ў, працава́ў, а доста́ткаў не маў. Жыў е́н ци́хенько, ґледзе́ў себе́ да свайго хаджа́йства; нико́му не рабі́ў ли́ха, дак и ево́ не чапа́ли лю́дзи. Перш з ево́ смея́лиса, стро́или кпи́нки, але́ ўба́чыли, што светы́ чалаве́к мо́ўчки ўсе зно́сиць, заличы́ли ево́ шалапава́тым ду́рням и атчапи́лиса. Жыве́ ґэ светы́ чалаве́к, от як-бы ево́ й на

свѣце немаш. Пачали́ лю́дзи бо́льш прыґля́датца да й дагада́лиса, што ґэто светы́ чалаве́к, бо нихто ў селе́ не мо́ґ сказа́ць ничо́ґо лихо́ґо пра таго́ чалаве́ка. Аднаго́ лю́дзи не магли́ разшало́паць,— чаму́ ґэто светы́ чалаве́к не хо́дзиць у цэ́ркаў и не хры́сцитца, як уба́чыць папа́. От пашли́ лю́дзи к папу́ й дава́й его́ пыта́ць, чаму́ ґэто той чалаве́к не хо́дзиць у цэ́ркаў. Паслу́хаў их по́п, распыта́ў пра таґо́ чалаве́ка да й ка́жэ, што ён за то́е бу́дзе праклятѣ.—Э, ён светы́,—ка́жуць лю́дзи.—Кали-б ён быў светы́, таб ён хадзи́ў у цэ́ркаў и мене́-б шанава́ў.—Паслу́хали то́е лю́дзи да й ду́маюць, што мо́о й пра́ўду ка́же по́п. От раз лю́дзи й пашли́ з цэ́ркви про́сто к таму́ свето́му чалаве́ку паґлядзе́ць, што ён ро́биць у той час, як усе́ мо́лятца ў цэркви. Прыхо́дзяць ены́, ажно́ светы́ чалаве́к зайшо́ў у ґумно́, ски́нуў сви́ту, распераза́ўса да ўсе ска́чэ цераз запе́ру. Што ты ро́биш?—пыта́юць свето́ґо чалаве́ка лю́дзи.— Малю́са,—атка́звае той. Чаму́-ж ты мали́тца не йдзеш у цэ́ркаў?— Бо там не́льґа мали́тца, там лю́дзи не мо́лятца, а то́льки ґре́шаць. Зноў пашли́ лю́дзи к папу́ да й разсказа́ли, што ены́ ба́чыли й што и́м каза́ў светы́ чалаве́к. От по́п сам пашо́ў к свето́му чалаве́ку да й дава́й его́ ўмаўля́ць, каб ен хадзи́ў мали́тца ў цэ́ркаў. Послу́хаў папа́ светы́ чалаве́к, адзену́ў но́вую ку́рту, абу́ў но́вые ла́пцы да бе́ленькие, бы снеґ ану́чы, падпераза́ўса по́ясам да й пашо́ў у цэ́ркаў. Цэ́ркаў стаяла за бало́там. Да ей лю́дзи йшли па ґрази́ па са́мы по́яс. Мужчы́ны раззува́лиса, скида́ли ґанави́цы, а жанки́ паднима́ли андараки́ да саро́чки па са́мы пуп. Сам по́п скида́й наґави́цы, падбира́ў по́лы да й месі́ў ґрязь го́лыми цыґлами па са́мы по́яс. А паґа́ны быў той по́п ён таґды́ йшоў у цэ́ркаў, як туды йшли дзе́ўки й маладзи́цы. От якра́з уци́снетца памиз их да й шутку́е, як тые рука́ми закрыва́юць сарамаце́не. От идзе́ по́п з жанка́ми па ґрази́ па са́мы по́яс; выквецалиса ены́ ў ґразь, бы чэ́рци, а светы́ чалаве́к идзе́ сабе́ ў сваи́х но́вых ла́пцыках и ў белю́сенькиx ану́чах па верх ґрази́, бы па сухо́й земли. Падзиви́ўса по́п, спужа́ўса, аж шуткава́ць з ба́бами паки́нуў. От падышли́ ены́

к цэ́ркви, абмы́ли ў калю́зе тро́хи ґразь, паадзева́лиса да й улѣ́зли ў цэ́ркаў Пача́ў по́п служы́ць; пачалі́ лю́дзи мали́тца, але́ й по́п и лю́дзи ўсе ду́маюць аб то́м, што ба́чыли, як шлі́ ў цэ́ркаў, пра Бо́ґа саўсі́м забы́ли. Спрэ́су ўсѣ хры́сцятца й мо́лятца, а ду́маюць аб друґо́м. Стаі́ць светы чалавѣ́к у цэ́ркви да пазира́е на людзе́й. Але ось зирну́ў е́н у куто́к да й ба́чыць, аж там чорт ухапі́ў наґа́ми й зуба́ми вало́вую шку́ру да ўсе разця́ґвае еѣ. Вы́цяґ чорт вало́вую шкуру, каб ена была́ бо́льшая да й пача́ў на шку́ры запі́сваць люцкі́е ґрахі́. Смѣх апанава́ў светоґо чалавѣ́ка, калі́ ўба́чыў е́н, як чорт кры́витца да ко́рчытца, каб расця́ґну́ць бо́льш вало́вую шку́ру. Уба́чыў чорт, што светы́ чалавѣ́к засмея́уса, хап и еґо́ записа́ў на вало́вуй шку́ры. Зна́чытца, й светы́ саґрашыў. Вы́шли лю́дзи з цэ́ркви, мужчы́ны паскида́ли ґанави́цы, а жанкі́ пападнима́ли андараки́ й саро́чки па са́мы пуп да й пацяґлі́са да гаспо́ды. Брадзе́ й по́п ра́зам з жанка́ми, брадзе да то́льки аблі́звается. Пашо́ў и светы́ чалавѣ́к да ґаспо́ды ра́зам з друґи́ми ў сваі́х но́венькіх ла́пциках и белю́сенькіх ану́чах. Але от то́льки е́н вайшоў у ґразь, як ноґи завя́зли чуць не па ко́стачки. И парабіу е́н у ґразь сваѣ́ но́венькие ла́пцики й белю́сенькие ану́чы. Пазна́ў тут светы́ чалавѣ́к, што е́н у цэ́ркви не памали́ўса, а то́лько наґрашы́ў. От вы́шли ены́ з бало́та, абмы́лиса тро́хи ў калю́зе, паадзева́лиса й паабува́лиса да й хацѣ́ли йци да ґаспо́ды, але ось по́п, зирну́ў на светоґо чалавѣ́ка да й ка́жэ: „светы ґэ́то чалавѣ́к, бо як е́н мали́ўса ў ґумнѣ́, та йшоў цераз бало́то па ґрази́ ў но́венькіх ла́пциках и чы́сценькіх ану́чах, а як памали́ўса ў цэ́ркви, та то́льки наґрашы́ў, бо, от ба́чыце, як заквѣ́цаў у ґразь сваѣ́ но́венькие ла́пцики и бѣ́ленькие, бы снѣґ ану́чы“. Пакланію́са тут по́п свето́му чалавѣ́ку да самаѣ земли.—Малиса—кажэ,—як мали́ўса, ма́быць твая́ мали́тва прыемнѣ́й Бо́ґу.

Пересказалъ П. Грыцкевичъ.

С. Чучевичи.

75. Чортаво балото.

Ба́чыце, яка́я тут не́тра, якая тхлань: це́лы ты́дзень идзи́, та да краю не дацця́гнешса. Даўне́й тут была́ чы́стая вада́, ўсе лелѣ́ла да блищало на со́нейку, бы шкло. Бо́ґ е́здзиў па вадзе́ ў чоўне да аґлядаў, ґдзѣ зрабиць зе́млю. От раз плыве́ Бо́ґ у чо́ўне да меркуе, як и ґдзѣ што ўро́ндзиць; а тым часам чорт закме́ў Боґа да й паплы́ў за Им на́зиркам: падплыве к чоўну да ат стра́ху нырне́ ў во́ду бы ныро́ц и зноў плыве. Ве́льми ему хо́чэтца пранюхаць, што Бо́ґ ма́е рабиць. Ба́чыць Бо́ґ, што чорт про́тца сле́дам, як тая мара́, бачыць да ўсе маўчы́ць. От пасе́яў Бо́ґ землю,—сыпану́ў жме́ню земли, а тут ра́зам разступи́ласа вада, й высунуласа суха́я земля з ле́сам, з полем да с сынажацями. Гледзиць чорт да то́льки дзи́витца, аткуль то́е ўсе бера́тца. От плыве́ Бо́ґ да жменяю з чоўна бы з сеўка разки́двае насе́не. Прыґледзе́ўса к таму́ чорт и ду́мае сабе́: „отож, каб мнѣ даста́ць ґэстаґо насе́ня,—нарабиў бы я мудре́й Боґа, нарабиў бы так, што сам ницы́пар пазави́дуваў бы“. Паба́чыў Бо́ґ ду́мки чорта да й пазво́лиў ему ўзяць таґо́ насе́ня От наверну́ў Бо́ґ чо́вен да яку́рат на чорта й наткну́ўса. Ско́рчыўса чорт, хацѣ́ў шмы́ґнуць у воду да зачапи́ўса хвасто́м за пастырча́к да й кру́цитца на виру́ бы вьюнъ. Тым ча́сам Бо́ґ атверну́ўса ў друґи́ бо́к, а чо́вен плыве́ кале́ са́маґо чо́рта. Ско́рчыўса чорт, што божы човен апъе́к ему бо́к, але тым ча́сам ухапи́ў з чоўна жме́ню насе́ня, а каб Бо́ґ не ўба́чыў таґо́ да не атабра́ў, хуце́нько ки́нуў насе́не ў ґо́рло да й глыну́ў. Не закме́пиу нибы́то Бо́ґ и паплы́ў да́лей. Рад чорт и ат ра́дасци суну́ў у бо́к, да́лей ат Боґа. Але ось ба́чыць чорт, што еґо чэ́раво расце́ бы на дро́жджах, расце, аж бо́ки распира́е. Расце чэ́раво ўсе бо́льш и бо́льш, расце так, што чо́рту не́льґа й ды́хаць. Дава́й ґэто е́н блева́ць да выплёўваць тое насе́не. Куды́ плю́не чорт, дак там и вы́расце корч або́ куст лазы́. Про́тца чорт па вадзе́ да так блюе́, што аж з еґо вантро́бы выпира́е А тым часам усе бо́льш и бо́льш па вадзе́ заплёўваетца чо́ртава

лазá. Мóташно чóрту, хóчэтца емý ўсе насе́не з жыватá вы́кинуць от ен снуе́ па вадзе́ бы павýк да ўсе блюе́. Па не мáлум часе ўся вадá закры́ласа лазóю да ракúтаю. Зачапúўса чорт за лóзу да як рыґне́, дак усе́ насе́не й вы́скачыло з жыватá ў воду, й пачалá з еґо расцú ўселя́кая непатрэ́бная травá. Запаґáниў чорт чы́стую вóду й абернýў е́ў паґáнае чóртаво балóто. Зирнýў Бóґ, што нарабúў чорт да аж за ґóлаў схапúўса. Што тут рабúць, што пачáць!? Як тут лóзу вы́ґубиць? А, ве́дамо, куды́ ўжэ лазá ўплю́нетца, дак е́ў ничы́м не вы́ґубиш. От паслаў Бóґ сóнейко, каб енó спалúло чóртаву лозу. Прыпеклó сóнейко, наґре́ло вóду,—а лазá хаць бы што,—ещэ́ ле́пш расце́. Узелáса лазá па балóце бы везе́ль. Бáчыць сóнейко, што ничóґо не парáдзиць, кúнуло пекцú й пашло к Боґу на скáргу. И веле́ў Бог марóзу вы́маразиць паґáные кусты́. Хапúў марóз, тращы́ць, ґнецé. Замéрзла вадá, а лазá й ни ґáтки,—седзúць сабе́ да весны́ чакáе. Што ни рабúў марóз, як не сцискáў лазóвые карчы, марóзиў, аж з сúлы вы́биўса й пашóў к Богу на скáргу. Падýмаў, падумаў Бóґ да й веле́ў, каб лазá аставáласа расцú; бо, ве́дамо, пóкуль зґýбиш лихóе, та дóбрае самó зґúне. От расце́ лазá й закрывáе не тóлько балóто, але й сынажáци, а то ле́зе й на пóле. Пабáчыў чалаве́к, што лазы́ так мнóґо да й дýмае сабе́: „ци не мóжна й з лазы́ зрабúць што кóльвек патрэ́бнае“. От пашóў чалаве́к у чóртаво балóто, наздзирáў з лазы́ кары́ да й давáй вить вераўкú. Вье да пе́сни паé. Убáчыў тое чорт и спужáўса. Падхóдзиць ен к чалаве́ку да й пытáе.—Што ты, чалаве́чэ, рóбиш?—Хибá табе́ бе́льма павылáзили, што не бáчыш,—кáжэ чалаве́к.—Бáчыць та я дóбрэ бáчу, але не ве́даю, на вóшто табе́ ґэтая рабóта.—А от дай пакажý.—Узяў ґэто чалаве́к да й скрампавáў чóрта лычакóм да й прывезáў еґó к таўщэ́разнаму дýбу.—От цепéр,—кáжэ чалаве́к,—давáй я цебе́ вы́леґчаю.—Спалóхаўса чорт да як рванéтца, дак и вы́рваў дýба з карéнем, вы́рваў да й сунýў наўцекачá з дýбам рáзам. Бежы́ць па балóце, а дуб карéнем да сукáми баранýе зéмлю, тóльки вы́скаци да ґлыбóкие равы́ ззáду

астаю́тца. А чалавѣ́к сѣ́ў сабѣ́ на ра́ла таґо ду́ба да пакры́квае на чо́рта: „верта́й на лѣ́во, верта́й на пра́во!“—Бѣ́гаў, бѣ́ґаў чорт, узверну́ў усе́ бало́то. От ат таґо́ да тых час ещэ́ стаяць па бало́це выжары́, азеры́ны да вы́скаци. До́ўґо круци́ўса чорт, паку́ль вы́лузаўса з веро́вак, а по́тым як суну́ў наўцекача́, дак чорт вѣ́дае куды́ й дзѣ́ўса. Аста́ўса тут чалавѣ́к и заўлада́ў чо́ртавым бало́там Дава́й ґэто е́н церабі́ць ло́зу, драць еѣ́ та на ла́пци, та на лычаки. Вы́церабиў тро́хи, пабудава́ўса серо́д лѣ́су, ўскарпа́ў поле, вы́сек на сынажаць, але да тых час ничо́ґо не парадзиць з чо́ртавыми карча́ми: вы́сечэ адзин, та дзесяць вырасце. И астае́тца чортаво бало́то чо́ртавым балотам да тых час·

Пересказалъ П. Грыцкевичъ.

С. Чучевичи.

---

76. Палешук и чорт.

Лю́дзи ка́жуць,—ко́лись дак гэ: дзѣ́ бало́то, там и чорт Але не то штоб то́лько ў бало́це, куды́ ни зирни́, ўсю́ды тра́пиш ґэ́стую не́чысь Вада́ ба́ло кишы́ць чарценя́тами. То́льки на Вадо́хрыщэ (Боґоявленіе), як павыґаня́юць чарце́й з вады́, та ены́ таўку́тца ў павѣ́тры да паднима́юць таку́ю хви́лю, што ни пи, ни ѣж и з хаты не лѣ́зь, Затым-то па Вадо́хрыщы за́ўжды быва́юць ґане́бные мецэ́лицы. Ча́сам усхо́дзитца така́я круцѣ́ль да завиру́ха, што спрэ́су пазано́сиць вески. Беда́ таґды́ ў по́ли: свѣ́ту Бо́жаґо не бачно́. Пападу́тца ў по́ли ло́дзи, дак нечы́сцики закру́цяць их кале́ са́маґо села́ да й заґу́бяць. Ба́ло баґа́цько хви́ля ни́щыла людзе́й. Цепе́р ужэ́ ре́дко быва́е ґане́бная завиру́ха, бо меньш ста́ло чарце́й, а чарценя́та спрэ́су перавели́са: их Илья́ пабиў ґро́мам, а друґи́е не раджа́ютца. Перш чэ́рци были́ ве́льми пло́дные, але Палешу́к перахитры́ў и чо́рта. От як то́е было́. Абабра́ў сабѣ́ Палешу́к седзи́бу пами́ж бало́та кале́ раки́ да й дава́й там рабі́ць будо́ўлю. Збудава́ў е́н сабѣ́ перш стано́к, накла́ў аґню́, налави́ў вьюно́ў, напьѣ́к их,

нaĕ́ўса да й апĕ́каетца сабĕ́ калé аґню́. Ба́чьць чорт, што Палешук не лека́етца ни бало́та, ни раки́, ни лĕ́су, от и дава́й ён усю́дах пужа́ць чалавĕ́ка, дава́й рабíць ему́ ўселя́кую па́касць, каб вы́ґнаць еґо́ з таĕ́ седзи́бы. Куды Палешу́к ни су́нетца, чорт ужэ́ там чака́е да наро́виць, каб зраби́ць яку́юсь па́касць Пашоў чалавĕ́к у лĕ́с, каб наґле́дзяць зда́тнаґо дзе́рава сабĕ́ на будо́ўлю, а тут чорт дава́й еґо́ вадзи́ць да кружы́ць, каб ен заблудзи́ўса да й заґи́б. Але́ Палешу́к идзе́ сабĕ́ па лĕ́се да ўсе залы́свае сакĕ́ркаю дзераўля́ки. Вадзи́ў—вадзи́ў чорт Палешука́ па лĕ́се, кружы́ў—кружы́ў. аж сам заплу́таўса, а той наґле́дзяў сабĕ́ зда́тнаґо дзе́рава, надра́ў лы́ка на ла́пци да й пашо́ў про́сто да ґаспо́ды, пазира́ючи на залы́сленые дзераўля́ки. Ба́чыць чорт, што чалавĕ́к не заблудзи́ўса, забĕ́ґ упе́рад. сустре́ўса да й пыта́е, на што ён залы́сиў так баґа́цько дзераўля́чын.—Гэ́то мнĕ́ зда́тнае дзе́раво на будо́ўлю—кажэ́ Палешук. На што-ж табĕ́ так баґато?—Я хачу́ забудава́ць усе Палĕ́се.

— От беда́—ду́мае чорт. От и пусти́ўса ён на хи́трась.—Дава́й, я табĕ́ бу́ду памаґа́ць—ка́жэ чорт—мнĕ́ серо́ўно нема́ чаґо́ рабíць.—До́брэ—ка́жэ Палешу́к—памаґа́й, та я падзя́кую. Тым ча́сам чо́рту то́лькы то́е й тре́ба.—Бу́ду памаґа́ць—ду́мае ён,—да так нараблю́, што пападзе́ш ты ў маĕ́ ла́пы.

От дава́й Палешу́к разчыща́ць зе́млю да ґато́виць дзе́раво на будо́ўлю. Перш велĕ́ў ён чо́рту разчы́сциць пу́шу. Нема́ чаґо́ рабíць,—слу́хае чорт Палешука́: выдзира́е таўща́разнае дубъе́ з каре́нем да сця́ґае ў бало́то, або́ ў во́зеро. Куде́ю чорт це́ґ дубъе, там да тых час ещэ́ е равы́ да вы́скаци. Разчы́сциў чорт до́брае ла́пикло земли́, от Палешу́к велĕ́ў ему́ нарабíць дарбґ. Вы́рваў чорт вели́зазнаґо ду́ба, ўхапíў еґо́ за верх да й паце́ґ цераз лĕ́с Баранýе дуб каре́нем, вырыва́е дзераўля́ки й так арэ́ зе́млю, што ззаду то́лькы астаю́тца брады́ да брадзеня́та. Нарабíў чорт таки́х дарбґ, што па и́х то́лькы ён сам и мажэ́ прайци́, або праĕ́хаць. Зирчýў Палешу́к да дава́й ля́яць чо́рта на чо́м свĕт ста́иць —Дзе́ля яко́ґо ты—ка́а—чо́рта нарабíў брадбў да брадзенят? Рад чорт, што

нарабиў чалавѣ́ку ли́ха, рад, абли́зваетца да тŏльки ци́хенько хвасто́м кру́циць.—Ну, давай жэ—кажэ Палешук—я на табѣ́ праѣ́ду па тваи́х даро́ґах. Сѣў Палешу́к на чо́рта да й паѣ́хаў цераз брады́ й брадзеня́та Бежы́ць чорт па брадŏх у вадзѣ́ да ў ґрази́ па са́мае ґорло, а Палешу́к седзи́ць на ка́рку, падґиба́ўшы но́ґи, да тŏлько киру́е Ѣздзиў-ѣ́здзиў Палешу́к на чо́рту, здаво́лиўса да й верну́ўса да ґаспо́ды.—Ба́чыш, до́брые даро́ґи—кажэ чорт. — До́брые та до́брые,—атка́звае Палешу́к,—да чорт-бы и́х пабра́ў ра́зам с табо́ю От с таѣ́ пары́ й астали́са ў Палѣ́си таки́е даро́ґи, што па и́х тŏльки на чо́рту мŏжна ѣ́хаць. По́тым пача́ў Палешу́к з чо́ртам пля́жыць лѣс да вази́ць дзе́раво на будŏўлю. Збудава́ў сабѣ́ Палешу́к уселя́ки буды́нак, ускарпа́ў паля́нку земли́, разчы́сциў ла́пикло сынажа́ци да й зажы́ў до́брым хаджа́йнам, а чорт рад, што ему́ астали́са бало́то й не́тра—пашо́ў туды́ да й седзи́ць там з чарценятами. От абжы́ўса Палешу́к, наґадава́ў ґаўя́да, нажа́ў збŏжа, налави́ў вьюнŏў—жыве́ й ли́ха не зна́е. Тŏльки ось раз мало́циць Палешу́к у ґумнѣ́, аж и прыхо́дзиць чорт да й пыта́е, што ґэто чалавѣ́к ро́биць.—Малачу́ хлѣб,—ка́жэ Палешу́к.—Дай я памалачу́. Даў Палешу́к чо́рту цє́п, а той як пачне́ биць, дак снапы́ леця́ць аж пад стрŏп.—Чаму ў цебе́—пыта́е чорт—снапы́ лежа́ць на мѣ́йсцу, а ў мене́ ска́чуць уве́рх?—Бо я дуже́йшы: як дам, дак снŏп и ўли́пне ў тŏк.—Атку́ль у цебе́ така́я си́ла?—пыта́е чорт.—Атку́ль! бо я себе́ вы́леґчаў. — Вы́леґчай мене́,—про́сиць чорт. До́брэ,— ка́жэ Палешу́к,— тŏльки трэ цебе́ звеза́ць, бо ты ўцечэ́ш, а то́е зашко́дзиць.—Звежы́. От узя́ў Палешу́к ли́ну, што цяга́юць ульѣ́ на дзе́раво, зкрампава́ў е́ю чо́рта, прывеза́ў еґо к то́ўстаму дўбу, узя́ў серп и дава́й леґча́ць. Крычы́ць чорт, раве́ нѣ́мым ґо́ласам, а Палешу́к пи́лиць серпо́м. Церпѣ́ў-церпѣ́ў чо́рт да як рване́тца, дак перш ду́ба вы́рваў з каре́нем, а по́тым и ли́ну разарва́ў, бы павуцѣ́не. Вы́леґчаў Палешу́к чо́рта да й ка́жэ—ну, цепе́р бу́дзеш ду́жы, як и я. Паця́ґса чорт у бало́то; ўжэ не бежы́ць, а паўзе́ чуць не ра́кам. Паседзѣ́ў ен там—нема́ ра́ды: кроў

льéтца, бы з вапрука́. Пацéґса ен зноў к Палешуку́. Ба́чыць Палешу́к, што чорт ця́гнетца разкара́чыўшыса, сказа́ў жо̀нцы, каб ена́ апрану́ласа ў мущы́ньскую адзе́жу да й пашла́ ў ґумно́ малаці́ць. Апрану́ласа ба́ба, пашла́ ў ґумно́ да й малоциць. Прыхо́дзиць чорт. З бо́ли е́н и невазна́ў, што ґэ́то не Палешу́к, а ба́ба, да й пыта́е, што чаму́ ґэто ра́на не зажыва́е —От чаґо́ ты захацэ́ў,— ка́жэ ба́ба,—каб так ху́тко ра́на зажыла́. Мене́ ўжэ от два́ццаць ґодо́ў як вы́леґчали, а ещэ й цепе́р не зажыло́. Пры ґэ́тум ба́ба падняла́ падо́л да й паказа́ла чо́рту сваю́ ра́ну. Зирну́ў чорт, аж пра́ўда ра́на не зажыла́.—От е́н падаґну́ў хво̀ст да й пацéґса ў бало́то. От з таѣ пары́ й го́дзи чэ́рци пладзи́тца. Тым ча́сам Илья ко̀жнае ле́цячко перуно́м бъе их да ни́щыць. Усе меньш да меньш чарцей у бало́це а палешуки́ мно̀жатца да се́лятца па ўсе́м Палѣси. Мо́о ско́ро ўсѣ чэ́рци пераведу́тца, таґды́ лю́дзи заўлада́юць и бало́там и ўселя́каю не́траю.

Пересказалъ П. Грицкевичъ

С. Чучевичи.

---

77. Шаптуха.

У яко̀мсь сельцы́ жыла старэ́нькая ба́ба. Была́ ена́ адна́, бы та́я былі́нка ў по́ли Усѣ ея крэ́ўные да сваяки́ даўно́ паўмира́ли, а ена́ як аста́ла́са, дак и липи́ць, як то́е ґнило́е да старо́е дзе́раво. Сельцэ́ было́ мале́нькае, мо̀о яки́х дымо̀ў дзе́сяць. На само̀м канцы́ стаяла ба́биная ха́тка. Ена́ была́ така́я старэ́нькая, як и сама́ ба́ба. Скрыви́ласа да змо́рщыласа баба, пакрыви́ласа й еѣ ха́тка Нашо́ўса яки́сь до́бры чалавѣ́к, што нарабі́ў у ба́бино̀й ха́тцы падпо̀рак да аблажы́ў еѣ заґа́таю; от и стаи́ць старэ́нькая, абро̀сшая мо́хам, бы еѣ хаджа́йка, ха́тка, стаи́ць и не варухне́тца, бо не ве́дае ў яки бо̀к павали́тца. Назбира́е ба́ба ще́пачак да цурба́лкаў, падто́пиць у пѣчцы да й апѣкаетца пе́рад по́ламьем. Ве́дамо, на ста́расци

дак и ў лѣтку хо́ладно. От так и жыве́ сабѣ́ старэ́нькая ба́ба: кали́ е што, та зъе́сь, а кали́ нема́, дак и так або́йдзетца. Да й ко́лько е́й трэба? Дась хто ко́львек асу́шкаў хлѣ́ба, або́ бу́льбы, от ба́ба размо́чыць скары́нку да й пасмо́кчэ еѣ́ трохи беззу́бым ро́там, а бу́льбу спечэ́ ў пры́ску да й е́сь. От ґэ́стым и жыви́ласа та́я ба́ба ўжэ́ пе́ўне ґадо́ў з сарачню́. Ба́чыце, е́й ужэ́ было́ мо́о бо́льш, як ґадо́ў сто.

Мо́о ещэ́ до́ўґо-б пражыла́ так та́я ба́ба, але́ от раз е́хаў праз то́е сельцэ́ та́машны пан, убачыў е́н старэ́нькую ба́бу да й здзиви́ўса, што ена так до́ўґо жыве́.

— Хиба-ж ты, ба́бко, ещэ́ жы́ва?—пыта́е пан.

— Жы́ва, пано́чку, мо́й сако́лику... От не даé Бо́ґ сме́рци...

— Як же ты жыве́ш?

— Яко́е маé жы́це, пано́чак мо́й дараґе́ньки! Як так жыць, та лепей ґниць: зараби́ць—неўзго́лею, а дзѣ́тки й уну́ки ўсѣ́ даўно́ паўмира́ли. Нѣ́каму й вады́ пада́ць.

— Чаму́-ж ты, ба́бо, не шэ́пчэш, або́ неваро́жыш?

— Не ўмѣ́ю, мо́й ле́бедзику.

— Слу́хай, ба́бо, я цебе́ наўчу́.

— Наўчы́, мо́й сако́ле ясны, наўчы́, каб и я не да́рам свѣт займа́ла.

Пан прыхили́ўса к ву́ху да й ка́жэ ба́бе: „от як пазаву́ць цебе́ к хво́раму, та ты паху́кай трэ́йко на еґо́ да й шапчы́—сиґо́лаў жыў, сиґо́лаў нѣ. Пашапчы́ о ґэ тро́хи, дай ему́ вы́пиць вады́, та е́н и папра́витца. А кали́ памрэ́, та сиґо́лаў еґо́ беры́. От за то́е цебе́ бу́дуць карми́ць и паважа́ць“.

Падзя́кувала ба́ба па́ну да й пачала́ шапта́ць, пачала́ людзе́й рата́ваць. Але каму́ ни па шэ́пчэ, ко́жын ачу́няе.

Пашла́ прачу́тка мо́о па ўсему́ свѣ́ту, што объяви́ласа така́я ба́ба, така́я шапту́ха, што ена́ ве́льми до́брэ лѣ́чыць людзе́й и ґаўя́до. Да й не то́лько лѣ́чыць, але й усе ўґа́двае. Павали́ли к то́й ба́бе лю́дзи атусю́ль; несу́ць и везу́ць то́й ба́бе ўселя́каґо дабра́.

Жывé сабѣ бáба анú ґáтки. Тым чáсам той пан, што наўчыў бáбу шаптáць, чўе аб тóм да тóльки смеётца сабѣ цíхенько з дурны́х людзéй. Алé ось пашóў я́кась той пан на палеване, мнóґо ахвóциўса, спацѣў да пакрычáў праци вѣтру, от и зрабíласа ў еґó ў ґóрле скўла. Пан к дахтурóм—куды там—от, от скўла задáвиць и тóльки. Жóнка кáжэ, каб пазвáли тўю слáўную бáбу, а пан и слўхаць не хóчэ; але нарэ́шце як прыпéрло лíхо, дак зґадзíўса каб пазвáли й тўю бáбу. Пришлá бáба, а пан ужэ чуць дыхае. От давáй бáба хўкаць да шаптáць—сиґóлаў жыў, сиґóлаў нѣ. Прыслўхаўса пан, да як учўў, што бáба шэ́пчэ тое, што éн еѣ наўчы́ў, дак еґó апанавáў такí смѣх, што не мажэ аж вытрымаць. А баба шэ́пчэ да шэ́пчэ. Слўхаў, слўхаў пан да як зараґóчэ,—дак скўла ў ґóрле й трéснула. От и вы́здаравеў пан да й давáй дзя́куваць тóй бáбе, што атратавáла еґó ат смéрци.

— Ци-ж ты, бáбко, ўсе так лѣчыш?—Пытáе пан

— Эґэ-ж, мóй сакóлику, ўсе так.

— Ну а як жэ ты, бáбко, ўґáдваеш?

— Угáдваю, бо так Бóґ дае.

— Атґадáй-жэ, бáбо, што ў менé ў руцé?

— Папáўса жўчку ў пáньскую рўчку,—щы́ро прамóвила баба. Енá, бáчыце, спужáласа, што не вѣдае, як атмóвиць пáну на еґó пытáне. Тым чáсам пан раптóўне да й кáжэ· „А не хáй цебé, бáбо, баґú каханюць, як жэ ты дóбрэ атґáдваеш!“ Пры гэ́стых славáх пан ращапúў рўку да й паказáў, што у еґó ў жмéни жук.

Дак от як шаптáла да варажы́ла тáя бáба. Енá рабúла й лю́дзям пажытэ́чне, й сабѣ ўжытэ́чне.

Пересказалъ Д. Кулешъ.

Д. Чудинъ.

78. Тое, да не тое.

Ма́быць вы ещэ не памета́ецe, да й куды вам, блазно́м, памята́ць! от тут за гро́белькаю было сельцэ, дак у то́м сельцы́ жыў сабе́ адзи́н чалавек. Дак ен, ба́чыце, хаць быў нехлемя́жы, але́ маў ве́льми ўпра́ўны язы́к: быва́ло як ска́жэ, дак бы звя́жэ. Зва́ўса ён Зми́цер Зми́цер таки́ зда́тны быў на прысказки, так ен го́жэ гаварыў, што его́ й паны́ слу́хали. Наш пан до́брэ знаў Зми́тра й ча́сто зваў его́ ў дво́р, каб ён паґаварыў да павесели́ў ґасце́й, як ены́ ча́сам зберу́тца, ўсе параґаво́раць и не ве́даюць аб чо́м ку́пяць Зми́цер ска́жэ да прыска́жэ, а паны́ то́лькі за бо́кі хвата́ютца да аж пу́каютца ат сме́ху. А то ча́сам Зми́цер як ска́жэ, дак таго́ це́лы ве́к не забу́дзеш. Але от кали́ зхо́чэ накпи́ць с каго́, дак ужэ так накпи́ць, што таму́ со́рам будзе не то́лькі лю́дзям ачу паказа́ць, але́ й само́му на себе́ паглядзе́ць. На́шы лю́дзи зна́ли Зми́тра й нихто ўжэ его́ нечапа́ў; усе́ бераґлиса его́, як аґню́. То́лькі ось прые́хаў у дво́р к па́ну яки́сь нача́льник. Кажуць,—ён быў тата́рын. Дак от зхаце́ў той тата́рын аґле́дзяць па́ньськи маентак. От и велеў пан таму́ Зми́тру запраґци́ кабы́лку да й абвезци́ тата́рына па маентку. Пасадзи́ў Зми́цер тата́рына да й пове́з. От то́лькі вы́ехали ены́ з двара́, аж на растанцо́х стаи́ць крыж От Зми́цер супыни́ў кабы́лку. зняў ша́пку да й перахрысци́ўса. Па́ехали ены́ далей, але от стаи́ць пры даро́зе слуп. Мо́о там быў капе́ц, ци што. Зми́цер без уся́каґа ува́ґи мина́е той слуп.

— Чаму-ж ты не перахрысци́ўса?—пыта́е Зми́тра тата́рын.

— Чаго́-ж я бу́ду хрысци́тца, кали ґэ́сто дзе́раво?

— Дак и то-ж было дзе́раво, а ты хрысци́ўса.

— То́е, да не то́е.

— Чаму́-ж не то́е? Серо́ўно-ж дзе́раво.

— Я-б табе́ сказа́ў, да баюса, што ты бу́дзеш ла́ятца.

— Кажы́. Не бу́ду.

— У цебе жо́нка е?

— Е.

— Дак пе́ўне ты, як пращаўуса з е́ю, та й пацалаваў мо́о ў са́мые ґу́бы

— Аджэ́-ж пацалаваў.

— Чаму-ж ты,—шануючы ґэ́стаґо дзенька́ свето́ґо й я́снаґо со́нейка,—не пацалаваў е́ў у сарамацне? Серо́ўно-ж це́ло. Але́ ма́быць то́е, да не то́е.

Пересказалъ Данило Бохматъ.

Д Чудинъ

---

79. Багатыр.

И той баґаты́р, хто ма́е мно́ґо уселя́каґо дабра́, й той, хто ве́льми ду́жы да здаравенны. Ча́сам дурны́е ка́жуць, што абы́ ґро́шы, та й здаро́ўе бу́дзе.—Не́, ма́быць, тра́сца табе́ не здаро́ўе бу́дзе за ґро́шы. Ма́быць ужэ́ так Бо́ґ даў, што баґа́таґо да замо́жнаґо дак за́ўжды яка́я ко́львек хваро́ба ци́сне. Бо штоб с таґо́ было́, каб ещэ́ баґа́ч да бы́ў и здаро́ў, е́н таґды́ й Бо́ґа сапхну́ў бы з не́ба. Бо́ґ знаў, што чалаве́к, як баґа́ты, та й ґа́рды; от аты́м Бо́ґ так зраби́ў, што хто баґа́ты, той за́ўжды нехлемя́жы, або́ хво́ры, а хто бе́дны, той здоро́вы да ду́жы. Бе́дны Бо́ґа памята́е, а баґаты́р дак уси́х забыва́е.

Гэ́так жэ, ка́жуць, даўне́й жыў адзи́н баґаты́р. Маў е́н то́льки ўселя́каґо дабра́, што й паличы́ць не мо́ґ. Жыў е́н у раско́шы да вы́ґадзе, не знаў ния́кае́ беды́, не маў ния́каґо ли́ха. Адно́ то́льки ґры́зло ео́, ґрызло й не дава́ло ему́ ни е́сци, ни спаць. Ґры́зло ео́ тое ли́хо, што кали́ до́брэ, дак хо́чэтца ещэ́ ле́пш, а тут не́льґа ничо́ґо ле́пшаґо прыду́маць. От и пача́ў той баґаты́р схнуць да петре́ць, што ат дабра́ не́льґа найци́ дабра́. То́льки ось ещэ ґаре́й ему зраби́ласо, як стре́ў е́н я́кась аднаґо́ ве́льми бе́днаґо чалаве́ка. Идзе́ сабе́ баґаты́р кале сваи́х пала́цаў, идзе засмуцо́ны, што нема́

на свѣце ўжэ лѣпшаґо дабра́, аж от якура́т су́нетца насустрэ́к чо́рны або́рваны ў ла́пиклу бѣ́дны чалавѣ́к, су́нетца да паэ́ пѣсни, аж табѣ́ баґатыра́ сад разлеґа́етца.

— Чаму ты паэ́ш?—пыта́е баґаты́р.

— А от паю́, бо здаро́ў и весе́л.

— Чаґо-ж ты весе́л, кали ты таки́ бѣ́дны?

— А яко́ґо-ж мнѣ бо́льш ражна́ трэ? Ссґо́днячы наѣ́ўса карто́пель, а за́ўтрэ буду мащь и хлѣ́б з са́лам, бо зараби́ў тро́хи асьмако́ў.

— Ци-ж ты таґо паеш, што здаро́ў и наѣ́ўса?

— Нѣ, я паю́, што як ни ли́хо жиць на свѣце, але́ пажыву́, та мо́о будзе й лѣпш.—Прамо́виў то́е бѣ́дны чалавѣ́к да й пацэ́ґса сабѣ далей, спева́ючы яку́юсь пѣсню.

— Уся́ беда́ ат баґа́тства,—ду́мае баґаты́р;—от атдам ткале́ лю́дзям збо́льшаґо сваэ́ баґа́тство, та мо́о й лѣпш бу́дзе.

Паду́маў э́н так да й дава́й крыча́ць, зваць бѣ́днаґо: „эй, чу́еш-бо! верни́са, е к табѣ́ дачыне́не“. Пачу́ў бѣ́дны чалавѣ́к, што заве́ баґаты́р да й верну́ўса. Тым ча́сам баґаты́р даста́ў з кишэ́ни капшу́к, по́ўны чырво́нцаў да й дае бѣ́днаму.—На,—ка,—вазьми ґэстые асьмаки́, та й табѣ́ будзе до́брэ, да й мнѣ лѣпш.

Падзякуваў бѣ́дны баґатыру́, ўзяў ґро́шы да й пашоў сабѣ́, а баґатыру́ й напра́ўду леґчэ́й стало на серцу, што э́н хаць раз зрабиў до́брае дзѣ́ло. Але не до́ўго ра́дуваўса баґаты́р, бо як прышо́ў да ґаспо́ды да як пача́ў личы́ць ґро́шы, от адра́зу еґо́ й апанава́ў жаль;—ему шко́да ста́ло тых асьмако́ў, што э́н атда́ў бѣ́днаму. Хо́дзиць баґаты́р, як у во́ду апу́щаны, сму́тны, як пад землэ́ю. Чым да́лей, тым ґарэ́й марко́тно баґатыру́ на се́рцу, марко́тно да так мо́ташно, хаць бер‌ы́ да й засили́са. А тут ещэ́ ўби́ласо баґатыру́ ў ґо́лаў, што бу́дзе з еґо́ баґа́цьем, як э́н здыр‌дзитца.—Як-бы ґэ́то зраби́ць,—ду́мае баґаты́р,—каб и па маэ́й сме́рци да ўлада́ць усим сваи́м баґа́цьем.—Ду́маў э́н, ду́маў да й наду́маўса. От зраби́ў э́н у кле́ци пад памо́стам по́ґраб, прыла́дзиў к ему так дзве́ры, што

нихто́ й не ўця́миць. Паскла́дваў баґаты́р у той по́ґраб усе́ сваё ґро́шы да ўсе, што ў его́ было́ са́мае дараґо́е Хо́дзиць баґаты́р у той по́ґраб да любу́етца на сваё добро́. От ґэ раз пашо́ў е́н у по́ґраб да не до́брэ зачыни́ў дзверы. Тым часам дзверы я́кась щакаўзну́лиса да й зачыни́лиса так, што баґа́ч немажэ́ з по́ґраба й вы́лезци. Седзи́ць баґа́ч у по́ґрабе да падыха́е ат ґо́ладу. Про́буваў крыча́ць, да нихто́ его́ не чу́е. Пазна́ў тут баґа́ч, яка́я цапа́ ґрашо́м и ўселя́каму баґа́тству, кали нема́ людзе́й, кали́ тое́ баґа́цье нико́му не трэ: пазна́ў, што тако́е ґро́шы, яка́я ат их лю́дзям кары́сь, пазна́ў, да не мажэ́ ничо́ґо нико́му сказа́ць, бо не́льґа вы́лезци з по́ґраба. От седзи́ць ен и не ве́дае, што пара́дзиць, аж ба́чыць, што ўсе́ его́ ґро́шы да ўсе добро́ аберну́ласо ў чалаве́чы по́т да ў кроў. Падніма́етца кроў з по́там у по́ґрабе ўсе бо́льш да бо́льш. От, от ужэ́ ена́ дахо́дзиць баґачу́ па са́мае ґо́рло, от, от ен захлебне́тца у чалаве́чуй крыві́ Тут баґаты́р сабра́ў, што е мо́цы да як кры́кне, дак чу́е, аж хтось абазва́ўса да й атчыня́е дзве́ры. Абра́дуваўса баґаты́р, так абра́дуваўса, як ещэ нико́ли, кали́ ўба́чыў, што ещэ мо́о тро́хи пажыве́ на све́це, мо́о ещэ зирне́ на я́снае со́нейко. Тым часо́ве бе́дны чалаве́к дава́й разбира́ць памо́ст, каб аслабаніць баґатыра́. Ґэто, ба́чыце, быў той са́мы бе́дны чалаве́к. што ему́ баґаты́р даў капшу́к асьмако́ў. Узя́ў ен таґды́ ат баґатыра́ ґро́шы да перш ду́маў, што з асьмака́ми бу́дзе ле́пш. Тым ча́сам ста́ло ґаре́й, як было: з ґрашы́ма ў дзень и ў но́чы—за́ўжды стра́шно, каб хто не ўкраў, або́ не заби́ў. Не ве́дае бе́дны, куды́ дзева́ць ты́е асьмаки́; но́ситца з ими, бы ко́т з асели́нцам. Не е́сь, не пье, ўсе ду́мае, каб не зґубиць тые ґро́шы; ґодзи пе́нь пе́сни, ґодзи́ ве́село жыць. Спя́траў за ты́е дни, але́ нарэ́шце даґада́ўса, што без ґро́шэй харо́шэй, да як даґада́ўса, дак схапи́ў той капшу́к з асьмака́ми да й папъе́р баґатыру́ наза́д. Прыне́с, аж таґо нема́. Дава́й бе́дны пыта́ць у людзе́й, ґдзе́ баґаты́р, а ты́е ка́жуць, што ма́быць чорт на хо́рму ухапи́ў, бо ен быў у ґаспо́дзе да ра́птам чорт ве́дае куды́ дзе́ўса. От стаи́ць бе́дны чалаве́к да чэ́шэ чупры́ну,

не вазьме́ сабе́ ў ґлузд, ґдзе́ найці́ баґатыра́. Але якура́т таґды́ баґаты́р закрыча́ў у по́ґрабе. Бе́дны ўвазна́ў е́ґо па ґо́ласу да й ки́нуўса рата́ваць Дак от разабра́ў бе́дны памо́ст да й раски́даў у по́ґрабе́ сто́ль. Вы́лез баґаты́р з по́ґраба чуць жыў да й про́сиць е́сци. Даста́ў бе́дны з ка́йстры пе́чаную карто́плю да асу́шки хле́ба, даў баґатыру́, а той наки́нуўса на тое, бы ґало́дны воўк; жу́мрыць, аж завуша́ми тращы́ць. Пасилкава́ўса тро́хи баґаты́р и дава́й дзя́куваць бе́днаму. А то́й ка́жэ: „Бо́ґу, а мне́ не́зашто. От дзя́куваць табе́ за тва́е ґро́шы. На табе́ их наза́д“. Тут бе́дны працяґну́ў ру́ку з ґраши́ма. Як уба́чыць баґаты́р ты́е ґро́шы да як закрычы́ць, што то чалаве́чая кроў да по́т, да як пабе́жы́ць ат ґро́шэй нау́цекача́, дак то́льки е́ґо пьятки митусятца. Бе́ґ, бе́ґ баґаты́р ат ґро́шэй да й уско́чыў у кало́дзесь. Кало́дзесь быў ґлыбо́ки. Пакуль збе́ґлиса лю́дзи да ки́нулиса рата́ваць, дак баґаты́р и зали́ўса. Ки́нуў таґды́ бе́дны туды́-ж у кало́дзесь и капшу́к з ґраши́ма, а сам пашо́ў сабе́ прыпева́ючы, як и ў пе́рад

Таґды́ пазна́ли лю́дзи, што ґдзе́ баґа́тство там ща́сця нема́ш, што баґаты́р ат баґа́тства ґи́не.

Пересказалъ Кругликъ

Д. Чудинъ.

80. Мужык и цыган.

Даўно́ то́е было́, мабыць ещэ таґды, як у наш край прышли́ цыґаны́. Ничаґу́сьсенько ены́ не ўме́ли рабиць, то́лько выпра́швали, або́ кра́ли да тым и жыви́лиса. От, ка́жуць, е́дзе раз мужы́к да й ба́чыць, што цыґа́н узле́з на дзе́раво, се́ў на ґали́ну да й сечэ е́е.

— Што ты ро́биш?—пыта́е мужы́к,—ґэ́тож ты ўпадзе́ш!

— Аткуль ты зна́еш, што я ўпаду́? Хиба́ ты праро́к,—атка́звае цыґа́н да ўсе пля́жыць пад сабо́ю ґали́ну От е́н падсе́к е́е да

ра́птам и ґрыманýўса далóў ра́зам з ґали́наю. Чуць печанцы́ не атсадзи́ў цыґа́н. От ён трóхи прачýхаўса да й ка́жэ: „ба́чу, што ты, ба́тю, праробк. Скажы́-ж ты мнѣ, кали́ я памру́?“

— Таґды́ памрэ́ш,—кажэ мужы́к, як за́дница пахало́дае. Падзя́куваў цыґа́н мужыку́ да й пашóў да́лей. От идзе́ сабѣ цыґа́н да ўсе ма́цае за́дницу, ци не пахало́дала. Але́ ось набѣґла хму́рка, лину́ў дож, а пóтым падхапи́ўса вѣцер. Прамóк цыґа́н да як мацну́ў за за́дницу, дак и нижы́ў: суздро́м ена́ пахало́дала. Спалóхаўса цыґа́н да беґóм к таму́ мужыку́.

— Ратýй, ба́тю,—ка́жэ ён мужыку́; кали́ бу́ду жыў, дак я табѣ ў падзя́ку дам ґасци́нца, або атраблю́ за турба́цаю.

— Дóбрэ,—ка́жэ мужы́к,—я цебе́ палечу́.

И дава́й лычакóм ґрéць цыґана́ па аза́дку. Грéў, ґрéў, аж з таґó па́ра павали́ла Раве́ цыґа́н нѣмым ґóласам, раве́, але́ як мацну́ў за за́дницу, дак и абра́дуваўса: ґарыць тая, бы аґóнь.

— Дзя́куй табѣ, ба́тю,—ка́жэ цыґа́н,—што атрата́ваў мене́ ат сме́рци. От скажы́-ж, чым ты мене́ лечы́ў?

— Чым, хиба́-ж ты не ба́чыш. Гэ́то-ж жыви́ло,—ка́жэ мужы́к, падня́ўшы ў руце́ лыча́к.

— Прадай, ба́тю, мнѣ ґэ́тае жыви́ло

— Купи́. Дай дзéсяць рублéў да й беры́. Будзеш лечы́ць себе́ й другúх, дак бу́дзе спóсаб да сме́рци.

Заплаци́ў цыґа́н дзéсяць рублéў, ухапи́ў лыча́к да й пабѣґ у село́. Прыбеґа́е ён туды́, аж там памéр чалавѣк. Пла́чуць лю́дзи, вѣдамо, як над пакóйникам.

— Гэ, дурны́е, чаґó вы пла́чэце?—ка́жэ цыґа́н.—От хи́бо да́йце я еґó палечу́, дак ён ажыве́.

— Палечы́, палечы́, мóй сако́лику!—про́сяць ба́бы.

От перавернýў цыґа́н пакóйника за́дницаю ўверх да дава́й еґó лупцава́ць лычакóм. Лупи́ў—лупиў, пама́цаў, аж за́дница ўсе хало́дная. Ничóґо не пара́дзиць цыґа́н,—пакóйник не ажыва́е. Уба́чыли тое лю́дзи да як пачали́ лупцава́ць цыґана́ за таку́ю лекóбу, дак

е́н наси́лу жывы́ вы́рваўса да наўцекача́. То̆льки еґо́ й ба́чыли Пашо́й цыґа́н з тых ча́саў валачы́тца па свѣ́ту да там чму́циць людзе́й, ґдзѣ еґо́ ещэ́ не зна́юць

Пересказалъ И Аземша

С. Лучицы.



ОГЛАВЛЕНІЕ.

Отъ собирателя. . . . . I—VII.
1. Нéбо и пéкло 1
2. Музы́ка и чэ́рци 2
3. Жо̀нка 5
4. Хваро́ба над хваро́бами 8
5. Кава́ль Баґаты́р 11
6. Чалавѣ́чае во́ко 15
7. Илья́ й Петро́ 16
8. Стары́ ба́цько 18
9. Кузьма́ 19
10. Бэч рыж 21
11. Бу́сел 22
12. Стралцы́ 23
13. Маска́ль и смерць . . . . . 25—33
14. Круци́ не круци́, а трэ́э умерци́ 34
15. Неха́й 37
16. Зави́сны баґаты́р 38
17. По́шасць и памо̀рак 39
18. Зави́дны по̀п 40
19. За до́брае злым запла́та 42
20. Брахня́ 43
21. Вада́ памаґла́ 44
22. Нашо́ў ґро́шы 46
23. Гро́шы цвиту́ць 47
24. За́ламка 48
25. Што ма́йстар, та зло́дзей 49
26. Ско́рам 50
27. Мужы́к, пан и ксёндз 52
28. Радзи́нки й пами́нки 53
29. Вецьма́к 54
30. Мужы́к и жыд 55
31. Як жыды́ шко́лу будава́ли 56
32. Баязли́вы жыд 60
33. Атрабля́не 61
34. Про́ща 63
35. Аб то̀м, як ксендзы́ вы́лечылиса 64

36. Ка́таржник и ста́раста 65
37. Чорт и ба́ба 67
38. Хаўру́с 71
39. Медзвѣдзь 73
40. Ла́стаўки 74
41. Цыга́н 75
42. По́п 76
43. Ве́льми наву́чны 78
44. Му́дры Салимо́н 79
45. Пи́сар 80
46. Дзеды́ 82
47. Мужы́к и пан 83
48. Аси́лак 87
49. Ви́сельник 90
50. Страх 94
51. Смерць 96
52. Цыга́н 97
53. Не вѣр ачо́м 98
54. По́п и пусте́льник 99
55. Па́ну наву́ка 103
56. Лиха́я до́ля 107
57. Кавали́ха 109
58. Бо́ртник 112
59. Кавальчу́к и пани́ч 119
60. Но́вы чорт 121
61. С чаго́ ли́хо на све́це 123
62. Калатня́ 127
63. Падаро́жны 128
64. Зна́хадка 129
65. Сме́лы 131
66. Адуко́ваны бычок 133
67. Петро́ Вели́ки 136
68. Дваранин 138
69. Памо́рак 139
70. Жа́ласливая па́ни 143
71. Ива́нко Прастачо́к 149
72. Кава́ль 152
73. Ганья́ 166
74. Светы́ чалаве́к 168
75. Чо́ртаво бало́то 171
76. Палешу́к и чорт 173
77. Шапту́ха 176
78. То́е, да не то́е 179
79. Баґаты́р 180
80. Мужы́к и цыга́н 183